БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

# УСХОДНЯЯ ЕЎРОПА Ў ЖАЛЕЗНЫМ ВЕКУ – ЭПОХУ ВЯЛІКАГА ПЕРАСЯЛЕННЯ НАРОДАЎ

**Матэрыялы
міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі,
прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння
А. А. Егарэйчанкі**

**Мінск, 24–25 красавіка 2025 г.**

Мінск
БДУ
2025

УДК 903(4-15)"638"(06)
ББК 63.442.7(4)я431
У75

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
доктар гістарычных навук прафесар *А. Г. Каханоўскі* (гал. рэд.);
доктар гістарычных навук прафесар *А. А. Гужалоўскі*;
доктар гістарычных навук прафесар *Т. А. Навагродскі*;
доктар гістарычных навук дацэнт *С. М. Цемушаў*;
доктар гістарычных навук прафесар *С. М. Ходзін*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *П. С. Курловіч*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *В. В. Рэпін*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *С. С. Юрэцкі*;
*А. Д. Сахончык*; *А. В. Зыль*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук дацэнт *А. А. Башкоў*;
кандыдат гістарычных навук дацэнт *А. М. Аўласовіч*

**Усходняя** Еўропа ў жалезным веку – эпоху Вялікага перасялення народаў : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 70-годдзю з дня нараджэння А. А. Егарэйчанкі, Мінск, 24–25 крас. 2025 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд. ) [і інш. ]. – Мінск : БДУ, 2025 – 399 с.
У75
ISBN 978-985-881-855-5.

Прадстаўлены матэрыялы беларускіх і расійскіх даследчыкаў аб навуковай спадчыне А. А. Егарэйчанкі ў святле сучаснай археалогіі. Разгледжаны актуальныя праблемы археалогіі позняга бронзавага і ранняга жалезнага вякоў Усходняй Еўропы, паказаны стан і перспектывы даследаванняў у галіне раннеславянскай археалогіі.

**УДК 903(4-15)"638"(06)**
**ББК 63.442.7(4)я431**

**ISBN 978-985-881-855-5**
© БДУ, 2025

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

| | |
|---|---|
| АЕС | – Археология евразийских степей |
| АСГЭ | – Археологический сборник Государственного Эрмитажа |
| БАН | – Беларуская акадэмія навук |
| БГУ/<br>БДУ | – Белорусский государственный университет/<br>Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт |
| ГАЗ | – Гістарычна-археалагічны зборнік |
| ГАИМК | – Государственная академия истории материальной культуры |
| ИА РАН | – Институт археологии Российской академии наук |
| ИИМК | – Институт истории материальной культуры |
| КСИА | – Краткие сообщения Института археологии |
| МАБ | – Матэрыялы па археалогіі Беларусі |
| МАИЭТ | – Материалы по археологии, истории и этнографии Таврии |
| МИА | – Материалы и исследования по археологии СССР |
| МИАДЛ | – Материалы и исследования по археологии Днепровского Левобережья |
| МКСА | – Международный Конгресс славянской археологии |
| МКАС | – Международный Конгресс археологов-славистов |
| НАВ | – Нижневолжский археологический вестник |
| ПАВ | – Петербургский археологический вестник |
| САИ | – Свод археологических источников |
| СА | – Советская археология |
| СПбГУ | – Санкт-Петербургский государственный университет |
| ЦНА НАН Беларусі. ФАНД | – Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі |

# ПРАДМОВА

Арганізаваная калектывам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Усходняя Еўропа ў жалезным веку – эпоху Вялікага перасялення народаў» прысвечана памяці выбітнага навукоўца, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Андрэевіча Егарэйчанкі (23.04.1955 – 02.12.2021). Аляксандр Андрэевіч з'яўляўся адным з першых выпускнікоў кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, якая адчынілася ў БДУ ў 1973 г. Большая частка працоўнага шляху таленавітага даследчыка і патрабавальнага выкладчыка была звязаная з гістарычным факультэтам і кафедрай.

Цэнтрам навуковай дзейнасці А. А. Егарэйчанкі было вывучэнне старажытнасцей жалезнага веку. У 1982 г. ён пад навуковым кіраўніцтвам В. В. Сядова абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную старажытным умацаваным паселішчам насельніцтва Беларускага Палесся ў VII–VI ст. да н. э. – II ст. н. э. У 1980 г. Аляксандр Андрэевіч пачаў працаваць у Інстытуце гісторыі АН БССР. Ён праводзіў археалагічныя разведкі па Прыпяці і яе прытоках, ажыццяўляў стацыянарнае вывучэнне гарадзішча Івань, гарадзішча Кашчэлічы Валожынскага раёна, селішчаў Востраў Пінскага раёна і Давыд-Гарадок Столінскага раёна.

У 1988 г. аўтарытэтны даследчык быў запрошаны ў БДУ на пасаду дацэнта кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 1997 г. А. А. Егарэйчанка быў прызначаны выконваючым абавязкі, а ў 1998 г. – загадчыкам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 2001 г. кафедра была рэарганізавана, і Аляксандр Андрэевіч узначаліў абноўленую кафедру археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

За час працы ў БДУ А. А. Егарэйчанка плённа сумяшчаў працу выкладчыка і буйныя палявыя археалагічныя даследаванні. У 1988 г. навуковец ажыццявіў раскопкі на гарадзішчы каля в. Гарадзішча ў Мядзельскім раёне, затым на працягу трох сезонаў вёў працы на гарадзішчы Івань у Слуцкім раёне. У 1992 г. А. А. Егарэйчанка прыступіў да вывучэння помнікаў позняга бронзавага і жалезнага веку ў Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці. З яго імем звязаныя раскопкі гарадзішча Тарылава, гарадзішча і селішча ў Зазонах і Рацюнках. Апошнія экспедыцыі пад кіраўніцтвам А. А. Егарэйчанкі праходзілі на паселішчы Падварынка з 2009 па 2013 гг.

У 2008 г. вынікам шматгадовай плённай працы даследчыка стала абарона доктарскай дысертацыі, у якой абгрунтоўвалася мэтазгоднасць падзелу культуры штрыхаванай керамікі на дзве самастойныя адзінкі і прапаноўваўся новы падыход да рэканструкцыі культурна-гістарычных працэсаў, што адбываліся ў паўночна-заходняй частцы лясной зоны Усходняй Еўропы ў канцы

II тыс. да н. э. – V ст. н. э. У 2013 г. яму было прысвоена званне прафесара. Велізарныя калекцыі матэрыялаў, назапашаныя Аляксандрам Андрэевічам, яго кнігі і рукапісы будуць запатрабаваныя наступнымі пакаленнямі даследчыкаў. А ў сэрцах вучняў А. А. Егарэйчанкі назаўжды застанецца добрая памяць аб настаўніку.

Нядзіўна, што канферэнцыя, прысвечаная памяці выбітнага даследчыка, атрымала актыўны водгук ад спецыялістаў ў галіне археалогіі жалезнага веку і эпохі Вялікага перасялення народаў з Беларусі і Расіі. Было прачытана 34 даклады, аўтарамі якіх сталі 43 навукоўцы з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Інстытута археалогіі РАН, Дзяржаўнага гістарычнага музея, Дзяржаўнага музея-запаведніка «Кулікова поле» і інш.

Пленарныя даклады былі прысвечаныя актуальным пытанням захавання археалагічнай спадчыны, вывучэнню матэрыяльнай культуры паселішчаў і пахавальнага абраду жалезнага веку – эпохі Вялікага перасялення народаў. Наступная праца канферэнцыі была арганізаваная па тэматычных секцыях, дзе разглядаліся сучасныя накірункі ў археалогіі жалезнага веку, навуковая спадчына А. А. Егарэйчанкі, пачатак жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі, гаспадарка і рэчавы інвентар жалезнага веку на тэрыторыі Усходняй Еўропы, вывучэнне археалагічных помнікаў жалезнага веку – эпохі Вялікага перасялення народаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Таксама ўдзельнікі азнаёміліся з экспазіцыяй вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ.

Праца канферэнцыі паказала, што навуковая спадчына Аляксандра Андрэевіча Егарэйчанкі запатрабаваная сучаснай археалагічнай супольнасцю. Былі ўведзеныя ў навуковы зварот новыя матэрыялы, атрыманыя як у выніку палявых даследаванняў, так і ў ходзе архіўных пошукаў. Агучаны дыскусійныя пытанні, якія патрабуюць далейшага грунтоўнага вывучэння.

**А. Г. Каханоўскі**
*дэкан гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*

**П. С. Курловіч**
*загадчык кафедры археалогіі і*
*спецыяльных гістарычных дысцыплін,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

# РАННІ ЖАЛЕЗНЫ ВЕК БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦАХ А. А. ЕГАРЭЙЧАНКІ

**Дз. А. Атрохаў**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,*
*220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, atrohaudzianis@gmail.com*

А. А. Егарэйчанка – адзін з вядучых даследчыкаў позняга бронзавага – жалезнага вякоў і ранняга сярэднявечча, навуковы інтарэс якога быў звязаны з вывучэннем старажытнасцяў культур штрыхаванай керамікі, а таксама сумежных з імі тэрыторый і культур (мілаградская, зарубінецкая і днепра-дзвінская культуры). У артыкуле даецца гістарыяграфічны агляд асноўных яго прац, а таксама спроба рэканструкцыі этнакультурных працэсаў ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі, як гэта прадстаўляў навуковец у сваіх публікацыях, артыкулах і манаграфіях.

***Ключавыя словы:*** ранні жалезны век; культура ранняй штрыхаванай керамікі; культура позняй штрыхаванай керамікі; мілаградская культура; зарубінецкая культура.

# РАННИЙ ЖЕЛЕЗНЫЙ ВЕК БЕЛАРУСИ В РАБОТАХ А. А. ЕГОРЕЙЧЕНКО

**Д. А. Атрохов**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,*
*220072, г. Минск, Республика Беларусь, atrohaudzianis@gmail.com*

А. А. Егорейченко – один из ведущих исследователей позднего бронзового – железного веков и раннего средневековья, научный интерес которого был связан с изучением древностей культур штрихованной керамики, а также смежных с ними территорий и культур (милоградская, зарубинецкая и днепро-двинская культуры). В статье дается историографический обзор основных его работ, а также попытка реконструкции этнокультурных процессов раннего железного века на территории Беларуси, как это представлял ученый в своих публикациях, статьях и монографиях.

***Ключевые слова:*** ранний железный век; культура ранней штрихованной керамики; культура поздней штрихованной керамики; милоградская культура; зарубинецкая культура.

# EARLY IRON AGE OF BELARUS IN THE WORKS OF A. A. EGOREYCHENKO

**Dz. A. Atrokhau**

*Institute of History of the NAS of Belarus, Akademic str., 1,*
*220072, Minsk, Republic of Belarus, atrohaudzianis@gmail.com*

A. A. Egoreychenko is one of the leading researchers of the Late Bronze–Iron Age and Early Middle Ages, whose scientific interest was connected with the study of the antiquities of the hatched pottery cultures, as well as adjacent territories and cultures (Milograd,

Zarubinets and Dnieper-Dvina cultures). The article gives a historiographical review of his main works, as well as an attempt to reconstruct the ethnocultural processes of the Early Iron Age in the territory of Belarus as presented by the scientist in his publications, articles and monographs.

***Keywords:*** Early Iron Age; early hatched pottery culture; late hatched pottery culture; Milograd culture; Zarubinets culture.

Аляксандр Андрэевіч Егарэйчанка (23.04.1955–02.12.2021) – доктар гістарычных навук, прафесар, адзін з выбітных прадстаўнікоў беларускай археалогіі позняга бронзавага – жалезнага вякоў і ранняга сярэднявечча. Першапачатковы навуковы інтарэс маладога даследчыка быў звязаны з вывучэннем старажытных гарадзішчаў беларускага Палесся ў VII–VI стст. да н. э. – II ст. н. э. Вынікам плённай працы стала абарона кандыдацкай дысертацыі ў 1982 г. і выхад у 1996 г. абагульняючай манаграфіі «Древнейшие городища Белорусского Полесья (VII–VI вв. до н. э. – II в. н. э.)», у якой былі падведзены вынікі шматгадовых даследаванняў па аналізе палескіх матэрыялаў, у тым ліку была распрацавана класіфікацыя старажытных умацаваных паселішчаў, дадзена комплексная характарыстыка помнікаў, а таксама прапанавана гісторыка-культурная рэканструкцыя працэсаў, што адбываліся ў рэгіёне [1].

У далейшым цікавасць даследчыка была скіравана на вывучэнне жалезнага веку цэнтральнай і паўночнай Беларусі. На падставе шматгадовых палявых даследаванняў быў назапашаны матэрыял, які дазволіў прапанаваць новы падыход да вызначэння культурнай прыналежнасці помнікаў Беларусі ў канцы II тыс. да н. э. – сярэдзіне I тыс. н. э., удакладніць храналогію культурных змен. Вынікі руплівай працы ляглі ў аснову манаграфіі «Культуры штрихованной керамики», якая выйшла ў 2006 г., а таксама доктарскай дысертацыі, абарона якой адбылася ў 2008 г. [1].

За сваю амаль 40-гадовую кар’еру археолага А. А. Егарэйчанка правёў шэраг археалагічных экспедыцый. Найбольш вядомыя даследаванні закранулі такія помнікі, як гарадзішча Халапенічы (1978 г.), гарадзішча Івань (1979, 1981–1983, 1989–1991 гг.), селішча Давыд-Гарадок (1985 г.), гарадзішча Кашчэлічы (1986 г.), селішча Востраў (1987 г.), гарадзішча Гарадзішча (1988 г.), гарадзішча Тарылава (Укля) (1992–1994 гг.), гарадзішча і селішча Зазоны (1995–1999 гг.), гарадзішча Рацюнкі (1999, 2001–2007 гг.), гарадзішча Падварынка (2009–2013 гг.) [2, с. 41–48]. Вынікі палявых даследаванняў ляглі ў аснову звыш ста навуковых артыкулаў, публікацый і дзвюх манаграфій. Навуковец разглядаў шэраг тэарэтычных пытанняў, звязаных з мілаградскай, зарубінецкай, днепра-дзвінскай культурамі, але галоўныя яго даследаванні былі скіраваны на вывучэнне старажытнасцяў культур штрыхаванай керамікі (КШК).

Параўноўваючы ранні і позні этапы КШК, А. А. Егарэйчанка заўважыў, што нягледзячы на наяўнасць агульнага, паміж этапамі шмат рознага. Розніца паміж імі была настолькі вялікай, што дазволіла падзяліць адзіную культуру на дзве генетычна звязаныя паміж сабою – культуру ранняй штрыхаванай керамікі (КРШК) і культуру позняй штрыхаванай керамікі (КПШК). Агульным для абедзвюх культур з'яўляецца адсутнасць могільнікаў, традыцыя пакрываць посуд штрыхоўкай, пэўная пераемнасць ў тапаграфіі паселішчаў і домабудаўніцтве. Акрамя гэтага, арэал КПШК уключаў у сябе помнікі КРШК [3, с. 170].

Адрозненняў паміж культурамі больш, чым агульнага. А. А. Егарэйчанка прыводзіць наступныя прыклады, чаму ранні і позні этапы з'яўляюцца рознымі культурамі. Для КРШК характэрны касцяны і каменны інвентар, а ў КПШК значнае месца займаюць вырабы з жалеза. Змены ў матэрыяльнай культуры храналагічна супадаюць са зменай керамічнага комплексу. Для ранніх «штрыхавікоў» быў характэрны баначны і слабапрафіляваны посуд, які цалкам пакрыты хаатычнай штрыхоўкай з беднай арнаментацыяй. У позніх «штрыхавікоў» вядучае месца займаюць рабрыстыя гаршкі з вертыкальнай ці дыяганальнай штрыхоўкай, нанесенай ад рабра да донца, з больш разнастайнай арнаментацыяй.

Слабаўмацаваныя пагоркавыя гарадзішчы КРШК у КПШК значна ўзмацняюцца, набываючы да некалькі ліній штучных умацаванняў, прадстаўленых валам і рвом. Позні штрыхавікі засвойваюць рачныя мысы, часта на месцы гарадзішчаў мілаградскай культуры. Акрамя гэтага, у КПШК узнікае асаблівы тып гарадзішчаў, якія ўзведзеныя на высокіх карэнных берагах рэк, якія не так жорстка звязаныя з прыроднымі перашкодамі, абароненыя з напольнага боку валам і рвом, а з боку звернутага да вады – драўлянай сцяной (Івань, Малышкі, Мыслі, Старая Рудніца і інш.). Адзначаюцца перамены і ў домабудаўніцтве. Разам з наземнымі дамамі слупавой канструкцыі ў КПШК прысутнічаюць паўзямлянкі (Івань, Мыслі, Равячка) і наземныя дамы (Вязынка) зрубнай канструкцыі.

Значныя перамены адбыліся і ва ўзбраенні. На помніках КРШК вядомы знаходкі дзідаў і дроцікаў, але раннія штрыхавікі надавалі перавагу выкарыстанню зброі дальняга бою, прадстаўленай знаходкамі шматлікіх касцяных стрэл. Ва ўзбраенні КПШК дамінуе зброя бліжняга боя, прадстаўленая жалезнымі дзідамі і дроцікамі, а стрэлы за рэдкім выключэннем невядомыя. Шырокае распаўсюджанне ў КПШК атрымалі гліняныя праселкі, амаль невядомыя на помніках КРШК [3, с. 170; 4, с. 70–72].

Істотнае адрозненне назіраецца ў структуры гаспадарчай дзейнасці. Аснову гаспадаркі КРШК складала жывёлагадоўля з перавагай ў статку свінні. Роля падсечнага земляробства была абмежаванай. Важную ролю захоўвалі

яшчэ паляванне і рыбалоўства. У КПШК на першы план выходзіць падсечнае земляробства, а ў жывёлагадоўлі ў статку дамінуе буйная рагатая жывёла [5, с. 42–50, 97–103].

Такім чынам, па свайму характару КРШК і КПШК з'яўляюцца рознымі культурамі. КРШК адносіцца да эпохі бронзы, а КПШК – да развітага жалезнага веку [3, с. 170]. Трэба адзначыць, што не ўсе даследчыкі прынялі падзел адзінай культуры на дзве генетычна звязаныя. На думку А. М. Мядзведзева, шэраг працэсаў, прыведзеных А. А. Егарэйчанкам у якасці доказу, насілі іншы характар. Так, на яго думку, з'яўленне рабрыстага посуду і шырокае распаўсюджанне жалезных вырабаў не адбылося ў адзін час. На стадыі LtD (каля 100 г. да н. э. – 10 г. н. э.) працягвалася шырокае выкарыстанне вырабаў з камня, косткі і рога і ў меншай ступені – з жалеза. Жалезныя прылады працы ўвойдуць у паўсядзённае жыццё каля памежжа эр [6, с. 71, 79]. Неабходна звярнуць увагу, што А. А. Егарэйчанка лічыў дапушчальным, што асобныя групы насельніцтва захавалі традыцыі КРШК і зніклі не пазней за пачатак III ст. н. э. [5, с. 56; 7, с. 113–114].

**Культура ранняй штрыхаванай керамікі.** На думку А. А. Егарэйчанкі, КРШК лакалізавалася адносна на вузкай тэрыторыі ў міжрэччы Нёмана і Заходняй Дзвіны. Ядро фарміравання КРШК – паўночна-ўсходняя Літва, верхні басейн р. Швянтойі (прыток Віліі) і левабярэжных прытокаў сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны, а таксама сумежныя тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі (Браслаўскі, Мядзельскі, Пастаўскі і іншыя раёны) і паўднёва-ўсходняй Латвіі (у асноўным у парэччы Заходняй Дзвіны), адкуль адбываецца паступовае рассяленне носьбітаў КРШК пераважна ў паўднёвым і паўднёва-ўсходнім накірунку [8, с. 38–39; 9, с. 67–69]. Больш позняе паходжанне, не раней другой паловы I тыс. да н. э., маюць гарадзішчы цэнтральнай Беларусі, у басейне верхняга Нёмана і ў Нёманска-Дняпроўскім міжрэччы [5, с. 13].

Вялікую дыскусію выклікала правядзенне мяжы паміж КРШК і днепра-дзвінскай культурай (ДДК) у Браслаўскім Паазер'і. З прычыны таго, што на гарадзішчах гэтага рэгіёну сустракаюцца як штрыхаваная, так і гладкасценная кераміка, а рэчавы комплекс абедзвюх культур мае шмат агульных рысаў, то розныя даследчыкі адносяць гэтыя помнікі то да адной, то да іншай культуры. А. А. Егарэйчанка лічыў, што мяжа паміж КРШК і ДДК заставалася амаль нязменнай на ўсім працягу існавання культур. Толькі ў I тыс. да н. э. адзначаецца слабавыяўленае пранікненне носьбітаў КРШК ў арэал ДДК, што праяўляецца ў пераходзе гарадзішча Рацюнкі ад ДДК да КРШК. Канчатковая стабілізацыя мяжы па гэтай лініі адбылася толькі на рубяжы эр. Мяжа паміж КРШК і ДДК праходзіла па лініі гарадзішчаў Рацюнкі–Тарылава (Укля) па ўсходняй частцы Браслаўскага раёна. Далей мяжа паміж куль-

турамі праходзіла па лініі гарадоў Шаркаўшчына–Докшыцы, выходзячы на верхнюю Бярэзіну. Далей на ўсход ад адзначанай мяжы носьбіты КРШК не пранікалі [10, с. 19–20].

На падставе аналізу керамічнага матэрыялу, З. А. Харытановіч аднесла гарадзішчы Рацюнкі, Тарылава (Укля), Зазоны да ДДК, адзначаючы, што няма нагод звязваць іх з КШК, а аб уплыве КШК можна казаць з моманту з'яўлення штрыхаванага посуду рабрыстай формы на памежжы эр, якая складае нязначную частку керамічнага комплексу [11, с. 177]. А. М. Мядзведзеў аднёс да КШК толькі гарадзішча Падварынка. На астатніх гарадзішчах (Зазоны, Рацюнкі, Тарылава (Укля)) асаблівасці мясцовай керамікі ставяць пад сумнеў аднясенне іх як да КШК, так і да ДДК. Так, спасылаючыся на значную ўдзельную вагу гаршкоў слоікавай формы, а таксама на наяўнасць у комплексе шурпатага і аблітага посуду, даследчык ставіць пытанне аб культурнай прыналежнасці дадзенага рэгіёну ці да ДДК з уплывам латгальскай культуры і КШК, ці да латгальскай культуры [12, с. 78–79].

Вядучы даследчык ДДК на тэрыторыі Беларусі В. І. Шадыра характарызуе этнакультурную сітуацыю ў Браслаўскім Паазер'і наступным чынам. Заходняя мяжа паміж ДДК і КШК праходзіць праз Дунілавічы–Варапаева–Браслаў–Верхнядзвінск, а гарадзішчы адзначанай тэрыторыі ўваходзяць у кантактную паласу культур, дзе выяўлена як штрыхаваная, так і гладкасценная кераміка. Навуковец пагаджаецца з А. А. Егарэйчанкам аб першапачатковым засяленні гарадзішчаў Зазоны, Рацюнкі, Тарылава (Укля) носьбітамі ДДК і ў далейшым пераходзе іх да носьбітаў КШК і характарызуе гэтыя з'явы як націск носьбітаў КШК на тэрыторыю насельніцтва ДДК. Пры гэтым рух КШК на гарадзішчы Рацюнкі і Зазоны быў у больш ранні час, што характарызуецца толькі прынясеннем элементу штрыхоўкі на пасудзіны мясцовых форм, а на гарадзішча Тарылава (Укля) у больш позні час – не раней за памежжа эр, што выяўляецца ў наяўнасці рабрыстага штрыхаванага посуду. Такім чынам, у Браслаўскім Паазер'і назіраецца вялікая актыўнасць КШК, магчыма, гэта актыўнасць была вымушанай і звязанай з адцісненнем іх з захаду на ўсход. На думку В. І. Шадыры, дадзеныя з'явы натуральныя для памежных зон розных археалагічных культур, асабліва блізкіх па свайму характару. Распаўсюджванне штрыхаванай керамікі на гарадзішчах ДДК у кантактнай зоне сведчыць аб перавазе ўплыву КШК на ДДК, актывізацыя якіх асабліва заўважна з памежжа эр [13, с. 189–193].

Кантакт КРШК з іншымі культурамі А. А. Егарэйчанка характарызаваў наступным чынам. На працягу апошняй чвэрці ІІ – першай чвэрці І тыс. да н. э. назіраюцца найбольш інтэнсіўныя сувязі паміж КРШК і культурамі заходняга рэгіёна, сярод якіх адзначаюцца перадлужыцкая, лужыцкая культуры і культура заходнебалцкіх курганоў, што выяўляецца ў наяўнасці прывазных вырабаў з бронзы (булаўкі з грыбападобным навершам, дзіды,

складанафігурныя гузікі і г. д.), а таксама іх мясцовых адпаведнікаў, вырабленых з косткі. З VIII ст. да н. э. пашыраюцца кантакты з усходнімі культурамі, у першую чаргу, з роднаснай ДДК. Паміж культурамі існаваў сталы ўзаемаўплыў. Так, у арэал ДДК ад КРШК патрапілі булаўкі з грыбападобным навершам, а праз ДДК у КРШК трапілі бронзавыя кельты акозінска–меларскага тыпу, грузікі дзякоўскага тыпу, а таксама шэраг тыпаў касцяных стрэл і гарпуноў [5, с. 52–53; 7, с. 113].

Фарміраванне КРШК прыпадае на апошнюю чвэрць II тыс. да н. э., пра што сведчаць выяўленыя бронзавыя булаўкі з цвікападобным навершам і іх касцяныя адпаведнікі (Зазоны, Рацюнкі і інш.). Таксама на карысць ранняга фарміравання КРШК кажуць даныя, атрыманыя пры выкарыстанні радыёкарбоннага аналізу вугалю з розных пластоў незакранутых ворывам гарадзішчаў Зазоны і Рацюнкі, і костак з двух пахаванняў з гарадзішча Рацюнкі. Атрыманыя вынікі ў цэлым пацвярджаюць адзначаныя храналагічныя межы культуры, распрацаваныя на падставе параўнаўча-тыпалагічнага метаду. Разам з тым частка дат дазваляе паставіць пытанне аб пераносе ніжняй храналагічнай межы КРШК да сярэдзіны II тыс. да н. э. [5, с. 54–56; 14, с. 134–136].

Фінал КРШК прыпадае на рубеж эр, калі яе змяняе КПШК. Магчыма, што асобныя групы насельніцтва, захаваўшы традыцыі КРШК, працягнулі сваё існаванне і пазней, у перыяд дамінавання КПШК, і знікаюць не пазней за пачатак III ст. н. э. Так, на гарадзішчах Невярышке і Сокішкяй у верхніх пластах сустракаюцца як баначныя і слабапрафіляваныя, так і рабрыстыя гаршкі. Там жа адначасова сустракаліся каменныя і жалезныя вырабы. У цэлым жа, на працягу існавання КРШК ў ёй не назіраецца істотных перамен. Асобныя навацыі, якія можна ўбачыць у яе вобліку, адлюстроўваюць эвалюцыйны характар развіцця [5, с. 56; 7, с. 113–114].

**Культура позняй штрыхаванай керамікі.** Новая культура фарміруецца на аснове КРШК, як адзначаў сам А. А. Егарэйчанка, пад моцным уплывам правінцыяльнарымскіх традыцый у I ст. да н. э. [5, с. 119]. Дадзены ўплыў пацвярджаецца ростам правінцыяльнарымскіх імпартаў у I–II стст. н. э. [15]. Арэал КПШК значна шырэй і акрамя паўночна-ўсходняй Літвы, паўднёва-ўсходняй Латвіі і паўночна-заходняй Беларусі ахоплівае ўсходнюю Літву, цэнтральную Беларусь і Перадпалессе [4, с. 72–73; 5, с. 57–60].

З моманту ўзнікнення КПШК праяўляе актыўную экспансію ў паўднёвым і паўднёва-ўсходнім накірунку. У другой палове I ст. да н. э. носьбіты КПШК пранікаюць у Перадпалессе і на Нёманска-Дняпроўскі водападзел (Івань, Мыслі), што ўсталёўваецца па шкляной пазалочанай пацерцы II ст. да н. э. – I ст. н. э., а таксама кельту. Згодна з аналогіямі ў зарубінецкіх матэрыялах, апошні датуецца не раней сярэдзіны I ст. да н. э., выяўлены у ніжніх пластах гарадзішча Івань. У I ст. н. э. КПШК асвойваюць сярэднюю Бярэзіну (Аздзяцічы, Кімія, Навасёлкі). Час пранікнення КПШК на сярэд-

нюю Бярэзіну ўсталёўваецца па прагнутай падвязной фібуле з гарадзішча Навасёлкі. Напэўна, у гэты ж час адбываецца слабае пранікненне КПШК у басейн ніжняй Бярэзіны (Чыжаха, Лысуха, Пятровічы, Слабодка і інш.). У выніку ў канцы I ст. да н. э. – пачатку I ст. н. э., мяжа КПШК стабілізуецца прыкладна па лініі Баранавічы–Нясвіж–Капыль–Слуцк [5, с. 105; 16, с. 75]. На думку А. А. Егарэйчанкі, большасць гарадзішчаў КПШК у Беларусі ўзнікла не раней за сярэдзіну I ст. да н. э. Менавіта бліжэй да памежжа эр на ўсёй тэрыторыі цэнтральнай Беларусі адбываецца ніверліроўка матэрыяльнай культуры, што выяўляецца перш за ўсё ў распаўсюджванні рабрыстых гаршкоў, пакрытых штрыхоўкай, наземных жытлаў слупавой і зрубнай канструкцыі, жалезных вырабаў у рэчавым комплексе, гарадзішчаў з моцнай сістэмай абароны [17, с. 67–68; 18, с. 118].

Такім чынам, А. А. Егарэйчанка адзначае наступныя межы КПШК. Заходняя мяжа ў Літве праходзіць па Нёману і Швянтойі. На тэрыторыі Беларусі вызначэнне заходняй мяжы выклікае складанасць з-за слабадаследаванасці рэгіёну і адсутнасці ў ім гарадзішчаў. Верагодна, мяжа як і ў Літве праходзіла па Нёману і яго левабярэжным прытокам (Свіслач, Рось, Зельвянка). На поўначы помнікі КПШК лакалізуюцца ў парэччы Заходняй Дзвіны і нізоўях яе прытокаў (паўднёва-ўсходняя Латвія і паўночна-заходняя Беларусь). На тэрыторыі Літвы КПШК займала тэрыторыі КРШК, аднак асноўны арэал КПШК знаходзіўся больш на поўдзень, у вобласці Нярыса (Віліі) і сярэдняга цячэння Нёмана. Паўднёвая мяжа КПШК праходзіла па водападзелу Дняпра і Нёмана, па вярхоўям левабярэжных прытокаў Прыпяці (Случ, Морач, Лань), пераходзячы на захадзе ў басейн верхняга Нёмана, на р. Шчару. Тэрыторыя распаўсюджвання КПШК на ўсходзе абмяжоўваецца правым берагам Бярэзіны. На яе левым беразе зафіксавана прысутнасць адзінкавых гарадзішчаў КПШК, якія сустракаюцца да Друці. Далей на ўсход да Дняпра і, асабліва, у Смаленскае Падняпроўе КПШК не пранікала [4, с. 72–73; 5, с. 57–60; 7, с. 114–115].

Доўгі час выклікала складанасць вызначэнне культурнай прыналежнасці помнікаў Гомельска–Магілёўскага Падняпроўя, Пасожжа і паўночна-ўсходняга Палесся. Улічваючы штрыхоўку на гліняным начынні мясцовых гарадзішчаў, шэраг даследчыкаў (А. Р. Мітрафанаў, В. В. Сядоў) адносілі іх да КПШК, але, на думку А. А. Егарэйчанкі, штрыхоўка ў гэтым рэгіёне мае мясцовыя карані і звязана з мілаградскай культурай і групай Кісцяні–Чачэрск верхнедняпроўскага варыянту зарубінецкай культуры, што пацвярджаецца шэрагам прыкмет (керамічны матэрыял, металічныя вырабы і г. д.) [4, с. 72–73; 8, с. 39–40; 9, с. 69]. У далейшым менавіта гэтая група паслужыла асноўным кампанентам у фарміраванні познезарубінецкіх помнікаў тыпу Грыні–Ваўкі, а не КПШК, як гэта лічылася раней [19, с. 238]. Такім чынам, удзел непасрэдна КПШК малаверагодны [4, с. 73; 5, с. 59].

Змяшэнне розных культурных традыцый адбывалася не толькі ў Верхнім Падняпроўі, але і ў басейне Заходняй Дзвіны, які складае значную частку арэалу ДДК. На гарадзішчах апошняй выяўлены штрыхаваны посуд, сярпы і праселкі, характэрныя для позніх «штрыхавікоў», што, на думку А. А. Егарэйчанкі, сведчыць аб інфільтрацыі невялікіх груп насельніцтва апошніх. Сярод важных перамен у Браслаўскім Паазер'і адзначаецца пераход да КПШК гарадзішча Тарылава (Укля) на рубяжы эр, якое да гэтага было заселена носьбітамі ДДК [4, с. 73–75; 16, с. 76]. Але ўсё ж такі, асноўны масіў КПШК у басейне Заходняй Дзвіны лакалізуецца ніжэй па поплыву гэтай воднай магістаралі. На тэрыторыі Латвіі мяжа КПШК праходзіла ў Краслаўскім раёне, а затым спускалася на поўдзень, у Браслаўскі раён Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь, праходзячы па лініі гарадзішчаў Зазоны–Рацюнкі–Тарылава (Укля) [4, с. 75]. Далей мяжа паміж КПШК і ДДК праходзіла, як і раней, па лініі гарадоў Шаркаўшчына–Докшыцы, выходзячы на верхнюю Бярэзіну.

Характарызуючы кантакты з іншымі культурамі, А. А. Егарэйчанка адзначыў наступнае. У выніку прасоўвання КПШК на поўдзень Перадпалесся, на Нёманска-Дняпроўскі водападзел і на паўднёвы-ўсход у басейн Бярэзіны ў фазе LtD2 (каля 60 г. да н. э. – 10 г. н. э.) утвараецца шырокая паласа прамога кантакту з носьбітамі зарубінецкай культуры, праз якую ў арэал КПШК пачынаюць трапляць як уласна зарубінецкія рэчы, так і больш далёкія імпарты. Сярод імпартных рэчаў позняга перадрымскага і раннерымскага перыядаў, якія можна звязаць з зарубінецкай культурай ці з ёй у якасці пасярэдніка, адзначаюцца знаходкі фібул верхнедняпроўскай серыі (Банцарыўшчына, Мыслі, Навасёлкі) і воінская фібула (Малышкі), шкляныя пацеркі, прадметы узбраення і інш., якія выяўлены, перш за ўсё, у межах Дняпроўскага басейна (Аздзяцічы, Івань, Лабеншчына, Малышкі і інш.). Аднак гэтыя сувязі былі не працяглымі, прыкладна з сярэдзіны I ст. да н. э. па сярэдзіну I ст. н. э. [20, с. 109–110; 21, с. 37–38].

Распад зарубінецкай культуры ў сярэдзіне I ст. н. э. спыніў ці звёў да мінімуму кантакты КПШК з больш паўднёвымі рэгіёнамі. Замест гэтага на першы план выступаюць сувязі носьбітаў КПШК з культурамі заходняга кола, прычым інтэнсіўнасць паступленняў прадметаў імпарту была найбольш высокай у позні перадрымскі і ранні рымскі перыяды. Пасля назіраецца паступовае змяншэнне колькасці прывазных рэчаў, што, па меркаванню А. А. Егарэйчанка, звязана з крызіснымі з'явамі ў самой КПШК. Асноўнымі катэгорыямі паступленняў з заходняга накірунку былі фібулы правінцыйнарымскіх тыпаў (Кашчэлічы, Івань, Мыслі і інш.) і дэталі паяснога набору (Лабеншчына, Рацюнкі, Малышкі і інш.), пераважна спражкі. Частка спражак, асабліва жалезных адначастных з'яўляецца мясцовым пераймannем імпартных. У якасці патэнцыйных «пастаўшчыкоў» маглі быць носьбіты вель-

барскай ці заходнебалтыйскай культур, прычым перавагу А. А. Егарэйчанка аддае апошнім, так як у заходнебалтыйскай культуры сустракаюцца аналогіі большасці імпартных рэчаў, знойдзеных у цэнтральнай і паўночна-заходняй Беларусі, і толькі ў гэтай культуры з ліку заходніх адзначаны вырабы з эмалямі [20, с. 109–110; 21, с. 38–40].

Актыўныя сувязі паміж КПШК і заходнебалтыйскімі культурамі могуць быць выкліканы неспрыяльным становішчам, якое складваецца ў фазах B1b–B2 (каля 40–160 гг. н. э.) раннерымскага перыяду, калі пад ціскам вельбарскіх плямёнаў частка носьбітаў заходнебалтыйскай культуры вымушана была адыйсці на тэрыторыю Літвы, дзе фармуюцца новыя культурныя ўтварэнні, якія маюць падобныя рысы з заходнебалтыйскімі. Такім чынам, большасць гарадзішчаў КПШК Літвы перастаюць функцыянаваць ў II–IV стст. н. э., што было выклікана прытокам новага насельніцтва з больш заходніх раёнаў, які прынеслі з сабою курганны абрад пахаванняў [16, с. 76; 21, с. 40].

Прыкладна такія ж працэсы назіраюцца і ў беларускім арэале КПШК. Фаза B1 (каля 10–80 гг. н. э.) была часам росквіту КПШК, пасля чаго назіраецца яе паступовы заняпад. Крызісныя з’явы КПШК пачынаюць выяўляцца ў канцы I ст. н. э. У гэты час згасае жыццё на гарадзішчах Перадпалесся (Івань, Мыслі), вярхоўяў Пцічы і сярэдняй Бярэзіны (Навасёлкі). У II–III стст. н. э. спыняецца жыццё на большасці гарадзішчаў цэнтральнай і часткова паўночна-заходняй Беларусі (Лабеншчына, Малышкі, Зазоны, Рацюнкі), за выключэннем, быць можа, крайняга паўночнага захаду Беларусі і часткі Верхняга Панямоння. Да сярэдзіны V ст. працягваюць існаваць толькі асобныя паселішчы, якія знаходзяцца на паўночным захадзе Беларусі (Гарадзішча, Равячка). Такім чынам, у першай палове I тыс. н. э. адбываецца паступовае скарачэнне тэрыторыі КПШК у паўночна-заходнім кірунку, з’ява – прама супрацьлеглая рассяленню носьбітаў гэтай супольнасці. Прычыны крызісу КПШК на тэрыторыі Беларусі ў першых стагоддзях н. э. пакуль не падаюцца адназначнай трактоўцы. Магчыма, гэта, як і сітуацыя з палескім варыянтам зарубінецкай культуры, звязана з кліматычнымі зменамі. Толькі нязначная колькасць гарадзішчаў працягнула сваё функцыянаванне і ў больш позні час, храналагічна даходзячы да банцараўскай культуры, носьбітамі якой і было асімілявана насельніцтва гарадзішчаў [16, с. 76; 21, с. 40; 22, с. 49–50].

Іншы погляд на фінал КПШК мае А. М. Мядзведзеў. Згаджаючыся з А. А. Егарэйчанкам аб знікненні КПШК (ці этап III КШК – па А. М.) ва ўсходняй Літве ў II–III стст. н. э., даследчык даводзіў існаванне КПШК на тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны V ст. н. э. Адзначаючы, што яе помнікі працягнулі сваё існаванне не толькі на памежжы паўночна-ўсходняй Літвы і сумежных тэрыторыях Беларусі, але і ў Перадпалессі, вярхоўях Нёмана (Івань, Мыслі, Гарадзішча, Варонча, Аношкі) [6, с. 77–79]. Ідэю аб падаўжэнні верхняй даты КПШК да сярэдзіны V ст. н. э. крытычна ўспрыняў А. І. Дра-

бушэўскі, які звярнуў увагу на неправамернасць вылучэння больш позняй даты існавання культуры па шырока датуемых знаходках (дзіды, каменныя праселкі, авальная жалезная спражка і інш.) [23, с. 166–169].

Што датычна этнічнай прыналежнасці носьбітаў КШК, то ў сваёй манаграфіі «Культуры штрихованной керамики» А. А. Егарэйчанка не дае адказу на гэтае пытанне, пералічваючы толькі асноўныя погляды іншых даследчыкаў [5, с. 115–117]. Асаблівую ўвагу ў прадстаўленых ідэях А. А. Егарэйчанка надае гіпотэзе Дз. А. Мачынскага. Гэта звязана з тым, што большасць даследчыкаў адносілі КШК да балтаў, у той жа час, Дз. А. Мачынскі адзін з першых, хто ў носьбітах КШК бачыць славян. Даследчык на падставе дадзеных археалагічных, лінгвістычных і іншых навуковых дысцыплін, развівае ідэю развіцця славянскіх культур на падставе КШК: носьбіты КПШК, працягваючы некаторыя культурныя традыцыі КРШК, увабралі асобныя элементы позняй цяжкаўлоўнай мілаградскай культуры, а затым, пры міграцыі на поўдзень (у Прыкарпацце), і элементы палескага варыянта зарубінецкай культуры, што, на думку даследчыка, суадносіцца з пісьмовымі данымі аб венедах Тацыта і ставанаў Клаўдзія Пталемея, і з’яўляюцца асноўнымі этнакультурнымі, моўнымі і, магчыма, генетычнымі продкамі этнаса, які ў IV–V стст. н. э. стварыў пражскую культуру і дакладна вядомы з пачатку VI ст. н. э. пад імем *slavēne (sclaveni, sclavini і г. д.) [24, с. 134–135].

А. А. Егарэйчанка, дыскутуючы з Дз. А. Мачынскім, сцвярджаў, што прыведзеныя апошнім доказы аб славянстве носьбітаў КШК не маюць адназначнай этнічнай характарыстыкі і знаходзяць свае адпаведнікі не толькі сярод КШК, але і іншых культур лясной зоны (ДДК, дзякоўскай, верхняокскай). Галоўная ідэя ж А. А. Егарэйчанкі была ў тым, што носьбіты КПШК не мігруюць на паўднёвы захад, у накірунку Прыкарпацця, як гэта лічыў Дз. А. Мачынскі, а наадварот скарачаюць арэал свайго пражывання ў паўночна-заходнім накірунку і пастулова асімілюцца сярод носьбітаў культур ўсходнелітоўскіх курганоў і банцараўскай [5, с. 115–117; 25, с. 62–65]. У той жа час галоўная ідэя, якую спрабаваў данесці Дз. А. Мачынскі, была не ў тым, што КШК распаўсюджвалася на поўдзень, а затым назад на поўнач, а ў здольнасці яе носьбітаў – венедаў–ст(л)аванаў – да кардынальнай трансфармацыі сваёй культуры ў новым культурна–гістарычным кантэксце, што па заўваге самаго Дз. А. Мачынскага пацвердзіў А. А. Егарэйчанка, выявіўшы «ўзрыўны» характар трансфармацыі КРШК у КПШК [24, с. 137]. Такім чынам, заўважна разыходжанне ў падыходзе да вырашэння пытання паміж даследчыкамі. А. А. Егарэйчанка сканцэнтраваўся на крыніцазнаўчым накірунку, абгрунтоўваючы працэсы, якія адбываліся ў КШК на падставе матэрыялаў з даследаванняў. У той час як Дз. А. Мачынскі, зыходзячы з аналізу пісьмовых крыніц рымскага часу і выкарыстання даных шматлікіх навук, будуе рэтраспектыўны шлях развіцця славянскіх народаў на падставе

КШК. Трэба адзначыць, што галоўнае нараканне з боку Дз. А. Мачынскага да А. А. Егарэйчанкі заключаецца ў тым, што апошні адмовіўся ад уласных інтэрпрэтацый у этнічнай прыналежнасці КШК [24, с. 136]. У цэлым жа Дз. А. Мачынскі кампліментарна ставіўся да працы А. А. Егарэйчанкі [24, с. 115–135].

**Мілаградская культура.** Трэба адзначыць, што погляды А. А. Егарэйчанкі на этнакультурныя працэсы, якія адбываліся ў басейне Бярэзіны, з цягам часу змяняліся.

У археалогіі жалезнага веку матэрыялы з помнікаў басейна Бярэзіны вядомы ў першую чаргу, дзякуючы працам А. Р. Мітрафанава. Характарызуючы культуру мясцовага насельніцтва, даследчык адзначыў, што асаблівасцю рэгіёна з'яўляецца наяўнасць пасудзін са штрыхаванай паверхняй баначных і мілаградскіх форм. Улічваючы іх спецыфіку, А. Р. Мітрафанаў аднёс помнікі басейна Бярэзіны да ўсходнебеларускага варыянту КШК [26, с. 8]. А. А. Егарэйчанка, аналізуючы артэфакты з помнікаў басейна Бярэзіны (Гатавічы, Аўгустова, Гарадзішча, Кімія, Лабеншчына, Навасёлкі, Аздзяцічы) у ранніх працах, на падставе іх падабенства з мілаградскай культурай, аднёс матэрыялы з ранніх напластаванняў да мілаградскай культуры. Аб чым, на думку даследчыка, сведчыць наступнае:

1) падабенства ранніх напластаванняў басейна Бярэзіны ў керамічным комплексе і традыцыях домабудаўніцтва з помнікамі мілаградскай культуры, а не паўночна-ўсходняй Літвы і паўночна-заходняй Беларусі, дзе лакалізуюцца помнікі КРШК [17, с. 64–65; 22, с. 48–49; 27, с. 54; 28, с. 56–58];

2) наяўнасць у басейне Бярэзіны асаблівага тыпу гарадзішчаў, якія характэрны для носьбітаў мілаградскай культуры. Гэтыя гарадзішчы размяшчаліся на роўнай мясцовасці, часцей за ўсё каля ці ў атачэнні балот, што ўскладняла да іх доступ, іх абарончая сістэма прадстаўлена валам і рвом, якія акружаюць пляцоўку з усіх бакоў. Па падліках А. А. Егарэйчанкі, дадзены тып гарадзішчаў пераважае ў арэале мілаградскай культуры і сустракаецца да сярэдняга поплыву Свіслачы [27, с. 54; 28, с. 56–58];

3) адсутнасць касцяных і каменных вырабаў, якія характэрны для гарадзішчаў КРШК усходняй Літвы (Наркунай, Невярышке, Сакішкяй і інш.) і паўночна-заходняй Беларусі (Гарані, Рацюнкі, Зазоны) [16, с. 75; 18, с. 118]. На думку даследчыкаў, адсутнасць касцяных прадметаў – асаблівая рыса для помнікаў КШК сярэдняй і ніжняй Бярэзіны [29, с. 152].

Такім чынам, на думку А. А. Егарэйчанкі, арэал мілаградскай культуры на тэрыторыі Беларусі быў значна шырэйшы і акрамя Палесся, часткі Падняпроўя таксама ўключаў у сябе помнікі басейна Бярэзіны. Адрозненне помнікаў басейна Бярэзіны ад «класічных» помнікаў мілаградскай культуры заключаецца ў наяўнасці штрыхоўкі і пласкадоннасці пасудзін, гліняных праселак і некаторых іншых тыпаў рэчаў, уласцівых усходнелітоўскім гарад-

зішчам, што тлумачыцца моцным уплывам з боку КРШК. Дадзеныя асаблівасці і далі падставу А. А. Егарэйчанку вылучыць на падставе помнікаў басейна Бярэзіны сярэднебеларускі варыянт мілаградскай культуры [17, с. 66; 18, с. 118; 27, с. 54; 28, с. 56–58]. Трэба адзначыць, што на помніках мілаградскай культуры вядомы не толькі кругладонны посуд, але і пласкадоннае начынне [30, рыс. 6].

Узаемаадносіны паміж носьбітамі КШК і мілаградскай культуры ў больш ранніх працах А. А. Егарэйчанка характарызаваў наступным чынам. У V–I стст. да н. э. у заходніх рэгіёнах цэнтральнай Беларусі склалася сітуацыя, калі носьбіты КРШК і мілаградскай культуры жылі цераспалосна. Пры гэтым на працягу некалькіх стагоддзяў носьбіты КШК прасочваліся ў цэнтральнабеларускі рэгіён і, нарэшце, масавае прасоўванне апошніх сюды ў канцы I тыс. да н. э. – пачатку I тыс. н. э. прывяло да поўнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва мілаградскай культуры. Прыкметамі руху КШК у цэнтральную Беларусь з'яўляюцца рабрыстыя гаршкі і прамавугольныя дамы слупавой канструкцыі [17, с. 66–68, 75; 18, с. 118].

Падобныя ідэі выказваў Л. Д. Побаль. На яго думку, верхнюю Бярэзіну займалі носьбіты КШК, а ніжняю Бярэзіну – мілаградскай культуры. Паміж імі ў басейне сярэдняй Бярэзіны, у межах ад Барысава да Бабруйска, знаходзілася змяшаная зона, у якой носьбіты абедзвюх культур знаходзіліся цераспалосна. Але з цягам часу адбывалася інфільтрацыя мілаградскага насельніцтва на поўнач. Такім чынам, гарадзішчы верхняй Бярэзіны былі ўзведзены «штрыхавікамі», але ў больш позні час перайшлі пад кантроль мілаградскага насельніцтва [31, с. 16].

У больш позніх працах А. А. Егарэйчанка, як і раней, не адносіў паселішчы басейна Бярэзіны да КРШК, але і не характарызаваў гарадзішчы як помнікі мілаградскай культуры, толькі адзначаючы іх моцнае падабенства з апошняй. Даволі істотна змяніліся ўяўленні навукоўца адносна ўзаемаадносін паміж КШК і мілаградскай культурай. Згодна з імі, да II ст. да н. э. паміж плямёнамі КРШК і мілаградскай культуры існавала паласа адасаблення, якая займала паўднёвую частку цэнтральнай Беларусі, у якой паселішчы абедзвюх культур раней за гэты час не вядомы. Пазней у гэтай паласе з'яўляецца шэраг гарадзішчаў, у ранніх пластах якіх сустракаецца кераміка, якая аб'ядноўвае ў сябе рысы абедзвюх культур. Для гэтых гарадзішчаў характэрна наяўнасць шыек класічнага мілаградскага аблічча ад гладкасценных і штрыхаваных гаршкоў, баначны штрыхаваны посуд, не характэрны для гэтай тэрыторыі, а таксама шыйкі блізкія да мілаградскіх, але з пласкадонным тулавам і пакрытыя хаатычнай штрыхоўкай. А. А. Егарэйчанка адзначае, што посуд змешанага тыпу прысутнічае на гарадзішчах басейна Бярэзіны (Аздзяцічы, Кімія, Лабеншчына, Лысуха, Навасёлкі, Чыжаха і інш.), а на захадзе падобная кераміка даходзіць да р. Лань. Фарміраванне асаблівай

групы помнікаў у паўднёвай частцы цэнтральнай Беларусі выклікана ўзаемна асіміляцыйнымі працэсамі, якія, верагодна, адносяцца да другой паловы III–II ст. да н. э. З’яўленне ў гэтай зоне носьбітаў мілаградскай культуры магло быць звязана з выцясненнем нейкай часткі на поўнач, у выніку рассялення ў Палессі і Верхнім Падняпроўі зарубінецкіх плямёнаў у канцы III – пачатку II ст. да н. э. [5, с. 53; 7, с. 113].

У больш познім артыкуле, прысвечаным праблематыцы храналогіі мілаградскай культуры, А. А. Егарэйчанка, не звяртаючы ўвагу на культурныя працэсы ў рэгіёне, адзначыў што ў Сярэдняй Беларусі, на Бярэзіне адсутнічаюць дакладна датаваныя знаходкі, але ёсць шмат венчыкаў, супастаўляльных з ранняй мілаградскай керамікай, што дазваляе аднесці час з’яўлення носьбітаў мілаградскай культуры да VII–VI стст. да н. э. Характарызуючы ў цэлым жа храналагічныя межы ўсёй мілаградскай культуры, даследчык адзначыў наступнае. Найбольш ранняя дата ўсталёўваецца па знаходках з Палесся і Гомельскага Падняпроўя, дзе былі выяўлены скіфскія лістападобныя рамбічныя і асіметрычна рамбічныя наканечнікі стрэл VII–VI стст. да н. э., але, калі ўлічваць, што на гарадзішчы Ясянец–2 падобны тып наканечніка быў выяўлены разам з посахападобнай і шматспіральнай шпількамі VII ст. да н. э., то і ранняя дата мілаградскай культуры адносіцца да VII ст. да н. э. Позняя дата вызначаецца на падставе антычных пацерак II ст. да н. э. з Гарошкаўскага скарбу. Акрамя гэтага, на карысць дадзенай даты сведчыць існаванне шэрагу агульных рыс паміж мілаградскай і зарубінецкай культурамі, што кажа аб іх храналагічным стыку [32, с. 7–8].

Ідэя А. А. Егарэйчанкі аб асіміляцыі мілаградскага насельніцтва зарубінецкім гучыць супярэчліва ў святле даследаванняў апошніх гадоў на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя, дзе на мілаградска-зарубінецкім могільніку Гарошкаў выяўлены міскі з круглым і амаль круглым дном. На думку Л. С. Варацінскай і А. І. Драбушэўскага, такія формы місак з’явіліся пад непасрэдным уплывам мілаградскіх традыцый, для якіх характэрна перавага пасудзін з круглым донцам, і адносяцца да ранняга этапу функцыянавання могільніка Гарошкаў (другая палова III – першая палова II ст. да н. э.). Самі знаходкі такіх місак у зарубінецкіх пахаваннях сведчаць аб пераемнасці і ўплыве мілаградскай керамічнай традыцыі пры фарміраванні зарубінецкай культуры Верхняга Падняпроўя [33, с. 9–11].

У цэлым жа, прапанаваныя А. А. Егарэйчанкам погляды на этнакультурныя працэсы ў басейне Бярэзіны былі крытычна ўспрыняты навуковай супольнасцю. Так, М. І. Лашанкоў, параўноўваючы матэрыялы з басейна Бярэзіны і сумежных рэгіёнаў, прыйшоў да высновы, што гарызонты аднаслойных ніжне- і сярэднебярэзінскіх гарадзішчаў тоесны ніжнім (раннім) гарызонтам гарадзішчаў цэнтральнай і, магчыма, паўночна-заходняй Беларусі. Такім чынам, на думку даследчыка, няма падстаў звязваць гарадзішчы

сярэдняй і ніжняй Бярэзіны з плямёнамі мілаградскай і зарубінецкай культур. Наадварот, керамічны комплекс пераканаўча сведчыць аб прыналежнасці гарадзішчаў сярэдняй і ніжняй Бярэзіны да ўсходнебеларускага варыянту КШК, найбольш ранні перыяд функцыянавання якіх можна адносіць да другой паловы ці канца III – пачатку II ст. да н. э. Гэты час М. І. Лашанкоў вызначае па пласцінчатых наканечніках стрэл з раздвоеным канцом чарашка (Дзмітравічы, Чыжаха), шпількам з кальцавым навершшам (Пятровічы, Чыжаха, Янава), шкляным пацеркам (Івань, Шчаткава) і іншым знаходкам, датаванне якіх укладаецца ў III ст. да н. э. – I ст. н. э. Жыццё на сярэдне- і ніжнебярэзінскіх гарадзішчах спыняецца ў сярэдзіне ці ў другой палове I ст. н. э., што даследчык усталёўвае па фібулах познелатэнскай схемы варыянта Н, О, Р і Ф (па Ю. Кастшэўскаму). Адкладанні ж культурнага слою на гарадзішчах цэнтральнай Беларусі сведчаць, што «штрыхавікі» пражывалі тут значна болей і праіснавалі яшчэ ў першай палове I тыс. н. э. [29, с. 148–154].

Супраць храналагічнай і культурнай прыналежнасці, прапанавай А. А. Егарэйчанкам для гарадзішчаў басейна Бярэзіны, таксама выступіла А. У. Ільюцік. Абагульніўшы матэрыялы як з раскопак іншых археолагаў (Аздзяцічы, Аўгустова, Багушэвічы, Пятровічы, Турэц, Шчаткава і інш.), так і ўласных даследаванняў (Бярэзіна, Чыжаха, Зборск і інш.), А. У. Ільюцік разглядае асноўныя тэзісы А. А. Егарэйчанкі аб аднясенні гарадзішчаў басейна Бярэзіны да мілаградскай культуры. На думку даследчыцы, гарадзішчы рэгіёну па характару керамічнага матэрыялу (посуду і праселкам) бліжэй да помнікаў «штрыхавікоў», чым да мілаградскай культуры. Наяўнасць жа на гарадзішчы Аздзяцічы жытла з заглыбленай падлогай і зрубнымі сценамі звязана з уплывам «мілаградцаў» на мясцовых «штрыхавікоў». Таксама даследчыца звяртае ўвагу, што на гарадзішчах Аздзяцічы, Навасёлкі, Кімія і інш. знойдзены такія ж касцяныя прадметы, як і ў ніжніх пластах гарадзішча Лабеншчына. Такім чынам, па меркаванні А. У. Ільюцік, басейн Бярэзіны быў заселены не мілаградскім насельніцтвам, а «штрыхавікамі», з'яўленне якіх адбылося ў апошняй чвэрці I тыс. да н. э., а больш раннія помнікі жалезнага веку на гэтай тэрыторыі невядомы [34, с. 35–41].

Уласныя ўяленні наконт культурнай прыналежнасці помнікаў басейна Бярэзіны меў С. Я. Расадзін. На яго думку, яны маюць шэраг асаблівасцяў і адрозненняў як ад мілаградскай культуры, так і ад КШК, і знаходзяць шэраг аналогій сярод ДДК. Але С. Я. Расадзін не адносіць помнікі рэгіёна да нейкай пэўнай культуры, вылучаючы іх самастойную групу – помнікі тыпу ніжняга пласта Лабеншчыны, якія займаюць прамежкавае становішча паміж паўднёва- і паўночнабеларускімі старажытнасцямі [35, с. 68–70].

Істотным момантам, які прасочваецца і ў больш ранніх, і ў больш позніх працах А. А. Егарэйчанкі, з'яўляецца погляд на культурную прыналежнасць гарадзішчаў Гомельска-Магілёўскага Падняпроўя, Пасожжа і паўночна-ўс-

ходняга Палесся. На думку даследчыка, гардзішчы адзначанага рэгіёну адносяцца да мілаградскай культуры, так як адзіным параметрам аднясення іх да КРШК з'яўляецца штрыхоўка. Але акрамя штрыхоўкі на помніках не выяўлены іншыя характэрныя для КРШК элементы (баначны і слабапрафіляваны посуд, касцяныя вырабы, праселкі і інш.). Позція адкладанні дадзенага рэгіёну, як адзначалася вышэй, адносіцца да групы Кісцяні–Чачэрск верхнедняпроўскага варыянту зарубінецкай культуры [5, с. 15–16; 17, с. 68–69;].

**Зарубінецкая культура.** У апошняй чвэрці I тыс. да н. э. на тэрыторыі Палесся і часткі Верхняга Падняпроўя мілаградская культура была зменена зарубінецкай. А. А. Егарэйчанка падтрымлівае меркаванні даследчыкаў (Ю. У. Кухарэнкі, К. В. Каспаравай, Дз. А. Мачынскага і інш.), якія лічаць, што зарубінецкая культура не з'яўляецца пераемніцай мілаградскай, а паўстала як прышлая на аснове паморскай культуры, а менавіта яе заключнага этапу – культуры падклёшавых пахаванняў. У выніку асіміляцыі мілаградскай культуры носьбіты зарубінецкай культуры дасягнулі на поўначы мяжы, якая праходзіць у раёнах верхняга і сярэдняга поплаву левабярэжных прытокаў Прыпяці, уступіўшы ў прамы кантакт з плямёнамі КШК, якімі і былі спынены [17, с. 71–75].

Зарубінецкая культура на поўдні Беларусі ў Палессі праіснавала да сярэдзіны I ст. н. э. Канец класічнай зарубінецкай культуры тут, на думку А. А. Егарэйчанкі, звязаны з адтокам насельніцтва у паўднёвым, заходнім і паўночным накірунках. Першая хваля зарубінецкага насельніцтва прайшла Валынь і дасягнула Верхняга і Сярэдняга Падністроўя, дзе ў выніку змяшэння з плямёнамі пшэворскай і ліпіцкай культур сфарміравала зубрыцкую культуру. Другая хваля пайшла на захад на тэрыторыю Люблiншчыны, дзе склаліся помнікі чарнічанскай групы, адкуль у далейшы час адбываецца інфільтрацыя невялікай групы насельніцтва на Беласточчыну [36, с. 265–266; 37, с. 77–78].

Паўднёвы і заходні накірункі былі вырашальнымі і шматлікімі, але не адзінымі. Так, асобныя нешматлікія групы зарубінецкага насельніцтва Палесся мігруюць на поўнач ад Прыпяці, у Верхняе Панямонне, Перадпалессе і на Бярэзіну. На думку А. А. Егарэйчанкі, гэта фіксуецца нешматлікімі, але яскравымі знаходкамі (глянцаваны посуд, шкляныя пацеркі, наканечнік кап'я і інш.) у Перадпалессі і на Нёманска-Дняпроўскім водападзеле і датуецца часам не пазней фазы B1b (каля 40–80 гг. н. э.).

Так, у Верхнім Панямонні выяўлены зарубінецкія фібулы канца I ст. н. э. каля п. Красносельскі (Красносельскі–5 і ўр. Красносельскі–Піскаш). Падобная сітуацыя магла назірацца і на Сярэдняй Бярэзіне. Гэтая тэрыторыя ў I ст. н. э. належала носьбітам КПШК, але на некаторых гарадзішчах выяўлены рэчы зарубінецкага паходжання, сярод якіх трэба адзначыць зарубінецкія фібулы са Слабодкі і Бытчы. Фібула са Слабодкі адносіцца да IV варыянту

фазы B1a (каля 10–40 гг. н. э.). Засцёжка з Бытчы ўяўляе сабой пераходны варыянт паміж фібуламі IV і V варыянтаў. А. А. Егарэйчанка аднёс гэту фібулу да другой паловы І ст. н. э.

# ВЫТВОРЧЫ ЎЧАСТАК НА ПАСЕЛІШЧЫ ПРАЖСКАЙ КУЛЬТУРЫ СНЯДЗІН-2

**В. С. Вяргей[1], Г. М. Бяліцкая[2]**

*[1] Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, v.viarhejpraga@gmail.com*
*[2] Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, hannabelitskaya@gmail.com*

Выяўленыя падчас археалагічных даследаванняў у 1993–1998 гг. экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі аб’екты і матэрыялы на паселішчы пражскай культуры Снядзін-2 у Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці дазваляюць меркаваць, што тут размяшчаўся вытворчы ўчастак. На гэтым месцы адкрыты ніжнія часткі 5 сырадутных печаў, у якіх атрымоўвалі жалеза, спецыяльныя ямы, прызначаныя для нарыхтоўкі драўнянага вугалю і адпаведнай апрацоўкі балотнай руды для яе выкарыстання ў металургічным працэсе. Тут жа прасочаны сляды апрацоўкі каляровых металаў і вырабу з іх упрыгажэнняў. Назапашаныя даныя сведчаць, што на даследаваным участку была сканцэнтравана праца старажытнаславянскіх рамеснікаў-металургаў, кавалёў і ювеліраў.

***Ключавыя словы:*** пражская культура; археаметалургія; ранняе сярэднявечча; сырадутныя печы; вытворчасць жалеза; кавальства; ювелірнае рамяство.

# ПРОИЗВОДСТВЕННЫЙ УЧАСТОК НА СЕЛИЩЕ ПРАЖСКОЙ КУЛЬТУРЫ СНЯДИН-2

**В. С. Вергей[1], А. Н. Белицкая[2]**

*[1] Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, v.viarhejpraga@gmail.com*
*[2] Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, hannabelitskaya@gmail.com*

Обнаруженные во время археологических исследований в 1993–1998 гг. экспедицией Института истории НАН Беларуси объекты и материалы на селище пражской культуры Снядин-2 в Петриковском районе Гомельской области позволяют предположить, что здесь располагался производственный участок. На этом месте открыты нижние части 5 сыродутных печей, в которых получали железо, специальные ямы, предназначенные для заготовки древесного угля и соответствующей обработки болотной руды для ее использования в металлургическом процессе. Здесь же прослежены следы обработки цветных металлов и изготовления из них украшений. Накопленные данные свидетельствуют, что на исследованном участке была сосредоточена работа древнеславянских ремесленников-металлургов, кузнецов и ювелиров.

***Ключевые слова:*** пражская культура; археометаллургия; раннее средневековье; сыродутные печи; производство железа; кузнечное дело; ювелирное ремесло.

# THE PRODUCTION SITE AT THE PRAGUE CULTURE SETTLEMENT SNIADZIN-2

**V. S. Vergey[1], A. N. Belitskaya[2]**

*[1] Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1,*
*220072, Minsk, Republic of Belarus, v.viarhejpraga@gmail.com*
*[2] Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1,*
*220072, Minsk, Republic of Belarus, hannabelitskaya@gmail.com*

Objects and materials discovered during archaeological research in 1993–1998 by an expedition of the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus at the settlement of Prague culture Sniadzin-2 in the Petrikovsky district of the Gomel region suggest that there was a production site here. At this place, the lower parts of 5 raw-fuel furnaces were opened, in which iron was produced, special pits designed for harvesting charcoal and the corresponding processing of marsh ore for its use in the metallurgical process. Traces of the processing of non-ferrous metals and the manufacture of jewelry from them are also traced here. The accumulated data indicate that the work of ancient Slavic artisans-metallurgists, forgers and jewelers was concentrated on the studied site.

***Keywords:*** Prague culture; archaeometallurgy; early Middle Ages; bloomeries; iron production; blacksmithing; jewelry craft.

У гісторыі чалавечага досведу адкрыццё і асваенне чорнага металу цяжка перабольшыць, таму цікавасць даследчыкаў да гэтых працэсаў з'яўляецца невыпадковай. Даволі часта ў археалагічных крыніцах паведамляецца пра знаходкі кавалкаў жужалю (металургічных адыходаў) на старажытных паселішчах, але даследаванне канструкцыйных асаблівасцяў старажытных металургічных печаў можа лічыцца рэдкай удачай, так як тэхналогіі і спосабы прыгатавання, веды і навыкі майстра сведчаць аб вытворчай культуры канкрэтнага соцыуму. Менавіта так можна разглядаць вывучэнне рэшткаў пяці печаў для атрымання жалеза на паселішчы 2 каля в. Снядзін.

Археалагічны комплекс каля в. Снядзін Петрыкаўскага раёна адкрыты В. С. Вяргей ў 1992–1993 гг. Ён складаецца з чатырох паселішчаў і грунтовага могільніка з пахаваннямі па абрадзе трупаспалення (рыс. 1). Размешчаны ў 2,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р. Прыпяць, на вышыні 2,5–3 м над узроўнем вады на краю надпоплаўнай тэрасы. З захаду і паўночнага захаду яго тэрыторыя абмежавана старычнымі азёрамі Барацкое і Уходнае (Входнэе).

Паселішчы Снядзін-1 і 3 знаходзяцца на выцягнутай з усходу на захад пясчанай градзе даўжынёю да 1 км. На самай высокай кропцы грады паміж паселішчамі 1 і 3 размяшчаўся грунтовы могільнік, на ўсёй паверхні якога паўсюль прасочваюцца кальцыніраваныя косткі з раздзьмутых ветрам пахаванняў. Два з іх, не да канца зруйнаваныя, даследаваныя ў 1993 годзе. Паселішча Снядзін-2 займае паўночнае становішча адносна паселішчаў 1 і 3 і




*Рыс. 1.* Сітуацыйны план паселішчаў каля вёскі Снядзін

аддзядяецца ад іх забалочанай нізінай [1, s. 278–304]. Паселішча Снядзін-5 размешчана паміж селішчамі Снядзін-2 і 3, яго плошча каля гектара. Выявіў у 2010 г. В. Г. Белявец.

Раскопкі археалагічнага комплексу каля в. Снядзін праводзіліся экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі на працягу шэрагу палявых сезонаў. У 1993 г. на паселішчы Снядзін-1 пад кіраўніцтвам В. С. Вяргей і М. М. Крывальцэвіча (122 м$^2$) [2], пад кіраўніцтвам В. С. Вяргей на паселішчы Снядзін-2 у 1994–1998 гг. (звыш 400 м$^2$) [3, с. 27–35], у 2005 г. на могільніку Снядзін-4 (112 м$^2$) [4], у 2006, 2011–2013 гг. на паселішчы Снядзін-3 (звыш 400 м$^2$) [5, с. 121–123; 6, с. 21–32]. На ўсіх селішчах выяўлены археалагічныя матэрыялы ад эпохі неаліту да сярэднявечча ўключна. З 1994 г. па 2006 г. удзел у раскопках прымаў прафесар Мюленбергскага каледжа В. Трымер з групай амерыканскіх студэнтаў (штат Пенсільванія, ЗША). У 2012, 2015–2016 гг. праведзены комплексныя даследаванні з групай супрацоўнікаў Гётынгенскага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам доктара Енса Шнеевайса сумесна са спецыялістамі з Польшчы і Расіі. У Снядзіне былі зняты тапаграфічны план мясцовасці, праведзена геафізічная разведка [7, с. 194–202; 8, с. 194–202; 9, с. 231–235]. З 2015–2016, 2019 гг. даследаванні на комплексе працягваліся экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі пад кіраўніцтвам А. Ф. Касюк (каля 80 м$^2$).

Звесткі аб археаметалургіі на тэрыторыі Беларусі з’явіліся у першай палове XX ст. Атрыманне такой інфармацыі стала магчымым у археалогіі з выкарыстаннем метадаў металаграфічнага даследавання. Першыя крокі па прымяненні метадаў прыродазнаўчых навук былі зробленыя ў беларускай археалогіі ў 30-я гады XX ст. А. М. Ляўданскім. Ён займаўся даследаваннем старажытнай чорнай металургіі з прыцягненнем метадаў фізічнай і хімічнай навук. Археалагічныя крыніцы дазволілі навукоўцу асвятліць працэс здабычы руды і атрымання жалеза. Ён адзначыў, што жалеза ў домніцы атрымоўвалі не ў вадкім (расплаўленым) стане, а ў выглядзе цестападобнай з дамешкамі жужалю крыцы. Шляхам гарачай коўкі і пакетавання крыцы рыхтавалі да далейшай апрацоўкі і вырабу з іх стальных і жалезных рэчаў [10, с. 55–84; 11]. Такім чынам, быў апісаны спосаб атрымання жалеза ў жалезным веку і раннім сярэднявеччы, фізіка-хімічныя параметры сырадутнага працэсу, аргументаваны мясцовы характар чорнай металургіі і вырабаў з жалеза. Навуковец адзначыў адклады балотнай руды і рэшткі жалезаробчай вытворчасці на Петрыкаўшчыне каля вёсак Аголіцкая Рудня, Сярэдняя Рудня, Бабунічы, Баклань, Глініца, Рубча, Белка, Снядзін. Найбольш значнае радовішча балотнай руды даследчык зафіксаваў каля пасёлка Ільіч (Слензакі).

Археаметалургічным накірункам даследаванняў (распрацоўкай праблемы чорнай металургіі і кавальства) у 1980-я – пачатку 2000-х гг. на высокім навуковым узроўні займаўся М. Ф. Гурын. Ён здейсніў комплексныя, пераважна металаграфічныя, даследаванні руд, дзесяткаў крыц і іх фрагментаў, тысяч кавалкаў жужалю, звыш 2000 кавальскіх вырабаў, знойдзеных больш як на 100 археалагічных помніках Беларусі. Праца праводзілася па навейшых методыках з выкарыстаннем аптычных і электронных мікраскопаў, спектрафатометраў, мікразондаў і іншых прыбораў вядомых зарубежных фірм. Вывучана прадукцыя насельніцтва розных археалагічных культур Беларусі эпохі жалеза, ранняга сярэднявечча і пазней. Вынікі даследаванняў дазволілі прасачыць развіццё вытворчасці чорных металаў і вырабаў з іх з сярэдзіны I тыс. да н. э. да канца XVIII ст. [12, с. 93]. Для пачатковых перыядаў станаўлення металургічнай індустрыі ў Прыпяцкім Палессі меліся ўсе неабходныя ўмовы: балотныя і поплаўныя руды, лясы з дастатковай колькасцю драўніны для выпальвання вугалю, гліна, камяні для пабудовы печаў, вапна для флюсаў. Як адзначае М. Ф. Гурын [12, с. 93–98], тэхніка металургіі жалеза складалася ў прамым аднаўленні з руды метала з розным утрыманнем жалеза ў невялікіх печах шахтавага тыпу. Крыцы ўтвараліся ў выніку цвёрдафазнага спякання мікрачасцінак між сабою. Зрэдку спяканне адбывалася пры наяўнасці вадкай фазы, структурна прадстаўленай ледзебурытным запаўняльнікам вольнай прасторы паміж спекшыміся часцінкамі ферыта альбо перліта. Вага найбольш вялікіх крыц магла дасягаць некалькіх сотняў грамаў [13, с. 27].




*Рыс. 2.* Схематычны план селішча Снядзін-2

Паселішча Снядзін-2 размешчана ў заходняй частцы выцягнутага з усходу на захад узвышша на вышыні 2,5–3,5 м над поплавам, ва ўрочышчы Дворышча, з поўначы абмежавана старычным возерам Уходнае (Входнэе), якое злучаецца з р. Прыпяць. Яго плошча дасягае прыкладна 150х270 м. У цэнтральнай частцы паселішча назіраецца паніжаная лагчына без прыкмет культурнага пласта. Тэрыторыя помніка разворвалася, на яго паверхні сустракаецца ляпная кераміка, кавалкі балотнай руды, жужаль. Даследавалася паўднёва-заходняя частка паселішча на плошчы звыш 400 $м^2$ (рыс. 2).

Культурны пласт дасягаў таўшчыні 0,35–0,7 м і складаўся ў верхняй частцы на глыбіню да 0,3–0,35 м з супеску цёмна-шэрага колеру, пашкоджанага ворывам на глыбіню 0,2–0,3 м. Ніжэй залягаў супесак буравата-карычневатага колеру. Мацярык уяўляе сабою жоўты пясок. У раскопах 1993–1998 гг. выяўлены 36 слупавых і 79 гаспадарчых ям, 2 асобныя агмені, складзеныя з камянёў і кавалкаў ляпнога посуду і 5 развалаў гліняных металургічных печаў (рыс. 3). Печы размешчаны кампактнай групай. Паўночнае становішча займае печ 1, к паўднёваму захаду ад яе знаходзяцца печы 2 і 3, к паўднёваму ўсходу – печы 4 і 5. Заходняя (2, 3) і ўсходняя (4, 5) пары печаў знаходзяцца на адлегласці каля 7 м ад печы 1. Адлегласць паміж печчу 2 і 3 складае крыху больш за 3 м і печамі 4 і 5 – звыш 4 м.

***Печ 1*** выяўлена на глыбіні 0,22–0,25 м у выглядзе развала чырванавата-карычневай і шэрай гліны з уключэннем кавалкаў жужалю, невялікіх камянёў і абломкаў ляпнога посуду (рыс. 4). Плошча развалу дасягала памераў прыкладна 1,4х1,6 м, таўшчыня яго вагалася ў межах 0,1–0,2 м. У паўднёвай частцы развалу прасочана амаль круглае ў плане дно печы дыяметрам 0,7 м, са знешняга боку якога захавалася аснова сценак на вышыню 2–3 см. Унутраны дыяметр печы складае 0,6 м, таўшчыня сценак дасягае 8–10 см. Дно ўяўляе сабою кола моцна абпаленай, парэпанай гліны, на якім прасочана тонкая праслойка чорнага пяску з попелам і два фрагменты ляпной керамікі. Само дно плоскае, яго таўшчыня даходзіць да 10 см, яго ніз залягае на вышыні каля 15 см ад мацерыка і на глыбіні 0,35–0,36 м ад дзённай паверхні. З паўночнага боку печы назіралася паглыбленне ў мацерыку да 0,1 м са слаістым запаўненнем. Адразу пад развалам гліны знаходзіўся пласт перапаленага пяску таўшчынёю 8–9 см, ніжэй залягаў пласт чорнай вуглістай зямлі з кавалкамі перапаленай гліны. Паміж ім і мацерыком прасочаны пласт бурага супеску таўшчынёю ад 2 да 10 см. На паўночным краю развалу гліны знойдзена крыца. У развале печы і пад ім выяўлена 66 кавалкаў металургічнага жужалю, некаторыя з іх дасягалі 16–18 см у дыяметры, а таксама 67 фрагментаў ляпной керамікі (рыс. 5). К поўдню ад дна печы, часткова пад скапленнем перапаленай гліны прасочана акруглая ў плане яма дыяметрам 1,2 м і глыбінёю ад узроўня мацерыка да 0,5 м. Яе запаўненне складалася з супеску бурага колеру з дамешкамі вуголля і попелу ў верхняй частцы. У яме знойдзена 4 кавалкі жужалю, 7 фрагментаў ляпной керамікі, 2 косткі жывёл і кавалкі балотнай руды. Вакол печы на глыбіні 0,3 м ад дзённай паверхні назіралася пляма чорнай зямлі з вуголлем і попелам. На ўсход ад печы яна распрасціралася на 3 м і на захад да 0,5 м.

***Печ 2*** выяўлена на глыбіні 0,2 м ад дзённай паверхні ў выглядзе скаплення чырвона-карычневай і шэра-зялёнай гліны плошчаю прыкладна 1,2х1,5 м з уключэннямі костак, кавалкаў жужалю, камянёў, фрагментаў ляпнога посуду. Таўшчыня развалу складала 5–10 см (рыс. 6, *1*). У яго цэнтры прасо-




*Рыс. 3.* Селішча Снядзін-2. Агульны план раскопаў (1994–1998 гг. )




*Рыс. 4.* Селішча Снядзін-2:

*1* – рэшткі металургічнай печы 1 на глыбіні 0,3 м; *2* – на ўзроўні мацерыка; *3* – расчыстка развалу металургічнай печы 1; *4* – рэканструкцыя домніцы;

*а* – гліна; *б* – фрагменты керамікі; *в* – каменне; *г* – грунт цёмна-шэрага колеру; *д* – пясок жоўта-шэрага колеру; *е* – жужаль

чана дно печы са знешнім дыяметрам 0,5 м і ўнутраным 0,3–0,35 м. Сценкі ў аснове мелі таўшчыню 7–9 см, а дно 2–3 см і было выкладзена буйнымі і дробнымі фрагментамі ляпнога посуду. Аснова печы знаходзілася на глыбіні

0,3 м ад дзённай паверхні і на вышыні 0,1 м ад мацерыка. Паміж дном печы і мацерыком прасочаны пласт супеску чорнага колеру з уключэннямі вуголля і попелу і рэдкімі лінзамі жаўтаватага пяску. На дне печы знойдзена 52 фрагменты керамікі, а ў развале – 16 (рыс. 7). З усходняга боку развала печы назіралася пляма чорнай з вуголлем і попелам зямлі.

***Печ 3*** знаходзілася прыкладна ў 3-х метрах к поўдню ад печы 2. Выяўлена на глыбіні 0,2–0,23 м ад дзённай паверхні ў выглядзе скаплення гліны чырвона-карычневага і шэра-зялёнага колераў з уключэннямі невялікіх камянёў, кавалкаў жужулю, фрагментаў ляпной керамікі (рыс. 6, *2*). Яго памеры прыблізна 1,2х1,7 м. Таўшчыня развалу вагаецца ў межах 8–12 см. Профіль развалу слаісты, праслойкі перапаленай чырванаватай гліны перамяжоўваюцца з праслойкамі чорнай з уключэннем вуголля і попелу зямлі. У заходняй частцы скаплення часткова прасочана падкавападобнай формы аснова сценак са знешнім дыяметрам каля 60 см і ўнутраным дыяметрам каля 40 см. Дно адсутнічае. У развале печы знойдзена 58 фрагментаў ляп-




*Рыс. 5.* Селішча Снядзін-2. Фрагменты ляпнога посуду з металургічнай печы 1




*Рыс. 6.* Селішча Снядзін-2. Рэшткі металургічных печаў 2–5:

*а* – гліна; *б* – фрагменты керамікі; *в* – каменне; *г* – грунт цёмна-шэрага колеру; *д* – пясок жоўта-шэрага колеру; *е* – жужаль; *ж* – цёмна-шэры пясок; *з* – бура-жоўты пясок; *і* – косткі; *к* – попельна-вуглісты пясок

ной керамікі, 23 кавалкі жужалю, 2 косткі жывёл. З заходняга боку, часткова пад развалам печы, у месцы, дзе прасочана аснова сценак, выяўлена яма 86, круглая ў плане, дыяметрам 0,7 м і глыбінёю 0,22 м ад узроўня мацерыка. У яе запаўненні, якое складаецца з чорнай зямлі з вуголлем і попелам, знойдзена 14 фрагментаў ляпнога посуду (рыс. 8) і 4 косткі жывёл. Пад паўднёвым краем скаплення гліны выяўлена яшчэ адна круглая ў плане яма дыяметрам 0,4 м і глыбінёю 0,2 м ад узроўня мацерыка. У яе запаўненні з чорнай зямлі з вуголлем і попелам выяўлена 2 фрагменты глянцаванага посуду, 2 грубаляпнога і кавалак пячыны.

***Печ 4*** выяўлена на глыбіні 0,2–0,22 м ад дзённай паверхні ў выглядзе скаплення чырвона-карычневай і шэра-зялёнай гліны з уключэннем невялікіх камянёў, кавалкаў жужалю, фрагментаў ляпнога посуду (рыс. 9), костак жывёл, плошчаю прыблізна 1,2х1,6 м (рыс. 6, *3*). Усяго знойдзены 91 фрагмент керамікі, 34 косткі і 8 кавалкаў жужалю. Амаль у цэнтры развалу прасочана аснова сценак печы і падвойнае дно. Знешні дыяметр печы




*Рыс. 7.* Селішча Снядзін-2. Фрагменты ляпнога посуду з развалу металургічнай печы 2







*Фота.* Рэшткі металургічнай печы 3:

1 – расчыстка асновы печы; 2 – профіль




*Рыс. 8.* Селішча Снядзін-2. Фрагменты ляпнога посуду з развалу металургічнай печы 3




*Рыс. 9.* Селішча Снядзін-2. Фрагменты ляпнога посуду з развалу металургічнай печы 4

каля 70 см, унутраны – каля 50 см. Верхняе дно мела таўшчыню 9–10 см, на ім знаходзілася 27 фрагментаў ляпной керамікі. Паміж верхнім і ніжнім дном прасочана праслойка (2–4 см) перапаленага светлага пяску. На ніжнім дне таўшчынёю да 8 см выяўлена 8 фрагментаў ляпной керамікі. Пад дном печы і яе развалам да мацерыка залягаў пласт бурага супеску таўшчынёю 16–25 см з лінзамі жоўтага і чорнага пяску з уключэннем вуголля і попелу. На паўночным краі развалу печы знойдзены 2 цэлыя гліняныя хлебцы дыяметрам 7,5 см і таўшчынёю 3,3 см. Непадалёк ад печы, у культурным пласце селішча выяўлена 14 фрагментаў падобных хлебцаў. У размешчаных на ўсход ад печы 4, запоўненых чорнай зямлёй з дамешкамі вуголля і попелу яме 67 знойдзена 59 кавалкаў жужалю і яме 65 – 22 кавалкі жужалю.

***Печ 5*** прасочана на глыбіні 0,16–0,2 м у выглядзе развала чырвонай і чырвона-карычневай гліны таўшчынёю 0,1–0,26 м і плошчаю прыкладна 1,6х2,5 м з уключэннем невялікіх камянёў, кавалкаў жужалю, фрагментаў ляпнога посуду і костак жывёл (рыс. 6, *4*). У заходняй частцы скаплення гліны прасочана аснова сценак і дно печы. Знешні дыяметр печы роўны 0,65 м, унутраны – 0,4 м. Дно печы двухслойнае, верх яго выяўлены на глыбіні 0,25 м ад дзённай паверхні. Верхняе дно лінзападобнае ў разрэзе, на ім заха-




*Рыс. 10.* Селішча Снядзін-2. Фрагменты ляпнога посуду з развалу металургічнай печы 5

ваўся тонкі пласт чорнай вуглістай зямлі, у якім знойдзена некалькі дробных каменьчыкаў, кавалкаў жужалю, 10 фрагментаў ляпной керамікі. На 10 см ніжэй знаходзілася другое дно, плоскае ў разрэзе. Паміж верхнім і ніжнім дном выяўлены перапалены, амаль развалены камень і вялікія абломкі верха гаршка пражскай культуры. На ніжнім дне выяўлены 14 фрагментаў ляпной керамікі і 4 косткі жывёлы. Аснаванне ніжняга дна ляжала на глыбіні 0,45 м ад дзённай паверхні, амаль на мацерыку, а ніз развалу знаходзіўся на глыбіні 0,3–0,38 м ад дзённай паверхні. Пры даследаванні развалу печы 5 знойдзены 144 фрагменты грубаляпной керамікі (рыс. 10), 2 глянцаванай, 62 кавалкі жужалю, 53 косткі жывёл, 1 крамянёвы адшчэп. Пад развалам печы 5, к усходу ад яе асновы выяўлена яма 98, авальная ў плане. Яе памеры 0,25х0,9 м, глыбіня 0,45 м ад узроўню мацерыка. Запоўнена чорнай сажыстай зямлёй з уключэннямі вуголля і попелу. У ёй знойдзена 4 фрагменты сценак ляпнога посуду, 5 кавалкаў жужалю, кавалкі пячыны. Вакол печы на глыбіні 0,3 м ад дзённай паверхні назіралася пляма чорнай сажыстай зямлі плошчаю прыблізна 5 х 9 м. Акрамя рэшткаў печаў на даследаваным участку паселішча вывучаны ямы, у якіх знойдзены матэрыялы, звязаныя з працэсам вытворчасці жалеза: кавалкі руды, пячыны, жужалю, косткі жывёл.

Такім чынам, на селішчы Снядзін-2 вывучаны рэшткі 5 сырадутных печаў па вырабу жалеза, якія размешчаны кампактнай групай на адлегласці 3–7 метраў адна ад другой. Яны захаваліся ў выглядзе развалаў чырвонавата-карычневай і шэрай гліны з уключэннем кавалкаў жужаля, невялікіх камянёў і абломкаў ляпнога посуду. У развалах прасочаны круглыя ў плане асновы печаў, са знешнім дыяметрам 0,5–0,7 м. Унутраны дыяметр рабочай прасторы складаў 0,3–0,6 м. У некаторых печах захаваліся асновы сценак на вышыню ад 2 да 8 см. Дно звычайна выкладвалася абломкамі ляпнога посуду і знаходзілася ў культурным пласце на вышыні ад 10 да 25 см ад мацерыка. Мяркуючы па ўсім, гэта былі стацыянарныя збудаванні з наземнымі, крыху заглыбленымі ў грунт шахтамі шматразовага выкарыстання. Аб гэтым сведчаць падвойныя асновы печаў – наступствы рамонту і шлакавыпускныя адтуліны. У шэрагу печаў дны выкладзены буйнымі фрагментамі посуду, што, на думку некаторых даследчыкаў, садзейнічала захоўванню высокай тэмпературы [14, с. 229]. Падобнай канструкцыі печы, прызначаныя для прамога ўзнаўлення жалеза з руды, узнікаюць ва Усходняй Еўропе ў першыя стагоддзі н. э. і зафіксаваныя на познезарубінецкім селішчы Люцеж, на помніках чарняхоўскай культуры Лапатна і Іванкаўцы, на чарняхоўска-вельбарскам паселішчы Лепясоўка [15, с. 377], у Правабярэжжы Прыпяці – на помніку перыяду рымскіх уплываў каля в. Хачэнь[1].

Вытворчасць жалеза адбывалася ў Снядзіне-2 на спецыяльным участку, адасобленым ад жылых пабудоў. У той жа час здабыча жалеза на помніках пражскай культуры ў Падняпроўі і на Паўднёвым Бузе адбывалася ў рамесных пабудовах шматпрофільнага прызначэння, размешчаных непадалёк ад жытлаў [14, с. 230; 16, с. 40]. Наземныя горны шахтнага тыпу ў чорнаметалургічнай вытворчасці выкарыстоўвала таксама насельніцтва пянькоўскай культуры на Правабярэжжы Дняпра, а ў міжрэччы Дняпра і Дона зафіксаваны наземныя круглыя альбо авальныя печы са звужанай верхняй часткай і ямныя горны з плазавата-грушападобнымі колбамі-тыглямі [17, с. 35–36, 79].

Меншая частка выяўленых ямаў адносіцца да слупавых, астатнія маюць гаспадарчы характар. Асобныя слупавыя ямы размешчаны каля сценак гаспадарчых ям, альбо на іх дне. Пяць слупавых ям утвараюць лінію, арыентаваную з паўднёвага захаду на паўночны ўсход даўжынёю да 7 м і з'яўляюцца слядамі сцяны. У шэрагу ям дно складаецца з перапаленага чырванаватага пяску з лінзамі чорнай сажыстай зямлі. Ямы маюць блізкую да круга форму, плоскае дно і прамыя, або крыху звужаныя да нізу сценкі. Іх дыяметр дасягаў

[1]Бяліцкая Г. М., Байкоўская А. А., Харытановіч В. М. Даследаванне вытворчага ўчастку перыяду рымскіх уплываў на селішчы Хачэнь-1 Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці // МАБ. 2025. Вып. 35. С. 109–123 (у друку).

двух метраў, глыбіня да 0,3–0,5 м ад узроўню мацерыка. Магчыма, гэтыя ямы выкарыстоўваліся як для вытворчасці драўнянага вугалю, так і для належнай апрацоўкі руды, для выкарыстання яе ў металургічным працэсе.

Неабходна адзначыць, што атрыманне жалеза пад час сырадутнага працэсу было спалучана з пэўнымі складанасцямі: неабходнасцю улічваць суадносіны руды і вугалю, часу засыпкі шыхты, тэмпературнага рэжыму на розных стадыях працэсу, сілы і магутнасці дуцця, часу і перыядычнасцю выпуску шлаку. Таму металургі маглі атрымаць гэтыя веды толькі пад час накаплення вялікага досведу. Перад тым, як засыпаць руду ў печ, яе шмат разоў прамывалі, каб выдаліць пясок ды іншае смецце, здрабнялі да памераў арэха і абпальвалі [13, с. 23].

Драўняны вугаль з’яўляўся адзіным відам паліва, які выкарыстоўваўся старажытнымі металургамі на тэрыторыі Беларусі. Аднак у яго вытворчасці таксама неабходна было мець пэўныя веды і навыкі. У першую чаргу найбольш прыдатнай у металургічным працэсе была драўніна хвойных парод, так як яна значна менш утрымоўвала фосфару ў параўнанні з лісцёвымі пародамі дрэў. Вялікая колькасць фосфару ў металургічным працэсе прыводзіла да ломкасці атрымоўваемага метала. Аднак, як паказала петраграфічнае вывучэнне адбіткаў вугалю і драўніны, а таксама рэшткаў вугалю, у шэрагу кавалкаў жужалю на Беларускім Падняпроўі выкарыстоўвалі як хвойныя, так і лісцёвыя пароды дрэў [13, с. 23–24]. У працэсе вуглепалення кожнае дзеянне мела свой сэнс. Неабходна было правільна пакласці дровы, пакрыць іх галлём, мохам, саломай, а зверху засыпаць зямлёю, пры гэтым забяспечыць пастаянны прыток паветра праз адтуліны, зрабіць магчымым адток газаў, каб не дапусціць пад час працэсу выбухаў. Як адзначае М. Ф. Гурын, выпальванне вуголля ў Беларусі адбывалася кучным спосабам [18, с. 11]. Аднак даследванні паказалі, што на вытворчым участку на паселішчы Снядзін-2 быў вядомы і спосаб выпальвання вуголля ў ямах.

М. Ф. Гурыным выказана меркаванне, што для тэрыторыі Беларусі, у асноўным, былі характэрны металургічныя печы шахтнага тыпу [18, с. 11]. Для атрымання жалеза ў папярэдне разагрэтую печ паслойна засыпаліся здрабнёная і пракаленая жалезная руда, драўняны вугаль, а таксама вапна. Металургічны працэс адбываўся пры тэмпературы не вышэй за 1350 °С [19, с. 24]. Пры падобнай тэмпературы расплаўлення жалеза не было. Адбывалася аднаўленне жалеза, і яго мікрачасцінкі паспяхова злучаліся між сабою ў крыцы, якія з’яўляюцца канчатковым металургічным прадуктам і зыходнай сыравінай для кавальства [18, с. 12].

Згодна функцыянальнага прызначэння вырабы з жалеза ўмоўна дзеляцца на чатыры групы: прылады працы, прадметы гаспадарчага ўжытку, зброя, рыштунак вершніка і каня. У цэлым, на паселішчы Снядзін-2 металічных рэчаў выяўлена не шмат (рыс. 11). Часцей за ўсё сустракаліся цэлыя і




*Рыс. 11.* Селішча Снядзін-2:
*1–14* – вырабы з металаў; *15–17* – вырабы з гліны

фрагментаваныя нажы. Іх даўжыня 11–14 см, чаранок аддзяляецца ад спінкі і ляза невялікімі ўступамі, спінка звычайна прамая. Падобнага тыпу нажы шырока распаўсюджаны і характэрны для славянскіх помнікаў другой паловы I тыс. [16, с. 17, рис. 18: 4, 5; 20, табл. 32]. З жалеза выраблены цэлыя і

фрагментаваныя шылы, невялікі, але масіўны прабойнік, язычок ад спражкі, кальцо з прабоем – магчыма ручка ад дзвярэй, альбо скрыні. Такая ж рэч знойдзена ў жытле 35 на ўсходнім гарадзішчы каля в. Манастырок на Украіне [21, рис. 42: 2]. Зброя прадстаўлена двухшыпным плоскім чарашковым наканечнікам стралы, якія бытавалі ва Усходняй Еўропе з I па XIV стст. [22, с. 61]. Жалезнае пласцінкавае трапецападобнае крэсіва з вушкам мае даўжыню 9,5 см. Тыпалагічна блізкая рэч таксама знойдзена на паселішчы Бухліцкі Хутар у Столінскім раёне. Пласцінкавыя крэсівы на паселішчах пражскай культуры выяўлены толькі ў Беларускім Палессі.

Аб структуры і тэхналагічных асаблівасцях жалезных вырабаў са Снядзінскіх паселішчаў пакуль няма даных. З дапамогаю металургічных метадаў прааналізаваны нажы, выяўленыя на паселішчы пражскай культуры Кажан-Гарадок, якое размешчана на захад ад Снядзіна ў Лунінецкім раёне [23, с. 160–162]. Яны выраблены з крычнага жалеза ферытнай структуры, з пакетаваных жалезных і сталёвых нарыхтовак. Кавалі з Кажан-Гарадка валодалі таксама тэхнікай зваркі [12, с. 93].

Даследчыкі Украіны таксама адзначаюць нешырокі асартымент жалезных вырабаў на паселішчах пражскай культуры: прылады працы, побытавыя рэчы, прадметы ўзбраення, дэталі адзення, аздобы, дробныя пакоўкі ў выглядзе пласцін, стрыжняў, аковак і да т. п. Гэтая кавальская прадукцыя задавальняла, галоўным чынам, патрэбы сельскай гаспадаркі [24, с. 42]. Неабходна адзначыць, што жалезаапрацоўка на паселішчах Украіны дасягнула значнай ступені развіцця ў 3-й чвэрці I тысячагоддзя. Яна характэрызуецца высокай тэхнікай свабоднай коўкі, наяўнасцю шырокага набору кавальскіх інструментаў, распаўсюджваннем кавальскай зваркі, тэрмічнай апрацоўкі, дыферынцыраваным выкарыстаннем жалеза і сталі [25, с. 31].

Вырабы з бронзы і медзі на паселішчы Снядзін-2 прадстаўлены нарыхтоўкамі ў выглядзе стрыжняў, пласцінак, колцаў, спражкаю. Два колцы з разамкнутымі канцамі зроблены з круглага ў сячэнні дроту. Выяўлена колца з заходзячамі канцамі, якое зроблена з плоскай прамавугольнай у сячэнні пласціны, і колца, адзін канец якога нагадвае штопар з трох віткоў. Акрамя пэўных рэчаў з каляровых металаў, тут знойдзены выліўкі, г. зн. жужаль і тыглі, для плаўкі металаў (рыс. 11, *15–17*). Гэты факт сведчыць, што тут таксама выраблялі рэчы з каляровых металаў.

Раннеславянскі перыяд функцыянавання паселішча Снядзін-2 датуецца V–VII стст. Падобная храналогія абапіраецца на марфалагічнай характарыстыцы раннеславянскага посуду (рыс. 5, 7–10) і на некаторых рэчах з абмежаваным часам бытавання. У адной з ям (№ 49), на глыбіні 0,57 м ад дзённай паверхні знойдзена «прапелерападобная» накладка на рамень (рыс. 11, *9*) [26, с. 33]. Падобныя рэчы вядомыя на могільніках IV – пачатку V ст. на тэрыторыі прыдунайскай часткі Норыка і Панонii [27, s. 249, abb. 6: 8; 28,

s. 245, abb. 18: 2]. Да гэтага ж часу можна аднесці пацерку ў форме куба са зрэзанымі краямі з сіняга паўпразрыстага кобальтавага шкла [29, с. 333]. У перадмацерыковым пласце каля печы 2 знойдзена цэльналітая срэбная спражка візантыйскага тыпу, якая датуецца VII ст., хутчэй яго сярэдзінай – другой паловай (рыс. 11, *12*) [30]. Тыпалагічны аналіз керамікі пражскага тыпу, выяўленай на дне печаў і ў іх развалах, паказвае, што яна належыць да больш развітых форм посуду, характэрнага ў асноўным для VI–VII ст. [26, с. 27–35]. Выяўленыя на паселішчы матэрыялы паказваюць, што тут адбываўся працэс вытворчасці жалеза, вяліся спадарожнічаючыя яму працы па нарыхтоўцы драўнянага вугалю і ўзбагачэнню балотнай руды. Таксама прасочваюцца сляды кавальскага і ювелірнага рамёстваў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Вяргей В. С.* Археалогія ранніх славян на тэрыторыі Беларусі // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. Warszawa, 2004. S. 278–304.

2. *Вяргей В. С.* Справаздача аб палявых даследаваннях у Петрыкаўскім і Жыткавіцкім раёнах Гомельскай вобласці, Столінскім раёне Брэсцкай вобласці ў 1994 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Спр. № 1538.

3. *Вяргей В. С, Трымер В.* Раннеславянскае селішча Снядзін-2 // Славяне и их соседи (археология, нумизматика, этнология). Минск, 1998. С. 27–35.

4. *Вяргей В. С.* Справаздача аб палявых даследаваннях у Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці на археалагічным комплексе каля в. Снядзін у 2005 годзе // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Спр. № 2290.

5. *Вяргей В. С.* Даследаванні шматслойнага паселішча Снядзін-3 на р. Прыпяць // ГАЗ. 2003. № 23. С. 121–123.

6. *Вяргей В. С.* Жытло і культавы аб’ект гарызонту пражскай культуры на паселішчы Снядзін-3 на р. Прыпяць у Петрыкаўскім раёне // Древняя история Восточной Европы: сб. науч. ст., посвящ. 80-летию профессора Э. М. Загорульского. Минск, 2009. С. 21–32.

7. *Вяргей В. С, Касюк А. Ф.* Даследаванні ў 2012 г. паселішчаў каля в. Снядзін у Петрыкаўскім раёне // МАБ. 2014. Вып. 25. С. 194–202.

8. *Шнеевайс Е.* Применение магниторазведки при изучении раннесредневековых памятников Беларуси // МАБ. 2014. Вып. 25. С. 259–265.

9. *Касюк А. Ф, Вяргей В. С, Шнеевайс Е, Бартроу Г, Шуман Ф.* Археалагічныя даследаванні каля вёскі Снядзін Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў 2015–2016 гг. (папярэдняе паведамленне) // МАБ. 2018. Вып. 29. С. 231–235.

10. *Ляўданскі А. Н., Палікарповіч К. М.* Да гісторыі жалезнай прамысловасьці на Беларусі па даных археолёгіі // Савецкая краіна. Менск, 1932. № 5. С. 55–84.

11. *Ляўданскі А. Н.* Да гісторыі жалезнага промыслу на Палесьсі: Рудні і месцазнаходжаньні руды // Працы Палескай экспэдыцыі. Вып. 2. Менск, 1933. 40 с.

12. *Гурин М. Ф.* Развитие металлургии железа в Беларуси // ГАЗ. 1997. № 11. С. 93–98.

13. *Гурин М. Ф.* Древнее железо Белорусского Поднепровья (I тысячелетие н. э.). Минск: Наука и техника. 1982. 124 с.

14. *Хавлюк П. Н.* О начальных этапах развития раннеславянского ремесла (на материалах ремесленных сооружений на Южном Буге) // Труды V МКАС. Киев, 1988. Т. 4. С. 225–231.

15. *Паньков С. В.* Производство железа // Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период. Киев, 1990. С. 376–382.

16. *Русанова И. П, Тимощук Б. А.* Кодын – славянские поселения V–VIII вв. на р. Прут. Москва: Наука, 1984. 87 с.

17. *Колода В. В.* Чёрная металлургия Днепро-Донецкого междуречья во второй половине I тыс. н. э. Харьков: РЦНИТ, 1999. 244 с.

18. *Гурын М. Ф.* Узнікненне і развіццё металургіі і апрацоўка жалеза // Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе Сярэднявечча. Мінск, 1999. С. 10–19.

19. *Колчин Б. А.* Чёрная металлургия и металлообработка в Древней Руси (домонгольский период) // МИА. № 32. Москва: Издательство Академии наук СССР, 1953. 260 с.

20. *Русанова И. П.* Славянские древности VI–XI вв. между Днепром и Западным Бугом. Москва: Наука, 1973. 100 с. (САИ. Вып. Е1-25).

21. *Максимов Е. В., Петрашенко В. А.* Славянские памятники у с. Монастырек на Среднем Днепре. Киев: Наук. думка, 1988. 146 с.

22. *Медведев А. Ф.* Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. Москва: Наука, 1966. 184 с. (САИ. Вып. Е1-36).

23. *Гурын М. Ф.* Кажан-Гарадок – паселішча пражскай культуры // ГАЗ. 1994. № 5. С. 152–162.

24. *Вознесенська Г. О, Недопако Д. П, Паньков С. В.* Чорна металургія та металообробка населення східноєвропейського лісостепу за доби ранніх слов’ян і Київської Русі. Київ: Б/и, 1996. 186 с.

25. *Гопак В. Д.* Обработка железа у славянских племён Юго-Восточной Европы во второй половине I тыс. н. э. // Труды V МКАС. Киев, 1988. Т. 4. С. 30–33.

26. *Вяргей В. С.* Сучасны стан і праблемы даследавання пражскай культуры ў Беларусі // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период. Минск, 2016. Кн. 2. С. 14–62.

27. *Pollak M.* Zur chronologischen Entwicklung der Gräberfelder Ufernoricums im 4. und 5. Jahrhundert // Probleme der relativen und absoluten Chronologie ab Latėnezeit bis zum Frühmittelalter. Kraków, 1992. S. 249–262.

28. *Tejral J.* Die spätantiken militärischen Eliten beiderseits der norisch-pannonischen Grenze aus der Sicht der Grabfunde // Germanen beiderseits des spätantiken Limes. Köln–Brno, 1999. S. 217–292.

29. *Вяргей В. С.* Помнікі тыпу Прагі-Карчак і Лукі-Райкавецкай на Беларусі // Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе Сярэднявечча. Мінск, 1999. С. 317–348, 392–406.

30. *Varsik V.* Byzantinische Gürtelschnallen im mittleren und unteren Donauraum im 6. und 7. Jahrhundert // Slovenska Archeologie. 1992. T. 40. S. 77–108.

# ПОСТРОЙКА С ПОСЕЛЕНИЯ ОГОРОДНЯ В КОНТЕКСТЕ ДОМОСТРОИТЕЛЬСТВА ГОРИЗОНТА ПОЧЕП (ПО МАТЕРИАЛАМ ДЕСНИНСКОЙ ЭКСПЕДИЦИИ)

**В. Н. Гурьянов[1)], А. А. Чубур[2)], Н. И. Сударев[3)]**

*[1)] ООО «Брянская Археологическая Служба», ул. Дуки 4-33,
241050, г. Брянск, Российская Федерация, gurian032@yandex.ru*
*[2)] ООО «Брянская Археологическая Служба», ул. Дуки 4-33,
241050, г. Брянск, Российская Федерация, fennecfox66@gmail.com*
*[3)] Институт археологии РАН, ул. Дмитрия Ульянова, 19,
117292, г. Москва, Российская Федерация, sudarev@list.ru*

Вводятся в научный оборот результаты раскопок поселения почепской группы позднезарубинецкой культуры Огородня (Трубчевский район, Брянская обл.). Анализируются остатки жилища-полуземлянки. Предложена его реконструкция и классификация конструкций почепских углубленных жилых построек. Уточнено распространение памятников типа Почеп.

***Ключевые слова:*** позднезарубинецкая культура; почепская группа; бассейн Десны; Огородня; постройки.

# ПАБУДОВА З ПАСЕЛІШЧА АГАРОДНЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ДОМАБУДАЎНІЦТВА ГАРЫЗОНТА ПОЧАП (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДЗЯСНІНСКАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ)

**В. М. Гур'янаў[1)], А. А. Чубур[2)], М. І. Судараў[3)]**

*[1)] ТАА «Бранская Археалагічная Служба», вул. Дукі 4-33,
241050, г. Бранск, Расійская Федэрацыя, gurian032@yandex.ru*
*[2)] ТАА «Бранская Археалагічная Служба», вул. Дукі 4-33,
241050, г. Бранск, Расійская Федэрацыя, fennecfox66@gmail.com*
*[3)] Інстытут археалогіі РАН, вул. Дзмітрыя Ульянава, 19,
117292, г. Масква, Расійская Федэрацыя, sudarev@list.ru*

Уводзяцца ў навуковы зварот вынікі раскопак паселішча почапскай групы познезарубінецкай культуры Агародня (Трубчэўскі раён, Бранскі рэгіён). Аналізуюцца рэшткі жытла-паўзямлянкі. Прапанавана яе рэканструкцыя і класіфікацыя структур почапскіх жылых заглыбленых пабудоў. Удакладняецца размеркаванне помнікаў тыпу Почап.

***Ключавыя словы:*** познезарубінецкая культура; почапская група; басейн Дзясны; Агародня; пабудовы.

# BUILDING FROM THE OGORODNYA SETTLEMEN IN THE CONTEXT OF HOUSE-BUILDING OF HORIZON POCHEP (BASED ON THE MATERIALS OF THE DESNINSKAYA EXPEDITION)

**V. N. Guryanov[1)], A. A. Chubur[2)], N. I. Sudarev[3)]**

*[1)] Bryansk Archaeological Service LTD, Duki str., 4-33, 241050, Bryansk, Russian Federation, gurian032@yandex.ru*
*[2)] Bryansk Archaeological Service LTD, Duki str., 4-33, 241050, Bryansk, Russian Federation, fennecfox66@gmail.com*
*[3)] Institute of Archaeology of the Russian Academy of Sciences, Dmitry Ulyanova str., 19, 117292, Moscow, Russian Federation, sudarev@list. ru*

The results of the excavations of the Pochep group of the Late Zarubinetskaya culture at the settlement Ogorodnya (Trubchevsk district, Bryansk region) are introduced into scientific circulation. The traces of the dwelling are analyzed. Its reconstruction and classification of the structures of the Pochep in-depth residential buildings is proposed. The distribution of the Pochep type monuments is clarified.

***Keywords:*** Late Zarubetskaya culture; Pochep group; Desna basin; Ogorodnya; buildings.

Необходимость своевременной публикации накопленного археологического материала не вызывает сомнений и не требует доказательств. Результаты работ, несомненно, требуют времени на осмысление, затем следуют новые работы, старые материалы постепенно откладываются и в итоге, к сожалению, зачастую остаются неопубликованными и забытыми. Именно так произошло с большинством материалов Деснинской экспедиции Института археологии РАН, проводившей значительные объёмы охранно-спасательных работ. Несмотря на свою научную значимость, они либо кратко упоминались в обзорных статьях, либо – в лучшем случае – кто-то из исследователей брал на себя труд по подготовке и публикации отдельных памятников. В данной работе речь пойдёт о раскопках поселения, которое даже не удостоилось упоминания в статье к юбилею Деснинской экспедиции [1], и лишь вскользь, даже без указания источника, упомянуто в списке исследованных памятников типа Почеп со следами построек [2, с. 79]. Между тем, несмотря на скромный объем полученного материала, оно представляет интерес в контексте конца эпохи раннего железа.

Ареал почепской группы позднезарубинецких памятников, впервые выделенной А. К. Амброзом как «почепская культура» [3], в основном ограничен бассейном среднего и верхнего течения Десны и её притоков [4–6; 7, с. 134–140; 8]: Болвы [9], Ревны, Навли, Неруссы, Судости [10–14] и Замглая [15]. Наибольшей концентрации поселения достигают на р. Судость, в полесье левобережья Десны и, наконец, на самой Десне выше Брянской луки (рис. 1). Поселение Огородня, таким образом, маркирует восточный край

Судостьского микрорегиона, соединяя его с Деснянским полесьем. Ф. М. Заверняев отметил несколько зарубинецких памятников на р. Ипуть [11], однако они известны лишь по результатам разведок и принадлежность их к почепской группе не ясна.




*Рис. 1.* Размещение позднезарубинецких памятников группы Почеп в бассейне Десны:

*1* – Устье р. Соложа; *2* – Спартак; *3* – Чернея; *4* – Высокое; *5* – Рябчичи; *6* – Будянский; *7* – Лозицы 2; *8* – Жуковка, Жуковка-Ореховое; *9* – Никитенка; *10* – Дубки; *11* – Ржаница-Витховка; *12* – Лунёво 2; *13* – Полужье (селище, городище Красное); *14* – Неготино 5, 6; *15* – Бетово, Хотылево (городище Кудеярка, селища Бетово, Сельцо-Коммунар, Хотылево 1 (Устье Гасомы), 2, 4, 12); *16* – Белокаменка; *17*– Добрунь; *18* – Воробейня; *19* – Макарово 1 и 2; *20* – Синьково 1, 2, 3; *21* – Дмитрово 1, 3; *22* – Почеп 1, 3; *23* – Козорезовка 3; *24* – Рогово; *25* – Полянка; *26* – Голяшовка-Заречное; *27* – Посудичи 6; *28* – Яковлевичи 3; *29* – Курово 2, 6, 7, Кружаловка; *30* – Борки 3; *31* – Огородня; *32* – Монастырище-Лбище; *33* – Арельск; *34* – Железное 1, 2, 3, 4; *35* – Парня 1, 2 (Салтановка); *36* – Партизанское-Святое 4; *37* – Кольцовка; *38* – Рябчевка; *39* – Колодезный Бугор; *40* – Чулатово; *41* – Киселёвка 3; *42* – Зеленин 4; *43* – Заречное 2; *44* – Новоямское 3а; *45* – Аркино; *46* – Туличево; *47* – Денисовка; *48* – Мешково 1, 2, 3, 4; *49* – Сомово 2, 3, 4; *50* – Яблочково; *51* – Семенково; *52* – Слободка; *53* – Дмитровск-Орловский; *54* – Алешинское; *55* – Булатово 1, 2; *56* – Волконск; *57* – Воронино; *58* – Еньшино; *59* – Шибинец (городище, селище); *60* – Хизовка (городище, селище) [6; 8; 9; 14; 29; 35; 36; 37; 38; 39; 40; 41; 42]

Поселение расположено на северо-западе Трубчевского района Брянской области Российской Федерации в верховьях р. Волотынь (левый приток р. Гнилой – левого притока р. Судости) близ деревень Могорь, Волотынь и Огородня. Оно занимает северную и восточную часть обширного мыса левобережной первой надпойменной террасы реки в 250–300 м к северу от д. Огородня, напротив д. Волотынь, что на правом берегу. Мыс размером 600x600 м образован с севера долиной реки, с востока долиной небольшого ручья, с запада – широким оврагом и возвышается над меженным уровнем реки от 4 м на севере у берега и до 10 м в южной напольной части (рис. 2). Памятник открыт в 1989 г. А. С. Смирновым [16, с. 13] и занимает площадь приблизительно 300x300 м, его поверхность распахивается. Поселение исследовал раскопом 146 м$^2$ летом 1992 г. отряд Деснинской экспедиции под руководством Н. И. Сударева в рамках полномочий Открытого листа на имя Р. А. Нигматуллина [17, с. 34–37].




*Рис. 2.* Схема расположения и топографический план поселения Огородня с указанием места раскопок. Горизонтали проведены через 1 м

Мощность культурного слоя колебалась в пределах 0,18–0,55 м. По всей площади под дерном залегал слой серо-жёлтой супеси мощностью 0,1–0,28 м. В большей части раскопа он лежал непосредственно на материке – рыхлом жёлтом песке либо плотной жёлтой супеси – горизонте ортзандов с мерзлотными деформациями Молодого Дриаса [18]. В некоторых местах его подстилали линзы серой золистой супеси с включениями мелких угольков, иногда обширные и достигающие мощности в четверть метра. Встречаются линзочки оподзоленного жёлтого песка мощностью до 0,15 м, которые подстилают либо серо-жёлтую супесь, либо серую супесь с угольками. Культурный слой нельзя назвать насыщенным. Индивидуальных находок всего 4, все они железные: это два кованых гвоздя, кольцо и пластина. Обнаружено также 9 кусков железного металлургического шлака. Основной же материал – фрагменты керамической посуды. В большинстве случаев они встречены в скоплениях, которых зафиксировано 24.

Материал делится на две группы: преобладающую груболепную керамику с примесью дресвы и шамота в тесте и с шероховатой поверхностью (249 фрагментов, 95,8 %), и немногочисленную лепную лощёную керамику с примесью песка и органики в плотном тесте, которой всего 11 фрагментов (4,2 %). Долевое соотношение групп керамики такое же, как на эталонном Почепском селище [5, с. 46]. Груболепная кухонная посуда по рыхлому черепку со слоистым обжигом, орнаментации (защипы и насечки по краям венчиков) и относительно сильным изгибам венчиков наружу, типична для позднезарубинецких почепских памятников Подесенья (рис. 3, *1–17*). Все диагностичные фрагменты можно с большой долей вероятности отнести к округлобоким горшкам типа I-1 варианта, без уточнения разновидностей, согласно классификации А. М. Обломского [19, с. 15, рис. 2], наиболее распространенным на почепских памятниках. Концентрируется груболепная керамика в скоплениях в придонном заполнении и ямах на дне котлована постройки (117 фрагментов).

Лощёная керамика имеет двустороннее лощение – чаще черное, реже серо-коричневое. Основная часть лощёной керамики найдена в придонном заполнении котлована постройки (8 фрагментов из 11). Судя по двум фрагментам с ребром (рис. 3, *18, 19*), лощёная керамика представлена мисками типа III-1 (ребристая с S-видным профилем) и типа III-2 вариант «а» (ребристая с вертикальным венчиком) по той же классификации [19, с. 15, рис. 2, рис. 12, *8, 10*]. Перечисленные типы посуды входят, как наиболее распространенные, в эталонный керамический набор почепских поселений [19, с. 52].

На вскрытой раскопом площади прослежено 42 материковых ямы, большая часть которых связана с полом и непосредственной периферией котлована углубленной постройки (ямы 1). В основном это круглые столбовые ямки, заполненные сильно гумусированной супесью с углями или просто древес-




*Рис. 3.* Керамика поселения Огородня:

*1–17* – груболепная кухонная; *18–19* – лепная лощеная (миски)

ным углём. Диаметр их колебался в пределах от 6 до 31 см; глубина от уровня материка – 5–26 см. Вне котлована постройки и связанных с ней внешних элементов располагались всего четыре ямы. Яма 2 в 4 м к северо-западу от постройки вскрыта частично (исследована часть 36х38 см и глубиной 12 см, из которых 8 см погружено в материк) и представляла собой неглубокую западину, которая уходила в северную стенку раскопа. Она была заполнена сильно гумусированной супесью с углями. Не исключено, что это следы открытого очага, тем более что к западу в основании культурного слоя зафиксировано пятно, насыщенное золой и угольками. Неправильно-округлая яма 3 поперечником около 0,65 м с чашеобразным дном, располагавшаяся в 6 м к востоку от южного края постройки, углублена в материк на 0,25 м,

а общая её глубина составляла 0,3 м. Заполнение ямы двухъярусное: верх (0,07–0,12 м) – оподзоленный желтый песок; низ (0,18–0,23 м) – темно-жёлтая супесь. Расположенные непосредственно к юго-востоку от нее столбовые ямки 4 и 5, вероятно, связаны с опорами примитивного навеса над ямой.

Перейдём к описанию постройки (рис. 4, 5). Как известно, на почепских памятниках выделяются два сильно отличающихся типа жилищ: наземные дома столбовой конструкции и полуземлянки со срубной конструкцией стен [20]. При этом сами полуземлянки также встречены нескольких разновидностей. Возможно, это связано с составлявшим единый социум композитным, мозаичным этническим составом населения, каждый из компонентов которого имел свои устоявшиеся традиции домостроения, берущие начало с одной стороны в классической зарубинецкой культуре, а с другой – в культурах лесных балтов [3; 21; 22] и даже в сарматских кочевьях [23]. Памятников, где сохранность следов построек удовлетворительная, не так много, поэтому каждое обнаруженное жилище представляет несомненный интерес. Не всегда выделение некоторых типов домов достоверно. Так, на Почепском селище, вопреки реконструкции Г. Н. Пронина [12], отсутствуют длинные наземные дома [24], а реконструкция наземных домов с углубленной центральной частью, предложенная И. К. Фроловым [13], была отвергнута при углубленном анализе [19, с. 55–56].

Итак, постройка первоначально была зафиксирована в виде подпрямоугольного тёмного углистого пятна с неровной границей размером 3,1х2,3 м. На 15 см глубже очертания приобрели правильную прямоугольную форму со сторонами 4х5 м. Котлован с горизонтальным дном и в основном вертикальными стенками был углублен на 0,65 м в материк. Верхний уровень заполнения мощностью до 0,25 м состоял из гумусированной супеси с углями. Его подстилал слой серой супеси с углями мощностью до 0,22 м. Нижняя часть заполнения – оподзоленный жёлтый песок с углями. В заполнении постройки зафиксировано 10 скоплений керамики, несколько кусков железного шлака, железный гвоздь, а у восточного борта за пределами котлована – железное кольцо.

В придонной части залегала тонкая, 2–5 см, прослойка угля. Уголь в виде небольших линз встречался и по всей толще заполнения. Вероятно, постройка погибла в пожаре. Поджечь её могли преднамеренно в ритуальных целях сами хозяева, перед тем как покинуть поселение и уйти на новое место. Об этом косвенно свидетельствует почти полное отсутствие индивидуальных находок и крупных развалов посуды. Отсутствие находок в остатках сгоревших почепских построек ставило исследователей в тупик [14]. Сожжение жилища и даже всего поселения могло восприниматься как его ритуальная смерть. Очищение огнём завершало некий жизненный цикл и давало начало новому циклу. *«Ритуал сжигания жилища означал снятие своего культур-*



*Рис. 4.* План постройки поселения Огородня

Условные обозначения:

*1* – скопления керамики и их глубины от репера в см; *2* – контуры ям; *3* – металлургический шлак и глубина от репера в см; *4* – индивидуальные находки и их глубины от репера в см (№ 3 кованый железный гвоздь, № 4 железное кольцо); *5* – контур пятна постройки в культурном слое поселения; *6* – контур подбоя в яме 42; *7* – контуры котлована постройки с указанием глубина от репера в см. Буквами С-Ю и З-В указано положение профилей постройки

*ного кода, очищение пространства и его возвращение в природное состояние»* [25, с. 220]. Подобный ритуал – распространенный архетип поведения, порой проявляющийся даже в новейшей истории, например, в зонах межэтнических и межконфессиональных конфликтов. Он многократно прослежен археологами в иных культурах и эпохах на территории Евразии [26, с. 20; 27; 28].

Большинство ям в полу постройки – столбовые, заполненные древесным углем (ямы 7–11, 29–31, 34, 36–39, 41, 42). Среди них выделяется более крупная яма 42 от центрального опорного столба. Она расположена почти в центре с небольшим смещением к северу. Диаметр её верхнего круглого контура – 0,24 м. На 0,15 м от верхнего края яма резко расширялась в за-




*Рис. 5.* Профили постройки и ям поселения Огородня

Условные обозначения:

*А* – З-В профиль постройки; *Б* – С-Ю профиль постройки; *В* – профили ям, нумерация соответствует номерам на плане;

*1* – дерновый слой; *2* – жёлто-серая супесь; *3* – серая супесь; *4* – оподзоленный жёлтый песок; *5* – гумусированная супесь; *6* – уголь; *7* – материк (жёлтый песок)

падно-восточном направлении, приобретая очертания вытянутого овала с длинной осью 0,53 м, а глубже вновь становилась в плане круглой, с тем же диаметром, что и по верхнему контуру. Возможно, это следы специально оставленных на столбе сучьев, предотвращавших раскачивание опоры. Общая глубина ямы 0,8 м, заполнение – темно-жёлтая супесь с большим количеством древесного угля. Отсутствие угловых столбовых ям, как отсутствие рядов ямок вдоль стен (следов плетня или частокола) однозначно указывает на срубную конструкцию стен дома. Остальные столбовые ямки невелики и могут быть связаны с элементами интерьера, достоверно реконструировать которые сложно. Наличие значительного количества таких ямок – характерная черта многих почепских жилищ [14; 29].

У неправильно-округлых ям 35 и 40 с чашеобразным профилем, расположенных к юго-западу от опорного столба и имеющих поперечник около 0,3 м каждая, заполнение углистое. Можно предположить, что это остатки

*I – 1–14* – погр. 4; *II – 15–18* – погр. 5

ного предмета отсутствует. Третья пряжка с плохо сохранившейся обоймой обнаружена на правой половине таза. Она изготовлена из серебра и имеет овальную рамку и обойму. Конец язычка загнут книзу и чуть выступает за пределы рамки.

Поблизости, над кистью правой руки, найден железный предмет, в который с внешней стороны «припаялся» кремневый отщеп (рис. 5, *3*). Снизу в этот же предмет оказалась «впаянной» маленькая серебряная пряжка с удлиненной прямоугольной обоймой на одной заклепке. Тут же собраны четыре серебряных заклепки с грибковидными шляпками (рис. 5, *12*). По мнению А. М. Обломского, это были остатки сумки с кусочком кремня, которая застегивалась пряжкой [6, с. 491].

Под левой ключицей лежала серебряная пряжка с овальной рамкой и удлиненно-прямоугольной обоймой на одной заклепке (рис. 5, *5*). На лодыжках встречены еще две небольшие серебряные пряжки от обуви. Они имеют округлые рамки и обоймы овальной формы на одной заклепке. Между костями правой ноги и стенкой могилы обнаружены кость животного, невыразительный фрагмент лепной керамики и кусок мела. У правого колена найдена кость животного, в которую был воткнут железный нож (рис. 5, *13*).

Сероглиняный гончарный кувшин, покрытый темным лощением, имеет высокое горло с желобчатым орнаментом, и тулово, украшенное поясом из пролощенных тройных полосок, образующих зигзаг (рис. 5, *4*). На дне – отпечаток клейма в виде колеса с четырьмя спицами. А. М. Обломский считал, что кувшин аналогичен тем, которые изготавливались на поселении Ксизово-19 [6, с. 491]. Но обычай украшать дно сосуда рельефным клеймом в виде колеса со спицами получает распространение на боспорской столовой посуде с IV в. н. э. [9, с. 317]. Зигзаговидный пролощенный орнамент известен на кувшинах черняховской культуры [8, с. 57], но, особенно, на Боспоре в конце IV – первой половине V в. н. э. [10, с. 242, рис. 4].

Железный меч с широкой и плоской рукоятью можно было бы отнести к одному из самых поздних вариантов длинных позднесарматских мечей (рис. 5, *1*) конца Ш – IV вв. н. э. [11, с. 85]. Однако клинок его более широкий, что характерно для боспорских мечей позднеантичного времени. Найденный вместе с мечом кинжал (рис. 5, *2*) имеет одну характерную особенность – бронзовую оковку нижней части ножен. Эта деталь довольно часто встречается на ножнах мечей и кинжалов эпохи Великого переселения народов [12, с. 162, табл. 9].

Более точную дату погребения 4 позволяет определить набор пряжек. И. Р. Ахмедов и М. М. Казанский существенно омолодили датировку этого комплекса в пределах 450–480 гг. Выходит, что они могли попасть в Центральную Россию только после распада «державы Аттилы». Поясной набор и наличие второго короткого меча соответствует о западной воинской моде,

распространенной во второй половине V в. [13, с. 179]. Судя по длинному мечу и набору серебряной ременной гарнитуры, этот комплекс относится к привилегированным мужским или вождеским погребениям гуннского времени группы IIa по Ф. Бирбрауэру [14, с. 163, 178].

Погребение 5 совершено в узкой могильной яме 0,55x1,75 м, глубиной 0,15 м (рис. 5, *II*). Ее дно было посыпано мелом. В могиле встречены два костяка: женский и детский. При детском костяке находок не было.

Скелет взрослой женщины положен вытянуто на спине, головой на юг. Ее ноги перекрещены в голенях, руки сведены вместе и лежали справа от туловища, голова чуть склонилась вправо. Детский костяк находился справа от женского, но залегал несколько выше. Он лежал на спине, головой на юг. Правая рука слегка согнута в локте и отведена в сторону. Судя по положению костяков, здесь было совершено парное захоронение женщины с ребенком.

Справа от черепа женщины найден лепной горшок (рис. 5, *15*). За ее черепом встречено днище второго лепного сосуда. Слева от черепа лежала бронзовая серьга в один оборот с утончающимися концами (рис. 5, *17*). На правой руке находился бронзовый браслет (рис. 5, *16*). На поясе, слева от позвоночника, найден обломок железного ножа (рис. 5, *18*). Горшок с шаровидным туловом близок одному из самых распространенных типов посуды, появившейся в позднесарматское время [15, с. 28, рис. 8, *4*]. Горшки этого типа встречаются в нижнедонских катакомбах IV в. [16, с. 289, рис. 6, *11*], а также в подбойных погребениях IV–V вв. на Среднем Дону [17, рис. 6, *9*].

Бронзовый браслет с уплощенными концами в виде стилизованных змеиных головок, украшенных крестами и насечками, обнаруживает аналогии в позднеантичных погребениях Танаиса [18, с. 11, табл. XXXIV: 11; 19, с. 70–71, табл. VXXIII). Их находки известны на памятниках гуннского времени, в том числе, на Верхнем Дону [20, с. 205–206].

Широкую дату имеет бронзовая серьга в виде колечка, утолщающегося в средней части, и несомкнутыми, близко сведенными концами. Укажем, что точно такое же сочетание сережек этого типа с браслетом, украшенным стилизованными змеиными головками, встречено в погребении 253 позднеантичного некрополя Танаиса [19, с. 69–71, табл. XXXI: 6; XXX: 8].

Планиграфический анализ показал, что погребение 2 выявлено в 2 м к северо-западу от ямы 33, погребение 3 находилось в 2 м к северо-востоку от постройки 21, погребение 4 было расположено в 2 м к юго-западу от постройки 21, а погребение 5 находилось в 6 м к юго-западу от погребения 4. Однако говорить о какой-либо связи погребальных комплексов с бытовыми объектами затруднительно. Замечено лишь то, что большинство погребений с ингумациями гуннского времени открыты там, где не было плотной застройки полуземлянками боршевской культуры, которые уничтожили большую часть более ранних объектов на площади городища.

Сравнительный анализ материалов поселения и грунтового могильника гуннского времени на площади Животинного городища позволяет уточнить ранее сделанные выводы. Судя по присутствию в керамическом комплексе поселения черняховской керамики и граненых пряслиц, слой интересующего нас времени начал отлагаться на городище в первой половине V в., скорее всего, ближе к его началу. Грунтовые захоронения, в частности, погребение 4, появляются здесь несколько позднее, не ранее середины V в. Они существенно отличаются от более ранних среднедонских погребений позднесарматского горизонта конца IV – начала V в. [17].

Скорее всего, грунтовый могильник с ингумациями на Животинном городище возник позднее. Он оставлен какой-то группой пришлого с юга населения, подчинившего оседлых земледельцев центральных и северных районов донской лесостепи с культурой Чертовицкое–Замятино. Но это были не кочевники-гунны, а, судя по инвентарю, представители некой варварской аристократии [21, с. 235].

## Библиографические ссылки

1. *Винников А. З.* Юго-восточная окраина славянского мира в VIII – нач. XIII вв. (Животинное городище на р. Воронеж). Воронеж: Кварта, 2014. 396 с.

2. *Медведев А. П., Винников А. З.* Грунтовый могильник на Животинном городище // Проблемы археологического изучения Доно-Волжской лесостепи. Воронеж, 1989. С. 148–156.

3. *Медведев А. П.* Сарматы и лесостепь (по материалам Подонья). Воронеж: Изд-во Воронежского университета, 1990. 217 с.

4. Острая Лука Дона в древности. Археологический комплекс памятников гуннского времени у с. Ксизово (конец IV–V в. ) / Сост. А. М. Обломский. Москва: ИА РАН. 2015. 660 с. (Раннеславянский мир. Вып. 16. ).

5. *Зиньковская И. В.* Поселение и могильник раннегуннского времени на Животинном городище // Древности эпохи Средневековья Евразийской лесостепи. Воронеж, 2008. С. 32–51.

6. *Обломский А. М.* Ранние славяне в лесостепном Подонье в III–VII вв. // Очерки археологии лесостепного Подонья в эпоху голоцена. Воронеж, 2021. С. 461–648.

7. Славяне и их соседи в конце I тыс. до н. э. – I первой половине тыс. н. э. / Отв. ред. И. П. Русанова, Э. А. Сымонович. Москва: Наука, 1993. 328 с.

8. *Магомедов Б. В.* Черняховская культура. Проблема этноса. Lublin: Wydaw. Uniw. M. Curie-Skłodowskiej, 2001. 290 с.

9. *Шелов Д. Б.* Танаис и Нижний Дон в первые века нашей эры. Москва: Наука, 1972. 352 с.

10. *Медведев А. П.* О греко-сарматах в позднеантичной Фанагории // НАВ. 2009. Вып. 10. С. 237–250.

11. *Смирнов К. Ф.* Сарматские погребения Южного Приуралья // КСИИМК. 1948. № 22. С. 80–86.

12. *Сокольский Н. И.* Боспорские мечи // МИА. 1954. №33. С. 123–196.

13. *Ахмедов И. Р., Казанский М. М.* После Аттилы. Киевский клад и его культурно-исторический контекст // Культурные трансформации и взаимовлияния в Днепровском регионе на исходе римского времени и в раннем Средневековье. Санкт-Петербург, 2004. С. 168–202.

14. *Казанский М. М., Мастыкова А. В.* Престижное оружие, конское снаряжение и воинский убор эпохи Великого переселения народов на Боспоре Киммерийском // МАИЭТ. 2023. Вып. 28. С. 161–217.

15. *Скрипкин А. С.* Нижнее Поволжье в первые века нашей эры. Саратов: Изд-во Саратов. ун-та, 1984. 150 с.

16. *Безуглов С. И.* Курганные катакомбные погребения позднеримской эпохи в нижнедонских степях // Проблемы современной археологии. Москва: Таус, 2008. С. 284–301.

17. *Медведев А. П., Березуцкий В. Д.* О новой группе погребений постсарматского времени на Среднем Дону // Вестник Волгоградского государственного университета. Сер. 4. История. Регионоведение. Международные отношения. 2018. Т. 23, № 3. С. 138–152.

18. *Шелов Д. Б.* Некрополь Танаиса. Москва: Изд-во АН СССР, 1961. 95 с. (МИА. № 98).

19. *Арсеньева Т. М.* Некрополь Танаиса. Москва: Наука, 1977. 152 с.

20. *Мастыкова А. В., Земцов Г. Л.* «Княжеское» женское погребение на поселении Мухино гуннского времени на Верхнем Дону // КСИА. 2014. Вып. 234. С. 200–224.

21. *Казанский М. М., Мастыкова А. В.* Акациры: северная окраина кочевой степи после Аттилы // КСИА. 2022. Вып. 267. С. 221–241.

# АРХЕАЗААЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ З ГАРАДЗІШЧА ЦЯСТЫ ВЕРХНЯДЗВІНСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**А. В. Зыль**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,
220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, zyl@bsu.by*

У артыкуле апублікаваныя даныя аб фауністычных рэштках, выяўленых падчас раскопак гарадзішча Цясты (Марыліна Гара) Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў 1981 г. і 2019 г. Большая частка астэалагічнага матэрыялу моцна фрагментаваная. На шматлікіх фрагментах характэрныя для кухонных рэштак сляды рэжучых прылад, тэрмічнага ўздзеяння, пагрызы сабак. У насельніцтва гарадзішча Цясты пераважала жывёлагадоўля. Больш за ўсё было выяўлена фрагментаў касцей буйной рагатай жывёлы і свінні хатняй. Рэштак дробнай рагатай жывёлы і каня, наадварот, нетыпова мала, у параўнанні з іншымі помнікамі поўначы Беларусі і сумежных тэрыторый. Палявалі жыхары гарадзішча пераважна на буйных капытных жывёл – лася і аленя, але таксама займаліся здабычай дзіка, казулі, бабра, куніцы і мядзведзя, што суадносіцца з паляваннем на іншых помніках лясной зоны. Для вывучэння астэалагічнага матэрыялу выкарыстоўваліся метады астэалогіі, а для вызначэння відавой прыналежнасці фауністычных рэштак выкарыстоўваўся параўнальны метад, эталонныя калекцыі і атласы-вызначальнікі.

***Ключавыя словы:*** археазаалогія; паляванне; жывёлагадоўля; фауністычныя рэшткі; косткі жывёл; днепра-дзвінская культура; гарадзішча; Паўночная Беларусь; вызначэнне астэалагічнага матэрыялу.

# АРХЕОЗООЛОГИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ МАТЕРИАЛОВ ГОРОДИЩА ТЯСТЫ ВЕРХНЕДВИНСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

**А. В. Зыль**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,
220030, г. Минск, Республика Беларусь, zyl@bsu.by*

В статье опубликованы данные о фаунистических остатках, обнаруженных во время раскопок городища Тясты (Марылина Гора) Верхнедвинского района Витебской области в 1981 г. и 2019 г. Большая часть остеологического материала сильно фрагментирована. На многих фрагментах характерные для кухонных остатков следы режущих инструментов, термического воздействия, погрызы собак. У населения городища Тясты преобладало животноводство. Больше всего было обнаружено фрагментов костей крупного рогатого скота и свиньи домашней. Остатков мелкого рогатого скота и лошади, напротив, нетипично мало, в сравнении с другими памятниками севера Беларуси и смежных территорий. Охотиться жители городища предпочитали на крупных копытных животных – лося и оленя, но также занимались добычей кабана, косули, бобра, куницы и медведя, что соотносится с

охотой на других памятниках лесной зоны. Для изучения остеологического материала использовались методы остеологии, а для определения видовой принадлежности фаунистических остатков использовался сравнительный метод, эталонные коллекции и атласы-определители.

***Ключевые слова:*** археозоология; охота; животноводство; фаунистические остатки; кости животных; днепро-двинская культура, городища; Северная Беларусь; определение остеологического материала.

## ARCHAEOZOOLOGICAL STUDIES ON THE TIASTY HILLFORT MATERIALS IN THE VERKHNEDVINSKY DISTRICT OF THE VITEBSK REGION

**A. V. Zyl**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, zyl@bsu.by*

The article presents data on the faunal remains discovered during the Tyasty (Marylina Gora) hillfort in the Verkhnedvinsky district of the Vitebsk region excavation in 1981 and 2019. Most of the osteological material is heavily fragmented. Many fragments contain traces of cutting tools, thermal effects, and dog bites, typical for kitchen remains. Livestock farming was predominant among the population of the Tyasty settlement. The largest number of bone fragments was found among cattle and domestic pigs. On the contrary, the remains of small cattle and horses are unusually few, compared to other sites in the north of Belarus and adjacent territories. The inhabitants of the settlement preferred to hunt large ungulates – elk and deer, but they also hunted wild boar, roe deer, beaver, marten and bear, which is consistent with hunting at other sites in the forest zone. Osteological methods were used to study the osteological material, and a comparative method, reference collections, and identification atlases were used to determine the species affiliation of the faunal remains.

***Keywords:*** archaeozoology; hunting; animal husbandry; faunal remains; animal bones; Dnieper-Dvina culture, hillforts; Northern Belarus; determination of osteological material.

Для рэканструкцыі гаспадарчага ўкладу насельніцтва Паўночнай Беларусі ў жалезным веку вялікае значэнне мае вызначэнне і аналіз астэалагічных калекцый з монакультурных помнікаў. Менавіта да такіх аб’ектаў адносіцца гарадзішча Цясты Верхнядзвінскага раёна. На ім пражывала насельніцтва лакальнага варыянта днепра-дзвінскай культуры. Датуюцца дадзеныя матэрыялы ў межах першай паловы I тыс. н. э.

**Раскопкі 1981 г.** Гарадзішча Цясты (Марыліна Гара) Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці размешчана за 0,5 км на ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Дрыса. У 1981–1982 гг. на помніку праводзіў раскопкі В. І. Шадыра, які даследаваў плошчу ў 160 м² [1; 2]. Магутнасць культурнага пласта склала ад 0,6 да 2 м. Большасць атрыманых матэрыялаў даследчык суаднёс з познім

перыядам днепра-дзвінскай культуры – I–IV стст. н. э. Помнік з'яўляецца аднакультурным, на ім прадстаўлены характэрныя для днепра-дзвінскай культуры прадметы побыту, а таксама астэалагічны матэрыял [1; 3, с. 39–40].

Падчас раскопак было выяўлена і вызначана 100 касцяных фрагментаў [1]. Вызначэннем фаўністычных рэшткаў займалася кандыдат біялагічных навук Н. П. Александровіч[1] [4, с. 241]. Хатнія жывёлы склалі 70 %, дзікія – 30 % ад агульнай колькасці вызначаных рэшткаў [4, с. 245, табл. 1]. Згодна вопісу астэалагічнага матэрыялу пераважалі фрагменты костак быка хатняга – 39,8 %. Пераважна выяўлены зубы, а таксама фрагменты трубчастых костак і рэбраў. На некаторых костках даследчык адзначыла наяўнасць пагрызаў сабак.

На другім месцы па колькасці фаўністычных рэштак знаходзіцца свіння хатняя – 22,6 %. Сярод касцяных рэшткаў свінні зубы і фрагменты сківіцы, сустракаюцца фрагменты прамянёвых костак, рэбраў, цэлыя фалангі і пясная косць. Значна меншы адсотак астэалагічнага матэрыялу сярод астэалагічнай калекцыі 1981 г. адносіцца да рэшткаў дробнай рагатай жывёлы – 7,6 %. Гэта таксама пераважна былі сківіцы і зубы, фрагменты трубчастых костак. Асобна вылучана фаланга авечкі са слядамі рэжучых інструментаў. Каню належыў толькі фрагмент карэннага зубу, што складае 1,1 % ад агульнай колькасці вызначаных рэшткаў [1].

Сярод дзікіх жывёл лідарам па колькасці выяўленых і вызначаных фаўністычных рэшткаў з'яўляўся алень звычайны – 12 %, былі вызначаны разцы, прэмаляры, маляры, фрагмент ніжняй сківіцы з пагрызамі сабак і фрагмент пяснай косткі. Фаўністычныя рэшткі бабра звычайнага склалі 10,5 %, гэты былі фрагменты сцегнавых костак, зубы, фрагменты верхняй сківіцы з малярам і фрагмент плечавой косткі [1]. Тры зубы, якія належаць казулі, склалі 3,2 %. Па 1,1 % ад агульнай колькасці вызначаных астаткаў склалі рэшткі лася (вызначаны адзін прэмаляр з ніжняй сківіцы) і барсука (фрагмент правай ніжняй сківіцы) [1].

Н. П. Александровіч правяла крапатлівую працу па вызначэнню фаўністычных рэшткаў. Асабліва дакладна вызначаны зубы жывёл – адзначаны іх тыпы і нумарацыя згодна зубной формуле відаў. Была ўсталявана анатомія кожнага фрагмента, які было магчыма вызначыць. Даследчык адзначыла агульны стан костак як сярэдняй ступені пашкоджання. Выяўленыя косткі мелі брудна-жоўты колер светлага адцення, што характэрна для рэштак, знойдзеных ў рачной даліне. Фаўністычныя рэшткі лёгкія, рыхлыя, пры ўздзеянні рэжучых інструментаў дававалі стружку і дробку з пахам калагену. Н. П. Александровіч аднесла выяўлены астэалагічны матэрыял да катэгорыі «кухоных рэшткаў» [1, с. 8].

---

[1] Шчыра дзякую аўтару даследаванняў В. І. Шадыра і Н. П. Александровіч за магчымасць выкарыстання вынікаў аналізу.

**Раскопкі 2019 г.** У 2019 г. экспедыцыяй гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам П. С. Курловіч праводзіліся новыя археалагічныя раскопкі гарадзішча Цясты. Была вывучана плошча 80 м$^2$. Раскоп меў памер 8x10 м і быў разбіты на 20 квадратаў памерам 2x2 м, магутнасць культурнага пласта склала ад 50 да 120 см (рыс. 1). Падчас правядзення раскопак было выяўлена 12298 прадметаў, з іх 118 – індывідуальныя знаходкі. Комплекс матэрыялаў з гарадзішча датуецца ў межах першай паловы I тыс. н. э. Сярод знаходак бытавыя прадметы, дэталі строю і прылады працы, косткі [5, с. 40–43][1].




*Рыс. 1.* Гарадзішча Цясты. План пасялення з пазначэннем раскопаў 1981, 1982, 2019 гг.:

планы 1981, 1982 гг. – В. І. Шадыра [1]; 2019 г. і апрацоўка – А. В. Зыль

[1] Шчыра дзякую аўтару даследаванняў Курловіч П. С. за магчымасць працы з палявой справаздачай і прадстаўленыя астэалагічныя матэрыялы для іх далейшага вызначэння.

Фауністычныя рэшткі з раскопак помніка ў 2019 г. прадстаўлены 1320 касцянымі фрагментамі рознай ступені захаванасці. Амаль усе яны, як і матэрыял 1981 г., належаць да кухонных рэштак. Косткі моцна фрагментаваныя, маюць пагрызы і сляды ад рэжучых прадметаў, частка падвяргалася тэрмічнаму ўздзеянню. Гэта вельмі ўскладніла працу па вызначэнні і выключыла магчымасць правесці вымярэнні. З 1320 касцяных фрагментаў аўтарам артыкула было вызначана 436 (33,03 %). Вынікі былі ўключаны ў палявую справаздачу [6]. Астэалагічны матэрыял належыць некальнкім відам млекакормячых, ёсць невялікі адсотак фрагментаў костак рыб і птушак[1].

**Бык хатні** (*Bos taurus taurus*). Найбольшая колькасць фрагментаў касцей як сярод хатніх, так і сярод дзікіх жывёл пры раскопках 2019 года належыць буйной рагатай жывёле – 49,53 %. Косткі ўпэўнена можна аднесці да кухонных рэштак. Яны моцна фрагментаваныя і на большасці бачныя разрубы і сляды ад зубоў сабак. Сярод рэштак лепш за ўсё захаваліся зубы, шматлікія абломкі трубчастых костак. Зубы – пераважна прэмаляры і маляры з ніжняй сківіцы. Цікавая знаходка адной з прамянёвых костак буйной рагатай жывёлы, абпаленай з аднаго боку. Верагодна, дадзены фрагмент выкарыстоўвалі ў якасці імправізаванай прыхваткі.

Нягледзячы на тое, што жывёлагадоўля на тэрыторыі Паўночнай Беларусі насіла пераважна мясны характар [7, с. 91], буйную рагатую жывёлу ўжывалі не толькі ў ежу. Так, сярод іншых, былі выяўлены зубы каровы з характэрнай пацёртасцю, якая паказвае на тое, што жывёлу ўтрымлівалі да сталага ўзросту і выкарыстоўвалі для атрымання малака. Гэтае назіранне падмацоўваюць выяўленыя фрагменты трубчастых костак з такімі характэрнымі прыкметамі, як моцная друзласць, крохкасць, памяншэнне шчыльнасці косткі, якія сведчаць аб нізкім утрыманні кальцыя. У літаратуры раней выказвалася сцвярджэнне аб тым, што буйная рагатая жывёла акрамя мяса давала насельніцтву паўночнабеларускіх гарадзішчаў і малочныя прадукты [7, с. 91–92].

**Свіння хатняя** (*Sus scrofa domesticus*). Другімі па колькасці з’яўляюцца касцяныя рэшткі хатняй свінні – 22,25 %. Гэтая жывёла непатрабавальная, яе зручна разводзіць у лясной паласе. Сярод рэштак пераважаюць зубы і фрагменты сківіцы, але трапляюцца і фрагменты трубчастых костак (прамянёвай, плечавой і інш.).

**Дробная рагатая жывёла** (авечка (*Ovis aries*) / каза (*Capra hircus*) хатнія) – 0,92 % ад колькасці вызначаных фрагментаў. Было знойдзена толькі тры зубы і фрагмент вялікай галёначнай косткі, па якіх адрозніць дадзеныя віды не ўяўляецца магчымым. На некаторых помніках Беларускага Падзвіння ў ліку дробнай рагатай жывёлы пераважала авечка, што, верагодна, звязана са здабычай воўны [8, с. 94–96].

---

[1]Шчыра дзякую за кансультацыю Н. П. Александровіч і А. А. Чубура.

**Лось** (*Alces alces*). Сярод дзікіх жывёл большасць касцяных рэшткаў належыць ласю – 12,38 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу. Сярод вызначаных рэшткаў пясная костка, фрагменты лапаткі, ніжняй сківіцы, зубоў і вялікай галёначнай косткі, як мінімум, двух асобных жывёл.

**Дзік** (*Sus scrofa*). Наступнымі па колькасці з'яўляюцца рэшткі дзіка, якія складаюць 6,19 %. Галоўным чынам, косткі жывёл гэтага віду адрозніваюцца ад свінні хатняй памерамі. Дзікі звычайна буйней, аднак, часта ўзнікаюць праблемы з дакладным вызначэннем віду, калі трапляюцца рэшткі маладых асобін, бо па памерах яны блізкія да дарослых асобін свінні хатняй. На гарадзішчы Цясты ў 2019 г. былі знойдзены фрагменты вялікай галёначнай косткі, чэрапа, прамянёвай косткі, пясных костак, фрагменты маляраў і іклоў.

**Казуля** (*Capreolus capreolus*). Касцяныя рэшткі іншых відаў дзікіх жывёл нешматлікія. Так, казулі еўрапейскай належыць 0,46 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу. Фаўністычныя рэшткі казулі прадстаўлены цэлай першай фалангай і зубам з верхняй сківіцы. Верагодна, казуля была не самай папулярнай жывёлай для палявання, прычым падобная тэндэнцыя захавалася і ў сярэднявеччы [9, с. 86–90].

**Бабёр звычайны** (*Castor fiber*). Быў знойдзены ўсяго адзін фрагмент тазавай косткі бабра, які склаў 0,23 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу. На бабра паляванне вялося як на пушнога звера, магчыма, для здабычы бабровага струменя, але яго таксама маглі ўжываць у ежу.

**Куніца** (лясная *Martes martes*/ каменная *Martes foina*). На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца два віды куніц. На помніку ў 2019 г. было знойдзена 2 (0,46 %) фрагменты ніжняй сківіцы, захаванасць якіх не дазволіла дакладна ўстанавіць, да якога канкрэтнага віду куніцы яны належаць. Адназначна сказаць, з'яўляюцца дадзеныя рэшткі куніцы вынікам паляўнічай здабычы ці не, цяжка. Каменныя куніцы могуць сяліцца каля чалавечых паселішчаў.

**Мядзведзь** (*Ursus arctos*). З'яўляецца самым буйным з драпежнікаў Беларусі. Быў знойдзены буйны фрагмент ніжняй сківіцы маладога мядзведзя з малярамі і прэмалярам. Спераду сківіца мае разлом, характэрны для вымання коснага мозгу (рыс. 2). Таксама можна вылучыць фалангу мядзведзяня з невялікай круглай незавершанай адтулінай (рыс. 3). Верагодна, з яе планавалася зрабіць упрыгожванне або кудмень, але костка апынулася крохкай і дала расколіну [10, с. 33]. Касцяныя рэшткі мядзведзя складаюць 0,46 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу.

Палявалі на мядзведзя ў першую чаргу дзеля шкуры, аднак маглі ўжываць у ежу мяса гэтай жывёлы. У Прудніках былі выяўлены раздробленыя косткі, якія належаць гэтаму зверу [4, с. 244].

Размяшчэнне гарадзішча паблізу ракі, а таксама знаходкі рыбалоўных кручкоў дазваляюць выказаць думку, што істотную ролю ў гаспадарцы яго жыхароў займала рыбалоўства. Сярод фаўністычных рэшткаў трапляюц-




*Рыс. 2.* Цясты 2019. Сківіца мядзведзя з характэрнымі для кухонных рэшткаў пашкоджаннямі.

Фота і апрацоўка А. В. Зыль



*Рыс. 3.* Цясты 2019. Фалангі мядзведзяня. Адна з невялікай круглай, незавершанай адтулінай.

Фота А. В. Зыль

ца косткі рыб, але яны адрозніваюцца дрэннай захаванасцю і склалі ўсяго 8 фрагментаў (1,84 % ад агульнай колькасці вызначаных). Дрэнная захаванасць рыбных костак характэрна і для іншых помнікаў рэгіёна [7, с. 96–97]. Акрамя таго, рэшткі рыб крохкія і дробныя. Каб мінімізаваць страту дробных костак, фрагментаў і лускі, варта выкарыстоўваць дробнае сіта і прамываць зямлю.

Сярод птушыных костак вылучаецца моцна згладжаны абломак трубчастай косткі гуся з вострым абламаным канцом. Дробныя фрагменты птушыных костак (гусь, качка), склалі 5,28 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу (23 фрагменты).

Такім чынам, у астэалагічным матэрыяле раскопак 2019 г. пераважаюць косці хатніх жывёл, у асноўным буйной рагатай жывёлы і свінні. Былі ўсталяваныя наступныя суадносіны: 72,71 % хатніх, 27,29 % дзікіх жывёл ад агульнай колькасці вызначальных рэшткаў (табл. 1, 2) [11, с. 73–74]. Моцная фрагментаванасць касцяных рэшткаў, сляды ад зубоў сабак і рэжучых інструментаў сведчаць аб тым, што жыхары гарадзішча актыўна ўжывалі ў ежу мяса хатніх жывёл, асабліва прадстаўнікоў буйной рагатай жывёлы. На костках дзікіх жывёл падобныя сляды штучных пашкоджанняў сустракаюцца радзей, аднак іх таксама ўжывалі ў ежу, хоць у меншай ступені. На карысць таго, што мяса жывёл падвяргалася тэрмічнай апрацоўцы, сведчыць і тое, што сярод рэшткаў трапляюцца кальцыніраваныя фрагменты костак бела-шэрага, бела-жоўтага колеру, а таксама часткова абпаленыя і абвугленыя рэшткі, працэнт якіх склаў 9,47 % (125 фрагментаў). Буйную рагатую жывёлу выкарыстоўвалі не толькі для атрымання мяса, але і малака.

Другі па папулярнасці від мясной жывёлы, які быў распаўсюджаны на дадзеным гарадзішчы – гэта свіння хатняя. Працэнт рэшткаў свінні хатняй у Цястах (22,6 % у калекцыі 1981 г. і 22,25 % у калекцыі 2019 г.) таксама вышэйшы, чым на іншых помніках поўначы Беларусі, дзе ў сярэднім працэнтныя суадносіны гэтага віду складаюць 7,2 % – 11,8 % [7, с. 91–92, табл. 6, 7]. Бліжэйшымі па працэнтных суадносінах свінні хатняй з’яўляюцца гарадзішчы Сярэдняй Беларусі, напрыклад, на Лабеншчыне рэшткі гэтай жывёлы складаюць 21,4 %. [12, с. 99–101].

Што да дробнай рагатай жывёлы і каня, то мяркуючы па малалікім касцяным рэшткам, у насельніцтва гарадзішча Цясты гэтыя віды не карысталіся асаблівай папулярнасцю ў жывёлагадоўлі. У Цястах выяўлена вельмі мала касцяных рэшткаў, якія належаць дробнай рагатай жывёле. Пры раскопках 1981 г. – 7,6 %, а ў 2019 г. – 1,47 % ад агульнай колькасці вызначанага матэрыялу. Практычна адсутнічаюць астэалагічныя рэшткі каня, што таксама не характэрна для іншых помнікаў Паўночнай Беларусі, Смаленшчыны і помнікаў культуры позняй штрыхаванай керамікі, дзе адсотак костак каня быў ад 10 % і вышэй [7, с. 91–92, табл. 6, 7; 12, с. 99–101].

*Табліца 1*

**Суадносіны хатніх жывёл на гарадзішчы Цясты (2019 г. ) [11, с. 73]**

| Найменне відаў | Косткі | | |
|---|---|---|---|
| | Колькасць | % ад колькасці костак хатніх жывёл | % ад агульнай колькасці вызначаных фрагментаў костак |
| Бык хатні | 216 | 68,14 | 49,53 |
| Свіння хатняя | 97 | 30,60 | 22,25 |
| Дробная рагатая жывёла(авечка / каза хатняя) | 4 | 1,26 | 0,92 |

*Табліца 2*

**Суадносіны дзікіх жывёл на гарадзішчы Цясты (2019 г. ) [11, с. 74]**

| Найменне відаў | Косткі | | |
|---|---|---|---|
| | Колькасць | % ад колькасці костак дзікіх жывёл | % ад агульнай колькасці вызначаных фрагментаў костак |
| Лось | 54 | 45,38 | 12,38 |
| Дзік | 27 | 22,69 | 6,19 |
| Казуля | 2 | 1,68 | 0,46 |
| Бабёр | 1 | 0,84 | 0,23 |
| Куніца | 2 | 1,68 | 0,46 |
| Мядзведзь | 2 | 1,68 | 0,46 |
| Гусь /качка | 23 | 19,33 | 5,28 |
| Рыбы | 8 | 6,72 | 1,84 |

На помніках поўначы Беларусі сярэдні паказчык складае 66 % хатніх жывёл і 34 % дзікіх жывёл адпаведна. Сярэдні паказчык гарадзішча Цясты, па даных даследаванняў 1981 г. і 2019 г., – 71,9 % хатнія жывёлы і 28,1 % дзікія. Сярод помнікаў Беларускага Падзвіння найбольш блізкія паказчыкі працэнтных суадносін хатніх і дзікіх жывёл прасочваюцца на гарадзішчы Кублічы (Ушацкі раён Віцебскай вобласці), дзе хатнія жывёлы складаюць 71,4 %, дзікія – 28,6 % адпаведна [7, с. 91–92, табл. 6, 7].

Відавы склад дзікіх жывёл, на якіх палявала насельніцтва гарадзішча Цясты, падобны з традыцыйным пералікам жывёл, папулярных у паляўнічай здабычы насельніцтва большасці помнікаў лясной зоны. Жыхары гарадзішча палявалі на дзіка, бабра і аленя. Найбольш прыярытэтнай здабычай з'яўляўся лось, які даваў вялікую колькасць мяса, шкуру і рогі, якім знаходзілі шырокае прымяненне [13, с. 106–108; 4, с. 244].

Для вызначэння астэалагічнага матэрыялу аўтарам артыкула першапачаткова былі выкарыстаны метады астэалогіі. Стан захаванасці часткі астэалагічнага матэрыялу дазволіў вызначыць элелементы шкілета, відавую прыналежнасць, пол, узрост жывёлы, паталогіі на костках у выніку эксплуатацыі жывёлы. Для відавой ідэнтыфікацыіі выкарыстоўваўся параўнальны метад і эталонныя калекцыі, таксанамічныя атласы і вызначальнікі [14; 15; 16; 17].

Пасля вызначэння прыналежнасці фауністычных рэштак адзначаўся характар пашкоджання астэалагічнага матэрыялу і сляды ўздзеяння. Археалагічныя і біялагічныя адзнакі, а таксама параметры костак могуць аднесці іх у розныя катэгорыі археазаалагічных знаходак: кухонныя рэшткі, сыравіна для кастарэзнага рамяства, рытуальны комплекс, косткі з комплексу аднаімгненных падзей і інш. Звычайна менавіта кухонныя рэшткі і косткі з вытворчых комплексаў з'яўляюцца найбольш часта сустракаемымі і шматлікімі [17]. Пераважная колькасць астэалагічнага матэрыяла з гарадзішча Цясты належыць менавіта да кухонных рэшткаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Шадыро В. И.* Отчет о разведках и раскопках в Верхнедвинском и Полоцком районах Витебской области в 1981 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Арх. № 816.
2. *Шадыро В. И.* Отчет о разведках и раскопках в Верхнедвинском районе Витебской области и разведке в Сморгонском районе Гроденской области в 1982 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Арх. № 796.
3. *Шадыра В. І.* Раскопкі Марылінай гары // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1985. № 3. С. 39–40.
4. *Шадыра В. І.* Жывёлагадоўля і паляванне ў жыцці насельніцтва Беларускага Падзвіння ў 2-ой пал. I тыс. н. э. // ГАЗ. 1997. № 12. С. 241–246.
5. *Курловіч П. С.* Папарэднія вынікі археалагічных даследаванняў на гарадзішчы Цясты (Марыліна Гара) у 2019 годзе // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. арт. V міжнар. навук. канферэнцыі (Полацк, 15–16 крас. 2021 г. ). Наваполацк, 2021. С. 39–43.
6. *Курловіч П. С.* Справаздача аб правядзенні археалагічных раскопак гарадзішча каля вёскі Цясты Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці і археалагічных разведак у Верхнядзвінскім і Міёрскім раёнах Віцебскай вобласці і Вілейскім раёне Мінскай вобласці ў 2019 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Арх. № 3751.
7. *Шадыро В. И.* Ранний железный век северной Белоруссии. Минск: Наука и техника, 1985. 126 с.
8. *Шадыра В. І.* Беларускае Падзвінне (I тысячагоддзе н. э. ). Мінск: ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2006. 150 с.
9. *Александрович Н. П.* Археозоологический анализ охотничьей териофауны средневековой Беларуси. Saarbrücken: LAP LAMBERT Academic Publishing, 2014. 232 с.

10. *Зыль А. В*. Итоги археозоологического изучения материалов с раскопок 2019 г. на городище Тясты Верхнедвинского района Витебской области // Актуальная археология 5. Материалы Международной научной конференции молодых учёных. Санкт-Петербург, 2020. С. 31–34.

11. *Зыль А. В.* О фауне городища Тясты Верхнедвинского района Витебской области по итогам раскопок 1981 и 2019 гг. // АЕС. 2023. № 1. С. 70–77.

12. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованой керамики. Минск: БГУ, 2006. 207 с.

13. *Краснов Ю. А.* Раннее земледелие и животноводство в лесной полосе Восточной Европы. Москва: Наука, 1971. 166 с. (МИА. № 174).

14. *Barone R.* Anatomie comparée des mammifères domestiques. Tome I, Osteologie atlas. Paris: Vigot editions, 1976. 428 p.

15. *Громова В.* Определитель млекопитающих СССР по костям скелета. Выпуск 2. Определитель по крупным костям заплюсны. Москва:, 1960. 118 с. (Труды комиссии по изучению четвертичного периода. Т. 16).

16. *Громова В.* Определитель млекопитающих СССР по костям скелета. Выпуск 1. Определитель по крупным трубчатым костям. Ч. А. Москва–Ленинград: Акад. наук СССР, 1950. 241 с. (Труды комиссии по изучению четвертичного периода. Т. 9).

17. *Антипина Е. Е.* Современная археозоология: задачи и методы исследования // Междисциплинарная интеграция в археологии (по материалам лекций для аспирантов и молодых сотрудников). Москва, 2016. С. 96–117.

# «СКАРБ ЮВЕЛІРА» V–VII стст. З ВЯРХОЎЯЎ р. АРЭСА (ПРЫПЯЦКАЕ ЛЕВАБЯРЭЖЖА)

**А. Ф. Касюк[1)], К. Ф. Ермаліцкая[2)]**

*[1)] Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей», вул. Замкавая, 20, 230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь, kasiuk2585@gmail.com*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, ermalitskaia@bsu.by*

Прадстаўлены вынікі ўсебаковага аналізу рэчавага комплексу – «скарбу ювеліра» эпохі ранняга сярэднявечча, знойдзенага каля в. Госціна Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Прыведзена яго датаванне і зроблена спроба вызначэння культурнай прыналежнасці. З выкарыстаннем метада лазернай атамна-эмісійнай спектраскапіі вызначаны элементны склад рэчаў. «Скарб ювеліра» з Госціна разгледжаны ў кантэксце гісторыка-культурнай сітуацыі ў канцы трэцяй чвэрці I тыс. н. э. на тэрыторыі Падняпроўя і Падзвіння, прыведзены гіпотэзы даследчыкаў наконт інтэрпрэтацыі падобных рэчавых комплексаў.

***Ключавыя словы:*** бранзалет; злітак каляровых металаў; ювелірная справа; ранняе сярэднявечча; лазерная атамна-эмісійная спектраскапія; элементны аналіз.

# «КЛАД ЮВЕЛИРА» V–VII вв. С ВЕРХОВЬЕВ р. ОРЕСА (ПРИПЯТСКОЕ ЛЕВОБЕРЕЖЬЕ)

**Е. Ф. Касюк[1)], К. Ф. Ермалицкая[2)]**

*[1)] Учреждение культуры «Гродненский историко-археологический музей», ул. Замковая, 20, 230023, г. Гродна, Республика Беларусь, kasiuk2585@gmail.com*
*[2)] Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, ermalitskaia@bsu.by*

Представлены результаты всестороннего анализа вещевого комплекса – «клада ювелира» раннего средневековья, найденного возле д. Гостино Стародорожского района Минской области. Приведена его датировка, сделана попытка определения культурной принадлежности. С использованием метода лазерной атомно-эмиссионной спектроскопии определён элементный состав предметов. «Клад ювелира» из Гостино рассмотрен в контексте историко-культурной ситуации в конце третьей четверти I тыс. н. э. на территории Поднепровья и Подвинья, приведены гипотезы исследователей насчёт интерпретации подобных вещевых комплексов.

***Ключевые слова:*** браслет; слиток цветных металлов; ювелирное дело; раннее средневековье; лазерная атомно-эмиссионная спектроскопия; элементый анализ.

**«THE JEWELER'S TREASURE» OF THE 5-7th CENTURIES FROM THE UPPER REACHES OF THE ARES RIVER (PRIPYAT LEFT BANK)**

**A. Kasiuk[1], K. Ermalitskaia[2]**

*[1] Hrodna State Historical and Archaeological Museum, Zamkavaya, 20, 230023, Hrodna, Republic of Belarus, kasiuk2585@gmail.com*
*[2] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, ermalitskaia@bsu.by*

The results of a comprehensive analysis of the artifact complex – «The Jeweler's Treasure» from the early Middle Ages, found near the village Gostino, Starodorozhsky district, Minsk region, are presented. Its dating was given and an attempt to determine its cultural affiliation was made. Using the method of laser atomic emission spectroscopy, the elemental composition of things was determined. The «Jeweler's Treasure» from Gostino is considered in the context of the historical and cultural situation at the end of the third quarter of the 1st millennium AD on the territory of the Dnieper and Dvina regions, hypotheses of researchers about the interpretation of such artifact complexes are presented.

***Keywords:*** bracelet; non-ferrous metal ingot; jewelry making; early Middle Ages; laser atomic-emission spectroscopy; elemental analysis.

**Уводзіны.** У 2020 г. недалёка ад в. Госціна Пасекскага с/с Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, у вярхоўях р. Арэса, каля безназоўнай рэчкі, у лесе былі выпадкова знойдзены металічныя рэчы: упрыгажэнні, дэталь касцюму, а таксама зліткі каляровых металаў (рыс. 1). Па словах знаходчыка, У. У. Бойка, прадметы размяшчаліся разам у ямцы глыбінёй да 0,3 м. Артэфакты былі перададзены ім ва ўстанову культуры «Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей» (г. Старыя Дарогі, вул. Пралетарская, 31), дзе яны і захоўваюцца на дадзены момант. Візуальны агляд паверхні месцазнаходжання, праведзены А. Ф. Касюк, іншых знаходак не даў. Мэтай артыкула з'яўляецца ўвядзенне выяўленых артэфактаў у навуковы зварот.

**Асноўная частка.** Атрыманая калекцыя налічвае восем прадметаў з каляровых металаў:

1) рамка спражкі (рыс. 2, *1*; 3, *2*). Язычок страчаны. Форма рамкі акруглая, памеры – 3,35x3,5 см, пярэдняя частка патоўшчаная. Сячэнне акруглае, яго найбольшы дыяметр – 0,6–0,65 см. Каля аднаго з краёў рамкі маецца арнамент з чатырох насечак. Вага прадмета складае 11,7 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3491;

2) бранзалет (рыс. 2, *3*; 3, *1*). Форма акруглая, канцы патоўшчаныя, памеры – 5,3x6,2 см. У цэнтры акруглы ў папярочным сячэнні, дыяметр 0,6 см; на канцах авальны, дыяметр – 1,55x1,85 см. Канцы на знешняй паверхні ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам, выкананым у тэхніцы глыбокай гравіроўкі. Насечка мае выгляд касых ліній ці «ялінкі», абмежаваных кальцавымі бароздкамі. Вага бранзалета – 65,8 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3492;



• - помнікі пражскай культуры • - помнікі калочынскай культуры ○ - іншыя помнікі з матэрыяламі V-VII стст.
1 - Госціна; 2 - Банцараўшчына; 3 - Калочын; 4 - Магілёў-Змяёўка; 5 - Нікадзімава; 6 - Клішына; 7 - Лукомль

*Рыс. 1.* Карта распаўсюджвання археалагічных культур трэцяй чвэрці I тыс. н. э. на поўдні і ўсходзе сучаснай Беларусі з пазначэннем некаторых апорных помнікаў і тых, якія ўзгадваюцца ў артыкуле

3) бранзалет (рыс. 2, *4*; 3, *4*). Падзелены на дзве часткі. Па форме і арнаментацыі ён аналагічны папярэдняму ўзгаданаму вырабу. Па краях бранзалета і на ўнутранай паверхні бачныя сляды рэзання (саскоблівання металу). Вага першага фрагмента складае 40,3 г, другога – 30,2 г. Уліковыя нумары адпаведна – СГЭМ КП 3493, КП 3494;

4) фрагмент вырабу (рыс. 2, *2*; 3, *3*). Мае выцягнутую конусападобную форму, даўжыня – 3,3 см. Сячэнне акруглае, дыяметр у сярэдняй частцы – 0,55 см. Вага фрагмента складае 5,5 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3490;

5) злітак (рыс. 4, *1*; 5, *1*). Мае форму палачкі, патоўшчанай на адным канцы і сплошчанай, завостранай – на другім. У патоўшчанай частцы сячэнне трапецападобнае. Памеры злітка – 10,2x1,9x1,6 см (тут і далей: даўжыня x шырыня x вышыня). Вага прадмета складае 127,5 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3487;




*Рыс. 2.* Рэчавы комплекс Госціна:

*1* – рамка спражкі; *2* – фрагмент вырабу; *3–4* – бранзалеты

6) злітак (рыс. 4, *2*; 5, *2*). Мае форму прамавугольнага бруска. Яго памеры складаюць 10,4х3,1х1 см. Злітак выгнуты ў профіль па даўжыні, краі крыху скругленыя. Папярочнае сячэнне прамавугольнае. На ніжняй і верхняй паверхнях вырабу па даўжыні, каля краёў, нанесены прадольныя барозны. Вага злітка – 244,4 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3486;

7) злітак (рыс. 4, *3*; 5, *3*). Мае форму прамавугольнага бруска. Памеры складаюць 9,3х3,3х0,95 см. Злітак дваякавыгнуты ў профіль па даўжыні, яго краі крыху скругленыя. Папярочнае сячэнне прамавугольнае. На ніжняй і верхняй паверхнях вырабу па даўжыні, каля краёў, нанесены прадольныя барозны. Вага злітка складае 195,1 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3488;

8) злітак (рыс. 4, *4*; 5, *4*). Мае форму прамавугольнага бруска. Папярочнае сячэнне трапецападобнае. Яго памеры складаюць 3,6х2,4х1,7 см. Вага – 72,4 г. Уліковы нумар СГЭМ КП 3489.

Усе артэфакты пакрытыя пацінай цёмна-зялёнага колеру, характэрнай для вырабаў з бронзы. На двух злітках (рыс. 4, *1, 4*; 5, *1, 4*) маюцца фрагменты спёкшайся масы, якая ўтварылася ў выніку ўздзеяння высокай тэмпературы. Для вызначэння складу металаў, з якіх зроблены артэфакты з Госціна, быў прыменены элементны аналіз, ход і вынікі якога прадстаўлены ніжэй.

**Прымяненне метаду лазернай атамна-эмісійнай спектраскапіі.** Пры правядзенні даследаванняў аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, і прадметаў археалагічных раскопак, перавага аддаецца недэструктыўным метадам аналізу, такім, напрыклад, як рэнтгена-флуарэсцэнтная спектраскапія. Аднак, варта мець на ўвазе, што адсутнасць дэструкцыі ўзору пры аналізе, у пераважнай большасці выпадкаў азначае элементнае даследаванне толькі павярхоўных пластоў прадмета. Так, пры вывучэнні вырабаў, якія на працягу стагоддзяў захоўваліся ў скарбніцы Ватыкана і не падвяргаліся агрэсіўнаму ўздзеянню навакольнага асяроддзя, натуральна трэба звяртацца да недэструктыўнага аналізу. Аднак большасць металічных прад-




*Рыс. 3.* Рэчавы комплекс Госціна:

*1* – бранзалет; *2* – рамка спражкі; *3* – фрагмент вырабу; *4* – фрагментаваны бранзалет са слядамі рэзання




*Рыс. 4.* Рэчавы комплекс Госціна. Зліткі каляровых металаў

метаў з калекцый беларускіх музеяў і ўстаноў навукі і адукацыі пакрыты значным пластом паціны, акаліны, іржы і забруджвання. Часта пры даследаванні даводзіцца мець справу з прадметам, які падвергся даволі працягламу высокатэмпературнаму ўздзеянню, затым на працягу стагоддзяў знаходзіўся ў кантакце з глебай і вадой, і, нарэшце, у XX ст. мог выпрабаваць на сабе ўплыў «магутнай» сельскагаспадарчай хіміі. Усе вышэйадзначаныя прычыны не маглі не паўплываць на змены ўзаемнага зместу элементаў у прыпаверхневых пластах, таму недэструктыўныя метады аналізу могуць прыводзіць да атрымання некарэктных вынікаў.

Рашэннем у дадзенай сітуацыі з’яўляецца выкарыстанне метаду лазернай атамна-эмісійнай спектраскапіі, заснаванай на выпарэнні тонкіх пластоў рэчыва (3–5 мкм) магутнымі лазернымі імпульсамі; дыяметр кратэра на паверхні (100–150 мкм) не залежыць ад колькасці імпульсаў. Такім чынам, можна вызначыць таўшчыню пласта паціны, акаліны і іржы на паверхні, выключыць атрыманыя даныя з вынікаў аналізу ўзору або, пры неабходнасці, параўнаць змест элементаў у паверхневых пластах і ў аснове, што дазволіць зрабіць выснову аб уплыве высокіх тэмператур, працяглага ўздзеяння агрэсіўных асяроддзяў на глыбіню і ступень карозіі аб’екта.




*Рыс. 5.* Рэчавы комплекс Госціна. Зліткі каляровых металаў

Элементны аналіз артэфактаў, выяўленых каля в. Госціна Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, праводзіўся на лазерным спектрометры ЛАЭМС на кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта БДУ. Пры правядзенні даследавання выпараецца $10^{-10-11}$ г рэчыва, дыяметр дэструкцыі 100–150 мкм, за рахунак выкарыстання магутных лазерных імпульсаў, вакол бакоў кратэра не ўтворыцца бруствер з застылага расплаву металу (мае месца так званая лазерная абляцыя – калі выпараецца непасрэдна цвёрды матэрыял без плаўлення). За рахунак тэхнічных рашэнняў, рэалізаваных пры праектаванні спектрометра, магчыма правядзенне аналізу як невялікіх прадметаў (плоскія фрагменты металаў 5*5 мм), так і даволі аб'ёмных. Пры гэтым, даследчык сам выбірае месца ўздзеяння (вонкавы бок дэкаратыўнага вырабу, гурт манеты і г. д.). Вынікі элементнага аналізу артэфактаў з Госціна прадстаўлены на рысунку 6.

**Культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя і інтэрпрэтацыя рэчавага комплексу.** Пры вызначэнні культурна-храналагічнай прыналежнасці калекцыі з Госціна мы абапіраліся, перш за ўсё, на спражку і бранзалеты. Спражкі з акруглымі ці авальнымі, патоўшчанымі ў пярэдняй частцы рамкамі, і хабатковымі язычкамі, шырока выкарыстоўваліся насельніцтвам Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, Паўночнага Прычарнамор'я, Каўказу, стэпу

| № | Узор | Медзь (Cu) | Волава (Sn) | Цынк (Zn) | Свінец (Pb) | Срэбра (Ag) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | С, % | | | | |
| КП 3492 |  | 96,79 | 2,19 | 0,00 | 1,03 | 0,00 |
| КП 3493 |  | 96,48 | 2,63 | 0,00 | 0,89 | 0,00 |
| КП 3491 |  | 58,66 | 27,97 | 7,91 | 4,15 | 1,32 |
| КП 3490 |  | 61,10 | 22,67 | 9,02 | 5,67 | 1,54 |
| КП 3489 |  | 66,19 | 20,16 | 8,47 | 3,68 | 1,50 |
| КП 3488 |  | 62,20 | 23,27 | 8,55 | 5,48 | 0,50 |
| КП 3487 |  | 62,27 | 25,48 | 6,12 | 6,14 | 0,00 |
| КП 3486 |  | 63,00 | 23,55 | 8,56 | 4,90 | 0,00 |

*Рыс. 6.* Вынікі элементнага аналізу рэчаў з комплекса Госціна

і лясной зоны Усходняй Еўропы з апошняй чвэрці IV ст. па VI ст. [1; 2; 3; 4, с. 44–46]. Па меркаванні А. М. Абломскага, верхняя мяжа бытавання спражак з акруглымі рамкамі ў лясной зоне Падняпроўя пакуль няясная: ускосныя даныя сведчаць аб тым, што яны могуць дажываць да фіналу калочынскай культуры – канца VII ст. [4, с. 45, рис. 35]. Найбольш блізкія спражцы з Госціна аналогіі прадстаўлены ў пахаваннях культуры пскоўскіх доўгіх курганоў [5, с. 21–27, рис. 1].

Бранзалеты з Госціна маюць масіўныя патоўшчаныя канцы, авальныя ў сячэнні, і аздобленыя геаметрычным арнаментам, выкананым у тэхніцы гравіроўкі. Варта адразу адзначыць, што яны не падобныя на вырабы гэтай катэгорыі, знойдзеныя на помніках V–VII стст. Беларускага Палесся. Усе вядомыя з гэтай тэрыторыі бранзалеты маюць не такія масіўныя канцы, і арнамент на іх адсутнічае, або ўяўляе сабой некалькі кальцавых бараздак (паселішчы Радасць-2, Астрамечава, Мерчыцы-2, Бярэжцы-4) [6; 7, с. 253, рис. 2: 13; 8, с. 549, мал. 24: 6–7]. Значна бліжэй па стылістыцы да бранзалетаў з Госціна знаходзяцца вырабы з помнікаў трэцяй чвэрці I тыс. н. э. Верхняга Падняпроўя, Пасожжа і Падзвіння: гарадзішчаў Магілёў–Змяёўка, Нікадзімава, Лукомль, гарадзішча Клішына (у складзе скарбу жаночых упрыгажэнняў) [9, с. 24–26, мал. 12; 10, с. 240, рис. 4: 3; 11, с. 36, рис. 12: 11; 12, с. 100, табл. 19/II]. Падобныя бранзалеты былі шырока распаўсюджа-

ны ў лясной і лесастэпавай зонах Еўропы, галоўным чынам – у старажытнасцях калочынскай і пянькоўскай культур [4, с. 52–53, рис. 41; 13, с. 33, 39, рис. 20: 20, 66: 7, 71: 4]. У тым ліку, яны сустракаюцца ў скарбах «старажытнасцей антаў» першай храналагічнай групы (другая – трэцяя чвэрці VII ст. н. э.) у басейне Сярэдняга Дняпра і на Дняпроўскім лесастэпавым Левабярэжжы [14; 15, с. 136, рис. 3: 1, 2].

Бронзавыя зліткі з Госціна з’яўляюцца найбольш цікавай катэгорыяй вырабаў у калекцыі. Сярод раннесярэднявечных старажытнасцей зліткі каляровых металаў былі знойдзены на помніках пянькоўскай культуры: паселішча Валошскае (Сурская Забора) – выяўлены злітак-грыўна [13, с. 39, рис. 75: 15]; паселішча Хітцы – даследаваны рэшткі майстэрні ювеліра з агменем-горнам, а ў культурным пласце выяўлены бронзавыя пласціны – нарыхтоўкі для ўпрыгажэнняў і бронзавы гранёны прут, які вызначаецца даследчыкамі як сыравіна для бронзаліцейных майстэрняў [16, с. 66, рис. 29: 1]. У Беларускім Палессі бронзавыя зліткі палачкападобнай формы былі знойдзены на паселішчах з матэрыяламі I тыс. н. э. Хачэнь на р. Сцвіга і Петрыкаў-2 на р. Прыпяць [17; 18, с. 156, мал. 28: 16]. Такія зліткі вырабляліся ў адкрытай форме, без дадатковай значнай механічнай апрацоўкі, а палачкападобная канфігурацыя з’яўляецца найбольш прыдатнай для далейшай апрацоўкі ці падзелу на часткі. Зліткі з Госціна маюць розныя формы, аднак асабліва вылучаюцца два найбольш масіўныя – выгнуты і дваякавыгнуты. Пакуль што аналогіі такім вырабам нам не вядомыя. Аддаленае падабенства па масіўнасці і форме да іх маюць зліткі з «Кузебаеўскага скарбу ювеліра» (VII ст.), знойдзенага на тэрыторыі Удмурціі [19, рис. 8].

Склад калекцыі вырабаў з Госціна: зліткі каляровых металаў і рэчы, частка з якіх ужо выкарыстоўвалася (разламаны бранзалет са слядамі рэзання, фрагментаваны выраб), а, астатняя, верагодна, планавалася для выкарыстання ў якасці сыравіны для ювелірнай справы, дазваляе нам умоўна называць яе «скарбам ювеліра». Падчас правядзення даследаванняў на раннесярэднявечных паселішчах частымі знаходкамі з’яўляюцца тыглі, льячкі, радзей выяўляюць металічныя інструменты ювеліраў: пінцэты, кавадлы і г. д. Аднак знаходкі сыравіны, асабліва ў такім выглядзе і колькасці, як у комплексе з Госціна, сустракаюцца вельмі рэдка. Зліткі са скарбу, на нашую думку, маглі таксама выконваць функцыю грашовых адзінак таго часу, як грыўны ў старажытнарускі перыяд. Аднак такія рэчы пакуль не былі выяўлены масава, таму гэтае меркаванне выказваецца як гіпотэза.

Праведзены элементны аналіз артэфактаў з Госціна дазволіў устанавіць, што самы «чысты» склад (медзь і невялікая дамешка волава), маюць бранзалеты (рыс. 6). Астатнія рэчы зроблены з алавянай бронзы з дамешкай цынку, свінцу і, зрэдку, срэбра. Для параўнання, хімічны аналіз металу вырабаў Курылаўскага скарбу (басейн р. Псёл, Дняпроўскае Левабярэжжа) паказаў,

што ўсе сплавы на меднай аснове, акрамя адзінага ўзора алавянай бронзы, дэманструюць сплаўленне латуні і свінцова-алавянай лігатуры. Такі прыём атрымання ювелірнага металу характэрны для дняпроўскіх скарбаў першай групы. Адзначаецца таксама, што волава больш дарагі метал, чым цынк і свінец [20].

The multicultural site Zagoryny-1 was discovered in 1962 by U. F. Isaenka. He explored it by excavation in 1967 and episodically in the 1960s and 1970s by collect on the surface. R. I. Mikhalchyshyn explored Zagoryny-1 in 1978, M. M. Kryvaltsevich in 2000s. There is no certainty about the discovery on the site of the burial ground of the «Palesse group of Corded Ware Culture», as claimed by U. F. Isaenka. In addition to a relatively large number of finds of the Early and Late Neolithic of the Eastern Palesian variant of the Dnipro-Donets culture, there is a complex of materials from the «corded period» (end of the first half / middle of the 3rd – beginning of the 2nd millennium BC), fragments of pottery of Trzciniec Cultural Circle, Late Bronze Age and Milagrad Culture of the Early Iron Age in Zagoryny-1.

***Keywords:*** Neolithic; Bronze Age; Circle of Corded Ware Culture; Middle Dnieper Culture; Trzciniec Cultural Circle.

**Уступ.** Помнік Загорыны-1 быў адкрыты У. Ф. Ісаенкам у 1962 г. Ён вывучаў гэты помнік невялікім раскопам і паверхневымі зборамі, згадваў у археалагічных публікацыях 1960–1990-ых гг. як адзін з апорных усходнепалескіх комплексаў днепра-данецкай неалітычнай культуры і «палескай групы культуры шнуравой керамікі» [1, с. 43, 45; 2, с. 49; 3, с. 86; 4, с. 258]. Тэрыторыя помніка пабурана ў 1970-ыя гады лесапасадкамі, і на яго месцы цяпер расце лес.

Мной неаднаразова праводзілася абследаванне Загорын-1 у перыяд з 2003 да 2019 гг., вывучаліся старыя (1960–1970-ых гг.) і новыя калекцыі (2000-ых гг.), у першую чаргу матэрыялы позняга неаліту і бронзавага веку, аналізаваліся публікацыі і справаздачы аб палявых даследаваннях У. Ф. Ісаенкі, што дазволіла выявіць некаторыя хібы ў ранейшых інтэрпрэтацыях і прапанаваць аўтарскую версію культурна-храналагічнага падзелу матэрыялаў помніка. Дагэтуль не рабіўся сістэмны тыпалагічны аналіз керамікі «шнуравога перыяду» Загорын-1 – аднаго з самых прадстаўнічых комплексаў на помніку. У гэтай сувязі мной прапануецца тыпалогія адпаведнай керамікі з вылучэннем асноўных культурных кампанентаў у яе складзе, разглядаюцца найбольш верагодныя крыніцы іх паходжання, абазначаецца кола тыпалагічна блізкіх помнікаў.

**Гісторыя вывучэння.** Шматкультурны помнік Загорыны-1, які знаходзіцца за паўднёвай ускраінай в. Загорыны (Прудоцкі сельскі савет, Мазырскі раён, Гомельская вобласць), адкрыў У. Ф. Ісаенка ў 1962 г. [5, с. 21–23;

2, с. 49; 4, с. 258] (рыс. 1, *А, Б*). Знаходкі – крэмень і фрагменты керамікі – ён збіраў на разбураных участках бязлеснай паверхні. Абследаванне Загорын-1 паверхневымі зборамі У. Ф. Ісаенка эпізадычна працягваў і пазней – у 1966, 1967, 1973, 1975, 1976, 1978 гг. [6, с. 25–26; 7, с. 2; 8, с. 6–7; 9, с. 21; 10, с. 52–53; 11, с. 14; 1, с. 43, 45; 2, с. 49; 3, с. 86; 4, с. 258]. Ва ўступе да справаздачы аб палявых даследаваннях 1967 г. У. Ф. Ісаенка паведамляў пра раскоп плошчаю 60 м$^2$, якім ён вывучаў *«паселішча палескай групы шнуравой керамікі»* каля Загорын [7, с. 2][1]. Пра найбольш верагоднае месца размяшчэння раскопа – паўночная ўскраіна помніка – можна толькі здагадвацца, параўноўваючы сістэму ўмоўных пазначэнняў на схематычным плане Загорын-1 у справаздачы У. Ф. Ісаенкі за 1967 г. [7, рис. 21] (рыс. 2, *А*). Зрэшты, прыведзенымі вышэй згадкамі і абмяжоўваецца інфармацыя пра раскоп у Загорынах-1. Пры праглядзе ўсіх даступных калекцый з помніка не заўважаліся якія-небудзь сведчанні пра раскопачны матэрыял.

У справаздачы за 1978 г. У. Ф. Ісаенка піша пра разбурэнне тэрыторыі Загорын-1 і знішчэнне рэштак культурнага пласта лесапасадкамі па схілу рачной тэрасы і карэннага берага [11, с. 14]. У гэтай жа справаздачы паведамляецца пра абследаванне і паверхневыя зборы на групе помнікаў у нізоўях ракі Тур (Прудок) каля вёсак Загорыны, Лучажэвічы, Мерабеля, у тым ліку на Загорынах-1, якія здзяйсняў украінскі археолаг з Львова Р. І. Міхальчышын [11, с. 14–15, 24]. У ілюстрацыйным дадатку да справаздачы змешчана фотакопія схематычнай карты помнікаў у нізоўях ракі Тур (Прудок) з подпісамі па-украінску [11, рис. 49] (рыс. 2, *В*). Аўтарам карты, мабыць, і быў Р. І. Міхальчышын. Побач з Загорынамі, Лучажэвічамі, Мерабеляй, у адпаведнасці са згаданай схематычнай картай, абазначаецца, у розных варыянтах нумарацыі і падзелу, ад 12 да 16 пунктаў збора археалагічнага матэрыялу.

Ужо ў тэксце справаздачы аб палявых даследаваннях 1966 г. У. Ф. Ісаенка піша пра Загорыны-1 не толькі як пра паселішча, але і пра знойдзеныя тут сляды могільніка «ранняй бронзы», г. зн. «шнуравога перыяду» [6, с. 25–26]. Пазней паведамленне пра грунтовы могільнік культуры шнуравой керамікі, альбо ў інтэрпрэтацыі У. Ф. Ісаенкі «культуры шнуравой керамікі Палесся», «палескай групы культуры шнуравой керамікі», у Загорынах-1 неаднаразова згадвалася ў яго публікацыях [2, с. 49; 3, с. 86; 4, с. 258].

Праблема адкрыцця слядоў грунтовага могільніка культуры шнуравой керамікі ў Загорынах-1 застаецца адкрытай. У справаздачнай дакументацыі і ў публікацыях У. Ф. Ісаенкі, акрамя кароткай тэкставай згадкі *a priori*, няма неабходнай у такім разе сістэмы абгрунтаваных доказаў і сведчанняў існавання пахаванняў, не кажучы ўжо пра археаметрыю пахавальных аб'ектаў.

[1] Паведамленне адным сказам: *«Возле д. Загорины в Мозырском районе проводились небольшие раскопки на поселении полесской группы шнуровой керамики (вскрыта площадь в 60 кв. м).»* [7, с. 2].




А




*Рыс. 1. А* – лакалізацыя Загорын-1 на тапаграфічнай карце;
*Б* – абазначэнне месца збора артэфактаў на помніку Загорыны-1 у 2000-ых гадах (з выкарыстаннем карты онлайн сэрвіса Google Maps)

A

Б

В




*Рыс. 2. А* – схематычны план Загорын-1, складзены У. Ф. Ісаенкам, з абазначэннем зоны распаўсюджання знаходак (касыя крыжыкі) і раскопа 1967 г. (невялікі прамакутнік з вертыкальнай штрыхоўкай) (?) [7, рис. 21];

*Б* – фотаздымак Загорын-1 (1967 г.) [7, рис. 21];

*В* – схематычны план (1978 г. ) размяшчэння Загорын-1 (абазначана арабскай і лацінскай лічбай лічбай «адзін») і іншых выяўленых і даследаваных Р. І. Міхальчышыным (?) помнікаў у нізоўях р. Тур [7, рис. 21]

Спарадычна ў яго тэкстах сустракаліся звесткі, якія, мабыць, ён лічыў аргументамі на карысць меркавання пра могільнік: згадкі пра развалы гаршкоў культуры шнуравой керамікі, пра каменную свідраваную сякеру (сякеры?), якую знаходзілі каля Загорын і якая захоўвалася ў школе. Аднак, ні ў калекцыйным матэрыяле Загорын-1, ні на апублікаваных У. Ф. Ісаенкам ілюстрацыях няма керамічных форм, якія маглі б пацвердзіць звесткі пра развалы гаршкоў культуры шнуравой керамікі. Няма малюнкаў ці фотаздымкаў свідраванай сякеры. Неабходна таксама дадаць, што ў згадках пра могільнік У. Ф. Ісаенка нічога не пісаў пра касцёвыя чалавечыя парэшткі альбо, напрыклад, пра сляды пахавальных ям. У сувязі з гэтым узнікаюць невырашальныя задачы па ідэнтыфікацыі грунтовага могільніка на месцы Загорын-1. Праблема ўсугубляецца тым, што на сёняшні дзень помнік разбураны ветравой эрозіяй, лесапасадкамі і практычна амаль не прыгодны для паўнавартасных раскопачных даследаванняў і пошукаў пахаванняў.

У справаздачнай дакументацыі У. Ф. Ісаенкі ёсць схематычны план і фотаздымак помніка [7, рис. 21] (рыс. 2, *А, Б*). Напэўна, здымак зроблены здалёк – з паўднёвага ўсходу, ад Лучажэвічаў, з правабярэжжа Тура (Прудка) (?). Па стану на 1960-ыя, пачатак 1970-ых гг., калі на помніку праводзіліся асноўныя паверхневыя зборы, паверхня Загорын-1 была адкрытая і амаль бязлесная. Паводле інтэрпрэтацыі У. Ф. Ісаенкі, Загорыны-1 – шматкультурны помнік. Сабраны матэрыял дазволіў яму вылучыць наступныя культурна-храналагічныя комплексы: мезалітычны, ранняга і позняга неаліту (днепра-данецкай неалітычнай культуры), «культуры шнуравой керамікі Палесся», тшцінецкай, мілаградскай і зарубінецкай (постзарубінецкай) культур.

У. Ф. Ісаенка, нягледзячы на разбураны стан культурнага пласта, назіраючы за стратыграфіяй некаторых ацалелых участкаў помніка, дзе захоўваліся глебавыя адклады, паспрабаваў вылучыць на помніку ранні (30 см) і позні (20 см) стратыграфічныя гарызонты. Паводле яго інтэрпрэтацыі, позні гарызонт – гумусаваны глебавы пласт – змяшчаў культурныя рэшткі позняга неаліту, бронзавага веку і эпохі жалеза, а ранні – падглебавы пласт – матэрыялы, характэрныя для мезаліту і ранняга неаліту. Паміж згаданымі гарызонтамі дзе-нідзе прасочваліся «дэлювіяльныя адклады» [10, с. 52–53; 2, с. 49; 4, с. 258]. Шкада, аднак, што ў ягоных працах адсутнічала зафіксаваная графічна ці фотаспосабам стратыграфічная калонка, гарызантальная планіграфія, якія маглі б адлюстраваць і пацвердзіць менавіта такі падзел культурнага пласта ў Загорынах-1.

Па выніках абследавання помніка ў 1973 г. ёсць згадка пра вуглістыя сляды і паглыбленні ў культурным пласце, якія, як мяркаваў У. Ф. Ісаенка, маглі быць рэшткамі жылых аб'ектаў (?) [8, с. 6–7], што яшчэ больш ускладняе разуменне стратыграфіі і функцыянальнага выкарыстання тэрыторыі Загорын-1 у старажытнасці.

Помнік абследаваўся мной у 2003[1], 2007[2], 2013, 2015[3], 2016, 2019 гг. Збор пад'ёмнага матэрыялу праводзіўся на даступных участках паверхні ўздоўж краю рачной тэрасы, у тым ліку на свежаразбураным паўднёвым адгалінаванні тэрыторыі помніка (рыс. 1, *Б*). У сабранай мной калекцыі пераважалі фрагменты неалітычнай керамікі (269 фр.), радзей сустракаліся дробныя рэшткі посуду кола культуры шнуравой керамікі (209 фр.), апрацаваны крэмень (86 экз.) і артэфакты іншых перыядаў.

У публікацыях і ў справаздачнай дакументацыі У. Ф. Ісаенкі інфармацыя пра колькасць сабраных у Загорынах-1 знаходак і пра іх асноўныя катэгорыі, у тым ліку па прыналежнасці да тых ці іншых культурна-храналагічных тыпаў, урыўкавая і няпоўная. Найбольш верагодна, калі аналізаваць тэксты справаздач, матэрыялы калекцый, якія захоўваюцца ў фондах Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ў музеях, колькасць знаходак была крыху больш за адну тысячу адзінак. Пераважная частка сабранай ім калекцыі прыходзілася на матэрыялы неаліту, меншая – на іншыя катэгорыі знаходак «шнуравога перыяду», бронзавага веку, эпохі жалеза. Дадам, паводле тагачаснай практыкі палявых даследаванняў, у тым ліку аўтарства У. Ф. Ісаенкі, у калекцыю браліся не ўсе археалагічныя знаходкі, параўнальна вялікая колькасць керамічных фрагментаў і крэменю выбракоўвалася і пакідалася на помніку (параўн.: [12, с. 92]), што, прынамсі, прасочваецца ў матэрыялах збораў У. Ф. Ісаенкі на Загорынах-1.

**Лакалізацыя помніка.** Помнік знаходзіцца на левабярэжжы вусця ракі Тур (Прудок) – правага прытока Прыпяці. Матэрыялы пачынаюць сустракацца праз некалькі дзесяткаў метраў на поўдзень ад паўднёвай ускраіны вёскі Загорыны (Прудоцкі сельскі савет, Мазырскі раён, Гомельская вобласць) і лакалізуюцца, паводле майго абследавання, уздоўж края рачной тэрасы на працягу амаль 330 м (рыс. 1). З разведак У. Ф. Ісаенкі 1960–1970-ых гг. вынікае, што тэрыторыя фіксацыі рэштак культурнага пласта, аб'ектаў і артэфактаў на Загорынах-1 дасягала 300–500х120 м (зборы на плошчы ад 36000 да 60000 м$^2$) і знаходзілася на ўзроўні каля 4 і болей метраў над ўзроўнем поймы рэк Тур і Прыпяць (рыс. 2, *А*). На поўдзень і паўднёвы ўсход ад Загорын-1 лакалізаваліся іншыя месцазнаходжанні з аналагічнымі матэрыяламі і з прывязкамі да вёсак Мерабеля, Лучажэвічы (рыс. 2, *В*), што сведчыць пра асваенне і выкарыстанне старажытнымі людзьмі практычна ўсіх, параўнальна высокіх, прылеглых ускраін тэрасы ўздоўж рэк Тур і Прыпяць.

Схематычны план з абазначэннем зоны распаўсюджання знаходак, які захаваўся ў справаздачы У. Ф. Ісаенкі за 1967 г., з'яўляецца адзіным планіграфічным дакументам Загорын-1 [7, рис. 21] (рыс. 2, *А*). Ён дапаўняецца фо-

[1] сумесна з А. М. Сінілам, А. І. Чарняўскім.

[2] сумесна з В. С. Вяргей.

[3] сумесна з У. В. Грыбам.

таздымкам 1967 г. [7, рис. 21] (рыс. 2, *Б*). Маё абследаванне суправаджалася абазначэннем на картах месцаў збора артэфактаў у 2000-ых гг. (рыс. 1, *Б*). Дадам, што амаль на ўсёй сучаснай тэрыторыі помніка расце лес.

**Вынікі тыпалагічнага падзелу керамікі і крамянёвых вырабаў.** У даступных аўтару археалагічных калекцыях з Загорын-1 на сённяшні дзень налічваецца болей за паўтары тысячы артэфактаў. Калекцыі складаюцца з фрагментаў керамікі і крамянёвых вырабаў, якія захоўваюцца ў археалагічных фондах Інстытута гісторыі НАН Беларусі (зборы У. Ф. Ісаенкі, М. М. Крывальцэвіча), у Нацыянальным гістарычным музеі (зборы У. Ф. Ісаенкі) і ў Мазырскім аб'яднаным краязнаўчым музеі (зборы У. Ф. Ісаенкі). Матэрыялы адносяцца да каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.

Большая частка фрагментаў керамікі і вырабаў з крэменю адпавядае азнакам *неаліту*. Сабраны ў 1960–1970-ых гг. неалітычны матэрыял У. Ф. Ісаенка дзяліў на два асноўныя культурна-храналагічныя таксоны: ранненеалітычны і познанеалітычны. Для ранняга неаліту (V–IV тыс. да н. э.) ён вылучаў у Загорынах-1 грабенчата-накольчатую кераміку ранніх этапаў днепра-данецкай культуры, якая, паводле яго заключэння, узнікла на ўсходзе Палесся пад уздзеяннем буга-днястроўскай культуры [2, с. 49–57, 113–115]. У Загорынах-1 прадстаўлены таксама перыяд позняга неаліту (III–пачатак II тыс. да н. э.), калі, на яго думку, завяршаецца трэці і развіваецца чацвёрты этапы днепра-данецкай культуры [2, с. 85–107, 115]. Неабходна дадаць, што крытэрыям таксонаў ранненеалітычнага і познанеалітычнага перыядаў, якія вылучаў у Загорынах-1 У. Ф. Ісаенка, адпавядае частка сабраных мной керамічных і крамянёвых вырабаў.

Калі прапанаваная У. Ф. Ісаенкам версія таксанамоміі комплексу днепра-данецкай культуры застаецца прыярытэтнай, то ў дачыненні да матэрыялаў «шнуравога перыяду» і наступных перыядаў эпохі бронзы ўзнікае неабходнасць паглыбленага аналізу і рэінтэрпрэтацыі.

Даступнымі для вывучэння былі крыху болей за 400 фрагментаў керамікі *«шнуравога перыяду»* (канец першай паловы/сярэдзіна III – пачатак II тыс. да н. э.) (рыс. 3–6; 7, *1–13*; 8, 9). Згаданы комплекс знаходак вылучаўся на падставе спецыфікі тэхналогіі, марфалогіі і арнаментальнага аздаблення. Азнакі і методыка ідэнтыфікацыі такога тыпу комплексаў распрацоўваліся мной на матэрыяле шэрагу іншых помнікаў Прыпяцкага Палесся (Азярное-1, Старыя Юрковічы-1, Бухліцкі Хутар-1 і інш.) (гл., напрыклад: [13, с. 7–25; 14, с. 116–123; 15, с. 219–242]).

Прапануецца наступная тыпалогія керамікі «шнуравога перыяду» з Загорын-1.

Паводле візуальнага вывучэння, вылучаюцца тры тэхналагічныя групы шнуравой керамікі. Група 1 характэрызуецца прысутнасцю ў фармовачнай масе буйных і дробных крупінак шамоту, у некаторых выпадках у тым ліку




*Рыс. 3.* Загорыны-1. Кераміка:

*А* – групы марфалогіі венцаў-шыек керамікі «шнуравога перыяду»; *Б* – групы марфалогіі донных-прыдонных частак «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара

і пяску. На асобных фрагментахназіраюцца шамоцістыя інгрэдыенты ў выглядзе невялікіх частачак старога посуду. У кераміцы першай групы паверхня параўнальна гладкая. Кераміка тэхналагічнай групы 1 – самая масавая на помніку. Радзей сустракаліся абломкі шнуравога посуду, якія вылучаюцца ў тэхналагічную групу 2. У гэтай кераміцы таксама прасочваюцца дададзеныя да гліны штучныя дамешкі шамоту, але паверхня рэльефна прыціралася знутры і звонку, альбо толькі знутры пасудзін. Адзінкавыя фрагменты аднесены да тэхналагічнай групы 3. У гліне такой керамікі прысутнічала жарства, а паверхня была гладкая альбо са слядамі прыцірання.

Неабходна дадаць, што таўшчыня сценак у посудзе трох груп вагалася ў межах ад 0,5–0,6 да 0,7–0,9 см.

Марфалогію шнуравога посуду з Загорын-1 можна аналізаваць толькі па формах венцаў–шыек, донных–прыдонных частак і радзей тулаваў. На падставе параўнання профіляў вылучаюцца венцы–шыйкі груп I–IV з падзелам на адпаведныя падгрупы (А–Д) (рыс. 3, *А*).

Група I. Венцы–шыйкі з «каўнерыкамі». Сярод іх па форме, па вышыні «каўнерыкаў», вылучаецца восем падгруп (А–Д). Кераміка з венцамі–шыйкамі групы I самая распасюджаная ў комплексе «шнуравога перыяду» (рыс. 3, *А, IА–IД*).

Група II. Прамыя, адхіленыя вонкі венцы–шыйкі. Дзеляцца па формах профіляў на чатыры падгрупы (А–Г) (рыс. 3, *А, IIА–IIГ*). Сустракаюцца радзей ў параўнанні з венцамі–шыйкамі групы I.

Група III. Прамыя, адхіленыя вонкі венцы–шыйкі з валікамі (рыс. 3, *А, III*). У складзе калекцыі іх налічваецца некалькі экзэмпляраў.

Група IV. Кароткія выгнутыя вонкі венцы–шыйкі (рыс. 3, *А, IV*). Адзінкавыя знаходкі.

Сярод невялікай колькасці донных–прыдонных частак «шнуравых» пасудзін па форме профіля вылучаюцца наступныя іх групы (мал. 3: Б): I – плоска-акруглыя; II – плоскія; III – плоскія завужаныя; IV – плоска-акруглыя, патоўшчаныя; V – плоскія з бакавымі закраінамі; VI – плоскія з выступаючым краем па ніжняму доннаму перыметру.

Донныя часткі, як правіла, ляпіліся асобна і прымацоўваліся да ніжняй стужкі гаршка. Дыяметры донцаў, параметры якіх можна было памераць, дасягалі 6–10 см.

Стан захаванасці керамічнай калекцыі не дазваляе паўнавартасна аднавіць макрамарфалогію шнуравога посуду Загорын-1. Форма большасці пасудзін набліжалася, відаць, да высакагорлых тыпаў гаршкоў (рыс. 5, *1–3*; 6, *5–7*), радзей сустракаліся рэшткі посуду з кароткімі выгнутымі вонкі венцамі са стромкім пераходам ад шыйкі да плечукоў і тулава (рыс. 3, *А, IV*; 7, *1*). Абазначаецца яшчэ адзін профіль гаршка, у якога назіралася паступовае звужэнне шыйнай часткі ў накірунку да гарлавіны з паступовым пашы-




*Рыс. 4.* Загорыны-1. Групы і падгрупы арнаментальных матываў на кераміцы «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара

рэннем на тулаве і выразным перагінам на пераходзе да прыдоннай часткі (рыс. 9, *4*). Апошняя форма набліжаецца да профіляў мясцовых гаршкоў «ляснога неаліту».

Пры тыпалогіі арнаментацыі керамікі «шнуравога перыяду» з Загорын-1 вылучаліся групы аздаблення на падставе сістэматызацыі матываў і ў залежнасці ад элементаў, якімі яны выконваліся (рыс. 4). У прыватнасці, «вусеневымі» адбіткамі (Аа, Аб) наносіліся матывы груп Аа1–16 і Аб1–3 (рыс. 4; 5, *6*; 6, *6*; 7, *3, 4, 8–10, 12*; 8, *3–5, 7, 10*; 9, *5*). Калі матывы Аа1–16 утвараліся адбіткамі шчыльна наматанай на аснову ніткай, то групы Аб1–3 – вынік прыкладання асновы з рэдка наматанай ніткай. Вылучаюцца шнуравыя арнаменты груп Б1–15 (рыс. 4; 5, *1–5*; 6, *6*; 7, *3, 8, 9, 11*; 8, *9, 10*; 9, *4*). Сярод арнаментаў абазначаюцца матывы груп В1–7, якія наносіліся адбіт-




*Рыс. 5.* Загорыны-1. Кераміка «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара




*Рыс. 6.* Загорыны-1. Кераміка «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара

камі лінейных штампаў (рыс. 4; 6, *3–5, 7*; 7, *1, 2, 13*; 8, *1, 2, 8*). Параўнальна невялікім быў набор матываў, якія ўтвараліся пракрэсленымі лініямі (групы Г1–3) (рыс. 4; 7, *5*; 9, *1*), наколамі, ямкамі (групы Д1–5) (рыс. 4; 6, *1, 2, 4*; 7, *7, 13*; 9, *3*). Група Е – матывы з выкарыстаннем насечак (рыс. 4; 6, *4*), група Ж – арнаментацыя пальцава-пазногцевымі ўцісканнямі (рыс. 4; 8, *5, 6*).

Колькасна пераважалі фрагменты керамікі, якія выконваліся «вусеневымі», шнуравымі арнаментамі, лінейнымі штампамі. Адзінкавымі былі керамічныя абломкі з іншымі арнаментамі. Аздабленне канцэнтравалася на верхняй палове пасудзін. Сустракаліся фрагменты донных і прыдонных частак з арнаментамі (рыс. 9, *5*), што, напэўна, сведчыць пра пакрыццё пэўнай катэгорыі керамікі арнаментальнымі матывамі па ўсёй паверхні. Частая з'ява – нанясенне элементаў аздаблення па краях і па тарцу, а часам і пад унутраным краем венца.

Як ужо адзначалася, вялікая колькасць *крамянёвых артэфактаў*, сабраных на помніку, суадносіцца з неалітычным комплексам днепра-данецкай культуры [2, с. 49–57, 85–107]. Адзінкавыя крамянёвыя вырабы, калі




*Рыс. 7.* Загорыны-1:

*1–13* –кераміка, *14* – крамянёвы наканечнік стралы «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара

параўноўваць іх з закрытымі комплексамі, у першую чаргу пахавальнымі, тэарэтычна атаясамляюцца з «шнуравым перыядам». Да гэтай катэгорыі адносяцца наканечнікі стрэл трохвугольнай формы з двухбаковай апрацоўкай з выемкай і без выемкі на аснове. У складзе апрацавай калекцыі адзначалася пяць такіх вырабаў – чатыры з прамой асновай і адзін з выемкай на аснове (рыс. 7, *14*). Зрэшты, першы тып наканечнікаў можна сустрэць сярод інвентару не толькі «шнуравых» комплексаў, але і позніх этапаў днепра-данецкай культуры, на помніках культуры шарападобных амфар і некаторых іншых сінхронных культур. Другі тып таксама ўжываўся не толькі носьбітамі кола культуры шнуравой керамікі, але і некаторых іншых адначасовых культур позняга неаліту і перыяду пераходу да бронзавага веку.




*Рыс. 8.* Загорыны-1. Кераміка «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара




*Рыс. 9.* Загорыны-1. Кераміка «шнуравога перыяду».

Малюнкі аўтара

Акрамя матэрыялаў «шнуравога перыяду» у Загорынах-1 вылучаецца кераміка *тшцінецкага культурнага кола* (3 фр.): два венцы–шыйкі (рыс. 10, *1, 2*) і прыдонная частка гаршка (рыс. 10, *3*). На фрагментах захаваліся сляды зубчастага арнаменту (рыс. 10, *2*), насечак (рыс. 10, *1*) па краях венцаў і ямак на шыйках (рыс. 10, *1, 2*), пракрэсленых ліній на прыдоннай частцы (рыс. 10, *3*). Кераміка гладкасценная, з дамешкамі жарствы.




*Рыс. 10.* Загорыны-1:

*1–3* – кераміка тшцінецкага культурнага кола; *4, 6* – позняга перыяду бронзавага веку; *5* – мілаградскай культуры.

Малюнкі аўтара

Адзначаюцца два фрагменты посуду з азнакамі, характэрнымі для мясцовага *позняга перыяду бронзавага веку* (рыс. 10, *4, 6*). Венцы закругленыя і патошчаныя, шыйкі параўнальна кароткія і выгнутыя. На шыйках нанесены круглыя ямкі. У гліну дадаваліся адтлушчальнікі – сярэдніх і буйных памераў жарства бялёсага і шэрага колераў. Паверхня не зусім гладкая, з часта выступаючымі на ёй краямі часцінак жарствы.

Адзін з венцаў атаясамляецца з керамікай *мілаградскай культуры* (рыс. 10, *5*). У кераміцы гладкая паверхня. Гліна замешвалася з дробнай жарствой.

Такім чынам, у выніку аналізу і тыпалагічнай сістэматызацыі артэфактнага матэрыялу ў складзе калекцыі з Загорын-1 вылучаюцца комплексы і асобныя знаходкі: неалітычнай днепра-данецкай культуры (усходнепалескі варыянт); «шнуравога перыяду», тшцінецкага культурнага кола, позняга перыяду бронзавага веку і мілаградскай культуры.

**Аспекты культурна-храналагічнай інтэрпрэтацыі.** Патрабуюць перагляду прапановы У. Ф. Ісаенкі па культурна-храналагічнай ідэнтэфікацыі матэрыялаў «шнуравога перыяду» з Загорын-1. Нагадаю, што мной неаднаразова разглядалася і аналізавалася праблема найбольш верагодных шляхоў генезісу і развіцця «шнуравой прасторы» на тэрыторыі Беларусі ў цэлым і таксаноміі асобных комплексаў «шнуравога перыяду» Палесся ў прыватнасці (гл., напрыклад: [13, с. 7–25; 14, с. 116–123; 15, с. 219–242; 16, с. 70–79; 17, с. 33–98; 18, с. 207–217; 19, с. 213–219; 20, с. 719–736; 12, с. 96–97, 100]).

У канцы першай паловы III – пачатку II тыс. да н. э. супольнасці тэрыторыі Беларусі былі складовай часткай культурна-камунікацыйнай прасторы, якая фармавалася і развівалася з удзелам шматлікіх экзагенных і эндагенных культурных традыцый. Сярод першых вялікае значэнне належала цэтральнаеўрапейскім культурам, галоўным чынам, Цыркумбалтыйскага культурнага кола: культуры шнуравой керамікі, культуры шарападобных амфар і інш. На позніх этапах акрэсленага перыяду пранікалі эпішнуравыя традыцыі прыкарпацкага культурнага кола, тыпы позняй шнуравой керамікі і культуры звонападобных кубкаў, што фіксуецца на матэрыялах палескіх помнікаў канца III – пачатку II тыс. да н. э. Да экзагенных неабходна залічваць традыцыі ямна-катакомбных культур, культурнага кола Бабіна і, напэўна, мар’янаўскага тыпу, якія найбольш выразна праяўляліся на паўднёвым усходзе Беларусі, і, у першую чаргу, у сярэднедняпроўскай культуры. Падмурак эндагеннай культурнай асновы складалі комплексы і шматлікія пражыткавыя элементы позніх груп мясцовага «ляснога неаліту».

Вялікае значэнне ў культурагенэзе ўсходнееўрапейскай прасторы ад Сярэдняга–Верхняга Падняпроўя да ўсходнебалтыйскіх земляў належала сярэднедняпроўскай культуры. Нагадаю, што сярэднедняпроўская культура, канцэнтрацыя пахаванняў і паселішчаў якой выяўляецца на Верхнім і Сярэднім Падняпроўі, узнікала ў працэсе ўзаемадзеяння культурных традыцый, з аднаго боку, лесастэпаў-стэпаў (ямна-катакомбных культур, культурнага кола Бабіна), з другога боку, мясцовых культур «ляснога неаліту», культур цэнтральнаеўрапейскага паходжання (культуры шнуравой керамікі, культуры шарападобных амфар, эпішнуравых культур і інш. ) (гл., напрыклад, аналіз праблемы [17, с. 33–98; 19, с. 213–219; 20, с. 719–736]).

Матэрыялы «шнуравога перыяду» з Загорын-1, а гэта галоўным чынам кераміку, неабходна ў гэтай сувязі разглядаць у сістэме інтэррэгіянальнага і інтэркультурнага ўзаемадзеяння, як тое здзяйснялася мной для другіх анала-

гічных усходніх помнікаў Прыпяцкага Палесся (Старыя Юрковічы-1, Азярное-1, Бухліцкі Хутар-1 і інш.). Загорыны-1 – шматкампанентны комплекс, у якім вялікае значэнне, як і на пералічаных вышэй помніках Прыпяцкага Палесся, належала традыцыям сярэднеднепроўскай культуры.

Паралелі з керамікай пасяленцкіх комплексаў сярэднеднепроўскай культуры прасочваюцца ў марфалагічнай і арнаментальнай стылістыцы: ужыванне керамікі з «каўнерыкамі» (марфалогія групы I) і посуду з высокімі прамымі і адхіленымі вонкі шыйкамі (марфалогія групы II), у тым ліку вельмі часта ў спалучэнні з «вусеневым», шнуравым аздабленнем (групы А і Б); вялікая роля «вусеневых» арнаментальных элементаў і матываў (у тым ліку матываў груп Аб1–3). У Загорынах-1 ёсць шнуравыя матывы (напрыклад, групы Б5, Б6, Б8, Б9, Б12, Б13, Б15) (рыс. 4) ідэнтычныя Мохаву-4 (параўн. [20, мал. 4]) (рыс. 8, *9*; 9, *2*). Характэрныя для керамікі сярэднеднепроўскай культуры т. зв. «паркетныя» арнаменты, выкананыя шнуравымі, «вусеневымі» уціскannямі, пракрэсленымі лініямі сустракаюцца і ў калекцыі Загорын-1 (матывы Аа14, Б15, Г1) (рыс. 4; 7, *3–5, 8*). Спалучэнне «шамоцістай» тэхналогіі, тэхнікі прыцірання паверхні, «вусеневага», шнуравога аздаблення, «каўнерыкавага» стылю ў марфалогіі, што часта сустракаецца ў адпаведнай кераміцы і паселішчаў сярэднеднепроўскай культуры і Загорын-1, дазваляе шукаць сувязь з эпішнуравымі комплексамі, у першую чаргу з стжыжоўскай культурай.

У першыя стагоддзі II тыс. да н. э. на Гомельскае і Мазырскае Палессе пранікае культура шматвалікавай керамікі (культурнае кола Бабіна). Вылучаюцца керамічныя тыпы са спалучэннем стылю аздаблення і тэхналогіі сярэднеднепроўскай культуры і культурнага кола Бабіна [21, p. 139–161]. Сярод керамікі ў Загорынах-1 ёсць адзінкавыя венцы–шыйкі групы III «шнуравога перыяду» (рыс. 3, *А, III*; 5, *4*; 7, *12*), якія, відаць, адлюстроўваюць кантакт з традыцыямі культурнага кола Бабіна.

У керамічным комплексе Загорын-1 прысутнічаюць характэрныя для культуры шнуравой керамікі кубкавыя формы посуду з высокімі прамымі гарлавінамі і акруглымі тулавамі, у якіх «шамоцістая» тэхналогія, прыціранне паверхні спалучаецца з шнуравымі арнаментамі, лінейнымі штампамі. У выніку кантактаў з носьбітамі культуры шнуравой керамікі ў Загорынах-1 мог з’явіцца рэльефны пальцава-пазногцевы хвалісты арнамент тыпу групы Ж (рыс. 4; 8, *5, 6*).

На керамічным матэрыяле Загорын-1 прасочваюцца элементы, якія сведчаць пра сувязі з культурай шарападобных амфар. Прынамсі, да гэтай катэгорыі азнак адносяцца некаторыя матывы, якія выконваліся лінейнымі штампамі (групы В4–В6) (рыс. 4; 7, *2*; 8, *2*), а таксама, напэўна, круглымі ямкамі (адбіткі тарцом полай сцяблін ці т. зв. «птушыным пяром») групы Д5 (рыс. 4; 9, *3*).

Захоўванне мясцовых эндагенных традыцый «ляснога неаліту» (днепра-данецкай культуры) назіраецца ў выкарыстанні накольчатых, ямкавых арнаментаў, насечак (матывы груп Д1–Д4) (рыс. 4; 6, *1, 2, 4*). Адзначаецца кераміка са спалучэннем лінейных штампаў, «каўнерыка» з ямкамі на шыйцы, насечкамі пад унутраным краем венца (рыс. 6, *4*). Да профіляў неалітычнага посуду набліжаецца адзін з фрагментаў гаршка са шнуравым арнаментам (рыс. 9, *4*).

Такім чынам, культурны змест керамічнага матэрыялу «шнуравога перыяду» у Загорынах-1 характэрызуецца шматкампанентнасцю з прысутнасцю традыцый сярэднедняпроўскай культуры, культуры шнуравой керамікі, культур эпішнуравога культурнага кола, культуры шарападобных амфар, «ляснога неаліту», культурнага кола Бабіна. Кампанентная структура Загорын-1 зближаецца з іншымі комплексамі «шнуравога перыяду» усходніх рэгіёнаў Прыпяцкага Палесся – Старымі Юрковічамі-1, Азярным-1, Бухліцкім Хутарам-1. Бадай, адна са спецыфік Загорын-1 у параўнанні з пералічанымі помнікамі – кераміка, якая ўзнікла пад уздзеяннем традыцый культурнага кола Бабіна. З іншага боку, дэтальны параўнальны аналіз «шнуравой» керамікі Загорын-1 і кожнага са згаданых усходнепалескіх комплексаў дазваляе адзначыць і адметныя, і сходныя стылістычныя рысы, што плануецца паказаць у іншых публікацыях аўтара.

**Заключэнне.** Шматкультурны помнік Загорыны-1 у Мазырскім Палессі адкрыў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка. Ён даследаваў Загорыны-1 раскопам у 1967 г. і эпізадычна ў 1960–1970-ыя гг. паверхневымі зборамі. Найбольш верагодна, у 1978 г. пад'ёмны матэрыял на помніку збіраў украінскі археолаг Р. І. Міхальчышын. Паверхневыя зборы ў Загорынах-1 здзяйсняліся мной у 2000-ыя гг. Няма ўпэўненасці пра адкрыццё на помніку могільніка «палескай групы культуры шнуравой керамікі». Ва ўсялякім разе меркаванне У. Ф. Ісаенкі на гэты конт, калі аналізаваць яго публікацыі і справаздачную дакументацыю, падаецца мне не абгрунтаваным і апрыорным.

Акрамя параўнальна вялікай колькасці знаходак – керамікі і крамянёвых вырабаў – ранняга (V–IV тыс. да н. э.) і позняга неаліту (III–пачатку II тыс. да н. э.) усходнепалескага варыянту днепра-данецкай культуры, у Загорынах-1 вылучаецца комплекс матэрыялаў «шнуравога перыяду» (канец першай паловы/сярэдзіны III – пачатку II тыс. да н. э.), асобныя фрагменты керамікі тшцінецкага культурнага кола, позняга перыяду бронзавага веку і мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку.

Вывучэнне параўнальна прадстаўнічай калекцыі керамікі «шнуравога перыяду» дазволіла аўтару прапанаваць версію культурна-храналагічнай інтэрпрэтацыі, заснаваную на кампанентным аналізе і ў сістэме інтэррэгіянальнага і інтэркультурнага ўзаемадзеяння. Культурны змест керамічнага матэрыялу «шнуравога перыяду» ў Загорынах-1 характэрызуецца шматкам-

панентнасцю з прысутнасцю традыцый сярэднедняпроўскай культуры, культуры шнуравой керамікі, культур эпішнуравога культурнага кола, культуры шарападобных амфар, «ляснога неаліту», культурнага кола Бабіна. Кампанентная структура Загорын-1 зближаецца з іншымі комплексамі «шнуравога перыяду» ўсходніх рэгіёнаў Прыпяцкага Палесся – Старымі Юрковічамі-1, Азярным-1, Бухліцкім Хутарам-1.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Исаенко В. Ф.* Археологическая карта Белоруссии. Минск: Полымя, 1968. 125 с. (Вып. 1. Памятники каменного века).

2. *Исаенко В. Ф.* Неолит Припятского Полесья. Минск: Наука и техника, 1976. 128 с.

3. *Исаенко В. Ф.* Археологическая карта Белоруссии. Минск: Полымя, 1976. 150 с. (Вып. 3. Памятники бронзового века).

4. *Ісаенка У. Ф.* Загорыны // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993. С. 258.

5. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях в 1962 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 158.

6. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях в 1966 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 296.

7. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях в Полесье в 1967 году // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 319.

8. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях Полесской неолитической группы в 1973 году // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 442.

9. *Исаенко В. Ф.* Отчет Полесского неолитического отряда о полевых работах 1975 года // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 521.

10. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях 1976 г. в Полесье // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 551.

11. *Исаенко В. Ф.* Отчет о полевых исследованиях 1978 г. // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. Арх. № 612.

12. *Крывальцэвіч М. М.* Праблематыка археалогіі бронзавага веку Палесся ў працах Уладзіміра Фёдаравіча Ісаенкі // МАБ. 2019. Вып. 30. С. 92–103.

13. *Крывальцэвіч М. М.* Азярное-1 – паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся. Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 1999. 108 с.

14. *Крывальцэвіч М. М.* Кераміка эпохі бронзы з паселішча Бухліцкі Хутар-1 на Гарыні // ГАЗ. 1994. № 5. С. 113–130.

15. *Крывальцэвіч М. М.* Старыя Юрковічы-1 – культурна-храналагічныя аспекты «шнуравога» комплексу // МАБ. 2010. Вып. 18. С. 219–242.

16. *Крывальцэвіч М., Ісаенка У., Майсеня С.* Кераміка «шнуравога» і «тшцінецкага гарызонтаў» паселішча Камень 2 (Заходняе Палессе) // ГАЗ. 2003. № 18. С. 69–91.

17. *Крывальцэвіч М. М.* Могільнік сярэдзіны III– пачатку II тыс. да н. э. на Верхнім Дняпры – Прорва-1. Мінск: Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. 202 с.

18. *Крывальцэвіч М.* Новыя вынікі даследавання позняга неаліту – пачатку эпохі бронзы ў Заходнім Палессі // Na rubieży kultur: badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu: materiały międzynarodowej konferencji, Supraśl, 18–19 listopada 2010 r. Białystok, 2011. S. 207–217.

19. *Кривальцевич Н. Н.* К проблеме распространения традиций культуры шнуровой керамики в междуречье Припяти и Западной Двины) // Культурные процессы в циркумбалтийском пространстве в раннем и среднем голоцене. Доклады международной научной конференции, посвященной 70-летию со дня рождения В. И. Тимофеева. Санкт-Петербург, 2017. С. 213–219.

20. *Крывальцэвіч М.* Мохаў-IV і перспектыва вылучэння асобнага тыпу паселішчаў сярэднедняпроўскай культуры на Верхнім Падняпроўі // Vir Bimaris. Od kujawskiego matecznika do stepów nadczarnomorskich. Studia z dziejów międzymorza bałtycko-pontyjskiego ofiarowane Profesorowi Aleksandrowi Kośko. Archaeologia Bimaris. Poznań, 2019. S. 719–736.

21. *Kryvaltsevich M.* Babino-type ceramics in the Eastern Palessiye // Baltic-Pontic Studies. 2013. Vol. 18: The Ingul-Donets Early Bronze civilization as springboard for transmission of Pontic cultural patterns to the Baltic Drainage Basin: 3200–1750 BC. P. 139–161.

# БРОНЗАВАЯ СЯКЕРА НАРТЫКЕНСКАГА ТЫПУ Ў НІЗОЎЯХ ГАРЫНІ

**М. М. Крывальцэвіч**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*

Прапануюцца вынікі ідэнтыфікацыйнага, параўнальна-тыпалагічнага аналізу бронзавай сякеры тыпу *Nortycken*, а таксама спадарожнай ёй сякеры тыпу *Gołoty* бронзавага веку, якія знойдзены ў 2022 г. каля Давыд-Гарадка (Столінскі раён, Брэсцкая вобласць). Рэгістрацыя артэфакта і археалагічнае абследаванне месца выяўлення знаходкі праводзілася аўтарам у 2022 г. Сякера тыпу *Nortycken*, якая магла выкарыстоўвацца ў якасці зброі, адпавядае прыкметам усходніх прыбалтыйскіх сякер і датуецца адпаведна III перыядам бронзавага веку. Храналогія сякеры тыпу *Gołoty,* паводле аналогій на тэрыторыі Польшчы, вызначаецца на заканчэнне I і пачатак II перыяду бронзавага веку. Знойдзеныя сякеры – імпарт з прыбалтыйскіх рэгіёнаў праз басейн Буга ў Прыпяцкае Палессе. Выкарыстанне разгледжаных імпартаваных бронзавых сякер адбывалася ў тшцінецкі перыяд (сярэдні і позні этапы развіцця) і было, напэўна, звязана з запатрабаванасцю ранняга метала носьбітамі тшцінецкай культуры Прыпяцкага Палесся.

***Ключавыя словы:*** Прыпяцкае Палессе; бронзавы век; бронзавыя сякеры; параўнальна-тыпалагічны аналіз; тшцінецкае культурнае кола.

# БРОНЗОВЫЙ ТОПОР НОРТИКЕНСКОГО ТИПА В НИЗОВЬЯХ ГОРЫНИ

**Н. Н. Кривальцевич**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*

Предлагаются результаты идентификационного, сравнительно-типологического анализа бронзового топора типа *Nortycken*, а также сопутствующего ему топора типа *Gołoty* бронзового века, которые найдены в 2022 г. возле Давид-Городка (Столинский район, Брестская область). Регистрация артефакта и археологическое обследование места обнаружения находки проводилась автором в 2022 г. Топор типа *Nortycken*, который мог использоваться в качестве оружия, соответствует признакам восточных прибалтийских топоров и датируется соответственно III периодом бронзового века. Хронология топора типа *Gołoty*, согласно аналогиям на территории Польши, определяется на окончание I и начало II периода бронзового века. Найденные топоры – импорт из прибалтийских регионов через бассейн Буга в Припятском Полесье. Использование рассмотренных импортированных бронзовых топоров происходило в тштинецкий период (средний и поздний этапы развития) и было, вероятно, связано с востребованностью раннего металла носителями тштинецкой культуры Припятского Полесья.

***Ключевые слова:*** Припятское Полесье; бронзовый век; бронзовые топоры; сравнительно-типологический анализ; тштинецкий культурный круг.

# BRONZE AXE OF THE NORTYCKEN TYPE IN THE LOWER REACHES OF THE GARYN RIVER

**M. M. Kryvaltsevich**

*The Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1, 220072, Minsk, Republic of Belarus, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*

The results of the identification, comparative and typological analysis of the bronze axe of the *Nortycken* type, as well as the accompanying axe of the *Gołoty* type of the Bronze Age, found in 2022 near Davyd-Garadok (Stolin district, Brest region), are presented. The registration of the artifact and the archaeological survey of the place of the find discovery were carried out by the author in 2022. The axe of the *Nortycken* type, which could have been used as a weapon, corresponds to the characteristics of the eastern Baltic axes and is dated to the III period of the Bronze Age. The chronology of the *Gołoty* type axe, according to analogies on the territory of Poland, is determined at the end of the I and the beginning of the II period of the Bronze Age. The found axes are imports from the Baltic regions through the Bug basin to Prypyat Palesse. The use of the imported bronze axes under consideration occurred during the Trzciniec period (middle and late stages of development) and was probably related to the demand for early metal by the bearers of the Trzciniec culture in Prypyat Palesse.

***Keywords:*** Prypyat Palesse; Bronze Age; bronze axes; comparative typological analysis; Trzciniec cultural circle.

Паступова пашыраецца колькасць знаходак металічных вырабаў эпохі бронзы, знойдзеных апошнім часам на тэрыторыі Беларусі. Колькаснае павелічэнне суправаджаецца адкрыццём новых тыпаў і катэгорый медна-бронзавых артэфактаў. Да такога роду знаходак адносіцца бронзавая сякера нартыкенскага тыпу, якая выяўлена ў нізоўях Гарыні (Прыпяцкае Палессе) каля Давыд-Гарадка ва ўрочышчы «Баравое Поле» (рыс. 1, 2). Сякера тыпу *Nortycken* упершыню знойдзена на тэрыторыі Беларусі. «Баравое Поле» – месца выяўлення яшчэ адной знаходкі – бронзавай сякеркі тыпу *Gołoty* (рыс. 3). З фіксацыяй згаданых спецыфічных для бронзавага веку Беларусі тыпаў сякер адкрываецца перспектыва для ўдакладнення часу, накірункаў і шляхоў паступлення на Прыпяцкае Палессе балтыйскага імпарту. Знаходкі дазваляюць выказаць некаторыя меркаванні пра іх функцыянальнае выкарыстанне і мэтавую запатрабаванасць, што, несумненна, пашырае наша ўяўленне пра эпоху бронзы на тэрыторыі Беларускага Палесся.

Сякера нартыкенскага тыпу (рыс. 1, 2) выпадкова знойдзена вясной 2022 г. жыхаром г. Давыд-Гарадка (Столінскі раён, Брэсцкая вобласць) у мясцовасці «Баравое Поле», што на поўдзень ад заходняй гарадской ускраіны Давыд-Гарадка (рыс. 4, *A*). Выраб захоўваецца ў знаходчыка. Вывучэнне сякеры і абследаванне месца яе выяўлення праводзілася мной у красавіку і чэрвені 2022 года. «Баравое Поле» – параўнальна вялікія па плошчы пяс-




*Рыс. 1.* Давыд-Гарадок, урочышча «Баравое Поле». Бронзавая сякера нартыкенскага тыпу.

Малюнак аўтара




*Рыс. 2.* Давыд-Гарадок, урочышча «Баравое Поле». Бронзавая сякера нартыкенскага тыпу.

Фотаздымак аўтара




*Рыс. 3.* Давыд-Гарадок, урочышча «Баравое Поле». Бронзавая сякерка тыпу *Gołoty*.
Малюнак аўтара

чаныя і ўзараныя пагоркі ў правабярэжжы Гарыні, якія ўзвышаюцца паміж старыцамі і забалочанымі нізінамі даліны ракі. Паўднёва-заходняя ўскраіна «Баравога Поля» перакапаная кар'ерамі і ямамі.

Паводле паведамлення знаходчыка і непасрэднага дакладнага ўказання месца выяўлення артэфакта, сякера выкапана на невялікай глыбіні ў перааднкладзенай глебе, побач з кар'ерамі, на пераходзе паўднёвага схілу ўзвышша ў забалочаную нізіну (рыс. 4, *А*). Глебавы пласт пагорка па схілу быў пашкоджаны бульдозерам і ссунуты ў высокі вал на край пойменнай нізіны. На месцы, дзе была знойдзена сякера, па краю пойменнай нізіны перад валам ссунутай глебы захаваліся сляды невялікай капанай ямы (рыс. 5).

У чэрвені 2022 г. мной зачышчалася месца выяўлення сякеры. Прасочваліся чорныя тарфяністыя пойменныя адклады (таўшчыня да 40 і болей см), якія перакрываліся шэрай перамяшанай глебай (таўшчыня да 15 см). Пад торфам залягалі супескі і апясчаненыя суглінкі бялёса-жаўтлявага колеру. Вынікае, што на момант выкопвання сякера, мабыць, ляжала ў перамяшанай шэрай глебе, якую бульдозер зрэзваў ў нізіне і ссоваў у вал. Маімі зачысткамі побач з ямай, дзе знайшлі сякеру, на адлегласці каля 40 см ад яе, у змяшанай шэрай глебе быў выяўлены крамянёвы пласцiністы скол з участкамі рэтушы па аднаму краю.




*Рыс. 4.* Давыд-Гарадок, урочышча «Баравое Поле»:
Лакалізацыя збора артэфактаў на месцазнаходжаннях 1 і 2 з вылучэннем месцаў выяўлення бронзавых сякер нартыкенскага тыпу (*А*) і тыпу Gołoty (*Б*);
з выкарыстаннем карты онлайн сэрвіса Google Maps




*Рыс. 5.* Давыд-Гарадок, урочышча «Баравое Поле».
Месца выяўлення (А) бронзавай сякеры нартыкенскага тыпу.
Фотаздымак М. М. Крывальцэвіча (красавік 2022 г.)

Знойдзены на «Баравым Полі» бронзавы выраб ідэнтычны балтыйскім бронзавым сякерам нартыкенскага тыпу, якія вылучаюцца характэрнымі марфалагічнымі паказнікамі, арнаментальным аздабленнем і тэхналогіяй вырабу. Сякеры пераўнальна доўгія і вузкія, з выразна пашыранымі лёзавай і абушковай часткамі, з жалабатымі аздабленнямі па тулаву, з круглай адтулінай для мацавання рукаяткі [гл., напрыклад: 1, tafel 14b, 16g, 20d, k; 2, c. 24–27; 3, pav. 6, 87, 149, 155, 162].

У сякеры з «Баравога Поля» (рыс. 1, 2) наступныя метрычныя параметры: агульная даўжыня – 150 мм; шырыня ляза – 55 мм; шырыня абушка – 31 мм; максімальная шырыня тулава з пярэдняга боку на месцы адтуліны для рукаяткі – 30 мм; дыяметр адтуліны – 20 мм; таўшчыня тулава на месцы адтуліны – 15 мм. Абушок сякеры пашыраны. Лязо шырокае, але, напэўна, першапачаткова было куды шырэй і рабілася з акруглым лёзавым краем, як тое вынікае з традыцыйных для такіх сякер форм. Пры выглядзе з пярэдняга боку ў сякеры амаль ромбападобная форма. Максімальнае пашырэнне тулава на бакавых паверхнях падкрэсліваецца акруглымі гарызантальнымі кантамі. Вузкая паверхня бакавых граняў вышэй і ніжэй згаданых акруглых кантаў аз-

доблена жалабкамі: верхні блок з чатырох жалабкоў даўжынёй амаль 47 мм і шырынёй каля 2 мм; ніжні блок таксама з чатырох жалобкоў (даўжыня каля 70 мм), якія загінаюцца і разыходзяцца парамі ў накірунку да шырокага ляза.

Сякера адліта ў двухбаковай раз'ёмнай форме. На паверхнях пярэдняга і тыльнага бакоў вырабу захаваліся і добра праглядаюцца сляды ліцейнага шва (рыс. 1, 2). Паводле эксперыметальнага мадэлявання тэхналогіі ліцця сякер нартыкенскага тыпу, літнік знаходзіўся ў абушковай частцы вырабу [4, s. 65–70]. Сляды і якасць ліцця заўважаюцца на паверхнях давыд-гарадокскай сякеры ў выглядзе дробных лакун-ямак (рыс. 2). Лязо сякеры моцна спрацаванае, і, напэўна, цягам эксплуатацыі зменшанае ў памерах, з шматлікімі вышчарбінамі і няроўнасцямі па краю. Абушок пашыраны і крыху прыплюшчаны па верхняму краю. Верхняя частка абушка пасярэдзіне збітая, утвараючы вышчарбленае паглыбленне. У двух месцах тулава сякеры, на ўчастках арнаментаванай бакавой паверхні заўважаюцца глыбокія выбаіны, якія маглі ўтварыцца ў старажытнасці ў выніку жорсткіх і моцных udaраў. Сляды пашкоджанняў, а менавіта, зношанае і вышчарбленае лязо, выбаіны ад ўдараў на адной з бакавых арнаментаваных паверхняў, збітая частка абушка, ускосна сведчаць, што сякера магла выкарыстоўвацца ў якасці зброі.

Асноўныя арэалы распаўсюджання сякер нартыкенскага тыпу прасціраюцца ўздоўж балтыйскага ўзбярэжжа ад Даніі да Латвіі [4, žemėl 6] (рыс. 6). Большая іх частка лакалізавана ва Усходняй Прыбалтыцы [2, с. 27]. Тып вылучаны паводле адпаведнай серыі сякер, знойдзеных у скарбе каля паселішча *Nortycken* ва Усходняй Прусіі (цяпер Гарбатаўка Зялёнаградскага раёна Калінінградскай вобласці, Расія) [4, žemėl 6: № 16, pav. 115] (рыс. 6, *16*). Сякеры з *Nortycken* адліваліся ў ліцейных формах двух відаў. Вырабы захаваліся з незагладжанымі ліцейнымі швамі [2, с. 26]. У адной форме адлівалі сякеры, якія знойдзены ў скарбе з *Kaleji* (Ліепайскі раён, Латвія) [4, žemėl 6: № 2, pav. 113] (рыс. 6, *2*). У сямі сякер з *Kaleji* ліцейныя швы таксама незагладжаныя [2, с. 26]. У такім разе, згаданыя сякеры і з *Nortycken*, з *Kaleji* – свежа прыгатаваныя і без практычнага ўжытку вырабы, змешчаныя на захаванне.

У свой час латвійскі археолаг Эдуард Штурмс, аналізуючы бронзавыя вырабы Усходняй Прыбалтыкі, упершыню звярнуў увагу на марфалагічныя адрозненні заходніх і ўсходніх груп сякер [1], якія пазней у літаратуры характарызаваліся адзнакамі вырабаў нартыкенскага ўсходняга і заходняга тыпаў з адгалінаваннямі на падтыпы [гл., напрыклад: 5, s. 43–47, 100–101; 6, s. 55; 7, s. 30–31; 2, с. 24]. Усходні тып адрозніваецца параўнальна меншымі агульнымі памерамі, шырэйшай паўкруглай лёзавай часткай, пашыраным прыплюснутым абухам. Назіраюцца таксама некаторыя асаблівасці сякер усходняга тыпу ў арнаментальным аздабленні і яго размяшчэнні на паверхні вырабаў.

Сякеры ўсходняга тыпу распаўсюджваліся ў рэгіёнах ад Паўночнай Германіі да Латвіі. Заходні тып лакалізуецца адпаведна ў заходніх рэгіёнах пашырэння. Зрэшты, даследчыкі адзначаюць, што сякеры заходняга тыпу сустракаюцца і на ўсходнепрыбалтыйскіх тэрыторыях [гл., напрыклад: 7, s. 30–31; 2, с. 24–26].

Знойдзеная каля Давыд-Гарадка сякера адпавядае прыкметам вырабаў ўсходняга нартыкенскага тыпу. Яна блізкая і аналагічная па форме і параметрах шматлікім знаходкам з тэрыторыі Польшчы, Паўднёва-Ўсходняй і




*Рыс. 6.* Карта распаўсюджання сякер нартыкенскага тыпу [паводле: 4, žemėl 6]:
спіс пунктаў з нумарамі гл.: [4, žemėl 6], чорны квадрат – абазначэнне лакалізацыі сякеры ў нізоўях Гарыні каля Давыд-Гарадка

Усходняй Прыбалтыкі. Напрыклад, з давыд-гарадокскай сякерай, звяртаючы ўвагу на марфалогію і арнаментацыю, збліжаецца серыя сякер з скарбу у *Nortycken* [параўн.: 4, pav. 115]. Назіраецца падабенства палескай знаходкі з сякерамі скарбу *Kaleji* ў Латвіі [4, pav. 113, lentelė IX]. Вырабы, блізкія і ідэнтычныя знаходцы з Давыд-Гарадка, сустракаюцца сярод сякер усходняга нартыкенскага тыпу Літвы [параўн., напрыклад: 3, pav. 6, 87, 155; 2, табл. VII: 2, 3, 6]. *Goniądz* – месцазнаходжанне сякеры нартыкенскага тыпу ў басейне р. Нараў на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Польшчы [7, tabl. 25: 3]. Выраб з *Goniądz* амаль ідэнтычны сякеры з Давыд-Гарадка. *Goniądz* у басейна Нарава, а таксама *Czubin, Krobów* у басейне сярэдняй Віслы [4, žemėl 6: № 17, 23, 24] – самыя ўсходнія месцазнаходжанні сякер нартыкенскага тыпу на землях Польшчы і найбольш тэрытарыяльна набліжаныя да Палесся. Яны могуць абазначаць верагодны накірунак распаўсюджання сякер нартыкенскага тыпу з прыбалтыйскіх тэрыторый на ўсход, у тым ліку на Прыпяцкае Палессе. Неабходна таксама дадаць, што прыкладам блізкай па форме сякеры з Давыд-Гарадка з'яўляецца знаходка з населенага пункта *Miejska Wieś* у паўночна-ўсходняй Польшчы [параўн.: 6, rys. 42d].

Пры вырашэнні праблемы храналогіі, і ў першую чаргу сякер нартыкенскага ўсходняга тыпу, неабходна звярнуць увагу на некаторыя версіі паходжання і эвалюцыі згаданых артэфактаў. Многія даследчыкі пагаджаюцца з тым, што нартыкенскія сякеры ўсходняга тыпу вылучаюцца арыгінальнай формай і іншымі характарыстыкамі, і ва ўсходніх рэгіёнах іх пашырэння сярод металічных матэрыялаў папярэдніх перыядаў не прасочваецца эвалюцыйны шэраг іх развіцця. У сувязі з гэтым дапускаецца, што вытокі генезіса ўсходняга тыпу варта шукаць у заходніх рэгіёнах распаўсюджання сякер нартыкенскага тыпу, дзе яны датуюцца больш раннім часам [5; 6, s. 55; 7, s. 30–31; 2, с. 26–27]. У сувязі з праблемай паходжання і пошукаў першапачатковых цэнтраў іх вытворчасці і распаўсюджання звяртаецца ўвага на два аспекты. Першы аспект – гэта канцэнтрацыя вялікай колькасці сякер ўсходняга тыпу ва Усходняй Прыбалтыцы і іх наяўнасць у скарбах. Другі – прысутнасць серый сякер нартыкенскага ўсходняга тыпу, адлітых у адной–дзвюх формах і з неапрацаванымі ліцейнымі швамі (гл., напрыклад *Nortycken, Kaleji*) [4, pav. 113, 115, lentelė IX; 2, с. 26–27]. Літоўская даследчыца Агне Чывілітэ мяркуе з гэтай нагоды, што ў выпадку з сякерамі нартыкенскага тыпу, як і некаторых іншых усходнебалтыйскіх бронзавых вырабаў, гаворка, напэўна, не павінна весціся пра іх вытворчасць мясцовымі майстрамі. Мабыць, з улікам распаўсюджання сякер у рэгіёнах уздоўж Балтыйскага мора і практыкі тагачаснай металавытворчасці, якая патрабуе дасведчанасці і пэўнай традыцыі, майстры былі прыезжымі і займаліся вытворчасцю сякер непасрэдна на ўсходнебалтыйскіх тэрыторыях [4, s. 234–235]. Услед за іншымі спецыялістамі Агне Чывілітэ сцвярджае, што ўласна ўсходне-прыбалтыйская мясцо-

вая металавытворчасць пачала распаўсюджвацца з IV перыяду эпохі бронзы (1100–900 cal. BC), калі ў культурных пластах ранніх умацаваных паселішчаў адзначалася вялікая колькасць форм для адліўкі бронзавых вырабаў і іншых прыстасаванняў для працы з металам, а таксама ва ўжытку пашырыліся адмысловыя прыбалтыйскія тыпы бронзавых артэфактаў [4, s. 235].

Як мяркуюць некаторыя навукоўцы, заходні нартыкенскі тып сякер мог з'явіцца ўжо ў перыяд II (1500–1300 cal. BC) паўночнаўрапейскага бронзавага веку [гл., напрыклад: 6; 2, с. 26–27]. У дачыненні да ўсходняга нартыкенскага тыпу сякер на тэрыторыі Усходняй Прыбалтыкі, Польшчы абгрунтоўваецца думка іх найбольш верагоднага распаўсюджання ў III перыядзе (1300–1100 cal. BC) эпохі бронзы [5, s. 43–47, 100–101; 7, s. 30–31; 2, с. 26–27]. Храналогія на III перыяд вынікае з тыпалагічнага комплекснага аналізу скарбаў. Прыведзены мной пералік аналагічных і блізкіх давыд-гарадокскай знаходцы сякер з тэрыторыі Польшчы, Усходняй Прыбалтыкі [параўн.: 7, s. 30–31, tabl. 40: 1; 65: 4; 6, s. 55, rус. 42d; 2, с. 26-27, табл. VII: 2, 3, 6] дазваляе датаваць палескую сякеру на III перыяд эпохі бронзы.

Вызначаны інтэрвал часу (III перыяд бронзавага веку) на Прыпяцкім Палессі адпавядае позняму этапу развіцця тшцінецкага культурнага кола. Храналогія палескіх тшцінецкіх помнікаў вызначаецца ў межах каля 1700/1600 – 1200/1000 гг. да н. э. [гл., напрыклад: 8, с. 45–46]. Тшцінецкі матэрыял, а гэта ў першую чаргу кераміка і крамянёвыя вырабы, прысутнічае на Пагарынні, у тым ліку каля Давыд-Гарадка. Асобныя фрагменты керамікі, якія нагадваюць тшцінецкі посуд, знойдзены мной у 2022 г. на «Баравым Полі» – лакалізацыя паверхневых збораў № 1 (рыс. 4, *1*), г. зн. побач з месцам выяўлення бронзавай сякеры нартыкенскага тыпу. Сляды помнікаў тшцінецкага культурнага кола адзначаліся таксама ўздоўж старарэччаў Гарыні каля вёсак Велямічы (паверхневыя зборы В. С. Вяргей, М. М. Крывальцэвіча і інш.), Альпень (паверхневыя зборы Г. М. Бяліцкай у 2019 г.), што насупраць Давыд-Гарадка і «Баравога Поля». Такім чынам, выкарыстанне бронзавай сякеры адбывалася ў позні тшцінецкі перыяд і было, напэўна, звязана з запатрабаванасцю носьбітаў тшцінецкай культуры ў раннім метале. Мабыць, менавіта тшцінецкае насельніцтва пачынае практыкаваць спажыванне металічнага імпарту на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся, тым самым распачынаючы ў рэгіёне ранні бронзавы век [параўн.: 8, с. 39–52].

У 2022 г. на «Баравым Полі», на паўночным схіле пагорка, на месцы лакалізацыі знаходак № 2 (пункт Б) (рыс. 4, *2, Б*), а гэта прыблізна праз 0,5 км на поўнач ад пункта (А) выяўлення сякеры нартыкенскага тыпу, тым жа жыхаром Давыд-Гарадка на раллі знойдзены яшчэ адзін металічны артэфакт эпохі бронзы – металічная сякерка малых памераў з закраінамі (рыс. 3). Бронзавы артэфакт захоўваецца ў калекцыі знаходчыка. Месца выяўлення паказана знаходчыкам і абследавалася мной у красавіку і чэрвені 2022 г.

Метрычныя параметры прылады (рыс. 3): даўжыня – 45 мм; шырыня ляза – 12 мм; шырыня абушка – 9 мм; максімальная таўшчыня – 6 мм. У сякеркі крыху пашыранае і закругленае лязо. Край абушка тонкі і закруглены. Пры бакавым выглядзе ў прылады завостраныя абушковая і лёзавая часткі з плаўным і максімальным пашырэннем закраін пасярэдзіне. Закраіны параўнальна нізкія (вышыня да 1 мм). Яны закруглена-завужаныя на верхніх краях і пашыраныя ў аснаванні. На бакавых гранях сякеркі няма слядоў ліцейнага шва. Паміж закраін, на адной з шырокіх плашчынаў вырабу прасочваецца няроўная вертыкальнай скіраванасці лажбіна з наплывамі металу. На супрацьлеглай плашчыне сляды падобнай лажбіны ёсць толькі на ніжняй паверхні – бліжэй да ляза. Згаданыя дэталі няроўнасці паверхні на плашчынах і вертыкальных лажбін на іх мажліва сведчаць пра тэхналагічны прыём падпраўкі сякеркі коўкай (ударамі па бакавых гранях?) на апошнім этапе апрацоўкі.

Артэфакт паводле асноўных марфалагічных элементаў нагадвае раннія бронзавыя сякеры з закраінамі эпохі бронзы. Адна з асаблівасцяў давыд-гарадокскага вырабу з месцазнаходжання № 2 – вельмі малыя памеры для сякеры (рыс. 3). Форма знаходкі адпавядае тыпу *Gołoty*, які вылучыў польскі археолаг Анджэй Шпунар [9, s. 58, tafel 17: 311]. Лакалізацыя тэрыторыі пашырэння згаданага тыпу абмяжоўваецца паўночнымі ўскраінамі цэнтральнай Польшчы – нізоўямі Віслы і вярхоўямі ракі Нотэц (правы прыток Варты) [9, tafel 37: A]. Даўжыня сякерак тыпу *Gołoty* на тэрыторыі Польшчы – ад 66 да 82 мм [9, s. 58], што ў пэўнай ступені адрознівае іх у параўнанні з давыд-гарадокскай знаходкай (45 мм). Тым не менш іх марфалагічнае падабенства бясспрэчнае. А. Шпунар схіляецца да датавання сякер тыпу *Gołoty* у межах заканчэння перыяду I і пачатку перыяду II эпохі бронзы [9, s. 58], г. зн. прыблізна на сярэдзіну II тыс. да н. э.

У такім разе, з улікам магчымай храналогіі сякер тыпу *Gołoty*, эпізод выкарыстання давыд-гарадокскай сякеркі з месцазнаходжання № 2 прыходзіцца на сярэдні этап тшцінецкай культуры палескага бронзавага веку. Адзін з верагодных накірункаў сувязі раёнаў лакалізацыі сякер тыпу *Gołoty* і нізоўяў Гарыні на Палессі мог пралягаць праз басейн Віслы і Заходняга Буга ў басейн верхняй Прыпяці.

У выніку вывучэння давыд-гарадокскай сякеры нартыкенскага тыпу з нізоўяў Гарыні і мікрарэгіянальна спадарожнай ёй сякеркі з закраінамі тыпу *Gołoty* можна прапанаваць наступныя заключныя высновы:

1. Сякера ўсходняга нартыкенскага тыпу з нізоўяў Гарыні – пакуль адзіная знаходка на тэрыторыі Беларусі. Асноўная тэрыторыя іх распаўсюджання лакалізуецца ў прыбалтыйскіх рэгіёнах ад Паўночнай Германіі да Латвіі. Храналагічны этап ужывання ўсходняга тыпу на тэрыторыі Польшчы і Усходняй Прыбалтыкі прыходзіцца на III перыяд паўночнаеўрапейскага брон-

завага веку, што можа адпавядаць позняму тшцінецкаму перыяду на Палессі і непасрэдна на Пагарынні. Мяркуецца, у адпаведнасці з фіксацыяй слядоў выкарыстання, сякера ўжывалася ў якасці зброі.

2. Давыд-гарадокская сякера нартыкенскага тыпу – імпарт з асноўных тэрыторый іх распаўсюджання. Шляхі пранікнення вырабу маглі пралягаць праз басейн Віслы – Заходняга Буга і басейн верхняй Прыпяці.

3. Яшчэ адна бронзавая знаходка з «Баравога Поля» – сякерка з закраінамі, якая амаль ідэнтычная тыпу *Gołoty* з прыблізнай храналогіяй на заканчэнне перыяду I і пачатак перыяду II паўночнаеўрапейскага бронзавага веку. Імпарт вырабу ў нізоўі Гарыні прыходзіцца на сярэдні этап развіцця палескіх тшцінецкіх помнікаў. З улікам асноўных раёнаў іх распаўсюджання – паўночныя тэрыторыі цэнтральнай Польшчы – накірункі пранікнення маглі праходзіць праз басейны Віслы, Заходняга Буга і Прыпяці.

4. Выкарыстанне разгледжаных імпартаваных бронзавых сякер адбывалася ў тшцінецкі перыяд (сярэдні і позні этапы развіцця) і было, напэўна, звязана з запатрабаванасцю ранняга метала носьбітамі тшцінецкай культуры Прыпяцкага Палесся, а значыць, у першую чаргу, з адпаведнымі зменамі ў сацыяльным развіцці тагачаснага палескага насельніцтва.

***Падзякаванні:*** аўтар ўдзячны А. Ю. Ткачову за камп'ютарную апрацоўку ілюстрацый да артыкула.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Šturms E.* Die ältere Bronzezeit im Ostbaltikum. Berlin–Leipzig: Walter de Gruyter, 1936. 155 s. (Vorgeschichtliche Forschungen. Heft 10).
2. *Григалавичене Э., Мяркявичус А.* Древнейшие металические изделия в Литве. Вильнюс: Мокслас, 1980. 144 с.
3. *Merkevičius A.* Ankstyvieji metaliniai dirbiniai Lietuvoje. Vilnius: Versus aureus, 2011. 176 p.
4. *Čivilytė A.* Žmogus ir metalas priešistorėje: žvilgančios bronzos trauka. Vilnius: Diemedžio, 2014. 272 p.
5. *Dąbrowski J.* Zabytki metalowe epoki brązu między dolną Wisłą a Niemnem. Wrocław–Warszawa–Kraków: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1968. 231 s.
6. *Dąbrowski J.* Epoka brązu w Północno-Wschodniej Polsce. Białystok: Białostockie Towarzystwo Naukowe, 1997. 188 s.
7. *Blajer W.* Skarby ze starszej i środkowej epoki brązu na ziemiach Polskich. Kraków: Wydawn. Nauk., 1999. 475 s.
8. *Крывальцэвіч М. М.* Праблемы перыядызацыі і храналогіі эпохі бронзы на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі // ГАЗ. 2006. № 22. С. 39–52.
9. *Szpunar A.* Die Beile in Polen I (Flachbeile, Randleistenbeile, Randleistenmeißel) // Prähistorische Bronzefunde. 1987. Abt. IX, Bd. 16. 164 s.

# НЕКАТОРЫЯ НОВЫЯ ЗНАХОДКІ МЕТАЛІЧНЫХ ВЫРАБАЎ БРОНЗАВАГА ВЕКУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**М. М. Крывальцэвіч[1)], А. Ю. Ткачоў[2)], М. М. Чарняўскі[3)]**

*[1)] Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*
*[2)] Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, aleh.tkachou@gmail.com*
*[3)] Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,maxchar@gmail.com*

Прапануюцца вынікі тыпалагічнага, культурна-храналагічнага аналізу 9 металічных вырабаў бронзавага веку (плоскай сякеры, трох сякер з закраінамі, двух наканечнікаў коп'яў, нажа, наканечніка стралы, спіралепадобнай часткі ўпрыгожання), знойдзеных у перыяд з канца 1990-ых гг. да 2025 г. на тэрыторыі цэнтральных і паўднёвых рэгіёнаў Беларусі. Металічныя вырабы датуюцца ў межах II – першай паловы I тыс. да н. э. Дапускаецца, што ўсе яны адносяцца да катэгорыі імпарту і траплялі на тэрыторыю Беларусі з цэнтральнаеўрапейскіх, прыбалтыйскіх і паўднёва-ўсходнееўрапейскіх рэгіёнаў. Непасрэдна на тэрыторыю Беларусі многія разгледжаныя артэфакты пранікалі праз Пабужжа, Заходняе і Усходняе Палессе і былі запатрабаваныя ў тшцінецкі і посттшцінецкі перыяды эпохі бронзы. Знойдзеныя артэфакты паводле свайго найбольш верагоднага функцыянальнага прызначэння, як правіла, залічваюцца ў катэгорыю зброі (сякеры, наканечнікі коп'яў, наканечнік стралы, нож) і ўпрыгожанняў (фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком). Рэдкія на тэрыторыі Беларусі металічныя вырабы, якія імпартаваліся з аддалёных тэрыторый, павінны былі шанавацца і разглядацца ў якасці прэстыжных і экзатычных рэчаў, набываючы значэнне сацыяльных маркераў.

***Ключавыя словы:*** металічныя вырабы; бронзавы век; цэнтральныя і паўднёвыя рэгіёны Беларусі; тыпалагічны і культурна-храналагічны аналіз.

# НЕКОТОРЫЕ НОВЫЕ НАХОДКИ МЕТАЛЛИЧЕСКИХ ИЗДЕЛИЙ БРОНЗОВОГО ВЕКА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

**Н. Н. Кривальцевич[1)], О. Ю. Ткачев[2)], М. М. Чернявский[3)]**

*[1)] Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*
*[2)] Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, aleh.tkachou@gmail.com*
*[3)] Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, maxchar@gmail.com*

Предлагаются результаты типологического, культурно-хронологического анализа 9 металлических изделий бронзового века (плоского топора, трех топоров с закраинами, двух наконечников копий, ножа, наконечника стрелы, спиралевидной части украшения), найденных в период с конца 1990-ых годов до 2025 г. на территории

центральных и южных регионов Беларуси. Металлические изделия датируются в пределах II – первой половины I тыс. до н. э. Допускается, что все они относятся к категории импорта и попадали на территорию Беларуси из центральноевропейских, прибалтийских и юго-восточноевропейских регионов. Непосредственно на территорию Беларуси многие рассмотренные артефакты проникали через Побужье, Западное и Восточное Полесье и были востребованы в тштинецкий и посттштинецкий периоды эпохи бронзы. Найденные артефакты согласно своему наиболее вероятному функциональному назначению, как правило, зачисляются в категорию оружия (топоры, наконечники копий, наконечник стрелы, нож) и украшений (фрагмент изделия со спиралевидным щитком). Редкие на территории Беларуси металлические изделия, которые импортировались с отдаленных территорий, должны были цениться и рассматриваться в качестве престижных и экзотических вещей, приобретая значение социальных маркеров.

***Ключевые слова:*** металлические изделия; бронзовый век; центральные и южные регионы Беларуси; типологический и культурно-хронологический анализ.

## SOME NEW METALLIC GOODS OF THE BRONZE AGE ON THE TERRITORY OF BELARUS

**M. M. Kryvaltsevich[1], A. Y. Tkachou[2], M. M. Charniauski[3]**

*[1] The Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1, 220072, Minsk, Republic of Belarus, mikola.kryvaltsevich@yandex.by*
*[2] The Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1, 220072, Minsk, Republic of Belarus, aleh.tkachou@gmail.com*
*[3] The Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1, 220072, Minsk, Republic of Belarus, maxchar@gmail. com*

The results of the typological, cultural-chronological analysis of 9 metal products of the Bronze Age (a flat axe, three axes with edges, two spearheads, a knife, an arrowhead, a spiral part of the decoration) found in the period from the late 1990s to 2025 in the central and southern regions of Belarus are presented. The metal products date back to the 2nd – first half of the 1st millennium BC. It is assumed that they all belong to the category of imports and came to the Belarusian territory from the Central European, Baltic and South-Eastern European regions. Many of the examined artifacts penetrated directly into the territory of Belarus through the Bug region, Western and Eastern Palesie and were in demand in the Trzciniec and post-Trzciniec periods of the Bronze Age. The found artifacts, according to their most likely functional purpose, are usually classified as weapons (axes, spearheads, arrowheads, knives) and jewelry (a spiral part of the decoration). Rare on the territory of Belarus metal products imported from distant territories must have been valued and considered as prestigious and exotic items, acquiring the value of social markers.

***Keywords:*** metal products; Bronze Age; central and southern regions of Belarus; typological and cultural-chronological analysis.

На тэрыторыі Беларусі знойдзена параўнальна невялікая колькасць металічных вырабаў бронзавага веку. Зрэшты, апошнім часам, галоўным чынам у выніку несанкцыяваных аматарскіх пошукаў з выкарыстаннем металадэтэктараў, адзначаецца павялічэнне колькасці медна-бронзавых знаходак эпохі бронзы. На жаль, да археолагаў трапляюць толькі асобныя і надзвычай абмежаваныя па інфармацыйнасці звесткі пра такія артэфакты.

Артыкул прысвячаецца разгляду некаторых новых металічных вырабаў бронзавага веку, якія знойдзены ў перыяд з канца 1990-ых гг. да 2025 г. на тэрыторыі паўднёвага і цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі (рыс. 1). Толькі адна знаходка – спіралепадобная частка ўпрыгожання – была выяўлена падчас раскопак (помнік Камянюкі-13, раскопкі А. Ю. Ткачова), усе іншыя вырабы знойдзены выпадкова, а археалагічны кантэкст месцазнаходжанняў застаецца не даследаваным альбо малавядомым. Па розных прычынах не праводзіўся спецыяльны аналіз металу знойдзеных артэфактаў. Аўтары прапануюць параўнальна-тыпалагічную і культурна-храналагічную ідэнтыфікацыю вырабаў, вызначаюць асноўныя перыяды распаўсюджання і найбольш верагодныя шляхі пранікнення металічных рэчаў на тэрыторыю Беларусі.

У артыкуле разглядаецца 9 вырабаў: дзве плоскія сякеры з нізкімі закраінамі (г. Заслаўе, Мінская вобласць; в. Боркі, Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці); сякера ўсходнебалтыйскага тыпу з высокімі закраінамі і лязом паўкруглай формы (в. Вавулічы, Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці); сякера тыпу «Казары» (в. Юравічы, Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць); праразны наканечнік кап’я (г. Брэст, вусце ракі Мухавец); наканечнік кап’я з доўгай утулкай (в. Рудкаўка, Іванаўскі раён, Брэсцкая вобласць); арнаментаваны нож (в. Чабатыры, Лагойскі раён, Мінская вобласць); тронкавы наканечнік стралы (в. Страдзеч, Брэсцкі раён, Брэсцкая вобласць); фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком (Камянюкі-13, Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць).

Дададзім, што для абазначэння тыпахраналогіі адпаведных вырабаў выкарыстоўваецца цэнтральна- і паўночнаеўрапейская перыядызацыі эпохі бронзы, пабудаваныя на комплексным вылучэнні тыпаў характэрных рэчаў. Для паўночных рэгіёнаў Еўропы, галоўным чынам для Скандынавіі, Даніі, вылучаюцца перыяды з наступным прыблізным датаваннем:

I (1700–1500 cal. BC);
II (1500–1300 cal. BC);
III (1300–1100 cal. BC);
IV (1100–900 cal. BC);
V (900–700 cal. BC);
VI (700–500 cal. BC).

Цэнтральнаеўрапейская перыядызацыйная шкала пабудавана на вылучэнні перыядаў:

BrA1 (2300/2200–2000/1950 cal. BC);
BrA2 (2000/1950–1600/1500 cal. BC);
BrB–C (1500–1300 cal. BC);
BrD–HaA1 (1300–1100 cal. BC);
HaA2–B1 (1100–900? cal. BC);
HaB2–B3 (900?–700? cal. BC);
HaC–HaD1 (700?–500 cal. BC)

(паводле A. Harding, H. Vandkilde і інш. – гл., напрыклад, бібліяграфію і агляд: [1; 2; 3; 4, p. 14-24]). На аснове згаданых сістэм распрацоўваюцца рэгіянальныя перыядызацыйныя схемы [гл., напрыклад: 3, s. 81–89].




*Рыс. 1.* Карта знаходак металічных вырабаў:

*1* – плоская сякера з нізкімі закраінамі (г. Заслаўе, Мінская вобласць); *2* – плоская сякера з нізкімі закраінамі (в. Боркі, Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці); *3* – сякера ўсходнебалтыйскага тыпу з высокімі закраінамі і лязом паўкруглай формы (в. Вавулічы, Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці); *4* – сякера тыпу «Казары» (в. Юравічы, Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць); *5* – праразны наканечнік кап'я (г. Брэст, вусце ракі Мухавец); *6* – востралісты наканечнік кап'я з доўгай ўтулкай (в. Рудкаўка, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці); *7* – арнаментаваны нож (в. Чабатыры Лагойскага раёна Мінскай вобласці); *8* – тронкавы наканечнік стралы (в. Страдзеч, Брэсцкі раён Брэсцкай вобласці); *9* – фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком (Камянюкі-13, Камянецкі раён Брэсцкай вобласці)

**Плоская сякера з нізкімі закраінамі** (г. Заслаўе, Мінская вобласць) (рыс. 2, *1*). Сякеру выпадкова знайшоў жыхар г. Заслаўя І. В. Жураўлёў у 2016 г. і перадаў у музейную археалагічную экспазіцыю Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дзе выраб і захоўваецца. Паводле паведамлення І. В. Жураўлёва, сякера знойдзена на тэрыторыі сучаснага Заслаўя, у паўднёвым накірунку ад птушкафабрыкі, на ўзвышаным участку левай тэрасы р. Свіслач (рыс. 1, *1*). Месца выяўлення вырабу паказана знаходчыкам на карце. Археалагічнае абследаванне тэрыторыі, на якой знойдзена сякера, не праводзілася.



*Рыс. 2.* Плоскія сякеры з нізкімі закраінамі:
*1* – г. Заслаўе, Мінская вобласць (малюнак М. М. Крывальцэвіча); *2* – в. Боркі, Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці (малюнак А. Ю. Ткачова)

Прылада адносіцца да тыпу плоскіх сякер з нізкімі закраінамі. Метрычныя параметры вырабу: даўжыня 73 мм; шырыня ляза 37 мм; шырыня абушка 25 мм; максімальная таўшчыня з закраінамі 7 мм; максімальная таўшчыня тулава без закраін 5 мм. Лязо пашыранае, дугападобнае, месцамі пашкоджанае ў старажытнасці. Абушок параўнальна шырокі і прывостраны. Край абушка скошаны на адзін бок, але, верагодна, першапачаткова быў прамым. На сякеры прасочваецца паціна цёмна-зялёнага колеру са светлазялёнымі плямамі. На асобных участках верхняй паловы вырабу, на метале захаваліся ледзь заўважныя вертыкальныя і амаль паралельныя пасы зацвярдзелага жаўтлява-шэрага рэчыва (рыс. 3) – сляды субстанцыі, якія могуць быць арганічнымі рэшткамі дзяржальна альбо муфты (драўлянай? рагавой? касцяной?).




*Рыс. 3.* Плоская сякера з закраінамі, г. Заслаўе, Мінская вобласць.
Сляды-рэшткі дзяржальна альбо муфты; фота М. М. Крывальцэвіча

Пры тыпалагічнай ідэнтыфікацыі заслаўскай плоскай сякеры з закраінамі неабходна звярнуць увагу на наступныя марфалагічныя элементы: дугападобнай формы і мала закругленае, мала пашыранае лязо; нізкія закраіны; максімальнае пашырэнне бакавых паверхняў закраін пасярэдзіне; прывостраны і параўнальна шырокі абушок, не выключана, прамы ў першапачатковым варыянце; параўнальна тонкае тулава. Прылады з блізкімі марфалагічнымі паказнікамі сустракаюцца сярод вырабаў, якія вядуць сваё паходжанне ад сякер унеціцкага тыпу цэнтральнаеўрапейскага ранняга бронзавага веку. У скарбах металічных вырабаў на тэрыторыі паўночнай Польшчы даследчыкі вылучаюць сякеры рэгіянальнага тыпу *Grodnica*, якія нагадваюць заслаўскую знаходку і суадносяцца з перыядам BrB [параўн., напрыклад: 1, s. 23–24, tabl. XV: 2, 3; 5, s. 51–54, tafel 57]. Неабходна таксама дадаць, што заслаўскі выраб збліжаецца па асноўных сваіх азнаках з некаторымі сякерамі, якія знаходзілі на тэрыторыі Заходняй Украіны, у тым ліку на Валыні, дзе яны датуюцца эпішнуравым і тшцінецкім перыядамі [гл., напрыклад: 6, с. 78–80; 7, tabl. V: 6; 8, с. 424–426; 9, с. 397–400]. Паводле В. І. Клочкі, сякеры з закраінамі, вытокі тыпалагічнага развіцця якіх варта шукаць ва ўнеціцкай традыцыі, спарадычна фіксуюцца ва ўсходнееўрапейскай лясной зоне [9, с. 397–400].

**Плоская сякера з нізкімі закраінамі** (в. Боркі, Бярозаўскі раён, Брэсцкая вобласць) (рыс. 2, *2*). Сякеру знайшоў жыхар г. Брэста П. Шыманскі у 2015 г. на ворным полі, што на захад ад вёскі Боркі (рыс. 1, *2*). Археалагічныя даследаванні на месцы выяўлення сякеры не праводзіліся. Захоўваецца ў фондах Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Прылада адносіцца да тыпу плоскіх сякер з нізкімі закраінамі (рыс. 2, *2*). Памеры выраба: даўжыня 95 мм; шырыня ляза 38 мм; шырыня абушка 25 мм; максімальная таўшчыня з закраінамі 9 мм; максімальная таўшчыня без закраін 7 мм. Лязо пашыранае, дугападобнае. Бакавыя паверхні закругленыя. Абушок сякеры пашкоджаны. Найбольш верагодна, у першапачатковым выглядзе край абушка быў прамым. З аднаго боку цалкам, а з другога часткова, грані і закраіны ў сякеры знішчаныя. На адной з плоскіх паверхняў амаль на ўсю даўжыню прылады праглядаецца паглыбленае пашкоджанне (след ад плуга альбо вынік сучаснай зачысткі вырабу?). Паверхня сякеры пакрыта цёмна-зялёнай пацінай, якая на ўчастках пашкоджання святлее і набывае светла-зялёны колер.

Выраб, які знойдзены каля вёскі Боркі, нагадвае некаторыя сякеры ўнеціцкіх тыпаў. У прыватнасці, калі звярнуць увагу на невялікую ўвагнутасць бакавых краёў выраба, нізкія закраіны, дугападобнасць ляза, то знаходка зближаецца з сякерамі тыпу *Wrocław-Szczytniki* з тэрыторыі Польшчы [1, s. 19–21] альбо з некаторымі сякерамі тыпу *Grodnice* [1, s. 23–24]. Ужыванне згаданых тыпаў бронзавых вырабаў на тэрыторыі Польшчы адносіцца, галоўным чынам, да заканчэння BrA2 і BrB перыядаў [гл., напрыклад: 1, s. 19, 23].

**Сякера ўсходнебалтыйскага тыпу з высокімі закраінамі і лязом паўкруглай формы** (в. Вавулічы, Драгічынскі раён, Брэсцкая вобласць) (рыс. 1, *3*; 4, *3*). Сякеру знайшла жыхарка горада Драгічын В. В. Мельнічук. Абставіны і дакладнае месца выяўлення сякеры каля в. Вавулічы не ўстаноўлены. У 2000 г. сякеру перадалі на гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. С. Пушкіна, дзе яна цяпер і захоўваецца.

Даўжыня сякеры 106 мм, шырыня ляза 64 мм, шырыня закраін 22 мм. Закраіны пачынаюцца прыкладна праз 10 мм ніжэй верхняга краю абушка. Даўжыня аправы 70 мм, шырыня – 37 мм. Раўчук аправы плоскі, а на пераходзе да ляза з уступам. Закраіны працягваюцца па плечыках лёзавай часткі вырабу. Невялікая круглая выемка зроблена па краю абушка (рыс. 4, *3*).

Выраб з Вавуліч адпавядае асноўным паказнікам усходнебалтыйскіх сякер тыпу *Tautušiai* [параўн. : 3, s. 47; 10, с. 18–23; 4, s. 92–94; 11, pav. 224, 150, 23]. У сякеры з Вавуліч шырокае лязо паўкруглай формы, уступ на месцы перахода ад аправы да ляза – азнакі, якія дазваляюць суадносіць выраб з сякерамі тыпу *Tautušiai* падтыпу *C* [параўн.: 3, s. 47, rус. 42b]. Вырабы тыпу *Tautušiai* сустракаліся, галоўным чынам, у рэгіёнах Памор’я, Усход-

няй і Паўднёва-Усходняй Прыбалтыкі [гл., напрыклад: 3, mapa 12; 4, pav. 78, žemėl 5]. Некаторыя даследчыкі разглядаюць такія сякеры ў якасці рэгіянальнага ўсходнебалтыйскага тыпу [гл., напрыклад: 4, s. 234]. Падтып С, паводле Я. Дамброўскага, датуецца ў межах III–IV перыядаў эпохі бронзы. Пры гэтым, найбольш верагодна, позняя храналогія адносіцца ў першую чаргу да вырабаў з усходніх рэгіёнаў іх распаўсюджання [3, s. 47]. А. Шпунар датуе іх на тэрыторыі Польшчы перыядам III [5, tafel 57].




*Рыс. 4.* Вырабы з бронзы:

*1* – фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком, Камянюкі-13, Камянецкі раён Брэсцкай вобласці; *2* – тронкавы наканечнік стралы, в. Страдзеч, Брэсцкі раён Брэсцкай вобласці; *3* – сякера ўсходнебалтыйскага тыпу з высокімі закраінамі і лязом паўкруглай формы, в. Вавулічы, Драгічынскі раён Брэсцкай вобласці.

Малюнкі А. Ю. Ткачова




*Рыс. 5.* Сякера тыпу «Казары», в. Юравічы, Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць.
Малюнак М. М. Крывальцэвіча

**Сякера тыпу «Казары»** (в. Юравічы, Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць) (рыс. 5). Параўнальна добрай захаванасці сякера знойдзена ў ваколіцах в. Юравічы, захоўваецца ў прыватнай калекцыі (рыс. 1, *4*).

Паводле тыпалагічнай ідэнтыфікацыі, юравіцкая знаходка адпавядае марфалагічным азнакам металічных прыладаў, якія ўкраінскія даследчыкі вылучаюць у тып *«цёслы скарбу «Казары»* [параўн. : 12, с. 100, 103–107, 303]. Як і вырабы тыпу «Казары», юравіцкая знаходка характарызуецца завужэннем абушковай і прылёзавай частак, максімальным пашырэннем тулава пасярэдзіне, шырокім лязом з выступаючымі бакавымі заканчэннямі, а таксама набліжаным да прамакутнай формы папярочным сячэннем тулава, плоскім па тарцу абушком (рыс. 5). У выраба наступныя метрычныя параметры: агульная даўжыня 147 мм; максімальная шырыня тулава 43 мм; максімальная таўшчыня вырабу 14 мм; таўшчыня абушка 7 мм; шырыня абушка 35 мм; шырыня завужэння ў прылёзавай частцы 39 мм; шырыня ляза 44 мм. Вага прылады 515 г.

Візуальны агляд сякеры дазваляе адзначыць некаторыя яе марфалагічныя і тэхналагічныя дэталі. У прыватнасці, калі бакавыя грані прылады прыплюшчаныя, то абедзве шырокія плашчыны зроблены з прадольнымі выпу-

класцямі. Лязо параўнальна вострае, з невялікімі вышчарбінамі па самаму краю. Паверхня сякеры зялянцавага колеру з невялікімі рудаватымі плямамі. На адной з шырокіх плашчынаў, у верхняй яе палове захаваліся сляды ледзь заўважнай зялёнай шурпатасці, якія, мабыць, можна інтэрпрэтаваць як сляды мацавання муфты ці дзяржальна (?). На супрацьлеглай плашчыне, на яе сярэдняй выпуклай паверхні, праглядаюцца мікраскапічныя тонкія надзёўбванні дыяганальнай скіраванасці. Тонкія кароткія насечкі заўважаюцца на адным з кантаў у верхняй палове сякеры.

На тэрыторыі Беларусі некаторымі элементамі формы і метрычнымі параметрамі знаходка з Юравіч нагадвае бронзавую сякеру, якая знойдзена М. М. Чарняўскім пры раскопках паселішча Кастыкі (Вілейскі раён, Мінская вобласць), што на Беларускім Паазер'і. Асноўныя складнікі металу сякеры з Кастык – медзь і волава ў суадносінах адпаведна 90 % і 8–10 %, што характэрна для класічнай і аптымальнай для практычнага выкарыстання бронзы [13, с. 320].

Юравіцкі выраб у найбольшай ступені адпавядае цёслам скарбу «Казары» Чарнігаўскай вобласці Украіны [параўн.: 12, с. 100, 303]. Цёслы тыпу «Казары» часта знаходзілі на Сярэднім Падняпроўі і на некаторых сумежных тэрыторыях, у тым ліку ў Чарнігаўскай, Кіеўскай абласцях Украіны [12, с. 100, 103–107, 303]. Украінскія даследчыкі суадносяць скарб «Казары» і цёслы адпаведнага тыпу з культурным колам Бабіна эпохі бронзы (2300–1700 гг. да н. э. ) [12, с. 303]. Неабходна дадаць, што ў басейне ніжняй Прыпяці, у тым ліку на Мазырскім Палессі і каля Юравіч (Юравічы-3, 4, 5), адзначаліся матэрыялы позняга тыпу культурнага кола Бабіна [гл., напрыклад: 14], якія ў некаторых выпадках спалучаюцца з традыцыямі сярэднедняпроўскай культуры. Матэрыялы бабінскага тыпу з паўднёва-ўсходняй Беларусі разглядаюцца ў складзе адной з паўночных і паўночна-ўсходніх перыферыйных груп пост-катакомбных культур культурнага кола Бабіна з храналогіяй на заключны іх этап, а менавіта, прыблізна на заканчэнне першай – пачатак другой чвэрці II тыс. да н. э. (гл., больш падрабязна, у тым ліку бібліяграфію: [14, р. 139–161].

Найбольш верагодна, знойдзеная ў Юравічах сякера – імпартаваны выраб, які пранік па Дняпру і Прыпяці з суседніх рэгіёнаў паўночнай Украіны.

**Праразны наканечнік кап'я** (г. Брэст, вусце ракі Мухавец) [гл. таксама: 15, с. 152–157] (рыс. 6). Наканечнік выпадкова знайшоў у 2008 г. жыхар г. Брэста Г. А. Умецкі. Старажытны выраб ляжаў у прыруславым пяску, недалёка ад месца ўпадзення ракі Мухавец ў Заходні Буг (рыс. 1, *5*). Знаходка трапіла ў Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, дзе цяпер і захоўваецца. У наканечніка пашкоджаныя і часткова адсутнічаюць асобныя элементы пяра. Аднак больш-менш упэўнена можна аднавіць агульную форму вырабу, што дазваляе разглядаць знаходку як тып наканечніка з праразнымі кры-

ламі [параўн., напрыклад: 16, с. 100–102; 17, p. 235–237 і інш. ] (рыс. 6). Артэфакт знойдзены на параўнальна вялікай адлегласці ад асноўных раёнаў распаўсюджання бронзавых праразных наканечнікаў – Сярэдняга і Ніжняга Падняпроўя, а таксама лесастэпавых і стэпавых тэрыторый на ўсход ад Дняпра [16, рис. 45]. Па комплексу марфалагічных элементаў брэсцкая знаходка нагадвае некаторыя праразныя наканечнікі Сярэдняга Падняпроўя. У такім разе ўзнікае праблема мадэлявання найбольш верагоднага шляху пранікнення знойдзенага бронзавага вырабу ў палескі рэгіён Беларускага Пабужжа.




*Рыс. 6.* Праразны наканечнік кап’я, г. Брэст, вусце ракі Мухавец.

Малюнак М. М. Крывальцэвіча

Даўжыня той часткі наканечніка, якая дайшла да нашага часу, складае 126 мм. У першапачатковым выглядзе даўжыня вырабу магла дасягаць амаль 130 мм. У наканечніка кароткая самкнутая ўтулка (даўжыня яе ад краю да ніжняй часткі пяра 13 мм). На ўтулцы зроблены дзве адтуліны, а вышэй яе краю – невысокае і вузкае патаўшчэнне ў выглядзе валіка. Дыяметр ніжняга краю ўтулкі 23 мм. Ніжнія часткі крылаў праразныя (даўжыня адтулін не перавышала 35 мм). Наканечнік адлівалі ў двухбаковай раздымнай форме, пра што сведчаць сляды ліцейнага шва на бакавых паверхнях. Выраб пакрыты характэрнай для медна-бронзавых вырабаў цёмна-зялёнай пацінай.

Бронзавыя наканечнікі коп’яў з праразнымі крыламі распаўсюджваліся на сумежных з Палессем паўднёва-ўсходніх тэрыторыях Еўропы. Самыя раннія варыянты праразных наканечнікаў адзначаліся ў бережноўска-маёўскай зрубнай культуры (XVII–XII стст. да н. э.). У коп’яў тыпу «Златопаль», якія вылучаў В. І. Клочка, шырокае востралістае пяро з вялікімі акруглымі прарэзамі, а ніжняя частка ўтулкі ўмацавана валікам [18, с. 194]. У бережноўска-маёўскай зрубнай культуры наканечнікі златопальскага тыпу з’яўляюцца больш познім тыпам развіцця форм наканечнікаў коп’яў у параўнанні з некаторымі мясцовымі вырабамі без прарэзаў [18, с. 194]. Я. М. Чарных вылучаў згаданыя раннія праразныя наканечнікі ў тып П-10. Ён лічыў, што Паўночнае Прычарнамор’е было адным з цэнтраў іх паходжання і вытворчасці [16, с. 100–101].

Наступны этап распаўсюджання коп’яў з праразнымі крыламі – белаазёрскі перыяд позняга бронзавага веку (XII–X стст. да н. э.). У гэты час выраблялiся праразныя наканечнікі завадоўскага тыпу з полымяпадобным пяром [18, с. 213–214, рис. 101: 17–20]. Я. М. Чарных вылучаў іх у тып П-12 [16, с. 101–102]. Верагодна, яны ўзніклі ў выніку сінтэзу цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх традыцый і распаўсюджваліся пераважна ў Сярэднім і Ніжнім Падняпроўі [16, с. 102; 18, с. 213–214]. Практыка вытворчасці і выкарыстання наканечнікаў коп’яў і дроцікаў з прарэзамі дажывае да кімерыйскага перыяду (X–VIII стст. да н. э.). У многіх вырабаў гэтага часу можна пабачыць кароткую ўтулку і шырокае лісцепадобнае пяро. Утулка не ўмацоўвалася валікам [18, с. 268, рис. 110].

У знойдзенага на Беларускім Пабужжы наканечніка доўгае лісцепадобнае пяро спалучаецца з кароткай утулкай, якая ўмацоўвалася валікам. Неабходна звярнуць увагу на такі марфалагічны элемент брэсцкага вырабу, як прысутнасць прарэзаў невялікіх памераў. Пры параўнанні палескай знаходкі з вырабамі лабойкаўскай групы, прынамсі з наканечнікамі тыпу «Златаполь», назіраецца толькі агульнае падабенства іх форм, што абумоўлена, відаць, ідэяй вытворчасці праразных наканечнікаў. Іх зблiжае таксама такая азнака, як умацаванне ўтулкі валікам. У наканечнікаў златапольскага тыпу, як правіла, доўгая ўтулка, шырокае і параўнальна кароткае пяро, вялікія прарэзы. Большасць наканечнікаў белаазёрскага этапу адрозніваецца ад брэсцкага вырабу формай пяра і ўтулкі, а таксама адсутнасцю валікаў.

Зрэшты, формы наканечнікаў без прарэзаў, з параўнальна доўгім пяром і кароткай утулкай можна сустрэць у комплексах сабацінаўскай (дрэмайліўскі тып), познетшцінецка-раннебелагрудаўскай груп узбраення позняга бронзавага веку [параўн., напрыклад: 18, рис. 75: 8, 10; 84: 5, 6]. Кароткая ўтулка (зрэдку з адтулінамі) і пяро востралістай формы – характэрныя рысы наканечнікаў без прарэзаў тыпу «Птахіўка», якія В. І. Клочка ўключае ў белазёрска-белагрудаўскую групу ўзбраення і адносіць да белаазёрскага этапу

[18, с. 206, рис. 96: 11–13; фото 17). На яго думку, яны нагадваюць некаторыя тыпы еўрапейскіх наканечнікаў перыядаў НаА1–А2 [18, с. 206]. Арэал наканечнікаў коп'яў з кароткай утулкай і лісцепадобным пяром, паводле Я. М. Чарных, не выходзіў за межы Сярэдняга Падняпроўя [16, с. 102–103, табл. XXVIII: 7, 8].

Спалучэнне адпаведных марфалагічных элементаў дазваляе адносіць наканечнік з Беларускага Пабужжа да белазёрска-белагрудаўскага часу. Найбольш верагодны перыяд яго вытворчасці – канец II тыс. да н. э. Неабходна таксама адзначыць, што некаторымі асаблівасцямі сваёй формы брэсцкая знаходка нагадвае наканечнікі з прарэзанымі крыламі, якія знойдзены на Кіеўшчыне ў Гогаліве [18, рис. 88: 10] і Козінцах [18, рис. 101: 21]. Наканечнік з Гогаліва В. І. Клочко ўмоўна аднёс да златапольскага тыпу, але пры гэтым не выключаў верагоднасць узнікнення такіх вырабаў у выніку развіцця мясцовай усходнеўкраінскай «постзлатапольскай» традыцыі [18, с. 194]. Ён таксама ўмоўна ўключаў у групу наканечнікаў белаазёрскага часу выраб, які знайшлі ў Козінцах, таму што знаходка толькі па некаторых азнаках адпавядала марфалогіі наканечнікаў з прарэзанымі крыламі завадоўскага тыпу [18, с. 214].

Элементы падабенства паміж брэсцкай знаходкай і вырабамі з Гогаліва і Козінцаў дазваляюць меркаваць пра іх тыпалагічную залежнасць і пераемнасць. У такім разе дапускаецца, што раён паходжання брэсцкай знаходкі – Сярэдняе Падняпроўе. Мажліва, з'яўленне ў вусці Мухаўца наканечніка з прарэзанымі крыламі адбылося ў выніку існавання сувязяў, хутчэй за ўсё апасродкаваных, паміж групамі насельніцтва Сярэдняга Падняпроўя і Беларускага Пабужжа.

Знойдзены ў Брэсце наканечнік кап'я з прарэзанымі крыламі, калі мець на ўвазе меркаваны перыяд яго вырабу (канец II тыс. да н. э. ), з'явіўся ў Беларускім Пабужжы сярод позніх груп насельніцтва тшцінецкага культурнага кола. Ва ўсходніх групах тшцінецкіх помнікаў, у тым ліку на тэрыторыі Палесся, прасочваюцца асобныя элементы суседніх паўночна-прычарнаморскіх культур. Вядома таксама, што тшцінецкае насельніцтва выкарыстоўвала некаторыя тыпы металічных вырабаў, для якіх характэрны азнакі стэпавых і лесастэпавых вытворчых цэнтраў [гл., напрыклад: 6, с. 92; 19, s. 173, 177–178, 344–348]. На помніках тшцінецкага культурнага кола неаднаразова знаходзілі металічныя і іншыя рэчы, якія траплялі па камунікацыйных шляхах з Цэнтральнай Еўропы і Паўночнага Прычарнамор'я [гл., напрыклад: 20, p. 302–337; 21, p. 338–367]. Многія імпартаваныя вырабы варта разглядаць у якасці прэстыжных прывазных тавараў, якія канцэнтраваліся ў прадстаўнікоў асобных абшчын. Працэс накаплення каштоўных рэчаў у меншай ступені закрануў палескія анклавы тшцінецкага насельніцтва, пра што сведчыць параўнальна невялікая колькасць прывазных металічных і іншых прэстыжных

рэчаў, знойдзеных на паўночных тшцінецкіх тэрыторыях [22; 8, с. 46–50; 11]. Амаль усе медна-бронзавыя артэфакты Палесся адносяцца да катэгорый упрыгожанняў і зброі. Яны пранікалі з суседніх рэгіёнаў Цэнтральнай Еўропы і Правабярэжнай Украіны [23, с. 246–259; 24, с. 92–93; 25, с. 46–50 і інш.].

У такім разе, знойдзены ў Брэсце наканечнік кап'я з прарэзанымі крыламі – рэдкі ўзор імпартаванай зброі, месца вытворчасці якога, найбольш верагодна, Сярэдняе Падняпроўе, адкуль ён мог трапіць у Беларускае Пабужжа. Для II тыс. да н. э. даследчыкі вызначаюць некалькі найбольш верагодных сухапутных і водных камунікацыйных шляхоў, па якіх адбывалася перамяшчэнне прэстыжных рэчаў, у тым ліку металічных. У тшцінецкі перыяд на прасторах паміж Сярэднім Падняпроўем і Заходнім Бугам адна з самых кароткіх камунікацыйных дарог магла цягнуцца па паўночных ускраінах Валыні ўздоўж Палесся [20, p. 322–327, fig. 22; 21, p. 360, fig. 42]. Некаторыя водныя і сухапутныя камунікацыйныя дарогі, якія ўзніклі ў II тыс. да н. э. паміж рэгіёнамі Паўночнага Прычарнамор'я і Балтыі, і па якіх перамяш-




*Рыс. 7.* Вырабы з бронзы:

*1* – востралісты наканечнік кап'я з доўгай ўтулкай, в. Рудкаўка, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці (фота М. М. Крывальцэвіча); *2* – бронзавы арнаментаваны нож, в. Чабатыры Лагойскага раёна Мінскай вобласці (малюнак А. Ю. Ткачова)

чаліся асобныя каштоўныя рэчы, ідэі, цягнуліся ў заходнім і паўночна-заходнім накірунках ад Сярэдняга і Ніжняга Падняпроўя. Час ад часу шляхі маглі адгаліноўвацца на Заходні Буг [20, fig. 22]. Напэўна, знойдзены ў вусці Мухаўца наканечнік з прарэзаным пяром быў каштоўнасцю для мясцовага тшцінецкага насельніцтва. Ён, мабыць, пранік па аднаму з меркаваных маршрутаў, канечным этапам якога было сярэдняе Пабужжа.

**Востралісты наканечнік кап'я з доўгай утулкай** (в. Рудкаўка, Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) (рыс. 7, *1*). Наканечнік знаходзіцца ў прыватнай калекцыі В. Еўтуховіча (г. Пінск), які ён выпадкова знайшоў разам са сваім сябрам (у 2012 г. ?). Наканечнік знойдзены на полі, якое пачынаецца за лесам, прыблізна праз 0,5 км на поўнач ад паўночна-ўсходняй ускраіны в. Рудкаўка. Згаданае поле прасціраецца ў правабярэжжы ракі Неслуха. Прыблізна праз 1,5 км на ўсход ад месца выяўлення наканечніка р. Неслуха ўпадае ў Піну (рыс. 1, *6*). Месцазнаходжанне абазначана на карце знаходчыкам. Археалагічнае абследаванне тэрыторыі, дзе быў знойдзены наканечнік, не праводзілася.

Пяро наканечніка пашкоджанае па краях, што не дазваляе ўпэўнена рэканструяваць яго першапачатковую форму (рыс. 7, *1*). У прылады параўнальна доўгая ўтулка, на якую прыходзіцца амаль палова даўжыні вырабу. Агульная даўжыня наканечніка 160 мм, пяра – каля 80 мм. Дыяметр утулкі амаль 23 мм. На ёй, каля ніжняга краю і паралельна яму, прарэзана доўгая гарызантальная шчыліна, а вышэй па баках – дзве скразныя круглыя дзіркі. Бронзавы выраб пакрыты ярка-зялёнай пацінай, якая месцамі скрышылася, агаліўшы рудавата-шэрую металічную паверхню.

Адна з асноўных марфалагічных адметнасцей наканечніка – доўгая ўтулка і высока размешчанае пяро. Апошняе займае амаль палову ўсёй даўжыні вырабу. Адзінкавыя прылады блізкага тыпу знойдзены на Сярэднім Падняпроўі і аднесены В. І. Клочкам да познатшцінецкай-раннебелагрудаўскай групы. Ён параўноўвае іх з шматлікімі аналагічнымі бронзавымі вырабамі Цэнтральнай Еўропы, дзе яны сустракаліся ў комплексах перыядаў BrD – HaA эпохі бронзы [18, с. 188–189, рис. 84: 1, 3]. Некаторае марфалагічнае падабенства знаходцы з Рудкаўкі можна ўбачыць у наканечніку са скарбу *Jelenie* (IV перыяд) на тэрыторыі Польшчы [2, tabl. 23: 3]. Такім чынам, ёсць падставы знойдзены каля Рудкаўкі металічны наканечнік датаваць і параўноўваць з блізкімі па форме вырабамі перыядаў BrD – HaA (III–IV) эпохі бронзы ў Цэнтральнай Еўропе.

**Арнаментаваны нож** (в. Чабатыры Лагойскага раёна Мінскай вобласці) (рыс. 1, *7*; 7, *2*). Выраб выпадкова знойдзены летам 2014 г. Месца выяўлення артэфакта на сённяшні дзень не было праверана на наяўнасць іншых археалагічных матэрыялаў прафесійнымі археолагамі. Нож захоўваецца ў вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ.

Артэфакт быў знойдзены ў разламаным выглядзе. Ён прадстаўляе сабой дзве няроўныя ацалелыя часткі – большую частку клінка, якая складае 93 мм у даўжыню, і пяткавую яго частку з рукаяццю, даўжынёй 57 мм (рыс. 7, *2*). Аблом на вырабе амаль вертыкальны, злёгку дугападобны, прыпадае, верагодна, на адну з вертыкальных наразных ліній арнаменту. Агульная даўжыня прылады, такім чынам, да пашкоджання складала не менш за 150 мм. У прадоўжным сячэнні выраб плаўна выгнуты. Вага яго – каля 16,51 г. Прадмет быў выраблены шляхам адліўкі ў плоскай аднабаковай форме, сячэнне клінка – выцягнуты сегмент. Паверхня добрыцы – выгнутая.

Даўжыня цэлага клінка складала не менш 110 мм (?), даўжыня рукаяткі – каля 40 мм. Хваліста-асіметрычны клінок нажа звужаецца да вастрыя. Прыблізна на сярэдзіне даўжыні ад пяткі ён змяшчаецца ад падоўжнай восі ў кірунку рэзальнай кромкі, бліжэй да самага вастрыя вяртаецца да яе, утвараючы лёгкую выпукласць ляза. Пры гэтым пяткавая частка ляза, выглядае, была пашыраная да ўзроўню прылёзавай выпукласці. Выніковая хвалістасць рэзальнай кромкі, верагодна, павінна была павялічваць эфектыўнасць прылады і не дазваляць клінку «запячатваць» сабой рану. Кромка абуха клінка паўтарае выгіны ляза, тую ж «хвалю» працягвае і рукаяць.

Рукаяць паступова звужаецца ад пяткі клінка – з 11 да 4 мм. Сячэнне яе С-падобнае, са знайніцы (з тыльнага боку) закраіны няроўна заплясканыя нерэгулярным фізічным уздзеяннем. Адтуліны для фіксавання накладных пласцін з косткі ці дрэва адсутнічаюць. На карысць выкарыстання рукаяці ў выяўленым непакрытым выглядзе кажа і загнутасць закраін, якая дазваляе пазбегнуць пашкоджання рукі пры моцным намаганні, і наяўнасць на ёй арнаментацыі.

Нож аздоблены наразнымі лініямі амаль па ўсёй паверхні з добрыцы. Вылучаюцца тры зоны арнаментацыі: лёзавая, пераходу да рукаяці і рукаяць. Лёзавая аформлена трыма шэрагамі пахіленых кароткіх нарэзак/насечак. Кожны шэраг пахілены ў іншы бок, разам яны ўтвараюць шырока вядомы на керамічным посудзе позняга неаліту – бронзавага веку матыў «гарызантальнай ялінкі». Пераход да рукаяці аформлены двума шэрагамі вертыкальнага зігзагу, паміж якімі размешчаны чатыры вертыкальныя лініі, якія крыху не даходзяць да краёў прылады. Па крайняй ад вастрыя з іх выраб і быў зламаны. Арнамент на рукаяці прадстаўлены злёгку выгнутай выцягнутай кампазіцыяй з дзвюх падоўжных ліній, прастора паміж якімі запоўнена шэрагам пахіленых нарэзак/насечак. Кампазіцыя пачынаецца яшчэ на пяткавай частцы ляза, каля абуховай яе часткі і завяршаецца, не дайшоўшы 14 мм да канца рукаяці. У прылёзавай частцы пяткі ляза таксама фіксуецца кароткі і не вельмі ахайны шэраг з чатырох насечак, які дапаўняе арнаментальную кампазіцыю рукаяці.

Прамыя аналогіі нажу з-пад в. Чабатыры адсутнічаюць. Паводле тэхналогіі адліўкі вырабу ў плоскай форме яго можна датаваць познім бронзавым – раннім жалезным векам. Бліжэйшыя аналогіі па форме клінка сустракаюцца ў культурах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы гэтага перыяду, у тым ліку і ў жалезных вырабах [26, taf. 130; 27, рис. 1: 1; 28, tabl. XXIV: 1], аднак выяўлены выраб адрозніваецца цэльнай арнаментаванай рукаяткай, якая не ўстаўлялася ў драўляную ці касцяную рукаяць. Ёсць верагоднасць, што нож з-пад Чабатыроў з'яўляецца лакальнай пераробкай імпартаванага вырабу.

**Тронкавы наканечнік стралы** (в. Страдзеч, Брэсцкі раён, Брэсцкая вобласць) (рыс. 4, *2*). Тронкавы наканечнік стралы выпадкова знойдзены ў ваколіцах в. Страдзеч (рыс. 1, *8*) і перададзены ў Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Абставіны выяўлення невядомы. У наканечніка адламана вастрыё. На адным баку ёсць патаўшчэнне ўздоўж восі пяра, другі бок пляскаты (рыс. 4, *2*). Асіметрычнасць пяра ў разрэзе дазваляе меркаваць, што наканечнік быў выраблены шляхам адліўкі ў плоскай аднабаковай форме. Даўжыня часткі, якая захавалася, 53 мм, шырыня 16 мм, таўшчыня 4 мм. Даўжыня тронка 28 мм, шырыня 7 мм, максімальная таўшчыня 3 мм.

Блізкія і аналагічныя па форме вырабы сустракаліся на тэрыторыі ўсходняй і паўднёвай Польшчы. Адносяцца яны да тронкавых наканечнікаў з лапаткападобным афармленнем пяра – *«łopatkowato uformowanym liściem»* [29, s. 66, ryc. 1, 2]. Аналагічныя тронкавыя наканечнікі знойдзены на помніках тшцінецкага культурнага кола, прынамсі, у курганах (Дубечно, Стругі, Тышовце), а адзін – сярод матэрыялаў паселішча ў Льгуве [29, s. 66].

**Фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком** (Камянюкі-13, Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць) (рыс. 4, *1*). Фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком выяўлены падчас выратавальных даследаванняў на поўдні Белавежскай пушчы на помніку Камянюкі-13 (раскопкі А. Ю. Ткачова 2016 г.). Помнік размяшчаецца на пагорку, які знаходзіцца праз 0,7 км на паўночны ўсход ад маста праз раку Лясная Правая. Пагорак узвышаецца між старым і новым рэчышчамі ручая – прытока Лясной Правай (рыс. 1, *9*). Асноўная частка археалагічнага матэрыялу, знойдзенага ў Камянюках-13, адносіцца да канца неаліту і звязваеццца з дабраборскім этапам нёманскай культуры. Акрамя таго, у калекцыі маюцца матэрыялы позняга мезаліту (яніславіцкая культура), ранняга неаліту (прыпяцка-нёманская культура). Матэрыялы больш пазнейшых эпох прадстаўлены фрагментам бронзавага вырабу і венчыкам ляпнога начыння.

Ад металічнага вырабу захаваўся спіралепадобны шчыток з адыходзячым плоскім драцяным працягам (рыс. 4, *1*). Дыяметр шчытка 20 мм, шырыня дроту 2 мм, таўшчыня 1 мм. Частка знешняга вітка пашкоджаная. Драцяная аснова шчытка сплюшчаная. Дрот плюшчылі прыладай са сферычнай паверхняй. Сведчанне таму – след ад нанесенага ўдару на знешнім

вітку ў месцы адыходу дроту ад спіралі. Выраб пакрыты цёмна-зялёнай пацінай, якая ў месцах пашкоджання набывае светла-зялёны колер. На жаль, фрагментарнасць металічнай аздобы не дазваляе рэканструяваць поўны яе выгляд, а значыць, дакладна ідэнтыфікаваць яе тып.

Самыя раннія ўпрыгажэнні са спіралепадобнымі шчыткамі знойдзены на тэрыторыі Беларусі ў сярэднедняпроўскай культуры (могільнік Ходасавічы-Мошка, курган 11, пахаванне 1). Спіралепадобныя шчыткі ходасавіцкіх падвесак таксама зроблены з прамавугольнага ў сячэнні меднага дроту [30, с. 35, рис. 22: 1, 2; 47: 28, 29]. Вырабы са спіралепадобнымі шчыткамі (падвескі, шпількі, фібулы, бранзалеты і інш.) сустракаліся ў многіх культурах наступных перыядаў бронзавага і жалезнага вякоў [гл., напрыклад, 31, с. 61, 138, 192, 254, мал. 31: 12–14, 49: 9–12, 31, 32, 61: 6, 84: 1, 4, 19].

На помніку Камянюкі-13 побач з спіралепадобным шчытком знаходзіліся фрагменты слабапрафіляванай керамічнай пасудзіны з маларэльефным храпаватым пакрыццём паверхні. Форму пасудзіны аднавіць не ўдалося. Кераміка падобнага тыпу, калі прыняць да ўвагі спосаб аздаблення знешняй паверхні, распаўсюджвалася ў канцы эпохі бронзы і ў пачатку жалезнага веку. Бадай, згаданая кераміка можа быць адзіным кампанентам, які, напэўна, быў адначасовы з упрыгажэннем са спіралепадобным шчытком.

Такім чынам, прааналізаваныя металічныя вырабы датуюцца ў межах II – першай паловы I тыс. да н. э. Дапускаецца, што ўсе яны адносяцца да катэгорыі імпарту і траплялі на нашы землі з цэнтральнаеўрапейскіх, прыбалтыйскіх і паўднёва-ўсходнееўрапейскіх рэгіёнаў. Непасрэдна на тэрыторыю Беларусі многія разгледжаныя артэфакты пранікалі праз Пабужжа, Заходняе і Усходняе Палессе і былі запатрабаваныя ў тшцінецкі і посттшцінецкі перыяды эпохі бронзы. Знойдзеныя артэфакты, паводле свайго найбольш верагоднага функцыянальнага прызначэння, як правіла, залічваюцца ў катэгорыю зброі (сякеры, наканечнікі коп’яў, наканечнік стралы, нож) і ўпрыгожанняў (фрагмент вырабу са спіралепадобным шчытком). Рэдкія на нашых землях металічныя вырабы, якія імпартаваліся з аддаленых тэрыторый, павінны былі шанавацца і разглядацца ў якасці прэстыжных і экзатычных рэчаў, набываючы значэнне сацыяльных маркераў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Blajer W.* Skarby z wczesnej epoki brązu na ziemiach polskich. Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk–Łódź: Ossolineum, 1990. 300 s.

2. *Blajer W.* Młodsza epoka brązu na ziemiach Polskich w świetle badań nad skarbami. Kraków: Historia Iagellonica, 2013. 290 s.

3. *Dąbrowski J.* Epoka brązu w Północno-Wschodniej Polsce. Białystok: Białostockie Towarzystwo Naukowe, 1997. 188 s.

4. *Čivilytė A.* Žmogus ir metalas priešistorėje: žvilgančios bronzos trauka. Vilnius: Diemedžio, 2014. 272 p.

5. *Szpunar A.* Die Beile in Polen I (Flachbeile, Randleistenbeile, Randleistenmeißel) // Prähistorische Bronzefunde. 1987. Abt. IX, Bd. 16. 164 s.

6. *Березанская С. С.* Средний период бронзового века в Северной Украине. Киев: Наукова думка, 1972. 268 с.

7. *Dąbrowski J.* Powiązania ziem Polskich z terenami wschodnimi w epoce brązu. Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk: PAN, Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1972. 319 s.

8. *Маркус І., Охріменко Г.* Озброєння та знаряддя праці населення Західної Волині IV–II тис до Р. Х. Луцьк: Волинська обласна друкарня, 2010. 492 с.

9. *Клочко В. І.* «Гордіївський феномен» // Peregrinationes archaeologikae in Asia et Europa Joanni Chochorowski dedikatae. Kraków, 2012. S. 395–404.

10. *Григалавичене Э., Мяркявичюс А.* Древнейшие металические изделия в Литве. Вильнюс: Мокслас, 1980. 115 с.

11. *Merkevičius A.* Ankstyvieji metaliniai dirbiniai Lietuvoje. Vilnius: Versus aureus, 2011. 176 p.

12. *Клочко В. И., Козыменко А. В.* Древний металл Украины. Киев: б. и., 2017. 367 с.

13. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі. Мінск: Беларуская навука, 1997. 424 с.

14. *Kryvaltsevich M.* Babino-type ceramics in the Eastern Palessiye // Baltic-Pontic Studies. 2013. Vol. 18. The Ingul-Donets Early Bronze civilization as springboard for transmission of Pontic cultural patterns to the Baltic Drainage Basin: 3200–1750 BC. P. 139–161.

15. *Кривальцевич Н. Н.* Бронзовый прорезной наконечник копья из Брестского Побужья // Донецький археологічний збірник. 2012. № 16. С. 152–157.

16. *Черных Е. Н.* Древняя металлообработка на Юго-Западе. Москва: Наука, 1976. 302 с.

17. *Klochko V. I.* Weaponry of Societies of the Northern Pontic Culture Circle: 5000–700 BC. Poznań: UAM, 2001. 376 p. (Baltic-Pontic Studies. Vol. 10).

18. *Клочко В. І.* Озброєння та військова справа давнього населення України (5000–900 рр. до Р. Х. ). Київ: АртЕк, 2006. 337 с.

19. *Makarowicz P.* Trzciniecki krąg kulturowy – wspólnota pogragicza Wschodu i Zachodu Europy. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2010. 446 s.

20. *Makarowicz P.* Baltic-Pontic interregional routes at the start of the Bronze Age // Baltic-Pontic Studies. 2009. Vol. 14. Routes Between the Seas: Baltic-Bug-Boh-Pont from the 3rd to the Middle of the 1st millennium BC. P. 302–337.

21. *Lysenko S. D., Lysenko S. S.* Ground communications of the Eastern Area of the Trzciniec Culture Circle // Baltic-Pontic Studies. 2009. Vol. 14. Routes Between the Seas: Baltic-Bug-Boh-Pont from the 3rd to the Middle of the 1st millennium BC. P. 338–367.

22. *Kryval'cevič M.* Z badań nad kultura trzciniecka na Polesiu Białoruskim w dorzeczu Prypeci // Folia Praehistorica Posnaniensia. 1997. T. VIII. S. 69–97.

23. *Крывальцэвіч М. М., Лебедзь В. А.* Бронзавая сякера з сярэдзіннымі крылкамі з Пінска // МАБ. 2001. № 3. С. 246–250.

24. *Лебедзь В. А.* Абручовыя аздобы з Горбава-Здзітава Бярозаўскага раёна // ГАЗ. 2003. № 18. С. 92–93.

25. *Крывальцэвіч М. М.* Праблемы перыядызацыі і храналогіі эпохі бронзы на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі // ГАЗ. 2006. № 22. С. 39–52.

26. *Dergačev V.* Die äneolithischen und bronzezeitlichen Metallfunde aus Moldavien. Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2002. 387 s.

27. *Шрамко И. Б., Буйнов Ю. В.* Переход от бронзы к железу в Днепро-Донецкой лесостепи // Российский Археологический ежегодник. 2012. № 2. С. 309–332.

28. Maciejewski M. Metal – granica – rytuał. Badania nad depozytami przedmiotów metalowych w kontekście sieci osadniczej (tablice zabytków metalowych / figures presenting bronze and iron artefacts). Poznań: Wydawnictwo Nauka i Innowacje, 2016. 198 s.

29. *Gedl M.* Brązowe grociki strzał z trzonkiem z terenu Polski // Rocznik Przemyski. 2003. T. XXXIX, Z. 2. S. 65–72.

30. *Артеменко И. И.* Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. Москва: Наука, 1967. 137 с. (МИА. № 148).

31. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 2. Жалезны век і ранняе сярэднявечча. Мінск: Беларуская навука, 1999. 502 с.

# МАТЭРЫЯЛЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ І ТЫС. Н. Э. З ТЭРЫТОРЫІ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў НАВУКОВЫХ ПУБЛІКАЦЫЯХ А. А. ЕГАРЭЙЧАНКІ

**П. С. Курловіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, kurlovichp@bsu.by*

У артыкуле аналізуюцца апублікаваныя матэрыялы другой паловы І тыс. н. э. з паселішчаў, даследаваных А. А. Егарэйчанкам на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я. Па меркаванні навукоўца, разглядаемыя помнікі ўтрымліваюць матэрыялы чатырох этапаў засялення. Першы звязаны з днепра-дзвінскай культурай і культурай ранняй штрыхаванай керамікі. Другі – з культурай позняй штрыхаванай керамікі (да ІІІ ст. н. э.). Затым, паводле А. А. Егарэйчанкі, у рэгіёне з’яўляюцца балцкія старажытнасці, для якіх была характэрная гладкасценная, а таксама з шурпатай і аблітай паверхняй кераміка слоікавых формаў. У канцы І тыс. на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я распаўсюджваюцца матэрыялы культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, якія, у сваю чаргу, змяняюцца старажытнасцямі, звязанымі з уключэннем рэгіёна ў склад Полацкай зямлі. Каб скласці больш поўнае ўяўленне пра культурна-храналагічную сітуацыю ў рэгіёне, неабходна ў першую чаргу правесці аналіз керамічнага комплексу, а таксама ўсталяваць кантэкст знаходак на даследаваных помніках.

***Ключавыя словы:*** Браслаўскае Паазер’е; старажытнасці трэцяй чвэрці І тыс. н. э.; культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў; гістарыяграфія.

# МАТЕРИАЛЫ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ І ТЫС. Н. Э. С ТЕРРИТОРИИ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В НАУЧНЫХ ПУБЛИКАЦИЯХ А. А. ЕГОРЕЙЧЕНКО

**П. С. Курлович**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, kurlovichp@bsu.by*

В статье анализируются опубликованные материалы второй половины І тыс. н. э. с поселений, изученных А. А. Егорейченко в Браславском Поозерье. По мнению учёного, рассматриваемые памятники содержат материалы четырёх этапов заселения. Первый связан с днепро-двинской культурой и культурой ранней штрихованной керамики. Второй – с культурой поздней штрихованной керамики (до ІІІ в. н. э.). Затем, по мнению А. А. Егорейченко, в регионе появляются балтские древности, для которых характерна гладкостенная, а также с шероховатой и облитой поверхностью керамика баночных форм. В конце І тыс. н. э. в Браславском Поозерье распространяются материалы культуры смоленско-полоцких длинных курганов, которые, в свою очередь, сменяются древностями, связанными с включением региона в состав Полоцкой земли. Для формирования более полной картины культурно-

хронологической ситуации в регионе необходимо, прежде всего, проанализировать керамический комплекс, а также установить контекст находок на исследованных памятниках.

***Ключевые слова**:* Браславское Поозерье; древности третьей четверти I тыс. н. э.; культура смоленско-полоцких длинных курганов; историография.

## THE SECOND HALF OF THE 1ST MILLENNIUM AD MATERIALS FROM THE TERRITORY OF NORTHWESTERN BELARUS IN SCIENTIFIC PUBLICATIONS OF A. A. EGOREJCHENKO

**P. S. Kurlovich**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4,*
*220030, Minsk, Republic of Belarus, kurlovichp@bsu.by*

The article analyzes published materials from the second half of the 1st millennium AD from the settlements studied by A. A. Egorejchenko in the Braslav Poozerye. According to the scientist, the sites contain materials from four stages of settlement. The first is associated with the Dnieper-Dvina culture and the Early hatched pottery culture. The second is associated with the Late hatched pottery culture (before the 3rd century AD). Then, according to A. A. Egoreychenko, Baltic antiquities appeared in the region, which were characterized by smooth-walled, as well as plastered and rough surface ceramics of jar forms. At the end of the 1st millennium AD, materials from the Smolensk-Polotsk long barrows culture spread in the Braslav Poozerye, which, in turn, were replaced by antiquities associated with the region inclusion in the Polotsk land. To form a more complete picture of the cultural and chronological situation in the region, it is necessary, first of all, to analyze the ceramic complex, as well as to establish the context of the finds at the studied sites.

***Keywords:*** Braslav Poozerye; antiquities of the third quarter of the 1st millennium AD; the Smolensk-Polotsk long barrows culture; historiography.

Аляксандр Андрэевіч Егарэйчанка ўвайшоў у гісторыю айчыннай археалогіі ў першую чаргу як даследчык старажытнасцей жалезнага веку. У фокусе яго вывучэння знаходзіліся супольнасці, якія былі аднесеныя навукоўцам да культур ранняй і позняй штрыхаванай керамікі [гл, напр., 1–3]. Палявыя даследаванні А. А. Егарэйчанкі, пачынаючы з 1990-х гг., былі засяроджаны на вывучэнні паселішчаў жалезнага веку на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я, а менавіта гарадзішчаў Тарылава, Зазоны і Рацюнкі, а таксама паселішча Падварынка[1] (рысунак). Аднак гэтыя помнікі ўтрымліваюць

[1]Помнік размешчаны на паўднёвым ускрайку озавай грады і візуальна не ўтрымлівае слядоў умацаванняў. Аднак мясцовасць у рэгёне пашкоджана нямецкімі дотамі і траншэямі часоў Першай сусветнай вайны. Частка пляцоўкі па інфармацыі мясцовых жыхароў была зрыта ў бок Відзаў для забеспячэння праходу праз граду. А. А. Егарэйчанка зафіксаваў тут тры паглыбленні шырынёй каля 3 м і глыбінёй каля 1,15 м, выцягнутыя з захаду на ўсход [4, с. 42]. Такім чынам, магчыма, Падварынка з’яўляецца гарадзішчам, але на сённяшні дзень аднясенне яе да ўмацаваных паселішчаў дыскусійнае. Гэта адлюстроўваецца і ў публікацыях аўтара раскопак, якія ў частцы артыкулаў адносіць помнік да гарадзішчаў, а ў іншай частцы – да паселішчаў.




Лакалізацыя паселішчаў, даследаваных А. А. Егарэйчанкам на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я.

Падложка – Open Street Map

і матэрыялы пазнейшага часу, у тым ліку другой паловы I тыс. н. э., якія часткова ўведзеныя ў навуковы зварот аўтарам раскопак. Прасачыць перспектывы далейшага вывучэння дадзеных матэрыялаў, а таксама вызначыць погляды А. А. Егарэйчанкі адносна культурнай сітуацыі ў рэгіёне пасля знікнення носьбітаў культуры позняй штрыхаванай керамікі і з’яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

**Тарылава.** Даследаванні на гарадзішчы Тарылава (Укля) праводзіліся А. А. Егарэйчанкам у 1992–1994 гг. Тут была ўскрытая плошча ў 180 м$^2$ [5, рис. 2]. Помнік змяшчаецца на пагорку, які знаходзіцца на паўночным беразе воз. Укля. Яго вышыня над навакольнай мясцовасцю – каля 14 м. Іншых слядоў абарончых умацаванняў акрамя падрэзкі схілаў не прасочваецца.

Найбольш грунтоўны артыкул, прысвечаны раскопкам дадзенага помніка, дзе апублікаваныя і матэрыялы, якія можна аднесці да трэцяй чвэрці I тыс. н. э., выйшаў у 2017 г. У ім прыводзіцца выява сямі венцаў ад гладкасценных слоікападобных пасудзін, якія, паводле А. А. Егарэйчанкі, адносяцца да разглядаемага часу (сярэдзіны – трэцяй чвэрці I тыс. н. э.) [5, рис. 8]. Адзначаецца, што слоікавая форма сярод такой керамікі дамінуе, зрэдку сустракаецца слабапрафіляваны посуд, арнаментацыя адсутнічае

[5, с. 271]. Даследчык звязвае наяўнасць матэрыялаў гэтага перыяду з выкарыстаннем гарадзішча ў якасці сховішча жыхарамі прымыкаючага да яго селішча [5, с. 269]. Згодна з табліцай размеркавання керамікі з рознымі спасабамі апрацоўкі паверхні з помніка [5, табл. 1; 6, табл. 1], такі посуд дамінуе ў верхніх трох пластах гарадзішча, дзе сустракаецца таксама большая частка пасудзін з аблітай і шурпатай паверхняй[1]. У адпаведнасці з прафіліроўкаў венцаў, вырабы з аблітай і шурпатай паверхняй маюць слоікавую форму, а гладкасценны посуд з верхніх пластоў пераважна таксама, слабапрафіляваныя венцы адзінкавыя [6, табл. 2]. У наступных чацвёртым і пятым пластах дамінуе штрыхаваная кераміка, а колькасць посуду з аблітай і шурпатай паверхняй памяншаецца. З шостага пласта іх колькасць становіцца яшчэ меншай, затым посуд з такой апрацоўкай паверхні знікае. Пачынае змяншацца і колькасць штрыхаванай керамікі, і ў ніжніх пластах дамінуе гладкасценны посуд.

Да індывідуальных знаходак, якія А. А. Егарэйчанка звязвае з заключнай стадыяй жыцця на гарадзішчы [5, с. 274], адносяцца вырабы з жалеза: нож з прамой спінкай [5, рис. 12: 1], шпора з загнутымі кручкамі [5, рис. 12: 4] і крэсіва [5, рис. 12: 8], а таксама гліняныя праселкі [5, с. 279].

Апублікаваныя А. А. Егарэйчанкам матэрыялы з верхніх пластоў гарадзішча Тарылава не дазваляюць вызначыць іх храналогію больш вузка, чым у межах другой – трэцяй чвэрці I тыс. н. э. Аднак яны дакладна сінхронныя прымыкаючаму селішчу, якое вывучалася В. І. Шадырам [8, табл. 16/II; 9, с. 194–196]. На селішчы на працягу ўсіх пластоў пераважае гладкасценная кераміка, маецца дастаткова значная колькасць фрагментаў вырабаў з аблітай і шурпатай паверхняй, а таксама нязначная колькасць асобнікаў са штрыхоўкай і некалькі фрагментаў вырабаў з зашчыпамі [9, рис. 1: 2, рис. 4].

**Зазоны.** Тут даследавалася не толькі гарадзішча, але і прымыкаючае да яго селішча. У 1995–2000 гг. на гарадзішчы была ўскрытая плошча ў 434 м$^2$ [4, с. 39], а на селішчы – 315 м$^2$ [10, с. 27–28]. Помнік знаходзіцца на тэрыторыі вёскі. Гарадзішча размешчана на пагорку вышынёй каля 12 м з эскарпаванымі схіламі. Селішча прымыкае да гарадзішча з усходняга, паўднёвага і паўднёва-заходняга боку. На значнай яго частцы размешчаны сядзібныя ўчасткі. Матэрыялы другой паловы I – пачатку II тыс. н. э. былі выяўлены не толькі на селішчы, але і на гарадзішчы [10, с. 27]. Паводле А.А. Егарэйчанкі, яно выкарыстоўвалася ў якасці сховішча ці ў трэцяй чвэрці I тыс. [11, с. 25], ці да X ст. [4, с. 41].

[1]Паводле А. А. Егарэйчанкі, кераміка з шурпатай паверхняй мае вялікую колькасць зерняў дробнай жарствы, якія засталіся пасля абмазвання пасудзін растворам вадкай гліны. Кераміка ж з аблітай паверхняй абмазана глінай больш груба, пасля чаго жарства выбівалася [5, с. 269]. У іншай публікацыі аўтара адзначаецца, што частка фрагментаў была арнаментаваная пад венцам скразнымі адтулінамі [7, с. 21].

Адзначаецца, што культурны слой на селішчы прадстаўлены супессю чорнага колеру. Яго магутнасць склала ад 0,3 да 1 м. Ён моцна насычаны ляпной керамікай. Да выяўленых аб’ектаў адносяцца рэшткі глінабітнай печы памерам 1,6х1,9 м [10, с. 28]. Жыццё на селішчы распачалося не пазней за канец IV ст. [12, с. 4].

Пра стратыграфію гарадзішча адносна размяшчэння там матэрыялаў разглядаемага перыяду А. А. Егарэйчанка адзначае, што ў верхніх гарызонтах культурнага слоя пераважае гладкасценная, аблітая і шурпатая кераміка, а на помніку ў цэлым дамінуюць штрыхаваныя і гладкасценныя пасудзіны, у той час як доля фрагментаў вырабаў з іншымі спосабамі апрацоўкі паверхні нязначная [11, с. 23]. У цэлым, гэтая тэндэнцыя адлюстроўваецца і на графіку размеркавання працэнтных суадносін керамікі па пластах, апублікаваным В. І. Шадырам [9, рис. 1: 3].

У артыкуле 1997 г. А. А. Егарэйчанка падзяляе ляпны посуд з селішча на слоікавы (з дыяметрам вусця ад 19 да 26 см) і прафіляваны. Пасудзіны першай групы складаюцца з двух варыянтаў: са сплошчаным ці акруглым краем венца; са скошаным унутр краем венца. Прафіляваныя асобнікі ж характарызуюцца як вырабы з кароткім адагнутым вонкі венцам і выпуклым тулавам. Заўважаецца падабенства аналізуемай керамікі посуду банцараўскай культуры [11, с. 25–26].

У артыкуле 2011 г. адзначаецца прысутнасць на селішчы двух этнакультурных гарызонтаў. Ніжні, паводле А. А. Егарэйчанкі, прадстаўлены знаходкамі ў культурным пласце пераважна гладкасценнай, а таксама часткова з аблітай і шурпатай паверхняй керамікі слоікавай формы і звязаны са старажытнасцямі балтаў [10, с. 28]. Верхні гарызонт, які атаясамляецца даследчыкам са з’яўленнем у рэгіёне славян і звязваецца са старажытнасцямі доўгіх курганоў, прадстаўлены ляпным прафіляваным посудам з кароткім адагнутым вонкі венцам і выразным плечыкам [10, с. 28]. На жаль, выявы і колькасныя паказчыкі керамічнага посуду ў публікацыях не прыводзяцца.

На графіку працэнтнага размеркавання керамікі з рознымі спосабамі апрацоўкі паверхні па пластах на селішчы Зазоны, апублікаваным В. І. Шадырам, бачна, што гладкасценныя вырабы тут абсалютна дамінуюць, але вылучаюцца два пікі, калі крыху павялічваецца працэнт аблітай і шурпатай керамікі (у сярэдніх пластах) і штрыхаванай керамікі (у ніжніх пластах) [9, рис. 1: 4]. Аднак рабіць высновы тут патрэбна з улікам таго, што, як вынікае з апублікаваных матэрыялаў, магутнасць слоя на селішчы нераўнамерная.

Асобныя апублікаваныя індывідуальныя знаходкі з гарадзішча і селішча Зазоны датуюцца трэцяй чвэрцю І тыс. н. э. (авальная жалезная спражка [10, рис. 1: 3] і бранзалет з патоўшчанымі канцамі [10, рис. 1: 12]). Да гэтага ж часу даследчыкам адносіцца знаходка жалезнай пласцінкавай шпоры з загнутымі канцамі [11, с. 26]. Жалезная спражка з прагібам у цэнтраль-

най частцы [10, рис. 1: 2], аднесеная А. А. Егарэйчанкам таксама да трэцяй чвэрці, магчыма, можа датавацца і больш познім часам. Таксама ў Зазонах выяўлены матэрыялы апошняй чвэрці I – пачатку II тыс. н. э. – буйныя трапецападобныя падвескі [10, рис. 1: 5, 6, 10] і больш дробныя, змешчаныя на біэсападобным ланцугатрымальніку [10, рис. 1: 1], умбонападобная бляха з загнутым краем [10, рис. 1: 7], падковападобная фібула [10, рис. 1: 8], спражка амегападобнай формы з прамакутнай абоймай [10, рис. 1: 4], 14-гранная гірка [10, с. 28]. Таксама да другой паловы I тыс. адносяцца знаходкі нажоў з валютападобным навершам. Яны захоўваюцца ў фондах вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ, аб іх знаходках піша В. І. Шадыра, аднак у публікацыях самога аўтара раскопак гэтыя вырабы не прыведзены [9, с. 194].

У сваім першым артыкуле, прысвечаным матэрыялам з Зазонаў, А. А. Егарэйчанка прадатаваў знаходкі з селішча ў межах V–VIII стст. і адзначыў, што яно ўяўляе сабой адно з самых паўночных паселішчаў банцараўскай культуры [11, с. 26]. Дадзеная пазіцыя атрымала крытыку В. І. Шадыры, які заўважыў, што, мяркуючы па абліччы керамічнага посуду, разглядаемы помнік адносіцца да кола паселішчаў з аблітай і гладкасценнай керамікай, а матэрыялы, якія сустракаюцца ў банцараўскай культуры, патрапілі сюды ці на заключным этапе існавання паселішча, ці ў выніку ўзаемаўплываў, звязаных з культурным абменам ці цераспалосным рассяленнем насельніцтва. Паводле даследчыка, падобная сітуацыя характэрная і для матэрыялаў гарадзішча «Замкавая Гара» ў Браславе [9, с. 194]. У пазнейшых публікацыях А. А. Егарэйчанка быў больш асцярожны адносна культурнага вызначэння разглядаемых старажытнасцей [10, с. 28; 13, с. 295].

На жаль, керамічны комплекс з селішча Зазоны дагэтуль не апублікаваны, што ўскладняе культурна-храналагічную характарыстыку дадзенага паселішча. Можна адзначыць толькі шырокае датаванне помніка ў межах сярэдзіны – другой паловы I тыс., магчыма, да пачатку II тыс.

**Рацюнкі.** Дадзенае гарадзішча даследавана практычна цалкам. Яно знаходзіцца ў паўднёвай частцы вёскі, на ўзорку вышынёй каля 10 м, схілы якога эскарпаваныя. У 1978, 1979 і 1981 гг. пад кіраўніцтвам Л. У. Дучыц і ў 1999–2008 гг. пад кіраўніцтвам А. А. Егарэйчанкі тут было ўскрыта 1008 м$^2$ [4, с. 41]. У 2000 г. раскопкі на гарадзішчы праводзіліся пад кіраўніцтвам А. М. Мядзведзева [12, с. 4].

Адносна матэрыялаў другой паловы I тыс. н. э. А. А. Егарэйчанка ў сваіх публікацыях адзначаў наяўнасць тут слоікавага посуду сярэдзіны – трэцяй чвэрці I тыс. н. э., а таксама кружальных пасудзін [4, с. 41]. З індывідуальных знаходак гэтага часу прыводзіцца спражка авальнай формы з патоўшчанай пярэдняй часткай, аналагічная выяўленай на селішчы ў Зазонах [13, рис. 2: 7]. Даследчык датуе яе фазай D эпохі Вялікага перасялення народаў

і звязвае з матэрыяламі балцкай культуры канца IV – пачатку VII ст. [13, с. 295] У артыкуле Л. У. Дучыц і А. Р. Мітрафанава адзначаецца прысутнасць на гарадзішчы з VI ст. жыхароў прымыкаючага селішча, якія выкарыстоўвалі яго ў якасці сховішча [14, с. 180]. Аднак само селішча, на жаль, захавалася кепска, так як разарана цалкам. Пры гэтым у ходзе шурфоўкі і збораў тут была выяўлена ляпная слабапрафіляваная і слоікавая кераміка, біканічныя праселкі з дастаткова шырокай адтулінай, што прымушае даследчыкаў шукаць аналогіі ў банцараўскай культуры, а таксама кружальны посуд і дужка ад вядра.

Больш выразна прадстаўлены ў Рацюнках гарызонт часоў Полацкай зямлі. Паводле Л. У. Дучыц і А. Р. Мітрафанава, тут не пазней за канец XI ст. узнікае сядзіба феадала на гарадзішчы і феадальная вёска на селішчы побач [14, с. 180]. У цэлым выяўленыя тут матэрыялы дадзенага перыяду датуюцца ў шырокіх межах з X па пачатак XV ст. [14, с. 165–167]. Таксама адзначаецца, што па звестках мясцовых жыхароў культурны слой зверху пляцоўкі быў перанесены на агароды, таму патэнцыйна комплекс рэчаў гэтага часу мог бы быць прадстаўлены значна лепш [14, с. 165].

А. А. Егарэйчанка зафіксаваў сярэдневяковыя знаходкі ўва ўсёй тоўшчы культурнага пласта на гарадзішчы ў Рацюнках, аднак заўважыў, што стратыграфічна яны не вылучаюцца [15, с. 209]. Матэрыялы, якія сведчаць аб розных баках жыцця на паселішчы ў часы Полацкай зямлі, прыводзяцца ў адпаведных публікацыях, а іх храналогія прапануецца ў межах канца IX – пачатку X – XIII стст. [15; 16].

Такім чынам, на гарадзішчы Рацюнкі прасочваецца выразны гарызонт часоў Полацкай зямлі, а звесткі пра матэрыялы больш ранняга часу фрагментарныя. Тым не менш можна са значнай доляй ўпэўненасці сцвярджаць аб прысутнасці тут насельніцтва ў трэцяй чвэрці I тыс. н. э.

**Падварынка.** Палявыя працы пад кіраўніцтвам А. А. Егарэйчанкі праводзіліся тут у 2009–2011, 2013 гг. Ускрытая плошча – 400 м$^2$. Паводле аўтара, да другой паловы I тыс. на помніку адносіцца нязначная колькасць керамікі з аблітай і шурпатай паверхняй [4, с. 42], а таксама біканічныя прасліцы і грубаляпны таўстасценны слоікавы посуд ў невялікай колькасці [12, с. 5; 17, с. 3, 7], характэрныя для трэцяй чвэрці I тыс. н. э. Сярод апублікаваных індывідуальных знаходак сярэдзіны – трэцяй чвэрці I тыс. прыводзяцца жалезныя крэсівы: з лапаткападобнай галоўкай і пласцінкавае з колцападобным навершам [4, с. 43]. Да канца I тыс. адносіцца фрагмент буйной трапецападобнай падвескі [4, рыс. 9: 8], а таксама пацеркі і наканечнік паса, якія могуць датавацца ў межах IX – першай паловы XI ст. [12, с. 5].

Такім чынам, паводле А. А. Егарэйчанкі, даследаваныя на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я ўмацаваныя паселішчы ўтрымліваюць матэрыялы чатырох культурна-храналагічных гарызонтаў:

1. З канца II тыс. да н. э. – у I тыс. да н. э. тут з’яўляюцца носьбіты днепра-дзвінскай культуры, культуры ранняй штрыхаванай керамікі.

2. У I–III стст. н. э. у рэгіёне распаўсюджваецца культура позняй штрыхаванай керамікі.

3. Да канца IV–VII стст. (ці сярэдзіны – трэцяй чвэрці I тыс. н. э.) адносяцца помнікі балтаў з гладкасценнай керамікай слоікавай формы, а таксама з аблітай і шурпатай паверхняй. Дадзеныя матэрыялы знаходзяць пэўнае падабенства ў банцараўскай археалагічнай культуры. Але іх культурная прыналежнасць на дадзены момант дыскусійная.

4. У канцы перыяду ў рэгіёне з’яўляюцца старажытнасці культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў.

Наяўнасць на помніках матэрыялаў розных культурна-храналагічных гарызонтаў дае надзею на магчымасць рэканструкцыі працэсаў змены насельніцтва ў рэгіёне. Пакуль найменш вывучаным з’яўляецца пераход ад старажытнасцей культуры позняй штрыхаванай керамікі да трэцяй чвэрці I тыс., а таксама больш дакладная храналогія і культурная прыналежнасць насельніцтва з гладкасценнай, шурпатай і аблітай керамікай слоікавых формаў. Другое актуальнае пытанне – пераход ад старажытнасцей трэцяй чвэрці I тыс. да матэрыялаў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Мяркуючы па даных з курганных могільнікаў, насельніцтва дадзенай культуры з’яўляеца тут не раней за IX–X стст., магчыма, бліжэй да канца IX ст. [18, с. 17; 19, с. 283; 20, с. 112].

А. А. Егарэйчанка распачаў справу ўвядзення ў навуковы зварот матэрыялаў другой паловы I тыс. н. э. з даследаваных ім паселішчаў на тэрыторыі Браслаўскага Паазер’я. Аднак наяўных публікацый не дастаткова, каб скласці ўяўленне пра культурна-храналагічную сітуацыю на разглядаемых помніках, наколькі дазваляе крыніцавая база. Апрацоўка матэрыялаў павінна ўключаць, у першую чаргу, аналіз керамічнага комплексу, а для разумення кантэксту знаходак варта правесці аналіз палявой дакументацыі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованной керамики. Минск: БГУ, 2008. 207 с.

2. *Yegoreichenko A.* Regarding about the Cultural Attribution of Hill Forts in Braslav Poozerye // Global Journal of Human-Social Science: D History, Archaeology & Anthropology. 2014. Vol. 14. Is. 5. S. 25–41.

3. *Егорейченко А. А.* Памятники культур штрихованной керамики на Северо-Западе и в Центральной Беларуси // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Л. Д. Поболя. В 2 кн. Кн. 2. Минск, 2016. С. 99–160.

4. *Егорейченко А. А.* Древнейшие городища Браславского Поозерья // МАБ. 2020. Вып. 31. С. 36–47.

5. *Егорейченко А. А.* Городище Тарилово (Укля) // Археология и история Пскова и Псковской земли. Вып. 32. Москва–Псков, 2017. С. 264–279.

6. *Егорейченко А. А.* Этнокультурная ситуация в Белорусском Подвинье в железном веке // ГАЗ. 1996. № 10. С. 8–11.

7. *Егорейченко А.* Железный век Браславского Поозерья // Браслаўскія чытанні: матэрыялы III-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі, 21–22 красавіка 1994 г. Браслаў, 1994. С. 20–22.

8. *Шадыра В. І.* Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.) Мінск: ДНУ «Інстытут гісторіі НАН Беларусі», 2006. 150 с.

9. *Шадыро В. И.* Белорусско-литовско-латышское порубежье в эпоху железа и раннего средневековья (этнокультурные аспекты) // Iš baltų kulturōs istorijos. Vilnius, 2000. С. 189–204.

10. *Егорейченко А. А.* Северо-Западная Беларусь во второй половине I – начале II тыс. н. э. (по материалам городища и селища Зазоны) // Труды III (XIX) Всероссийского археологического съезда. Санкт-Петербург–Москва–Великий Новгород, 2011. С. 26–28.

11.Егорейченко А. А. Городище и селище Зазоны // Браслаўскія чытанні: матэрыялы IV-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі 24–25 красавіка 1997 г. Браслаў, 1997. С. 22–26.

12. *Егорейченко А. А.* История археологического изучения древнейших городищ в Браславском Поозерье // Веснік БДУ: навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2012. № 1. С. 3–6.

13. *Егорейченко А. А.* Хронология ранних городищ Браславского Поозерья // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 59-го заседания. Вып. 29. Санкт-Петербург–Москва, 2014. С. 289–297.

14. *Дучиц Л. В., Митрофанов А. Г.* Городище Ратюнки // ГАЗ. 1994. № 5. С. 163–182.

15. *Егорейченко А. А.* Средневековые находки из городища Ратюнки // МАБ. 2017. Вып. 28. С. 209–213.

16. *Егорейченко А. А.* Средневековые находки из городищ Браславского Поозерья // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 61-го заседания. Вып. 31. Москва, 2016. С. 340–348.

17. *Егорейченко А. А.* Поселение Подваринка // Веснік БДУ: навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2012. № 3. С. 3–7.

18. *Плавінскі М. А.* Гісторыя археалагічнага вывучэння курганных могільнікаў захаду Браслаўскага Паазер'я // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф. Мінск, 2013. С. 14–18.

19. *Плавинский Н. А.* Население культуры смоленско-полоцких длинных курганов в Браславском Поозерье // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 60-го заседания. Вып. 30. Москва, 2015. С. 270–285.

20. *Плавинский Н.* На западных рубежах кривичского мира // Край Смоленский. 2019. № 2. С. 111–114.

# ГАРАДЗІШЧЫ БРАСЛАЎСКАГА РАЁНА ПА ДАНЫХ ПАВЕТРАНАГА ЛАЗЕРНАГА СКАНАВАННЯ

**П. С. Курловіч[1], А. А. Сазонаў[2], Я. А. Кухлеўскі[3]**

*[1] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, kurlovichp@bsu.by*
*[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, sazonauaa@bsu.by*
*[3] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, kyhlevskiea@bsu.by*

Мэта артыкула – увядзенне ў навуковы зварот лічбавых мадэлей рэльефу (ЛММ) гарадзішчаў на тэрыторыі Браслаўскага раёна, атрыманых у выніку паветранага лазернага сканавання (ПЛС). Большая частка аб’ектаў утрымлівае напластаванні ранняга жалезнага веку, аднак сустракаюцца і помнікі без культурнага слою ці з матэрыяламі Сярэднявечча – Новага часу. Мяркуючы па атрыманых мадэлях, фартыфікацыя гарадзішчаў, як правіла, прадстаўлена эскарпаванымі схіламі. На асобных помніках маюцца адзінкавыя валы ці рэшткі больш складанай сістэмы ўмацаванняў. ПЛС паказала высокую эфектыўнасць у лакалізацыі гарадзішчаў з геадэзічнай дакладнасцю і фіксаванні іх стану на момант абследавання, а таксама патэнцыял у выяўленні невядомых раней археалагічных аб’ектаў і перспектыўных для вывучэння ўчасткаў.

***Ключавыя словы:*** паветранае лазернае сканаванне (ПЛС); лічбавая мадэль мясцовасці (ЛММ); лічбавая мадэль рэльефу (ЛМР); гарадзішча; Браслаўскае Паазер’е.

# ГОРОДИЩА БРАСЛАВСКОГО РАЙОНА ПО ДАННЫМ ВОЗДУШНОГО ЛАЗЕРНОГО СКАНИРОВАНИЯ

**П. С. Курлович[1], А. А. Сазонов[2], Е. А. Кухлевский[3]**

*[1] Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, kurlovichp@bsu.by*
*[2] Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, sazonauaa@bsu.by*
*[3] Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, kyhlevskiea@bsu.by*

Целью статьи является введение в научный оборот цифровых моделей рельефа (ЦМР) городищ Браславского района, полученных в результате воздушного лазерного сканирования (ВЛС). Большинство объектов содержат напластования раннего железного века, однако встречаются и памятники без культурного слоя или с материалами Средневековья и Нового времени. Судя по полученным моделям, фортификация городищ, как правило, представлена эскарпированными склонами. На некоторых памятниках встречаются единичные валы или остатки более сложной системы укреплений. ВЛС показало высокую эффективность в локализации городищ

с геодезической точностью и фиксации их состояния на момент обследования, а также потенциал в выявлении ранее неизвестных археологических объектов и перспективных участков для изучения.

***Ключевые слова:*** воздушное лазерное сканирование (ВЛС); цифровая модель местности (ЦММ); цифровая модель рельефа (ЦМР); городище; Браславское Поозерье.

## BRASLAV DISTRICT HILLFORTS ACCORDING TO AIRBORNE LASER SCANNING

**P. S. Kurlovich[1)], A. A. Sazonau[2)], E. A. Kuhleuski[3)]**

*[1)] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, kurlovichp@bsu.by*
*[2)] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, sazonauaa@bsu.by*
*[3)] Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, kyhlevskiea@bsu.by*

The purpose of the article is the introduction into scientific circulation of hillforts of the Braslav district digital terrain models (DTM), obtained as a result of airborne laser scanning (ALS). Most of the objects contain layers of the early Iron Age, but there are also monuments without a cultural layer or with materials from the Middle Ages and the New Age. According to the obtained models, the fortification of hillforts, as a rule, is represented by escarpment slopes. On some monuments, single ramparts or the remains of a more complex system of fortifications are found. ALS showed high efficiency in localization of settlements with geodetic accuracy and fixation of their condition at the time of survey, as well as potential in identifying previously unknown archaeological objects and promising areas for study.

***Keywords:*** airborne laser scanning (ALS); digital terrain model (DTM); digital evaluation model (DEM); hillfort; Braslav Poozerye.

Паветранае лазернае сканаванне (ПЛС) заснаванае на выкарыстанні тэхналогіі лідар (LiDAR – Light Detection And Ranging) – вызначэнне дальнасці пры дапамозе святла, якая на сённяшні дзень трывала ўвайшла ў розныя сферы чалавечага жыцця. Актыўна выкарыстоўваецца лідарная здымка і ў археалогіі, як для лакалізацыі, так і для вывучэння аб’ектаў розных перыядаў часу. У беларускай археалогіі для пошуку і атрымання лічбавых мадэлей археалагічных помнікаў ПЛС пачало сістэмна выкарыстоўвацца з 2022 г. аўтарамі артыкула ў супрацоўніцтве з іншымі даследчыкамі – спецыялістамі ў галіне археалогіі каменнага веку і сярэдніх вякоў [1–4]. На сённяшні дзень у распараджэнні калектыву знаходзіцца беспілотны лятальны апарат (БЛА) DJI Matrice 300 RTK, лазерны сканер DJI Zenmuse L1, мабільная базавая станцыя DJI D-RTK 2. Выкарыстанне D-RTK 2 дазваляе атрымліваць высокадакладныя каардынаты ў рэальным часе ў палявых умовах.

Падрыхтоўка да палявых даследаванняў падугледжвае некалькі этапаў:

1) складанне маршруту абследаванняў на падставе вывучэння навуковай і даведачнай літаратуры і архіўных даных (Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, «Зборы помнікаў гісторыі і культуры», навуковыя археалагічныя справаздачы і інш.);

2) вызначэнне ўчастка работ, нанясенне яго на карту, абазначэнне геаграфічных каардынат;

3) атрыманне дазволу на аэрафотаздымку (АФЗ) у Генеральнага штаба Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь;

4) узгадненне выкарыстання паветранай прасторы ўстаноўленым парадкам (мясцовы выканкам, РАУС);

5) атрыманне дазволу на выкарыстанне паветранай прасторы ў цэнтры Адзінай сістэмы арганізацыі паветранага руху РУП па аэранавігацыйным абслугоўванні паветранага руху «Белаэранавігацыя».

Неабходна адзначыць, што ў Рэспубліцы Беларусь выкарыстанне БЛА рэгламентуецца Паветраным кодэксам, Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 297 ад 25.09.2023, № 81 ад 25.02.2016; пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1471 ад 04.11.2006, № 636 ад 16.08.2016, № 970 ад 28.12.2023, № 971 ад 28.12.2023, № 972 ад 28.12.2023, № 972, № 980 ад 29.12.2023; пастановамі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь № 26 ад 09.11.2020, № 21 ад 13.11.2017; пастановай Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусі № 86/24ОВ ад 30.09.2024.

Непасрэдна праца па ПЛС на базе БЛА, першаснай у палявых умовах і камеральнай апрацоўцы атрыманых у ходзе здымкі даных складаецца з чатырох этапаў.

Першы этап – перадпалётная падрыхтоўка. Ён уключае ў сябе праверку сістэм БЛА, вызначэнне ўчастка здымкі і ўстаноўку асноўных параметраў, такіх як працэнт перакрыцця, вышыня і хуткасць палёту, колькасць адлюстраванняў лазера.

Другі этап – непасрэдна правядзенне ПЛС ўчастка мясцовасці. На гэтым этапе важна праводзіць пастаянны кантроль за ходам працэсу, сачыць за ўзроўнем зараду батарэй, улічваць умовы надвор’я, гарантаваць бяспеку палёту.

Трэці этап – постапрацоўка сырых даных. На гэтым этапе даныя, атрыманыя з лазернага сканара, апрацоўваюцца ў праграмным забеспячэнні DJI Terra, толькі пасля гэтага можна атрымаць воблакі кропак у фармаце LAS/LAZ для далейшага аналізу і пабудовы ЛМР. У працэсе постапрацоўкі ўсталёўваецца сістэма каардынат выхадных даных, ураўноўваюцца воблакі кропак, адбываецца іх каларызацыя на аснове атрыманых падчас АФЗ фотаздымкаў.

Чацвёрты этап – пабудова ЛМР. Атрыманыя воблакі кропак загружаюцца ў спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне – QuickTerrainModeler, ArcGIS – для класіфікацыі. Класіфікацыя дазваляе аднесці кропкі да наступных класаў: зямля (ground), некласіфікаваныя кропкі (default), нізкая раслiннасць (low vegetation), сярэдняя раслiннасць (medium vegetation), высокая раслiннасць (high vegetation), будынкі (building) і г. д. На аснове класіфікаваных воблакаў кропак можна пабудаваць лічбавую мадэль рэльефу (ЛМР) з прасторавай разрознасцю ад 0,3 м.

Палявыя абследаванні гарадзішчаў у Браслаўскім раёне праводзіліся ў жніўні 2024 г. Сканаванне ажыццяўлялася на вышыні 100 м з хуткасцю 5…10 м/с у залежнасці ад шчыльнасці расліннага покрыва. Колькасць вымераных кропак з'яўляецца найбольшай пры частаце дыскрэтызацыі 240 кГц у рэжыме падвойнага рэха, прыкладная шчысльнасць складае 90…110 кропак/м$^2$, рэжым сканавання – паўтаральны.

А. А. Егарэйчанка – адзін з асноўных даследчыкаў старажытнасцей Браслаўскага Паазер'я – адзначыў наяўнасць у рэгіёне 17 гарадзішчаў: Лукшы, Слабодка, Пустошка, Маскавічы, Зазоны, Шавуры, Рацюнкі, Тата-




*Рыс. 1.* Лакалізацыя абследаваных аб'ектаў

раўшчына, Майшулі, Тарылава (Укля), Едагалі, Жвірблі, Ахрэмаўцы (Гурка), Нурвяны, Замошша, Падварынка, Богіна [5, рис. 1]. Аднак ступень даследаванасці іх нераўнамерная. ПЛС ажыццяўлялася на 13 аб'ектах: Лукшы, Жвірблі, Пустошка, Майшулі, Браслаў, Шавуры, Рацюнкі, Маскавічы, Слабодка, Іказнь, Тарылава, Падварынка, Замошша (рыс. 1). У першую чаргу фіксаваліся даследаваныя помнікі і аб'екты, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Так як культурна-храналагічная інтэрпрэтацыя абследаваных гарадзішчаў на сённяшні дзень магчымая не для ўсіх аб'ектаў, то для іх першаснай класіфікацыі была выкарыстана фармальная прыкмета – асаблівасці фартыфікацыі, зафіксаваныя па атрыманых мадэлях.

Для верыфікацыі атрыманых даных, інтэрпрэтацыі і культурна-храналагічнай характарыстыкі выяўленых аб'ектаў працы па ПЛС павінны суправаджацца палявымі археалагічнымі абследаваннямі помнікаў. У ходзе даследавання, як правіла, ажыццяўляўся візуальны агляд мясцовасці без земляных прац. Аднак ва ўмовах абмежаванага на працы часу прыходзілася абыходзіцца без яго, калі здымка вялася з дастаткова аддаленай мясцовасці, альбо месца, прыдатнае для кіравання БЛА, размяшчалася за натуральнымі перашкодамі ад помніка, пераадолець якія не ўяўлялася магчымым. Таму атрыманыя вынікі яшчэ будуць дапоўнены ў ходзе далейшых даследаванняў.




*Рыс. 2.* Гарадзішча Лукшы ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 3.* Гарадзішча Шавуры ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 4.* Гарадзішчы Слабодка-1, Слабодка-2 у навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 5.* Паселішча Падварынка ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map

Большая частка гарадзішчаў не мае візуальных слядоў дадатковых умацаванняў акрамя падрэзкі схілаў. Складана зафіксаваць па існуючых прывязках гарадзішчы Лукшы (рыс. 2) і Шавуры (рыс. 3). Паводле іх, першае змяшчаецца на высокім пагорку без слядоў умацаванняў, а другое – на высокім і доўгім пагорку, на якім з напольнага боку захаваліся рэшткі вала [6, с. 152, 156]. З улікам гэтага, для атрымання мадэлі ахопліваўся максімальна магчымы участак, папярэдняя лакалізацыя можа быць здзейснена, абапіраючыся на існуючыя апісанні, а дакладная – толькі ў выніку візуальнага агляду ці шурфоўкі. Слаба прасочваюцца сляды ўмацаванняў на паселішчах каля в. Слабодка (рыс. 4) і каля в. Падварынка (рыс. 5). Спецыфіка дадзеных аб'ектаў у тым, што яны размешчаны на озавых градах.

Эскарпаваныя схілы маюць гарадзішчы Рацюнкі (рыс. 6), Зазоны (рыс. 7) і Тарылава (рыс. 8, *1*) – найбольш даследаваныя помнікі жалезнага веку ў Браслаўскім раёне [гл. 7–10 і інш.]. Канструкцыю іх умацаванняў, такім чынам, магчыма прасачыць толькі ў ходзе раскопак [8, с. 41; 9, с. 163]. Верагодна, падобную сістэму фартыфікацыі мела і гарадзішча Замошша (рыс. 9). Аднак яно вельмі моцна пашкоджана, у тым ліку з-за таго, што на яго пляцоўцы быў размешчаны храм, спалены ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а зараз помнік, да якога вядуць прыступкі. Не прасочваюцца візуальна дадатковыя ўмацаванні на гарадзішчы Пустошка, пляцоўка якога пашкоджа-




*Рыс. 6.* Гарадзішча Рацюнкі ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 7.* Гарадзішча Зазоны ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 8.* Гарадзішчы каля в. Укля (Тарылава) у навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map; на паўночны захад ад гарадзішчаў знаходзіцца курганны могільнік




*Рыс. 9.* Гарадзішча Замошша ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 10.* Гарадзішча Пустошка ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 11.* Гарадзішча Жвірблі ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 12.* Гарадзішча Майшулі (Рацкі Бор) ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map; па паўднёвы захад і поўдзень ад гарадзішча знаходзіцца курганны могільнік

на траншэяй (рыс. 10). Пры гэтым і прыкметаў культурнага слоя ў выніку візуальнага агляду і прагляду кратавін на ім не назіралася. На пагорку, на якім размяшчаецца ваданапорная вежа, знаходзіцца гарадзішча Жвірблі (рыс. 11). З дадатковых умацаванняў тут можна адзначыць вал з паўночна-ўсходняга боку. Агляд гарадзішча не дазволіў зрабіць высновы аб наяўнасці тут культурнага слою. А вось валунныя камяні, змешчаныя на ім, верагодна, усё ж не маюць дачынення да фартыфікацыі [6, с. 148], а прыроднага паходжання.

Досыць распаўсюджанымі сярод старажытнасцей жалезным веку з'яўляюцца гарадзішчы з кальцавымі валамі. Сярод даследаваных аб'ектаў атрымалася зафіксаваць толькі адзін такі помнік – Майшулі (урочышча Рацкі Бор) (рыс. 12). Мяркуючы па публікацыях, тут былі выяўлены матэрыялы культуры позняй штрыхаванай керамікі [11]. Побач з гарадзішчам знаходзіцца курганны могільнік, у якім на сённяшні дзень даследаваны 26 курганоў [12, табл. 1].

Больш познія гарадзішчы адрозніваюцца геаметрычнасцю формаў. Дзядзінец летапіснага Браслава (рыс. 13) мае вал вышынёй да 6 м з паўночнага і заходняга боку і да 2 м – з усходняга і паўднёвага. Гарадзішча Маскавічы (рыс. 14) мае двухузроўневую структуру і тонкі вал (?) па перыметры ніжняй пляцоўкі. Складаную структуру, якая ўключае ў сябе археалагізаваную асно-




*Рыс. 13*. Гарадзішча летапіснага Браслава ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 14*. Гарадзішча Маскавічы ў навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map




*Рыс. 15.* Гарадзішча (замчышча) Іказнь у навакольным ландшафце.

ЛМР, аснова – Open Street Map

ву сцен і абарончых вежаў, маюць рэшткі замчышча Позняга сярэднявечча – ранняга Новага часу, размешчаныя на востраве Замак воз. Іказнь (рыс. 15). Варта адзначыць, што сярэднявечныя знаходкі былі выяўлены ў рэгіёне ў Рацюнках і Падварынцы [13; 14], аднак гэтая акалічнасць ніяк не паўплывала на іх візуальны выгляд на сённяшні дзень.

Цікавыя вынікі дало ПЛС гарадзішча Тарылава (Укля). На адлегласці каля 300 м на паўночны-ўсход ад помніка, які даследаваўся ў 1990-я гг., быў зафіксаваны яшчэ адзін аб’ект са слядамі антрапагеннага ўздзеяння ў выглядзе невысокіх (каля 50 см) трох ліній кальцавых валоў (?) (рыс. 8, *2*). Дадзены аб’ект быў папярэдне пазначаны намі як гарадзішча Тарылава-2. Яго візуальнае абследаванне не паказала прыкметаў наяўнасці тут культурнага слою. У падножжа з заходняга боку ён прысутнічае, але яго храналогія не можа быць вызначана без шурфоўкі, так як дадзеная пляцоўка актыўна выкарыстоўваецца на сённяшні дзень пад кэмпінг і, верагодна, утрымлівае матэрыялы, звязаныя з існаваннем тут хутара Тарылава. У сучаснай навуковай літаратуры звесткі пра наяўнасць у ваколіцах больш за адно гарадзішча адсутнічаюць, але Ф. В. Пакроўскі ў канцы XIX ст. адзначае наяўнасць у Тарылаве трох гарадзішчаў [15, с. 5]. Магчыма, разглядаемы аб’ект з’яўляецца адным з іх.

Такім чынам, выкарыстанне ПЛС падчас абследавання гарадзішчаў на тэрыторыі Браслаўскага раёна пацвердзіла высокую эфектыўнасць дадзенай тэхналогіі ў атрыманні лічбавых мадэлей археалагічных аб'ектаў, якія фіксуюць іх стан на момант абследавання і лакалізаваныя з геадэзічнай дакладнасцю (хібнасць да 10 см). Палявыя працы без уліку візуальнага агляду ці шурфоўкі пры гэтым займаюць ад 30–40 хвілін (гарадзішча з вядомымі каардынатамі і лёгкім доступам) да некалькіх гадзін (складаны археалагічны комплекс у цяжкадаступнай мясцовасці). Атрыманыя мадэлі могуць выкарыстоўвацца для мерапрыемстваў у сферы аховы археалагічнай спадчыны і навуковага вывучэння аб'ектаў. Суцэльнае ПЛС пэўнага мікрарэгіёну дазваляе выяўляць невядомыя раней археалагічныя аб'екты і перспектыўныя для вывучэння ўчасткі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Сазонов А. А., Киндеев А. Л., Князев И. С., Курлович П. С., Маковская В. А.* Применение воздушного лазерного сканирования в археологических исследованиях на территории Беларуси // ГИС-технологии в науках о Земле: материалы респ. науч. -практ. семинара студентов и молодых ученых, Минск, 16 нояб. 2022 г. Минск, 2022. С. 283–287.

2. *Сазонов А. А., Курлович П. С., Князев И. С., Вашанов А. Н.* Моделирование рельефа по данным воздушного лазерного сканирования на примере острова Выспа // ГИС-технологии в науках о Земле: материалы респ. науч. -практ. семинара студентов и молодых ученых, Минск, 15 нояб. 2023 г. Минск, 2023. С. 145–154.

3. *Сазонов А. А., Курлович П. С.* Опыт применения воздушного лазерного сканирования для археологической разведки на территории Беларуси // Беспилотные аппараты «БПЛА-2024»: сб. ст. Междунар. молодежного форума 22 апреля 2024 г. Минск, 2024. С. 7–11.

4. *Курлович П. С., Сазонов А. А.* Гарадзішчы Харытанцы-Забарочча, Радзіца, Грыцковічы Крупскага раёна Мінскай вобласці: вынікі абследаванняў 2023 года // МАБ. 2025. Вып. 35. С. 188–193. (у друку)

5. *Егорейченко А. А.* Браславское Поозерье в первых веках н. э. // Stratum plus. 2014. № 14. С. 149–158.

6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. Мінск: БелСЭ, 1985. 496 с.

7. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованной керамики. Минск: БГУ, 2008. 207 с.

8. *Егорейченко А. А.* Древнейшие городища Браславского Поозерья // МАБ. 2020. Вып. 31. С. 36–47.

9. *Дучиц Л. В., Митрофанов А. Г.* Городище Ратюнки // ГАЗ. 1994. № 5. С. 163–182.

10. *Егорейченко А. А.* История археологического изучения древнейших городищ в Браславском Поозерье // Веснік БДУ: навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2012. № 1. С. 3–6.

11. *Плавінскі М., Харытановіч З., Дзярновіч С.* Новыя археалагічныя помнікі жалезнага веку ў Браслаўскім Паазер'і (па выніках даследаванняў 2003–2005 гг.) // МАБ. 2008. Вып. 15. С. 205–211.

12. *Плавінскі М. А.* Гісторыя археалагічнага вывучэння курганных могільнікаў захаду Браслаўскага Паазер'я // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф. Мінск, 2013. С. 14–18.

13. *Егорейченко А. А.* Средневековые находки из городища Ратюнки // МАБ. 2017. Вып. 28. С. 209–213.

14. *Егорейченко А. А.* Поселение Подваринка // Веснік БДУ: навуковы часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2012. № 3. С. 3–7.

15. *Покровскій Ф. В.* Археологическая карта Виленской губерніи. Вильна: Типографія А. Г. Сыркина, 1893. 164 с.

# КАМЕННЫЕ СВЕРЛЕНЫЕ ИЗДЕЛИЯ, НАЙДЕННЫЕ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ. ТЕРМИНОЛОГИЧЕСКИЙ АППАРАТ

**С. Б. Линевич**

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1,
220072, г. Минск, Республика Беларусь, lsb1986@mail.ru*

Статья посвящена представлению авторского терминологического аппарата, применяемого при атрибуции и описании каменных сверленых изделий, найденных на территории Беларуси. Исходя из условно функционального признака, весь массив находок разделяется на пять групп (топор, булава, мотыга, кирка, киркомотыга) с последующим делением по характеру конструктивных элементов. На основе разработанного терминологического аппарата автором статьи предлагается алгоритм первичной атрибуции находок.

***Ключевые слова:*** каменные сверленые изделия; каменный сверленый топор; каменная сверленая булава; каменная сверленая мотыга; каменная сверленая кирка; каменная сверленая киркомотыга.

# КАМЕННЫЯ СВІДРАВАНЫЯ ВЫРАБЫ, ЗНОЙДЗЕНЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ. ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ АПАРАТ

**С. Б. Ліневіч**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1,
220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, lsb1986@mail.ru*

Артыкул прысвечаны прадстаўленню аўтарскага тэрміналагічнага апарата, які прымяняецца пры атрыбуцыі і апісанні каменных свідраваных вырабаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі. Зыходзячы з умоўна функцыянальнай прыкметы, увесь масіў знаходак падзяляецца на пяць груп (сякера, булава, матыка, кірка, кіркаматыка) з наступным дзяленнем па характары канструктыўных элементаў. На аснове распрацаванага тэрміналагічнага апарата аўтарам артыкула прапануецца алгарытм першаснай атрыбуцыі знаходак.

***Ключавыя словы:*** каменныя свідраваныя вырабы; каменная свідраваная сякера; каменная свідраваная булава; каменная свідраваная матыка; каменная свідраваная кірка; каменная свідраваная кіркаматыка.

# STONE SCHAFT HOLE ARTEFACTS FROM BELARUS. TERMINOLOGY

**S. B. Linevich**

*Institute of History of the NAS of Belarus, Academic str., 1,
220072, Minsk, Republic of Belarus,sb1986@mail.ru*

The article devotes the presentation of the author’s terminology used in the attribution and description of stone schaft hole artefacts. Based on a conditionally functional attribute, all the finds are divided into five groups (axe, mace, hoe, pick, pickaxe), with subsequent

division according to the features of the structural elements. Based on the developed terminological apparatus, an algorithm for the primary attribution of finds is proposed by the author of the article.

***Keywords:*** stone schaft hole artefacts; stone schaft hole axe; stone schaft hole mace; stone schaft hole hoe; stone drilled pick, stone drilled pickaxe.

На сегодняшний день в археологической науке отсутствует единое мнение относительно функционального назначения каменных сверленых изделий (далее – КСИ). В результате подобной ситуации подходы и терминология, применяемые исследователями при описании данной категории артефактов, имеют значительные отличия. Исходя из субъективного восприятия назначения предмета, авторы используют различную не унифицированную терминологию. Как правило, расшифровка используемых терминов не приводится. В результате возникает путаница в базовых понятиях, что значительно затрудняет описание и введение в научный оборот данной категории артефактов. Характерный пример существующей путаницы привел в своей статье М. В. Ступка [1, с. 17] на примере введенного Д. А. Крайновым типа «обушковых каменных сверленых топоров-молотков»[1] [2, с. 41]. Как отмечает М. В. Ступка, в отношении топоров, изготовленных из камня, термины «проушной», «сверленый», «топор-молоток» являются синонимами и подразумевают изделия одной конструктивной схемы, в которой присутствует лезвие и противолежащая ему часть. Соответственно, словосочетание «обушковый сверленый топор-молоток» будет выступать тавтологией. Поскольку к теме изучения КСИ ученые-археологи неоднократно обращались в прошлом и продолжают обращаться сегодня, а процесс изготовления КСИ в древности весьма сложно назвать стандартизированным, на данный момент терминологический аппарат характеризуется запутанностью и противоречивостью и нуждается хотя бы в предварительной унификации. По этой причине основной целью данного текста выступает представление и разъяснение терминов и понятий, которые применяются автором для обозначения и описания основных типов КСИ, найденных на территории Беларуси.

Прежде всего, следует обратить внимание на тот факт, что КСИ изначально являлись частью составного орудия, которое состояло из каменного навершия, закрепленного на деревянной рукоятке при помощи искусственно сформированного отверстия (проушины). Поскольку в подавляющем большинстве случаев рукоятки не сохраняются, то под общим термином «КСИ» следует понимать исключительно навершия. Таким образом, под каменными сверлеными изделиями (бел. «каменныя свідраваныя вырабы») подразумеваются приспособления или заготовки приспособлений, изготовленные из камня, в конструкции которых присутствует либо должно присутствовать

[1]Ради справедливости необходимо отметить, что тип «обушковый» для каменных сверленых топоров был введен еще В. А. Городцовым в 1916 году [3].

технологически сформированное отверстие для закрепления на рукоятке[1]. При отсутствии отверстия либо его незавершенности изделие называется «заготовкой» (бел. «нарыхтоўка»). Если изделие имеет следы присутствия двух отверстий – одного начатого или завершенного, а второго обломанного, – то в таком случае оно называется «изделием со вторичным сверлением» (бел. «выраб з другасным свідраваннем»). При наличии только одного обломанного отверстия изделие называется «обломком КСИ» (бел. «абломак каменнага свідраванага вырабу»).

Таким образом, на основании анализа коллекции оба поселенческих памятника могут быть отнесены к культуре поздней штрихованной керамики, что подтверждается как анализом керамического материала, происходящего с памятников, так и индивидуальными находками. С учетом данного обстоятельства представляется очень важной находка наконечника дротика, так как предметы вооружения являются крайне редкими на памятниках КПШК.

## Библиографические ссылки


1. *Покровский Ф. В.* К исследованию курганов и городищ на восточной окраине современной Литвы // Труды IX археол. съезда в Вильне, 1893. Москва, 1897. Т. 2. С. 138–136.
2. *Покровский Ф. В.* Археологическая экскурсия по Виленской губернии. Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1893. 50 с.
3. *Покровский Ф. В.* К исследованию бассейна р. Вилии в археологическом отношении // Труды X археол. съезда в Риге, 1896. Москва, 1899. Т. 1. С. 71–171.
4. *Гуревич Ф. Д.* Древности Белорусского Понеманья. Москва–Ленинград: Издательство АН СССР, 1962. 233 с.
5. *Гороховский Е. Л.* Хронология ювелирных изделий первой половины I тыс. н. э. лесостепного Поднепровья и Южного Побужья: дис. … канд. ист. наук: 07.00.06. Киев, 1988. 525 с.
6. *Гавритухин И. О.* Кодынские фибулы (типы и некоторые проблемы интерпретации) // Vakaru baltu archeologija ir istorija. Klaipėda, 1989. С. 78–85.
7. *Madyda-Legutko R.* Die Gürtelschnallen der Römischen Kaiserzeit und der frühen Völkerwanderungszeit im mitteleuropäischen Barbaricum. Oxford: BAR Publ., 1987. 330 S.
8. *Седов В. В.* Древнерусская народность: историко-археологическое исследование. Москва: Языки русской культуры, 1999. 316 с.

9. *Казакявичус В.* Оружие балтских племён II–VIII веков на территории Литвы. Вильнюс: Мокслас, 1988. 160 с.

10. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованной керамики. Минск: БГУ, 2006. 207 с.

11. *Митрофанов А. Г.* Железный век средней Белоруссии. Минск: Наука и техника, 1978. 160 с.

12. *Смирнов К. А.* К вопросу о систематизации грузиков «дьякова типа» // МИА. 1971. № 184. С. 80–98.

13. *Шмидт Е. А.* Верхнее Поднепровье и Подвинье в III–VII вв. н. э.: Тушемлинская культура. Смоленск: ГУП Смол. обл. тип. им. В. И. Смирнова, 2003. 296 с.

14. *Обломский А. М.* Колочинская культура // Раннеславянский мир. Вып. 17. Раннесредневековые древности лесной зоны Восточной Европы (V–VII вв. ). Москва, 2016. С. 10–113.

# КЛЕЦК – ПАСЕЛІШЧА КУЛЬТУРЫ ШТРЫХАВАНАЙ КЕРАМІКІ

**В. С. Пазднякоў**

*Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы, вул. Крапоткіна, 55,*
*220002, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, vpmiensk@gmail.com*

Выкладзены матэрыялы археалагічных раскопак у г. Клецку, якія паказваюць на існаванне на тэрыторыі старажытнага дзядзінца (Высокага замка) паселішча культуры штрыхаванай керамікі ў I ст. да Н. Х. – IV ст. па Н. Х.

***Ключавыя словы:*** Клецк; культура штрыхаванай керамікі; пальчатыя фібулы.

# КЛЕЦК – ПОСЕЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ ШТРИХОВАННОЙ КЕРАМИКИ

**В. С. Поздняков**

*Белорусский научно-исследовательский институт документоведения и архивного дела, ул. Кропоткина, 55,*
*220002, г. Минск, Республика Беларусь, vpmiensk@gmail.com*

Изложены материалы археологических раскопок в г. Клецке, которые указывают на существование на территории древнего детинца (Высокого замка) поселения культуры штрихованной керамики в I в. до Р. Х. – IV в. по Р. Х.

***Ключевые слова:*** Клецк; культура штрихованной керамики; пальчатые фибулы.

# KLECK – A SETTLEMENT OF THE HATCHED POTTERY CULTURE

**V. S. Pazdniakou**

*The Belarusian Research Institute for Archival Science and Records Management, Krapotkin St., 55,*
*220002, Minsk, Republic of Belarus, vpmiensk@gmail.com*

Materials from archaeological excavations in the town of Kletsk are presented, which indicate the existence of a settlement of the Hatched Pottery culture in the 1st century BC – 4th century AD on the territory of the ancient courtyard (High Castle).

***Keywords:*** Kletsk; Hatched Pottery culture; fingered fibulae.

Клецк – вядомы беларускі горад, у XII–XVI стст. цэнтр феадальнага княства. У 1986–1990 г. у Клецку былі праведзены буйныя археалагічныя раскопкі, асноўныя вынікі якіх апублікаваныя [1]. У ходзе раскопак былі атрыманы матэрыялы жалезнага веку, на якія варта звярнуць увагу.

На дзядзінцы (былым Высокім замку) археалагічныя раскопкі вяліся ў асноўным у цэнтральнай частцы, на дне старога катлавана. З мэтай даведацца пра наяўнасць культурнага пласта ў іншых месцах дзядзінца ў 1988 г. у

яго розных частках былі закладзены шурфы. Шурф № 5 быў размешчаны ва ўсходняй частцы дзядзінца на адлегласці 18,5 м ад трашэі М. А. Ткачова 1983 г., якой быў прарэзаны вал дзядзінца. Накірунак ад шурфа 5 да траншэі 1983 г. – 15º. Шурф меў памеры 2×2 м, арыентаваны па баках свету. У ходзе раскопак пасля дзярновага чорнага пласта адкрыўся светла-карычневы пясчаністы пласт, які ішоў на глыбіню ад 0,50 м да 1,4 м. Глыбей ляжаў торфападобны чорны пласт магутнасцю 0,20–0,50 м, яшчэ глыбей – пласт шэрага колеру 0,30–0,40 м. Знаходкі ў ім былі зусім нешматлікімі: фрагмент сценкі гаршка X–XIII стст., фрагмент донца XVI–XVII стст., фрагмент сценкі пасудзіны культуры штрыхаванай керамікі. Далей ішла праслойка вільготнай жоўтай гліны да 0,10 м таўшчынёй. Пад ёй адкрыўся пласт са шматлікімі знаходкамі культуры штрыхаванай керамікі. Гэты пласт меў інтэнсіўную чорную афарбоўку, быў вільготным, меў невялікі дамешак дробных вугалькоў. Таўшчыня пласта 0,15–0,20 м, глыбіня ад дзённай паверхні 2,20–2,30 м. Тут была сабрана вялікая колькасць фрагментаў штрыхаваных начынняў, фрагмент гаршка кіеўскай культуры, невялікі гліняны грузік. Мацярык у гэтым месцы быў складзены з жоўтай гліны.




*Рыс. 1.* Паўночная і паўднёвая сцены траншэі № 4 (1989–1990 гг. ) на дзядзінцы (Высокім замку) Клецка.

Пункцірам пазначаны контуры вала XI ст. (I) і XIII ст. (II).

Умоўныя пазнакі: *1* – дзённая паверхня; *2* – светла-шэры грунт; *3* – пясок; *4* – чорны грунт; *5* – жоўтая гліна; *6* – вуглі; *7* – дрэва; *8* – мацярык




*Рыс. 2.* Клецк, дзядзінец (Высокі замак). Фрагменты штрыхаванага посуду

У 1989–1990 гг. ва ўсходняй частцы клецкага дзядзінца была закладзена траншэя № 4, якая перарэзала абарончы вал. Трашэя была далучана да шурфа № 5, так што агульная даўжыня траншэі склала 20,30 м пры шырыні 2 м (шурф № 5 атрымаў абазначэнне квадрат 10). Культурны пласт чорнага колеру таўшчынёй да 0,20 м са знаходкамі культуры штрыхаванай керамікі быў прасочаны ў заходняй палове квадрата 9, які прымыкаў да квадрата 10, ва ўсходняй палове квадрата 9 ён выклініваўся (рыс. 1).

Такім чынам, пласт (таўшчыня да 0,20 м) культуры штрыхаванай керамікі быў выяўлены непасрэдна на мацерыку на плошчы каля 6 м$^2$ ва ўсходняй частцы дзядзіца Клецка (Высокага замка). Ва ўсходнім кірунку ён выклініваўся ў пласт жоўтага пяску з бессістэмна размешчанымі тонкімі праслойкамі вугалю, які залягаў у падэшве вала сярэднявечных умацаванняў. Відавочных слядоў абарончых умацаванняў паселішча культуры штрыхаванай керамікі не выяўлена.




*Рыс. 3.* Клецк, дзядзінец (Высокі замак). Фрагменты штрыхаванага посуду




*Рыс. 4.* Клецк, дзядзінец (Высокі замак). Фрагменты штрыхаванага посуду

Ніжні пласт культуры штрыхаванай керамікі, пэўна, не зведаў значных уздзеянняў, бо ўтрымліваў вялікія фрагменты гліняных начынняў. Усяго тут было знойдзена больш за 100 фрагментаў штыхаванай керамікі, некалькі дробных фрагментаў костак жывёл і жалезных шлакаў. У тых пластах, які ляжалі вышэй, штрыхаваная керамікі таксама сустаркалася, але радзей і была малых памераў.

Увогуле было знойдзена больш за 200 фрагментаў штрыхаванай керамікі. Усе яны адносяцца да пасудзін (гаршкоў) позняга тыпу – з добра вылучаным рабром на адлегласці 4–5 см ад зрэзу венчыка. Добра захаваліся 19 фрагментаў верхніх частак пасудзін з венчыкам (рыс. 2, 3). Увогуле начынні танкасценныя, таўшчыня сценак 0,5 см ці крыху больш. Фрагменты керамікі ў асноўным шэрага колеру, плямістыя, што сведчыць аб нераўнамерным абпале на адкрытым вогнішчы. Добра прыкметны дадатак у глінянае цества жарствы. Верхняя частка пасудзін з большага не арментаваная, а асноўная частка – ніжэй рабра – арментаваная глыбокімі бароснамі, зробленымі ці пукам саломы, ці драўлянай (?) зубчатай прыладай. Захаваліся фрагменты начыння, цалкам пакрыта бароснамі. У верхняй частцы пасудзіны (нават у асобных месцах ніжэй рабра) яны гарызантальныя, у ніжняй частцы амаль вертыкальныя. Арнаментацыя зроблена спецыяльнай прыладай (рыс. 2, *1*).

Іншыя фрагменты пасудзін упрыгожаны бароснамі ў асноўным ніжэй рабра. Рабро ў некаторых выпадках дадаткова арнаментавана. Сустракаюцца адбіткі пазногцяў (рыс. 4, *3, 4*) і ямкі (рыс. 4, *1, 2*). У верхняй частцы (вышэй рабра) сценкі гаршкоў загінаюцца ўнутр. У некаторых гаршках венчык (скрайняя частка) загінаецца вонкі (рыс. 2, *2*; 3, *4, 6–8*). У класіфікацыі штрыхаванага посуду, распрацаванай А. А. Егарэйчанкам, такія пасудзіны адносяцца да тыпу 2 – *«сосуды с вертикально поставленым венчиком»* [2, с. 75] (аднак, трэба адзначыць, што нічога вертыкальнага тут няма).

Невялікі гліняны грузік, знойдзены разам са штрыхаванай керамікай, мае вузкі канал (рыс. 5, *10*). Такія вырабы прынята адносіць да ўпрыгожанняў (пацерак) [2, с. 93, табл. 66: 17–23].

У цэлым, разглядаемы корпус керамічных знаходак адносіцца да той культурнай з'явы, якую А. А. Егарэйчанка называў *«культура позняй штрыхаванай керамікі»*. Рэчаў з вузкай датыроўкай у ім няма. А. А. Егарэйчанка абгрунтоўваў агульнае датаванне гэтай культуры ў межах сярэдзіны I ст. да Н. Х. – IV ст. па Н. Х. [2, с. 111].

Нечаканай знаходкай, адкрытай у пласце разам са штрыхаванай керамікай, стаў вялікі фрагмент начыння, які адносіцца да іншай культурнай традыцыі. Гэта верхняя частка гаршка з добра вылучаным рабром і загнутым унутр верхам, пры гэтым самы венчык адагнуты вонкі (рыс. 5, *1*). Падобная кераміка сустракаецца на познезарубінецкіх помніках і паселішчах кіеўскай культуры.




*Рыс. 5.* Знаходкі з дзядзінца (Высокага замка) Клецка (1–10) і з гарадзішча каля аг. Карацк (11, 12):

*1* – фрагмент гаршка; *2* – жалезны наканечнік кап’я; *3–8* – фрагменты ажурнага бронзавага ўпрыгожання; *9* – фрагмент пальчатай фібулы; *10* – гліняная пацерка; *11–12* – фрагменты гаршкоў

Такім чынам, раскопкі на клецкім дзядзінцы (Высокім замку) зафіксавалі культурны пласт паселішча культуры позняй штрыхаванай керамікі. Магчыма, гэта было ўмацаванае паселішча. Помнік адносіцца да самых паўднёвых паселішчаў са штрыхаванай керамікай. Пэўную паралель для Клецка ў гэтых адносінах мае Слуцк. Гэтыя два гарады размешчаны прыблізна на адной паралелі (53º) у блізкіх прыродных умовах, былі шчыльна звязаныя ў гістарычных падзеях XII–XVIII стст. Некрануты культурны пласт культуры штрыхаванай керамікі ў Слуцку не адкрыты, але ў напластаваннях знойдзена некалькі фрагментаў штрыхаванай керамікі, гліняныя праселкі, а ў аснове насыпу абарончага вала – жалезная сякера-кельт [3].

Штрыхаваная кераміка сустракаецца і на поўдзень ад Клецка. На гарадзішчы каля аг. Карацк (Галынкаўскі с/с Клецкага р-на) намі ў ходзе шурфоўкі ў 1988 г. быў знойдзены фрагмент штрыхаванага гаршка з характэрнымі насечкамі па рабру (рыс. 5, *11*). Іншы фрагмент належыць гаршку зарубінецкай культуры (рыс. 5, *12*) [4]. Спецыялістамі Інстытута гісторыі ў ходзе выведачных работ у 2016 і 2018 гг. штрыхаваная кераміка зафіксавана каля в. Капланавічы (Чырвоназоркавы с/с) і Лактышы (Нацкі с/с Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. ) [5, с. 244, 253–254].

На клецкім дзядзінцы (Высокім замку) у межах раскопаў у цэнтральнай частцы помніка былі знойдзены некаторыя матэрыялы, значна ранейшыя за феадальны горад. У раскопах IX і X (кв. 36, 37, 40, 41) была ўскрыта неглыбокая мацерыковая яма, інтэрпрэтаваная як рэшткі жытла-майстэрні ювеліра XIII ст. Сярод яе запаўнення былі 5 зліткаў медзі няправільнай формы, абломкі ўпрыгожанняў больш ранняга часу – ажурнага вырабу і пальчатай фібулы [1, мал. 101: 12–18]. Відаць, усё гэта было сыравінай для клецкага ювеліра. Ажурнае ўпрыгожанне мела круглую форму, утвораную прынамсі двума вялікімі канцэнтрычнымі коламі, змацаванымі перамычкамі; па краі знешняга кола шоў ланцужок з маленькіх колцаў (рыс. 5, *3–8*). Дэталь у выглядзе конусу з абламанай пецелькай, відаць, знаходзілася ў цэнтры ўпрыгожання. Выраб зроблены з меднага сплаву метадам ліцця па васковай мадэлі. Усё разам можна інтэпрэтаваць як абломкі ажурнай бляшкі, якая мацавалася з дапамогай скуранога рамяня на адзенне ці вупраж. Пальчатая фібула (рыс. 5, *9*) была разгледажана ў адмысловай публікацыі, дзе датавана V–VI стст. [6].

Засталося спыніцца на яшчэ адной рэдкай знаходцы – жалезным наканечніку кап’я (рыс. 5, *2*). Ён знойдзены ў цэнтры Высокага замка (раскопкі 1989 г., раскоп X, пласт 14, кв. 45) разам з масавымі матэрыяламі XII–XIII стст. і дамешкам матэрыялаў XVII ст. Відавочна, у гэты пласт знаходка трапіла з парушанага пласту ранняга жалезнага веку. Наканечнік утульчаты, пяро лаўрападобнай формы. У Беларусі надобныя наканечнікі вядомы толькі ў курганным могільніку Дубай мілаградскай культуры [7, с. 11, 22, 24, табл. 1: 1, 2, 5, 7; 2: 2]. Сярод скіфскіх старажытнасцей такія наканечнікі

датуюцца VII–VI стст. да Н. Х. [8, с. 36, табл. 12: 4–8]. Трэба адзначыць, што жалезныя наканечнікі такой формы відавочна капіруюць бронзавыя, якія былі распаўсюджаны працягам усяго бронзавага веку.

Матэрыялы жалезнага веку з Клецка паказваюць, што тэрыторыя горада была заселена з самых ранніх часоў жалезнага веку і да другой паловы I тыс. па Н. Х.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Пазднякоў В. С.* Клецк X–XVIII стст.: Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. Мінск: БелНДІДАС, 2008. 286 с.

2. *Егорейченко А. А.* Культуры штрихованной керамики. Минск: БГУ, 2006. 207 с.

3. *Колединский Л. В.* Городище Слуцк в раннем железном веке // ГАЗ. 1994. № 5. С. 199–206.

4. *Пазднякоў В. С.* Даследаванні ў Клецкім і Нясвіжскім раёнах // Весці Акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1994. № 2. С. 120–122.

5. *Касюк А. Ф., Гаршкоў А. Д.* Археалагічныя разведкі ў вярхоўях ракі Лань у 2016 і 2018 годзе // МАБ. 2019. Вып. 30. С. 241–260.

6. *Пазднякоў В. С., Мядзведзеў А. М.* Знаходка пальчатай фібулы ў Клецку // МАБ. 2002. № 5. С. 284–285.

7. *Кухаренко Ю. В.* Памятники железного века на территории Полесья. Москва: Издательство АН СССР, 1961. 70 с.

8. *Мелюкова А. И.* Вооружение скифов. Москва: Наука, 1964. 91 с. (САИ. Вып. Д1-4).

# МИКРОМОРФОЛОГИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ ПОСЕЛЕНЧЕСКОЙ КЕРАМИКИ В ИЗУЧЕНИИ ЭТНОКУЛЬТУРНЫХ ПРОЦЕССОВ СКИФО-САРМАТСКОЙ ЭПОХИ В ДОНСКОЙ ЛЕСОСТЕПИ[1]

**Ю. Д. Разуваев[1)], А. Н. Меркулов[2)]**

*[1)] Воронежский государственный педагогический университет, ул. Ленина, 86, 394043, г. Воронеж, Российская Федерация, razuvaevyd@mail.ru*
*[2)] Воронежский государственный педагогический университет, ул. Ленина, 86, 394043, г. Воронеж, Российская Федерация, aleksandrmerkulov@mail.ru*

В лесостепном Подонье на протяжении VI в. до н. э. – III в. н. э. пять комплексов лепной кухонной и столовой посуды сменяли друг друга либо сосуществовали. Это «текстильные» и груболепные горшки раннескифского времени, гладкостенные и «рогожные» сосуды скифоидной и городецкой культур, керамика сарматского периода. Экстерьер гончарных изделий (форма и орнаментация) позволяет предполагать этнокультурную взаимосвязь заселявших регион социумов. Более объективное суждение на сей счет можно составить на основе сопоставления технологических показателей (минеральный и химический составы формовочной массы). На сегодня соответствующие данные получены для 248 образцов из вышеназванных групп (100 происходят с городища у с. Верхнее Казачье). Они характеризуют специфику гончарства на разных исторических этапах, не давая основания усматривать преемственность между ними. Вместе с тем, отмечается значительное сходство рецептур формовочных масс керамики скифоидной и городецкой культур, что является свидетельством взаимодействия соседствовавших групп населения в V–III вв. до н. э.

***Ключевые слова:*** Лесостепное Подонье; ранний железный век; этнокультурные процессы; лепная керамика; микроморфология.

# МІКРАМАРФАЛАГІЧНЫ АНАЛІЗ ПАСЯЛЕНЧАЙ КЕРАМІКІ Ў ВЫВУЧЭННІ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАЎ СКІФА-САРМАЦКАЙ ЭПОХІ Ў ДАНСКІМ ЛЕСАСТЭПУ

**Ю. Д. Разуваеў[1)], А. М. Меркулаў[2)]**

*[1)] Варонежскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, вул. Леніна, 86, 394043, г. Варонеж, Расійская Федэрацыя, razuvaevyd@mail.ru*
*[2)] Варонежскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, вул. Леніна, 86, 394043, г. Варонеж, Расійская Федэрацыя, aleksandrmerkulov@mail.ru*

У лесастэпавым Падонні на працягу VI ст. да н. э. – III ст. н. э. пяць комплексаў ляпнога кухоннага і сталовага посуду змянялі адзін аднаго або суіснавалі. Гэта «тэкстыльныя» і грубаляпныя гаршкі раннескіфскага часу, гладкасценныя і «рагожныя» пасудзіны скіфоіднай і гарадзецкай культур, кераміка сармацкага перыяду. Экстэр’ер ганчарных вырабаў (форма і арнаментацыя) дазваляе меркаваць аб

[1]Исследование выполнено за счет гранта Российского научного фонда № 23-28-00030, https://rscf. ru/project/23-28-00030/

этнакультурнай узаемасувязі соцыумаў, якія засялялі рэгіён. Найбольш аб'ектыўнае меркаванне на гэты конт можна скласці на аснове супастаўлення тэхналагічных паказчыкаў (мінеральны і хімічны склады фармовачнай масы). На сёння адпаведныя даныя атрыманы для 248 узораў з вышэйназваных груп (100 паходзяць з гарадзішча каля в. Верхняе Казачча). Яны характарызуюць спецыфіку ганчарства на розных гістарычных этапах, не даючы падставы ўгледжваць пераемнасць паміж імі. Разам з тым, адзначаецца значнае падабенства рэцэптур фармовачных мас керамікі скіфоіднай і гарадзецкай культур, што з'яўляецца сведчаннем узаемадзеяння суседніх груп насельніцтва ў V–III стст. да н. э.

***Ключавыя словы:*** Лесастэпавае Падонне; ранні жалезны век; этнакультурныя працэсы; ляпная кераміка; мікрамарфалогія.

## MICROMORPHOLOGICAL ANALYSIS OF SETTLEMENT CERAMICS IN THE STUDY OF THE ETHNOCULTURAL PROCESSES OF THE SCYTHIAN-SARMATIAN ERA IN THE DON FORESTRY

**Yu. D. Razuvaev[1], A. N. Merkulov[2]**

*[1] Voronezh State Pedagogical University, Lenina str., 86, 394043, Voronezh, Russian Federation, razuvaevyd@mail.ru*
*[2] Voronezh State Pedagogical University, Lenina str., 86, 394043, Voronezh, Russian Federation, aleksandrmerkulov@mail.ru*

In the Don forest-steppe drill throughout the 6th century BC – 3th century AD five complexes of hand-made kitchen ceramics and tableware replaced each other, or coexisted. These are «textile» and coarse hand-made of the Early Scythian time, smooth-cut and «matting» vessels of the Scythoid and Gorodets cultures, ceramics of the Sarmatian period. The exterior of pottery (form and ornamentation) suggests the ethnocultural relationship of society inhabited by the region. A more objective judgment on this score can be made on the basis of comparison of technological indicators (mineral and chemical compositions of molding mass). Today, the relevant data was obtained for 248 samples from the above groups (100 occur from the hillfort near the village of Verkhneye Kazachye). They characterize the pottery specifics at different historical stages, preventing the reason to see the continuity between them. At the same time, there is a significant similarity of the molding masses recipes of the Scythoid and Gorodets cultures ceramics, which is evidence of the neighboring groups of the population interaction in the 5th–3th centuries BC.

***Keywords:*** Don forest-steppe; Early Iron Age; ethnocultural processes; hand-made ceramics; micromorphology.

Лепная керамика выступает едва ли не единственным источником изучения проблемы этнокультурного своеобразия социумов, обитавших в VI в. до н. э. – III в. н. э. на поселениях Среднего и Верхнего Подонья.

Комплекс кухонной посуды раннескифского времени, первоначально открытый на Пекшеском городище [1, с. 31–39, 67–77], а затем и на городище у с. Верхнее Казачье [2], дал некоторое представление о начальном периоде раннежелезного века. Он включает более-менее профилированные горшки

двух разновидностей, стратиграфически неразделенных. У одних внешняя поверхность покрыта так называемыми «нитчатыми», изредка «рябчатыми» или «бороздчатыми» отпечатками (рис. *1–3*). Эти «текстильные» сосуды обычно были лишены орнамента, но иногда украшались пальцевыми защипами по венчику, проколами или вдавлениями на шейке. Вторая разновидность – груболепные горшки, имеющие заглаженную или бугристую внешнюю поверхность (рис. *4–6*). На них орнамент чаще всего отсутствовал, либо состоял из пальцевых защипов по краю или срезу венчиков. Некоторые сосуды на шейке имели сквозные проколы, вдавления щепки или круглой палочки, нередко вместе с защипами по венчику. Иногда срез венчика покрывали насечки или вдавления палочки.

Историко-культурная атрибуция составных частей этого комплекса предложена А. П. Медведевым. Исследователь «текстильную» керамику соотносит с выходцами из лесной зоны, груболепную же – с переселенцами из лесостепного Посеймья, на Пекшевском городище заместившими предшественников (возможно, неполностью) после военного столкновения [1, с. 36-39, 71-75]. По его мнению, поддержанному другими специалистами [3, с. 61; 4, с. 14, 15], на базе верхнедонских поселений с «текстильной» керамикой произошло формирование городецкой культуры. В свою очередь, пришельцы с запада положили в регионе начало скифоидной культуре.

В V–III вв. до н. э. поселения названных культур в донской лесостепи близко соседствовали [1, с. 39–89]. На скифоидных керамический комплекс составляли преимущественно горшки, в меньшем количестве – миски и кувшины. Кухонные сосуды были хорошо профилированы, обладали довольно тщательно заглаженной поверхностью и в большинстве своем украшались пальцевыми защипами по краю венчика, в раннее время – проколами по шейке (рис. *7–9*). Городецкая посуда – это практически исключительно горшки как неорнаментированные, так и украшенные пальцевыми защипами, насечками по венчику, а также проколами под ним (рис. *10–12*). Значительное количество сосудов на внешней поверхности имело характерные «рогожные» или, гораздо реже, «сетчатые» отпечатки. Были и гладкостенные горшки, причем, на большинстве поселений они преобладали. По профилировке и орнаментации те и другие фактически не отличались от скифоидной керамики.

Схожесть керамических комплексов некоторые исследователи склонны объяснять процессами этнической миксации, приведшими к утрате обитателями донских поселений городецкой культуры своей самобытности [1, с. 45; 5, с. 23].

Для I–III вв. н. э. характерен новый набор кухонной и столовой посуды (рис. *13–15*). Доминировавшие в нем горшки зачастую по форме и орнаментации, состоявшей из пальцевых защипов по венчику, походили на гладко-




Фрагменты лепной керамики скифо-сарматского времени с городища у с. Верхнее Казачье

стенные сосуды предшествующего периода. Вместе с тем, получили широкое распространение горшки с раструбовидной горловиной, с насечками по краю венчика или без таковых.

Наличие в керамическом комплексе начала н. э. форм, имеющих более древние аналогии, дало возможность предполагать демографическую и культурную преемственность между населением скифского и сарматского времени [6, с. 67; 7, с. 88].

Для оценки меры сходства керамики местного производства, разнесенной во времени или пространстве, исследователи учитывали, прежде всего, ее экстерьер. Находя в формах или орнаментах те или иные соответствия, делали вывод об этнической общности производителей и пользователей глиняной посуды. Однако данный вид археологических материалов далеко не всегда пригоден для таких выводов [8]. Для повышения репрезентативности источника совершенно необходимо оперировать и сведениями о способах изготовления керамики, характеризующихся высокой степенью устойчивости [9, с. 48–52].

Ранее о гончарной технологии скифо-сарматского времени судили по визуально определимым проявлениям, таким как наличие и состав примесей в глиняном тесте, фактура поверхности, вид излома черепков. Сейчас же появилась возможность ее углубленного изучения. Произошло это благодаря сотрудничеству с М. А. Кульковой, под руководством которой на лабораторном оборудовании Российского государственного педагогического университета им. А. И. Герцена осуществлено петрографическое и геохимическое исследование 248 образцов поселенческой керамики[1]. В результате определены минеральный и химический состав формовочной массы, рецептура теста и режим обжига сосудов, представляющих, хотя и в разных пропорциях, каждую из пяти охарактеризованных выше керамических групп [10–12].

По этим данным было проведено сравнение микроморфологии керамических комплексов, что, как представляется, позволило более объективно судить о степени этнокультурной близости стоявших за ними сообществ.

Отдельно рассматривалась серия из 100 образцов [12], происходящая с уже упомянутого городища у с. Верхнее Казачье (Задонский р-н Липецкой обл.), на котором присутствует керамика всех пяти групп [2; 13; 14]. Общая локализация материалов позволяла надеяться, что результаты их сравнения наглядно засвидетельствуют наличие либо отсутствие этнокультурной связи между жителями городища в разные периоды его функционирования.

Ассортимент глин, использовавшихся для производства посуды, в каждой из групп разнообразен – совпадения фиксируются лишь отчасти (табл. 1). Существенные различия показало и сравнение рецептур формовочных масс (табл. 2). Из девяти разновидностей глин, пошедших на изготовление сосудов раннескифского времени, только три применялись в обеих сериях. «Текстильные» сосуды характеризуются значительной запесоченностью. Песок присутствовал в каждом из них, обычно являясь единствен-

[1] Авторы выражают М. А. Кульковой глубокую благодарность.

*Таблица 1*

**Состав глин сосудов скифо-сарматского времени с городища у с. Верхнее Казачье**

| Состав глины | Керамические сосуды | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «текстильные» | | груболепные | | скифоидной культуры | | городецкой культуры | | сарматского времени | |
| | количество | % | количество | % | количество | % | количество | % | количество | % |
| гидрослюдистый | 3 | 15 | 2 | 10 | 1 | 5 | 4 | 20 | 2 | 10 |
| смектитовый | 4 | 20 | - | - | 5 | 25 | 1 | 5 | 7 | 35 |
| хлоритовый | - | - | 4 | 20 | 5 | 25 | 2 | 10 | 3 | 15 |
| каолинитовый | - | - | - | - | - | - | 1 | 5 | - | - |
| гидрослюдисто-смектитовый | 2 | 10 | 2 | 10 | - | - | 10 | 50 | - | - |
| гидрослюдисто-хлоритовый | - | - | - | - | - | - | 1 | 5 | - | - |
| каолинитово-гидрослюдистый | 1 | 5 | - | - | - | - | - | - | - | - |
| каолинит-смектитовый | - | - | - | - | - | - | 1 | 5 | - | - |
| смектитово-гидрослюдистый | 1 | 5 | 6 | 30 | - | - | - | - | 6 | 30 |
| смектит-хлоритовый | - | - | 6 | 30 | - | - | - | - | - | - |
| хлорит-гидрослюдистый | 6 | 30 | - | - | 4 | 20 | - | - | 2 | 10 |
| хлорит-смектитовый | 3 | 15 | - | - | 5 | 25 | - | - | - | - |
| ***ВСЕГО:*** | ***20*** | ***100*** | ***20*** | ***100*** | ***20*** | ***100*** | ***20*** | ***100*** | ***20*** | ***100*** |

*Таблица 2*

**Искусственные примеси в формовочных массах керамики городища у с. Верхнее Казачье и других поселений скифоидной и городецкой культур**

| Примесь | Керамические сосуды | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | «текстильные» | | грубoлепные | | скифоидной культуры | | городецкой культуры | | сарматского времени | |
| | количество | % | количество | % | количество | % | количество | % | количество | % |
| песок | 16 | 80 | 4 | 20 | 1 | 0,9 | 2 | 2,5 | 1 | 5 |
| дресва | - | - | 3 | 15 | 3 | 2,8 | 11 | 13,75 | - | - |
| шамот | - | - | 1 | 5 | 3 | 2,8 | 1 | 1,25 | - | - |
| песок+дресва | 4 | 20 | 6 | 30 | 12 | 11,1 | 25 | 31,25 | 2 | 10 |
| песок+шамот | - | - | 1 | 5 | 46 | 42,6 | 9 | 11,25 | - | - |
| дресва+шамот | - | - | - | - | 6 | 5,6 | 2 | 2,5 | 1 | 5 |
| песок+дресва+шамот | - | - | 5 | 25 | 34 | 31,5 | 29 | 36,25 | 13 | 65 |
| песок+дресва+шамот+кость | - | - | - | - | 1 | 0,9 | 1 | 1,25 | 3 | 15 |
| песок+шамот+кость | - | - | - | - | 1 | 0,9 | - | - | - | - |
| песок+мох | - | - | - | - | 1 | 0,9 | - | - | - | - |
| **ВСЕГО:** | **20** | **100** | **20** | **100** | **108** | **100** | **80** | **100** | **20** | **100** |
| ***Частота встречаемости искусственных примесей*** | | | | | | | | | | |
| песок | 20 | 100 | 16 | 80 | 96 | 88,9 | 66 | 82,5 | 19 | 95 |
| дресва | 4 | 20 | 14 | 70 | 56 | 51,9 | 68 | 85 | 19 | 95 |
| шамот | - | - | 7 | 35 | 45 | 41,7 | 42 | 52,5 | 17 | 85 |
| кость | - | - | - | - | 2 | 1,8 | 1 | 1,3 | 3 | 15 |
| мох | - | - | - | - | 1 | 0,9 | - | - | - | - |

ным отощителем, лишь в четырех случаях сочетаясь с дресвой (дробленые магматические породы). В груболепной серии песок встречался тоже часто, но в меньших объемах. Как правило, он использовался вместе с дресвой, с дресвой и шамотом (дробленой керамикой отличного от образца состава). Количество рецептур формовочных масс у этой керамики в три раза больше, чем у «текстильной» Исходя из этих наблюдений, можно говорить о сосуществовании двух гончарных традиций, по-видимому, связанных с неоднородным составом основателей городища. Хронологическое различие исключить пока нельзя, но, как было сказано, стратиграфически оно не прослеживается.

Гончарное производство скифского времени вряд ли напрямую проистекало из предшествующего, хотя некоторые общие черты и просматриваются. Сырьевая база во многом стала иной. Для скифоидной посуды использовалась глина, как правило, не встречавшаяся в груболепной. В свою очередь, «рогожная» и «текстильная» керамика демонстрируют сходство по трем разновидностям глины, различие – по четырем. Даже в случаях совпадения наблюдаются количественные диспропорции. Керамика скифского времени с городища у с. Верхнее Казачье зачастую содержит набор отощителей, присущий и более древней. Это песок+дресва, песок+дресва+шамот, дресва. Но если «текстильные» образцы в подавляющем большинстве содержали песок в качестве единственной искусственной примеси, то среди «рогожных» таких оказалось только два. О технологической преемственности керамики двух периодов, похоже, говорить не приходится.

Судя по значительному несовпадению химических характеристик сырья, производители городецкой и скифоидной посуды проживали на городище в разное время. Вместе с тем, по другим технологическим показателям (выше уже отмечалось, что и по внешнему виду) продукция тех и других демонстрирует значительную степень близости. Об этом свидетельствуют данные не только по городищу у с. Верхнее Казачье, но и по другим поселенческим памятникам – гораздо более многочисленные (табл. 2).

Для скифоидной и городецкой керамики присущи восемь общих рецептур формовочных масс. Сочетание искусственных примесей песок+дресва+шамот встречено в трети образцов той и другой культурной принадлежности. Вместе с тем, дресва и песок+дресва чаще использовались в городецкой среде, а песок+шамот – в скифоидной.

Многокомпонентные рецепты, как известно из исследований А. А. Бобринского, могут свидетельствовать о смешении гончарных традиций и усложнении состава населения [15, с. 92]. Надо полагать, что и в данном случае керамика отражает процессы взаимодействия носителей скифоидной и городецкой культур. Хотя о слиянии двух групп населения донской лесостепи речи быть не может – хозяйственно-бытовой уклад их жизни свидетельствует об обратном [16].

В сарматское время на городище у с. Верхнее Казачье использовались четыре разновидности глин, характерные для скифоидной керамики, и еще две новые. В формовочную массу добавлялись песок с дресвой, к которым, как правило, подмешивался шамот. В то же время, появились такие сочетания примесей, как песок+дресва+шамот+дробленая кость и дресва+шамот.

Взаимосвязь гончарного производства этого времени с предшествующим остается под вопросом. Но инновационный характер некоторых технологических приемов прослеживается.

В заключение следует оговориться, что результативность первого для донской лесостепи опыта сопоставительного изучения микроморфологии керамики скифо-сарматского времени зависит от объема источниковой базы. Тем не менее, перспективность обозначенного исследовательского направления сомнений не вызывает.

## Библиографические ссылки


1. *Медведев А. П.* Ранний железный век лесостепного Подонья. Археология и этнокультурная история I тысячелетия до н. э. Москва: Наука, 1999. 160 с.

2. *Разуваев Ю. Д.* Новые поселенческие материалы начала раннего железного века на Верхнем Дону // Российская археология. 2018. № 1. С. 93–104.

3. *Сарапулкина Т. В.* Особенности донского локального варианта городецкой культуры // Научные ведомости Белгородского государственного университета. Серия История, Политология, Экономика, Информатика. 2008. № 10 (50). Вып. 8. С. 57–65.

4. *Ставицкий В. В.* Проблема происхождения городецкой культуры // Вестник НИИ гуманитарных наук при Правительстве Республики Мордовия. 2010. № 1 (13). С. 7–16.

5. *Сарапулкина Т. В.* Городецкая культура на Верхнем и Среднем Дону. Автореф. дис. … канд. ист. наук. Москва, 2010. 25 с.

6. *Медведев А. П.* Сарматы в верховьях Танаиса. Москва: Таус, 2008. 252 с.

7. *Разуваев Ю. Д.* Ишутинское городище на Красивой Мече // Археологические памятники Верхнего Подонья первой половины I тысячелетия н. э. (Археология восточноевропейской лесостепи. Вып. 12). Воронеж, 1998. С. 85–96.

8. *Шнирельман В. А.* Керамика как этнический показатель: некоторые вопросы теории в свете этноархеологических данных // КСИА. 1990. Вып. 201. С. 49–56.

9. *Бобринский А. А.* Гончарная технология как объект историко-культурного изучения // Актуальные проблемы изучения древнего гончарства (коллективная монография). Самара, 1999. С. 5–109.

10. *Меркулов А. Н., Разуваев Ю. Д., Кулькова М. А.* К изучению технологии изготовления среднедонской керамики скифского времени // Вестник Воронежского государственного университета. Серия: История. Политология. Социология. 2021. № 1. С. 74–80.

11. *Разуваев Ю. Д.* Результаты микроморфологического исследования керамики донских поселений городецкой культуры // Теория и практика археологических исследований. 2024. Т. 36, № 2. С. 74–91.

12. *Разуваев Ю. Д., Меркулов А. Н.* Керамические комплексы скифо-сарматского времени с верхнедонского городища у с. Верхнее Казачье (опыт микроморфологического сравнения) // КСИА. 2024. Вып. 247. С. 296–131.

13. *Разуваев Ю. Д.* Городище у с. Верхнее Казачье: три среза скифской эпохи на Верхнем Дону // Археологическое наследие. 2020. № 1 (3). С. 209–223.

14. *Разуваев Ю. Д.* Материалы сарматской эпохи на городище у с. Верхнее Казачье близ г. Задонска // Археологическое наследие. 2022. № 1 (5). С. 73–85.

15. *Бобринский А. А.* Гончарство Восточной Европы: источники и методы изучения. Москва: Наука, 1978. 272 с.

16. *Разуваев Ю. Д.* Оседлые этносы скифской эпохи в донской лесостепи: опыт сравнения хозяйственно-бытовых укладов // Уральский исторический вестник. 2019. № 1 (62). С. 63–70. DOI: 10. 30759/1728-9718-2019-1(62)-63-70.

# КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК КАЛЯ В. ДУБАЙ У КАНТЭКСЦЕ ПАХАВАЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ МІЛАГРАДСКАЙ КУЛЬТУРЫ

**А. Д. Сахончык**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, sahonod@bsu.by*

По выніках аналізу пахавальнага абраду курганнага могільніка каля в. Дубай была зроблена шэраг высноў. На помніку вылучаецца некалькі абрадавых груп. У курганных пахаваннях мілаградскай культуры, у цэлым, дамінуе традыцыя палажэння цел галавой на поўнач. Пры гэтым у матэрыялах дубайскага могільніка і грунтовых інгумацыйных пахаваннях мілаградскай культуры такая арыенціроўка адзначаецца рэдка. Гэтую асаблівасць можна звязваць з міграцыямі ды кантактамі як ўнутры арэала мілаградскай культуры, так і з іншакультурным насельніцтвам. Храналагічна могільнік каля вёскі Дубай адносіцца да канца VII – першай паловы VI ст. да н. э.

***Ключавыя словы:*** мілаградская культура; курганны могільнік; ранні жалезны век; пахавальны абрад; культурныя сувязі.

# КУРГАННЫЙ МОГИЛЬНИК ОКОЛО Д. ДУБОЙ В КОНТЕКСТЕ ПОГРЕБАЛЬНЫХ ПАМЯТНИКОВ МИЛОГРАДСКОЙ КУЛЬТУРЫ

**О. Д. Сахончик**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,*
*220030, г. Минск, Республика Беларусь, sahonod@bsu.by*

По результатам анализа погребального обряда курганного могильника возле д. Дубой было сделано несколько заключений. На памятнике выделяется несколько обрядовых групп. В курганных погребениях милоградской культуры, в целом, доминирует традиция положения тел головой на север. При этом в материалах дубайских погребений и грунтовых ингумационных могильниках милоградской культуры такая ориентировка отмечается редко. Эту особенность можно связывать с миграциями и контактами как внутри ареала милоградской культуры, так и с инокультурным населением. Хронология могильника возле д. Дубой определяется концом VII – первой половиной VI в. до н. э.

***Ключевые слова:*** милоградская культура; курганный могильник; ранний железный век; погребальный обряд; культурные связи.

# THE BURIAL CEMETERY AROUND DUBAJ VILLAGE IN THE CONTEXT OF THE MYLOHRAD CULTURE FUNERAL MONUMENTS

**O. D. Sahonchyk**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4,*
*220030, Minsk, Republic of Belarus, sahonod@bsu.by*

Based on the results of the burial rite analysis of the burial mound near the village of Dubaj, several conclusions were made. Several ritual groups were distinguished at the site. In the burial mounds of the Milograd culture, in general, the tradition of placing the bodies with the head to the north dominates. At the same time, in the materials of the Dubaj burials and the ground inhumation cemeteries of the Milograd culture, such an orientation is rarely noted. This feature can be associated with migrations and contacts both within the area of the Milograd culture and with a foreign cultural population. The chronology of the burial ground near the village of Dubaj was determined by the end of the 7th – first half of the 6th century BC.

***Keywords:*** Milograd culture; burial mound; early Iron Age; burial rite; cultural connections.

Адной з асаблівасцяў пахавальных практык насельніцтва мілаградскай культуры з’яўляецца традыцыя ўзвядзення курганных насыпаў над пахаваннямі. На тэрыторыі Прыпяцкага Палесся найбольш поўна вывучаным некропалем з’яўляецца помнік каля в. Дубай (Столінскі раён, Брэсцкая вобласць) (рыс. 1, *1*). Пэўны час курганныя некропалі лічыліся лакальнай з’явай, характэрнай для тэрыторыі Палесся і Валыні [1, с. 43]. На сённяшні дзень, можна казаць што падобныя могільнікі вядомы ва ўсім арэале бытавання культуры (рыс. 1). Аўтар валодае інфармацыяй аб 20-ці могільніках і адзінкавых курганах, якія атаясамляюцца з мілаградскай культурай. Пры гэтым матэрыялы могільніка Дубай з’яўляюцца найбольш прадстаўнічымі і дыскусійнымі. Неабходна параўнаць пахавальны абрад дадзенага могільніка з сінхроннымі могільнікамі мілаградскай культуры, што дазволіць скарэктаваць некаторыя пытанні.

**Лакалізацыя і гісторыя даследавання.** Помнік упершыню адкрыў і даследаваў у 1956 г. Ю. У. Кухарэнка. Ужо на той момант частка насыпаў была пашкоджана воркай [2, с. 11–12, 21–24]. Навукоўцам было даследавана 13 курганаў. Матэрыялы былі перададзены ў Музей Беларускага Палесся (г. Пінск), Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, Столінскі раённы краязнаўчы музей. Далейшыя раскопкі на помніку праводзілі Г. М. Залашка (1981 г.) і С. Я. Рассадзін (1989 г.), якія агулам вывучылі яшчэ 4 насыпы. Матэрыялы іх даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.




а) ■ ; б) ○ ; в) ● ; г) △ ; д) □ ;

*Рыс. 1.* Курганныя могільнікі насельніцтва мілаградскай культуры:

*а* – пахаванні па абраду інгумацыі; *б* – пахаванні па абраду крэмацыі; *в* – бірытуальныя могільнікі; *г* – кенатафы; *д* – курганны могільнік, аднесеныя да мілаградскай культуры ўмоўна; *1* – Дубай; *2* – Вулька Арэя; *3* – Бор Дубянецкі; *4* – Вылазы; *5* – Валадымырэць; *6* – Забороль, ур. Бічаль; *7* – Забороль, ур. Глібака; *8* – Прыбар; *9* – Дзяснянка; *10* – Курылаўка; *11* – Мізякава; *12* – Беразоўка-1; *13* – Малапалавецкае-3; *14* – Грэмячае; *15* – Сялец, VI курганая група; *16* – Селец, VIII курганая група; *17* – Псішча; *18* – Крошніна; *19* – Народзічы; *20* – Няцешын

Падчас раскопак курганам надавалася скразная нумарацыя, прапанаваная ў свой час Ю. У. Кухарэнка і выкарыстаная таксама Г. М. Залашкам, С. Я. Рассадзіным [3, с. 58]. Даследаваныя ў 1989 г. курганы размяшчаліся ў розных частках урочышча Задубенне, кожная з якіх мела сваю назву [3, с. 58, мал. 2: б]. Праца з картаграфічнымі матэрыяламі дазволіла аўтару артыкула вызначыць, што урошчы Бішчане і Крывы Рог, якія згадваюцца ў С. Я. Рассадзіна лакалізаваліся побач з Задубеннем.

Матэрыялы раскопак некропаля каля в. Дубай ужо публікаваліся. Спецыяльныя працы былі прысвечаны публікацыі матэрыялаў 1956, 1989 гг. [2, с. 21–24; 3]. Розныя навукоўцы неаднаразова звярталіся да матэрыялаў помніка пры напісанні абагульняючых прац па археалогіі Беларусі і сумежных тэрыторый [4, с. 44–56; 5; 6; 7, с. 147–148; 8 і інш. ].

У гістарыяграфіі найбольш дыскусійным з'яўляецца пытанне храналогіі помніка. Ю. У. Кухарэнка першапачаткова аднёс курганы да VI–V стст. да н. э. [2, с. 11–12]. В. М. Мельнікоўская і У. Я. Яроменка цалкам пагадзіліся з храналогіяй, якую прапанаваў навуковец [9, с. 84; 10, с. 49]. Пазней У. Я. Яроменка пераглядзеў храналогію. На яго думку, традыцыя курганных пахаванняў са зброяй у заходнепалескім варыянце мілаградскай культуры з'яўляецца толькі на фазе B1 (650/640–560/550 гг. да н. э.) згодна адноснай храналогіі Скіфіі [10, с. 52–53]. Л. Д. Побаль у «Очерках по археологии Белоруссии» і М. І. Лашанкоў прапанавалі адносіць іх да VII–VI стст. [11, с. 144–145; 12, с. 168]. С. Я. Рассадзін абазначыў храналагічныя рамкі Дубайскіх курганаў у межах VIII–VII ст. да н. э. [4, с. 26]. С. С. Беразанская адносіла курганы каля в. Дубай да эпохі позняй бронзы – ранняга жалеза. Асноўным крытэрыем для даследчыцы было назіранне аб форме насыпаў і іх блізкасці з курганамі позняй бронзы [7, с. 147–148].

Не менш дыскусійным заставалася пытанне культурных уплываў і кантактаў насельніцтва, што пакінула курганны могільнік каля в. Дубай. Упершыню аб гэтым напісаў Ю. У. Кухарэнка, які лічыў, што грушападобныя гаршкі, адкрытыя ім у курганах, сведчаць аб кантактах з іншакультурным насельніцтвам з поўдня і паўднёвага захаду – лужыцкай, высоцкай ці скіфскай археалагічных культур [2, с. 11]. Л. Д. Побаль выказаў думку, што матэрыялы з дубайскіх курганоў адлюстроўваюць кантакты мілаградскага насельнітцтва з носьбітамі іншых культур паміж Заходнім Бугам і Дняпром [13, с. 11–12]. На падставе аналізу керамічнага комплексу курганных пахаванняў У. Я. Яроменка свярджаў аб тым, што на фарманне мілаградскай культуры ў Заходнім Палессі аказала важны ўплыў насельніцтва суседніх позднелужыцкай і высоцкай культур [14, с. 79]. А. І. Цераножкін і В. А. Іллінская разглядалі гаршкі з курганаў як сведчанне пераймання скіфскіх уплываў [15, с. 189–190]. На карысць існавання актыўных сувязяў з насельніцтвам высоцкай культуры на падставе аналізу элементаў пахавальнай абраднасці і ўзбраення (наканечнікаў коп'яў) з Дубайскіх курганаў выказваўся С. Я. Рассадзін, а таксама аўтары «Очерков по археологии Белоруссии» [4, с. 48, 60; 11, с. 144–145].

Неабходна адзначыць, што метады раскопак насыпаў і фіксацыя працэсу іх даследавання на кожным этапе вывучэння некропаля ў Дубаі адрозніваліся, што не заўсёды дазваляе суаднесці вынікі, атрыманыя рознымі аўтарамі, і параўнаць іх назіранні. Гэта, у сваю чаргу, пэўным чынам уплывае на магчымасці аналізу ў працэсе вывучэння пахавальнага абраду некропаля і рэканструкцыі працэсу будаўніцтва курганоў. Асноўным для аналізу застаецца сітуацыйны план, які быў зроблены ў 1956 г. Ю. У. Кухарэнка [2, с. 11]. Гэты ж план выкарыстоўваўся С. Я. Рассадзіным для абазначэння даследаваных ім насыпаў [3, с. 58].

**Характарыстыка курганнага абраду могільніка каля в. Дубай**

| № кур-гана | Кас-цякі заха-валіся: | Цела нябожчыка выцягнута па асі | Пясчаная пля-цоўка на ўзроўні старажытнай дзённай паверхні | Пахаванне здзяйснялася | Рэшткі драўляных канструкцый | Прад-меты зброі | Рэшткі трызны | Насып складаўся з дзвюх частак | Дыяметр насыпу, м | Вышыня насыпу, м |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | - | ПдУ – ПнЗ | - | у яме | Зруб; Абпаленая | - | + | + | 19 | 1,7 |
| № 2 | + | ПдУ – ПнЗ | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | + | - | + | 12 | 0,6 |
| № 3 | - | - | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | + | - | 13 | 0,5 |
| № 4 | - | ПдУ – ПнЗ | - | у яме | - | + | + | - | 14 | 0,85 |
| № 5 | + | ПдУ – ПнЗ | + | на ўзроўні старажытнай паверхні | Зруб; Спарахнелая | + | - | + | 22 | 1,5 |
| № 6 | - | ПдУ – ПнЗ | + | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | + | - | - | 10 | 0,5 |
| № 7 | + | ПдУ – ПнЗ | - | у яме | Зруб; Спарахнелая | + | + | + | 18 | 1 |
| № 8 | - | - | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | - | 8 | 0,25 |
| № 9 | - | - | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | - | 6 | 0,2 |
| № 10 | + | ПдУ – ПнЗ | + | у яме | - | - | + | + | 2 | 1 |

*Сканчэнне табліцы*

| № кур-гана | Кас-цякі заха-валіся: | Цела нябожчыка выцягнута па асі | Пясчаная пля-цоўка на ўзроўні старажытнай дзённай паверхні | Пахаванне здзяйснялася | Рэшткі драўляных канструкцый | Прад-меты зброі | Рэшткі трызны | Насып складаўся з дзвюх частак | Дыяметр насыпу, м | Вышыня насыпу, м |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 11 | + | ПдУ – ПнЗ | + | на ўзроўні старажытнай паверхні | Зруб; Абпаленая | - | + | + | 16 | 1,1 |
| № 12 | - | - | + | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | + | 12 | 0,5 |
| № 13 | + | ПдУ – ПнЗ | + | на ўзроўні старажытнай паверхні | Слупавая; Абпаленая | + | - | + | 15 | 1 |
| № 14 | - | - | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | + | - | 5 | 0,5 |
| № 15 | - | Пн – У (?) | - | у яме | - | - | + | - | 12 | 1,5 |
| № 16 | - | - | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | - | 8-10 | 0,5 |
| № 17 | + (?) | ? | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | - | 10 | 0,5 |
| № 18 | + | ? | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | + | - | 12 | 1 |
| № 19 | + | ПнЗ – ПдУ | - | на ўзроўні старажытнай паверхні | - | - | - | - | 11 | 1 |

**Асноўныя вынікі даследавання курганнага могільніка каля вёскі Дубай.** Той факт, што за гады раскопак каля в. Дубай было даследавана 19 са 100 насыпаў (калі улічваць дзве групы, што лакалізаваліся на усход і паўднёвы-захад ад урочышча Задубення), дазваляе адносна падрабязна і дастаткова надзейна ахарактарызаваць яго пахавальны абрад.

Можна атрымаць наступную карціну пахавальнага абраду. Насыпы Дубайскіх курганаў былі акруглыя ў плане, у большай альбо меншай ступені пашкоджаныя воркай і аплыўшыя. Іх вышыня складала да 2 м, а дыяметр вагаўся ад 5 да 20 м (табл.). Вылучаецца курган № 10, які быў пашкоджаны воркай і меў вышыню 1 м пры дыяметры ўсяго 2 м [4, с. 24]. Насыпы ўзводзіліся з грунту рознай шчыльнасці: у аснове залягала гліністая ці сугліністая глеба, а верхняя дасыпалася, як правіла, з пяску. На думку Ю. У. Кухарэнка, курган № 5 насыпаўся ў два прыёмы. Першапачатковы насып меў дыяметр каля 11 м і вышыню 1 м, і толькі пасля пэўнага часу, калі паспеў сфармавацца дзярновы слой, курган падсыпалі і ён набыў канчатковыя памеры – да 22 м у дыяметры [4, с. 12].

Можна меркаваць, што ва ўсіх даследаваных курганах пахаванні здзяйсняліся па абраду інгумацыі. Пры гэтым варта адзначыць, што ў 9-ці курганах косткі нябожчыка не захаваліся. Ю. У. Кухарэнка, а пазней С. Я. Рассадзін звязвалі адсутнасць рэштказ цел у курганах з уласцівасцямі глебы [4, с. 16]. Адносна кургана № 17 можна прапанаваць два варыянты інтэрпрэтацыі. Па-першае, абпал цела нябожчыка адбываўся па-за прасторай кургана, і тут мы сутыкаемся з імітацыяй абраду крэмацыі. Па-другое, абпал адбываўся падчас узвядзення кургану і сведчыць на карысць здзяйснення складаных рытуальных практык падчас пахавальнай цырымоніі [3, с. 63].

З-за таго, што косткі ў Дубаі захаваліся дрэнна, не зразумелай застаецца поза нябожчыкаў ў пахаваннях. На падставе размеркавання тлену ад костак, Ю. У. Кухарэнка выказаў меркаванне, што касцякі ляжалі на спіне ў выцягнутым стане [2, с. 11]. Ускосна гэты тэзіс можна пацвердзіць назіраннямі за інгумацыйнымі пахаваннямі мілаградскай культуры, дзе стан захаванасці шкілетаў дазваляў зрабіць падобныя назіранні. Так, выцягнутыя на спіне касцякі вядомы па наступных курганных могільніках: Мізякава (Калінаўскі р-н, Вінніцкая вобл.) (рыс. 1, *11*) (кург. № 2, 3, 4, 5, 6), Курылаўка (рыс. 1, *10*) (Хмельніцкі р-н, Вінніцкая вобл.) (кург. № 1, 2, 9), Малапалавецкае-3 (рыс. 1, *13*) (Фастаўскі р-н, Кіеўская вобл.) (пах. 48) [16; 17; 18, с. 28]. Добра вядомы і грунтовыя могільнікі з пахаваннямі па абраду інгумацыі, якія таксама ілюструюць традыцыю класці нябожчыка на спіне у выцягнутым стане. Сярод іх адзначым пахаванні з могільнікаў Гарадок (Ровенскі р-н, Ровенская вобл.) (пах. № 1, 2, 4, 5), Рудзякі (Барыспольскі р-н, Кіеўская вобл.) (пах. № 1), Казаровічы (Вышгарадскі р-н, Кіўеская вобл.) (пах. № 2–4), Малапалавецкае-3 (пах. № 32, 41, 48, 55, 62, 69 і інш.) і інш. [8, с. 71–73; 19; 20, с. 14–16; 18].

Вядомы таксама пахаванні, у якіх касцякі былі пакладзеныя на баку, у позе эмбрыёну: Мітрапаліччы Сад (г. Кіеў) (пах. № 1), Малапалавецкае-3 (пах. № 188), дзе дземембрацыя[1] імітавала скурчаную позу [21, с. 152–153; 23]. Праўда аб'ект з Малапалавецкага-3, магчыма, адносіцца да эпохі бронзы [22]. Улічваючы тое, што ў цэлым у мілаградскай культуры скурчаныя на баку пахаванні рэдкія, можна меркаваць, што нябожчыкі ў Дубаі сапраўды, верагодней за ўсё, ляжалі выцягнута на спіне.

Грунтуючыся на вызначэнні М. М. Памазанава і У. С. Крумплеўскага, а таксама Ю. У. Кухарэнкі, на помніку каля в. Дубай варта вылучаць калектыўныя пахаванні. Пад адным насыпам змяшчалася некалькі нябожчыкаў у курганах № 5 і 13, 17, 18 (?) [2, с. 22, 24, рис. 11: III, 12: III; 3, с. 59, 62]. Адсутнасць слядоў укопаў у насыпы сведчыць, што калектыўныя пахаванні здзяйсняліся адначасова. Яны здзяйсняліся толькі на старажытнай дзённай паверхні. У арэале мілаградскай культуры калектыўныя пахаванні выяўлены таксама каля в. Сялец, Мізякава (рыс. 1, *11, 15, 16*) (кург. № 5, 6) і Дзяснянкі (рыс. 1, *9*) (кург. № 4). Калі ў Дубае ў калектыўных пахаваннях усе нябожчыкі былі арыентаваны ў адным напрамку, то ў Мізякава (кург. № 5) целы былі арыентаваныя ў супрацьлеглыя бакі [16, с. 82–83; 4, с. 22–24]. У VIII курганнай групе каля в. Сялец было выяўлена два пахаванні, кожнае з якіх знаходзілася ў асобнай пахавальнай яме [9, с. 50]. На тэрыторыі Беларусі ў Верхнім Падняпроўі падобная сітуацыя адзначаецца ў Прыбары, у кургане № 2 (рыс. 1, *2*) [23, с. 62]. На падставе аналогій з курганнага могільніка Мізякава нельга выключыць, што ў кургане № 18 таксама было змешчана калектыўнае пахаванне.

Для курганнага могільніка Дубай можна вызначыць арыентыроўку нябожчыкаў у 12-ці пахаваннях. У 9-ці выпадках целы былі арыентаваныя галавой на паўднёвы-ўсход (табл.). Разам з тым на помніку сустракаецца і паўночная арыентыроўка. Падобная сітуацыя фіксавалася ў Курылаўцы (кург. № 1, 2, 9), Мізякава (кург. № 2–6) [16, с. 83; 17, с. 18–19]. Галавой на паўночны захад былі арыентаваныя пахаванні ў Дзяснянцы [24, с. 155]. У курганнай групе № VIII каля в. Сялец нябожчык быў арыентаваны галавой на паўночны ўсход – усход (кург. № 1, пах. 1 і 2) [9, с. 50]. С. С. Бяссонава, аналізуючы матэрыялы Усходняга Падолля, выказвала меркаванне, што пахаванні з арыентацыяй нябожчыка галавой на поўнач – у цэлым тыповая для мілаградскай культуры пахавальнай практыкі [25, с. 30].

Адзначым, што паўночная і паўночная з адхіленнямі арыенціроўка не характэрная для грунтовых пахаванняў мілаградскай культуры. Не з'яўляецца яна дамінуючай і для насельніцтва лесастэпавай скіфойднай культуры [26,

[1] Паводле Ю. А. Смірнова дземембрацыя – адзін з этапаў (варыянтаў) птоматалагічнай стадыі некралагічнага цыклу, на якім адбываюцца дзеянні, якія прыводзяць да парушэння агульнай («анатамічнай») цэласнасці цела памерлага, г. зн. да яго частковага ці поўнага расчлянення.

с. 111–112]. На тэрыторыі Кіева-Чаркаскай групы паўночная арыенціроўка займае трэцяе месца па распаўсюджанасці [27, с. 27–28; 28, с. 111]. У сінхроннай мілаградскай, валынскай (паводле А. І. Цераножкіна і В. А. Ільінскай) ці магілянскай (паводле Л. І. Крушальніцкай) групе ўвогуле быў характэрны абрад крэмацыі [28, с. 34–36]. Помнікі гэтай групы размяшчаліся цераспалосна з мілаградскімі [29, рис. 50]. Тут вядомы толькі адзінкавыя інгумацыі, але іх культурна-храналагічнае вызначэнне дыскутуецца [28, с. 36–37]. Такім чынам, на дадзены момант не магчыма пераканаўча патлумачыць крыніцу і шляхі распаўсюджання традыцыі паўночнай арыенціроўкі нябожчыкаў у курганных некропалях мілаградскай культуры.

У прасторы кургана пахаванні лакалізаваліся ў цэнтральнай частцы ці з невялікім змяшчэннем ад яго. Той жа прынцып характарызуе інгумацыі, даследаваныя ў арэале культуры ў цэлым [24, с. 155; 31, ріс 1, с. 343–350; 9, с. 50; 18, с. 73, 74; 24]. Большая частка пахаванняў была здзейснена на ўзроўні старажытнай дзённай паверхні (табл.). Сустракалася таксама дадатковая перакрываючая паверхня ў выглядзе пясчанай пляцоўкі (табл.). Можна вылучыць пляцоўкі дзвюх формаў: акруглай і авальнай. Пераважалі пляцоўкі першай формы. Яны выяўленыя ў курганах: 6 (дыяметр крыху болей 2 м), 10 (дыяметр каля 6 м), 11 (3 м), 12 (3 м), 13 (6 м). Пляцоўка авальнай формы выяўлена толькі ў кургане № 5 (даўжыня 5 м, шырыня 3,5 м, таўшчыня 0,10 м, арыентаваная з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход). Пахавальная яма ў кургане № 10 знаходзілася пад пясчанай пляцоўкай, што не характэрна для разглядаемага могільніка. У іншых курганах, дзе былі выяўлены пясчаныя пляцоўкі, пахаванні былі здзейсненыя на іх. Не менш важнай складаючай пахавальнага абраду з'яўляецца выкарыстанне драўляных канструкцый у якасці дадатковай перакрываючай паверхні насельніцтвам мілаградскай культуры на могільніку ў Дубаі. У адным выпадку, верагодна, была зафіксавана слупавая канструкцыя, а ў іншых – зрубная (табл.).

Сляды больш складаных абрадавых дзеянняў, якія могуць быць інтэрпрэтаваныя як трызна, зафіксаваныя ў 9-ці курганах Дубая. Мы не ведаем, як выглядаў у дэталях гэты абрад. Але яго слядамі, якія могуць фіксаваць археолагі, з'яўляюцца абломкі посуду, выяўленыя ў курганах па-за межамі пахавальных ям ці пясчаных пляцовак, развалы пасудзін у насыпу, а таксама сляды вогнішчаў. У кургане № 4 каля в. Дубай наканечнік кап'я знаходзіўся па-за межамі пахавальнай ямы. Магчыма, гэтая знаходка таксама адлюстроўвае пэўныя памінальныя дзеянні. Таксама ў якасці элементу памінальнага абраду на ўзроўні старажытнай паверхні маглі змяшчацца рэшткі жывёл. Такі абрад зафіксаваны ў курганах № 1, 10, 18. Пад насыпамі № 1, 10 знаходзіліся парэшткі каня, і каровы ў кургане № 18. У кургане № 1 парэшткі каня знаходзіліся побач з развалам пасудзіны, што яшчэ раз можа ўказваць на здзяйсненне пэўных рытуалаў.

Змяшчэнне костак жывёл у пахаванні вядомыя і па матэрыялах грунтовых могільнікаў [9, с. 47; 21, с. 14–16]. Падобную інтэрпрэтацыю для знаходак парэштак жывёл прапануюць для помнікаў лесастэпавай скіфойднай культуры [26, с. 225]. На падставе аналізу планіграфіі аб'ектаў можна вылучыць некалькі варыянтаў месцаў абрадавых дзеянняў, звязаных з трызнай: 1) побач з пахвальнай ямай (курганы № 1, 7); 2) на адлегласці ад пахавальнай ямы ці пляцоўцы ў паўночным ці паўночна-заходнім напрамку (курганы № 3, 4, 10, 11, 15, 18).

Сляды абпалу на зубах чалавека з кургана № 17 таксама можна разглядаць у кантэксце пэўных рытуальных практык. На карысць гэтага ўказвае невялікая тэмпература абпалу, а таксама кароткачасовае знаходжанне костак ў вогнішчы, згодна з вызначэннем антраполагаў [3]. Можна меркаваць, што абпал цела нябожчыка адбываўся на заключным этапе здзяйснення пахавання, непасрэдна перад узвядзеннем курганнага насыпу. Верагодна, частковы абпал цел нябожчыкаў адбываўся і ў іншых пахаваннях на могільніку ў Дубаі. Ускосна на гэта указваюць рэшткі абпаленых драўляных плах з кurганоў № 1, 11 і 13. На іншых помніках мілаградскай культуры слядоў частковага абпальвання нябожчыкаў на дадзены момант не выяўлена. У кургане № 17 былі зафіксаваны камяні са слядамі агню, а таксама пляма са спарахнелымі косткамі. Верагодней за ўсё, у гэтым выпадку мы таксама маем дачыненне з праявамі пэўных рытуалаў, якія здзяйсняліся падчас пахавання. Камяні і агонь займалі важнае месца ў пахавальным абрадзе насельніцтва мілаградскай культуры [9, с. 46–47]. Гэты тэзіс знаходзіць пацверджанне і ў матэрыялах дубайскіх курганаў, дзе, акрамя курганаў № 17 і 19, сляды звязаных з агнём рытуалаў можна адзначыць яшчэ ў 7-мі насыпах (табл.).

Можна канстатаваць той факт, што пахавальны абрад Дубайскіх курганоў дэманструе падабенства па шэрагу прыкмет з астатнімі курганнымі некропалямі ў арэале мілаградскай культуры. Пахаванні здзяйсняліся ў блізкіх па памерах ямах прамакутнай формы. Яны ажыццяўляліся па абраду інгумацыі, таксама на могільніку фіксуюцца калектыўныя пахаванні. Існавала традыцыя рытуальнага абпальвання і абкладання пляцовак пяском на ўзроўні старажытнай паверхні. Здзяйсненне пэўных рытуалаў адбывалася каля пахавальных ям.

На прыкладзе могільніка Дубай можна адзначыць, што не заўсёды адзначаецца ўзаемасустракаемасць такіх элементаў, як найбольшы памер насыпу, драўляная канструкцыя, памінальныя абрады, пясчаная пляцоўка з аднаго боку з найбольш багатым і прадстаўнічым інвентаром, такім як прадметы ўзбраення ці ўпрыгожанні (табл.). Так, напрыклад, насып кургана № 1 вызначаецца вялікімі памерамі, у ім прысутнічае драўляная канструкцыя. Між тым, у яме ў якасці інвентару адзначаецца толькі крамянёвы скрабок. У кургане № 2, дзе пры касцяку знаходзіўся такі прэстыжны элемент інвентару,

як наканечнік кап'я, насып не вылучаўся сярод іншых памерам, у ім адсутнічалі складаныя элементы, такія як драўляная канструкцыя ці адмысловая ахвярная пясчаная пляцоўка.

**Храналогія і праблема культурных сувязей.** Датаванне Дубайскіх курганаў у значнай ступені грунтуецца на датах, які прапануюцца для жалезных наканечнікаў коп'яў. Абапіраючыся на сучасны стан вывучэння знаходак падобных тыпаў, можна датаваць гэты помнік у межах VII–VI ст. да н. э. Выяўленыя ў Дубае наканечнікі коп'яў маюць блізкую, лаўралістную форму, аднак, іх можна падзяліць на 2 групы, згодна з тыпалогіяй Г. І. Мелюковай [32, с. 168; 36, с. 36, 38]. Да першай групы адносяцца наканечнікі з курганоў № 2, 4 і 5 [2, табл. 1: 1, 2, 5], утулка ў якіх праходзіць шырокім рабром па сярэдзіне лопасцяў пяра і суадносяцца з 1 тыпам 1 аддзелам. У наканечнікаў, знойдзеных у курганах № 6, 13, паміж лопасцямі знаходзіцца вузкае рабро, якое паступова пераходзіць ва ўтулку [2, табл. 2: 2, 1: 1, 2, 5, 7]. Згодна з Г. І. Мелюковай, гэтыя наканечнікі ў цэлым можна датаваць у межах VII–VI ст. да н. э. [32, с. 36].

Найбольш цікавай з'яўляецца залатая завушніца з кургана № 5 (рыс. 2, *б*) [2, табл. 1: 3], якая адносіцца да сягментападобных. Звычайна яны маюць выгнутую дужку, да якой мацуюцца два шчыткі розных памераў. У завушніцы з Дубая адзін шчыток памерамі 11,4х11,3 мм, а меншы – 8,3х7,9 мм, дыяметр дужкі – 2,1 мм. Падобныя завушніцы найбольш распаўсюджаныя ў арэале мілаградскай культуры, але, як правіла, яны зроблены з бронзы. Акрамя таго, такія вырабы шырока прадстаўленыя ў матэрыялах суседніх сінхронных культур: у тарнабжэгскай групе лужыцкай культуры, высоцкай, юхнаўскай, днепра-дзвінскай, культурах Лесастэпавай Скіфіі і інш. [33, рис. 73: 23; 34, рис. 126; 36, с. 21; 36; 37]. В. Г. Пятрэнка адносіць падобныя завушніцы да 1 варыянта 1 тыпу і датуе ў межах VI ст. да н. э. [35, с. 21, 25]. Пры гэтым варта адзначыць, што вырабы, зробленыя з золата, найбольш прадстаўлены ў матэрыялах лесастэпавай скіфіі ў комплексах «арыстакратычных» курганоў (рыс. 2, *а*) [39, с. 28–33]. Храналогію комплексаў з аналагічнымі ўпрыгажэннямі можна вызначыць у межах канца VII – першай паловы VI ст. да н. э. [38, с. 28–33; 40, с. 52–53; 10, табл. 1; 41, с. 141].

Важнымі для разумення культурных кантактаў насельніцтва мілаградскай культуры з'яўляюцца два грушападобныя гаршкі з курганаў № 5 і 7 (рыс. 3). У пасудзіны з кургана № 5 прамое, зрэзанае венца, шыйка не вылучана. Плячук упрыгожаны трыма двайнымі выступамі (рыс. 3, *1*). Гаршчок з кургана № 7 меў адагнутае звонку венца з плаўным выгінам (рыс. 3, *2*). Упрыгожаны чатырма вушкамі-ўпорамі з адтулінамі. На пасудзіне маюцца тры скразныя адтуліны памерамі 3–4 мм, якія, хутчэй за ўсё, сведчаць аб слядах рамонту. Паверхня абедзвюх пасудзін глянцаваная [2, с. 98]. Гэта нетыповыя для мілаградскай культуры формы. Падобныя пасудзіны ў арэале




*Рыс. 2.* Залатыя завушніцы ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Усходняй Еўропы:

*а* – Комплексы ранняга жалезнага веку з залатымі сягментападобнымі завушніцамі:
*1* – Дубай; *2* – Сіняўка 100; *3* – Бельскае гарадзішча, курганны могільнік Скорабар 2, 2019; *4* – Репехеватая магіла; *5* – Бобрыца, курган № 40; *6* – Жураўка, курган № 447; *7* – Трыполле, курган № 1; *8* – Курылаўка, курган № 25; *9* – Івахноўцы, курган № 1; *10* – Ракоўка, курган № 2; *11* – Трахцеміраўскае гарадзішча; *12* – Мошны, выпадковая знаходка;
*б* – Залатая завушніца з кургана № 5 каля вёскі Дубай

мілаградскай культуры былі знойдзены на шэрагу помнікаў з цячэння ракі Гарынь: у кургане № 3 каля в. Валадымірэц; грунтовым пахаванні каля в. Брадзіў (Астрожскі р-н); грунтовым пахаванні каля в. Гарадзішча (Ровенскі р-н); а таксама ў комплексе пабудовы Пересопніца-Баранівка – 2 (Ровенскі р-н) [14; 4, с. 43, рis. 8: 1–4; 42, с. 258].




*Рыс. 3.* Карчагі з курганнага могільніка каля в. Дубай:

*1* – Курган № 5; *2* – Курган № 7

Умоўна пасудзіны можна аднесці да карчаг вілланаўскага тыпу, якія былі пашыраныя ў культурах усходнеальпійскага і фракійскага гальштата, а таксама у лесастэпавай зоне ў перадскіфскі і скіфскі перыяды. Ад класічных карчаг гэтага тыпу дубайскія адрозніваюцца прафіліроўкай ніжніх частак, якія маюць мілаградскія рысы, а менавіта акруглабокасць. Такім чынам, у гэтых пасудзінах можна прасачыць сінкрэтызм культурных традыцый. Існуе два накірункі па рашэнню пытання аб крыніцы запазычання ідэі такіх пасудзін. Частка даследчыкаў лічыць, што яны з’яўляюцца ў насельніцтва мілаградскай культуры пад уздзеяннем плямёнаў Лесастэпавай Скіфіі [41, с. 43; 15, с. 180; 43, с. 42–45]. Гаршкі вілланаўскага тыпу былі распаўсюджаны ў асноўным на раннескіфскім этапе, які ахоплівае VII–V ст. да н. э., і не адзначаюцца ў старажытнасцях сярэднескіфскага этапу [43, с. 42–45; 44, с. 53, 77, рис. 10: 12, 13]. Іншыя даследчыкі лічаць, што на мілаградцаў аказала ўплыў

насельніцтва высоцкай культуры [4, с. 60]. Гэтаму не супярэчыць храналогія пахаванняў, у якіх былі выяўлены разглядаемыя пасудзіны. Адна з падобных пасудзін знойдзеная ў пахаванні № 53а могільніка Высоцк, якое належыць да II этапу позневысоцкага перыяду і сінхранізуецца з фазай НаС1 па цэнтральнаеўрапейскай храналогіі [34, с. 215, рис. 96: 3–4, табл. 5]. У цэлым, ранняе для мілаградскай культуры датаванне пахаванняў пацвярджаецца падабенствам глінянага начыння з раннімі формамі Пагарыння і Падняпроўя, а таксама арнаментацыяй перлінкамі і праколамі, тыповымі для керамічнага комплексу ранніх помнікаў гэтай культуры [3, с. 59–63].

**Высновы.** Па выніках аналізу пахавальнага абраду курганнага могільніка каля в. Дубай можна зрабіць шэраг высноў. На помніку вылучаецца некалькі абрадавых груп, якія характарызуюцца наступнымі рысамі.

1) Пахаванні здзейсненыя з паўднёва-ўсходняй арыентыроўкай нябожчыкаў. У дадзенай групе можна вылучыць два варыянты.

а) Пахаванні лакалізуюцца на ўзроўні старажытнай дзённай паверхні. У якасці дадатковых элементаў пабудовы кургана выкарыстоўваліся пясчаныя пляцоўкі, а на пэўнай адлегласці ад нябожчыка здзяйсняліся рытуалы, звязаныя з трызнай. Зрэдку выкарыстоўваліся драўляныя канструкцыі.

б) Цела нябожчыка змяшчалася ў яму падакруглай формы. Дадатковыя элементы ў цэлым падобныя на папярэдні варыянт.

2) Пахаванні з паўночнай арыентыроўкай (курган № 15, 19). У якасці дадатковых элементаў фіксуюцца сляды трызны.

Пэўная асаблівасць тычыцца арыенціроўкі нябожчыкаў. У курганных пахаваннях мілаградскай культуры, у цэлым, дамінуе традыцыя палажэння цел галавой на поўнач. Пры гэтым у матэрыялах Дубайскага могільніка і грунтовых інгумацыйных пахаваннях мілаградскай культуры такая арыенціроўка фіксуецца рэдка. Паўночную арыенціроўку можна адзначыць на шэрагу курганных могільнікаў, такіх як Дзяснянка, Курылаўка, Мізякава, Сялец, VIII курганная група. В. М. Мельнікоўская лічыла, што курганы Жытоміршчыны з’яўляюцца архаічнымі [9, с. 50]. Аднак могільнікі Дзяснянка, Курылаўка і Мізякава сёння сумарна адносяцца да VI–IV ст. да н. э., і можна меркаваць, што паўночная арыенціроўка пераважае на розначасовых курганных некропалях ў розных рэгіёнах. Такім чынам, тэндэнцыя да арыентавання нябожчыкаў галавой на поўдзень, якая характарызуе пахавальную абраднасць могільніка ў Дубаі, вылучае гэты помнік на агульным фоне мілаградскіх курганных некропаляў і набліжае яго да грунтовых пахаванняў з інгумацыямі. Гэтую асаблівасць можна звязваць з міграцыямі і кантактамі як ўнутры арэала мілаградскай культуры, так і з іншакультурным насельніцтвам. Традыцыя ўзвядзення драўляных канструкцый на ўзроўні старажытнай паверхні вылучае курганы каля в. Дубай сярод пахаванняў мілаградскай і сінхронных культур, для якіх больш характэрны канструкцыі ў ямах.

Храналагічна могільнік каля вёскі Дубай, на нашу думку, адносіцца да канца VII – першай паловы VI ст. да н. э. Вызначэнне больш дробнай храналогіі на сённяшні дзень не магчыма. Улічваючы залатую завашніцу і прапанаваныя аналогіі, можна выказаць думку аб уплыве на насельніцтва, якое пакінула могільнік каля в. Дубай, з боку лесастэпавай скіфойднай культуры. Пры гэтым з-за слабой вывучанасці помнікаў цячэння ракі Гарынь ў раннім жалезным веку, а таксама надкультурным характары формы пасудзін з курганоў № 5 і 7, цяжка дакладна вызначыць вектар культурных навацый і сувязей.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Сахончик О. Д.* Погребальный обряд населения милоградской культуры: историография и история изучения // Вестник Гродненского государственного университета имени Янки Купалы. Серия 1. История и археология. Философия. Политология. 2022. Т. 14, № 3. С. 41–50.
2. *Кухаренко Ю. В.* Памятники железного века на территории Полесья. Москва: АН СССР, 1961. 70 с.
3. *Сахончык А. Д.* Даследаванне курганнага могільніка мілаградскай культуры каля вёскі Дубай Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў 1989 годзе: сістэматызацыя і аналіз крыніц // МАБ. 2023. Вып. 33. С. 58–65.
4. *Рассадин С. Е.* Милоградская культура: ареал, хронология, этнос. Минск: ГНУ «Институт истории НАН Беларуси», 2005. 106 с.
5. *Лашанкоў М. І.* Археалагічныя помнікі мілаградскай культуры // Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 2. Мінск, 1999. С. 29–39.
6. *Вергей В. С.* Западный ареал милоградской культуры // ГАЗ. 1995. № 7. С. 83–100.
7. *Березанская С. С.* Северная Украина в эпоху бронзы. Киев: Наукова думка, 1982. 210 с.
8. *Свешников І. К.* Пам’ятай милоградської культури в басейні р. Горинь // Археологія. 1971. № 2. С. 68–81.
9. *Мельниковская О. Н.* Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. Москва: Наука, 1967. 195 с.
10. *Еременко В. Е.* Относительная и абсолютная хронология Скифии: взгляд со стороны // Stratum + ПАВ: Сб. статей к 60-летию Д. А. Мачинского и М. Б. Щукина. Кишенев, 1997. С. 44–61.
11. Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1. Минск: Наука и техника, 1970. 272 с.
12. *Лошенков М. И.* Городища Милоградской культуры на территории Беларуси. Минск: МФЦП, 2011. 408 с.
13. *Поболь Л. Д.* Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Минск: Наука и техника, 1983. 429 с.
14. *Еременко В. Е.* Археологическая карта милоградской культуры // Славяне: этногенез и этническая история (междисциплинарные исследования). Ленинград, 1989. С. 76–105.

15. *Ильинская В. А., Тереножкин А. И.* Скифия VII–IV вв. до н. э. Киев: Наукова Думка, 1983. 380 с.

16. *Лобай Б. И.* Кургани скіфського часу на Вінниччині // Археологія. 1977. № 21. С. 77–84

17. *Лагодовська Ф.* Кургани скіфського часу в с. Курилівці // Археологічні пам'ятки УРСР. Київ, 1956. т. VI . С. 17–20.

18. *Лысенко С. Д.* Погребения скифского времени Малополовецкого могильника // Археологічні пам›ятки Фастівщини. Матеріали до археологічної карти Київської області. Фастів, 2004. № 20–21. С. 6–33.

19. *Савчук А. П.* Бескурганное погребение в с. Рудяки на Киевщине // КСИА АН УССР. 1952. Вып. 1. С. 56–58

20. *Петровська Є. О.* Підгірцівські пам'ятки Київського Подніпров'я // Археологія. 1971. № 2. С. 9–22.

21. *Гончар В. М.* Нові пам›ятки раннього заліза на території сучасного Києва // Археологія. 1997. № 1. С. 149–155.

22. *Лысенко С. Д.* Исследования Малополовецкого археологического комплекса в 2009 г. // Археологічні дослідження в Україні 2009 р. Київ, 2010. С. 270–271.

23. *Крывальцэвіч М. М. Бычкоў М. У.* Прыбарскія курганныя могільнікі эпохі бронзы // ГАЗ. 1996. № 9. С. 61–76.

24. *Шекун А. В.* Могильник милоградской культуры у с. Деснянка близ Чернигова // Археологічні старожитності Подесення. Чернігів, 1995. С. 152–158.

25. *Бессонова С. С.* Курганы лесостепного Побужья // Древности скифов: сборник статей. Киев, 1994. С. 3–34.

26. *Махортых С. В.* Общее и особенное в погребальной обрядности ранних скифов лесостепной Украины // Восточноевропейские древности: сборник научных трудов. Воронеж, 2012. С. 106–118.

27. *Ковпаненко Г. Т.* Памятники скифской эпохи Днепровского Лесостепного Правобережья (Киево-Черкасский регион). Киев: Наукова думка, 1989. 336 с.

28. *Скорый С. А.* О Волынской локальной группе памятников «скифской культуры» Правобережной Лесостепи // Древности скифов: сборник статей. Киев, 1994. С. 34–40.

29. Археология Прикарпатья, Волыни и Закарпатья (энеолит, бронза и раннее железо). Киев: Наукова думка, 1990. 188 с.

30. *Махно Е. В.* О культурно-хронологической принадлежности могильника Гремячье на Житомирщине // Емінак. 2020. №1 (29). С. 342–363.

31. *Лысенко С. Д.* Курган милоградской культуры близ Киева // Донецький археологічний збірник за 2009/2010 рр. 2010. № 13–14. С. 229–247.

32. *Мелюкова А. И.* Вооружение скифов. Москва: АН СССР, 1964. 92 с.

33. *Каравайко Д. В.* Памятники юхновской культуры Новгород-Северского Полесья. Киев: ИА НАН Украины, 2012. 276 с.

34. *Бандрівський М.* Культурно-історичні процеси на Прикарпатті і Західному Поділлі в пізній період епохи бронзи – на початку доби раннього заліза. Львів: Інститут українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, 2014. 574 с.

35. *Петренко В. Г.* Украшения Скифии VII–III вв. до н. э. Москва: АН СССР, 1978. 144 с.

36. *Полит Б.* Матеріали до вивчення цвяхоподібних сережок ранньозалізного віку з території Польщі // Археол. досл. Львів. ун-ту. 2010. Вип. 13. С. 148–170.

37. *Gawlik A.* Elementy miłogradzkie w środowisku kultury łużyckiej Polski Południowo-Wschodniej // Tarnobrzeska kultura łużycka. Źródła i interpretacje. Rzeszów, 2009. S. 177–189.

38. *Клочко Л.* Сережки у вбранні населення Скіфії (з колекції Музею історичних коштовностей України). Київ: ТОВ «Фенікс», 2021. 172 с.

39. *Ковпаненко Г. Т.* Курганы раннескифского времени в бассейне р. Рось. Киев: Наукова думка, 1981. 162 с.

40. *Гречко Д. С.* О памятниках киммерийцев и «раннескифской» культуре // Stratum plus. Культурная Антропология. Археология. 2013. № 3. С. 133–154.

41. *Бардецкий А.* Житло милоградської культури з поселення Пересопниця–Баранівка-2 Рівненського району // Нові дослідження пам'яток археології на Волині: Матеріали науково-практичної конференції. Пересопниця, 2018. Вип. 6. С. 29–48.

42. *Бардецький А.* Парне поховання милоградської культури Бродівське на Острожчині // Острозький краєзнавчий збірник. Острог, 2021. Вип. 13. С. 254–281.

43. *Пеляшенко К. Ю.* Ліплений посуд скіфського часу населення Дніпро-Донецького Лісостепу. Київ–Котельва: ІА НАН України–ІКЗ «Більськ», 2020. 378 с.; 175 рис.; 72 табл.

44. *Ковпаненко Г. Т., Бессонова С. С., Скорый С. А.* Памятники скифской эпохи Днепровского Лесостепного Правобережья (Киево-Черкасский регион). Киев: Наукова думка, 1989. 336 с.

# ІМПАРТАВАНЫЯ ШКЛЯНЫЯ ПАЦЕРКІ З МОГІЛЬНІКА КАЛЯ В. ЧАПЛІН У КАЛЕКЦЫІ «АРХЕАЛОГІЯ ПЕРШАБЫТНАСЦІ» НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**А. М. Ушко**

*Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, вул. К. Маркса, 12,
220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь;
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,
220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, ushkoarch@gmail.com*

Прадстаўлена апісанне шкляных пацерак з могільніка каля в. Чаплін у калекцыі «Археалогія Першабытнасці» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Вызначаны памеры, колер і іншыя асаблівасці пацерак з пахаванняў. Зроблена полаўзроставая ідэнтыфікацыя пахаванняў з пацеркамі. Выяўлены найбольш папулярны тып пацерак па класіфікацыі К. М. Аляксеевай. Выяўлены найбольш магчымыя шляхі паступлення шкляных пацерак на тэрыторыю Беларусі. Вызначаны асноўныя тэндэнцыі і час бытавання шкляных пацерак на помніках зарубінецкай культуры.

***Ключавыя словы:*** зарубінецкая культура; Беларускае Падняпроўе; упрыгожванні; імпарт; полаўзроставыя характарыстыкі.

# ИМПОРТИРОВАННЫЕ СТЕКЛЯННЫЕ БУСЫ С МОГИЛЬНИКА ОКОЛО Д. ЧАПЛИН В КОЛЛЕКЦИИ «АРХЕОЛОГИЯ ПЕРВОБЫТНОСТИ» НАЦИОНАЛЬНОГО ИСТОРИЧЕСКОГО МУЗЕЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

**А. М. Ушко**

*Национальный исторический музей Республики Беларусь, ул. К. Маркса, 12,
220030, г. Минск, Республика Беларусь;
Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,
220030, г. Минск, Республика Беларусь, ushkoarch@gmail.com*

Представлено описание стеклянные бус из могильника около д. Чаплин в коллекции «Археология Первобытности» Национального исторического музея Республики Беларусь. Определены размеры, цвет и другие особенности бус из погребений. Сделана половозрастная идентификация погребений с бусами. Определены наиболее популярные типы бус по классификации Е. М. Алексеевой и возможные пути их поступления на территорию Беларуси. Определены основные тенденции и время бытования стеклянных бус на памятниках зарубинецкой культуры.

***Ключевые слова:*** зарубинецкая культура; Белорусское Поднепровье; украшения; импорт; половозрастные характеристики.

# IMPORTED GLASS BEADS FROM THE BURIAL GROUND NEAR CHAPLIN VILLAGE IN THE COLLECTION «ARCHEOLOGY OF PRIMITIVENESS» OF THE NATIONAL HISTORICAL MUSEUM OF THE REPUBLIC OF BELARUS

**A. M. Ushko**

*The National historical museum of the Republic of Belarus, K. Marx str., 12, 220030, Minsk, Republic of Belarus;*
*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, ushkoarch@gmail.com*

Glass beads description from the burial ground near Chaplin village in the collection «Archaeology of Primitiveness» of the National Historical Museum of the Republic of Belarus is presented. The size, color, and other features of the beads from the burials have been determined. The sex and age identification of burials with beads has been made. The most popular types of beads according to the classification of E. M. Alekseeva and possible ways of their entry into the territory of Belarus have been identified. The main trends and the time of the existence of glass beads on the monuments of the Zarubinets culture are determined.

***Keywords:*** Zarubinets culture; Belarusian Dnieper region; jewelry; import; gender and age characteristics.

З пачаткам выкарыстання шкладутнай трубкі чалавецтва пераходзіць да рашучага пералому ў тэхналогіі шклянога майстэрства: прадукцыя стала шырэй, танней і больш даступнай для насельніцтва. Пачынаючы з першых стагоддзяў нашай эры, шкляны посуд і упрыгожванні пераўтвараюцца ў звычайны і штодзённы тавар. Таксама пачынаюць удасканальвацца і складаныя тэхналогіі.

Працэс шкловарэння атрымаў шырокае распаўсюджанне ў розных частках Рымскай імперыі – рамеснікі-шкларобы мігравалі і асноўвалі сваю вытворчасць у мностве буйных цэнтраў, дзе іх прадукцыя карысталася вялікім попытам [1, с. 35–36]. Акрамя распаўсюджвання ў саміх буйных цэнтрах, шкляныя вырабы (у першую чаргу пацеркі) распаўсюдзіліся ў якасці імпарту і ў іншыя рэгіёны, у тым ліку на тэрыторыю Беларусі.

Вялікая колькасць пацерак знойдзена на зарубінецкіх могільніках Беларускага Падняпроўя. У іншых рэгіёнах зарубінецкай культуры шкляныя пацеркі сустракаюцца значна радзей. І гэта негледзячы на тое, што верхнедняпроўскі варыянт геаграфічна больш аддалены ад шкларобчых майстэрняў латэнскага і антычнага свету. А. І. Драбушэўскі мяркуе, што ў гэтым рэгіёне, у адрозненні ад Прыпяцкага Палесся і Сярэдняга Падняпроўя, антычны імпарт уяўляў большую каштоўнасць і яму надавалі вялікае значэнне ў пахавальным інвентары [2]. Самая вялікая колькасць пацерак жалезнага веку была знойдзена на могільніку Чаплін (Лоеўскі раён Гомельская вобласць).

Пацеркі выяўлены ў пахаваннях, якія лакалізаваліся ў цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частках могільніка. Згодна з распрацоўкамі археолагаў, выяўленыя комплексы адносяцца да ранніх. У літаратуры фігуруе меркаванне, што пад час бытавання познелатэнскіх фібул пацеркі амаль не паступалі насельніцтву зарубінецкай культуры [3, с. 135–139].

Пацеркі былі выяўлены ў 37 пахаваннях, і іх агульная колькасць складае больш за тысячу адзінак, некалькі соцен пацерак аплаўлены, таму вызначыць дакладную колькасць не магчыма. Да таго ж, выклікае пытанне спосаб падліку шкляных пацерак Л. Д. Побалем: даследчык не падлічваў кожную пацерку, а дзяліў агульную вагу на вагу адной, атрымоўваючы, такім чынам, прыблізную колькасць. Большасць пацерак былі знойдзены ў жаночых пахаваннях, але сустракаюцца і ў мужчынскіх.

Вялікая частка пацерак, знойдзеных падчас раскопак Л. Д. Побалем могільніка каля в. Чаплін, захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Частка з іх знаходзіцца ў фондах калекцыі «Археалогія Першабытнасці», а таксама – непасрэдна выстаўляецца ў пастаяннай экспазіцыі.

У калекцыі прадстаўлены пацеркі з шаснаццаці пахаванняў: № 63, № 72, № 99, № 111, № 116, № 117, № 120, № 127, № 132, № 133, № 188, № 218, №219, № 263, № 268 і № 270. З усёй калекцыі шэсцьдзесят адна – гэта пацеркі ці асобныя, ці сплаўленыя разам, і пяцьдзесят восем расплаўленых аморфных згрушчванняў.

*Пахаванне № 63* прадстаўлена згрушчваннем (КП 45416/18) моцна сплаўленых шкляных пацерак сіняга і зялёнага колераў з рэшткамі кальцынаванай косткі (рыс. 1, *1*). Памеры гэтага згрувашчвання наступныя: даўжыня – 2,3 см, шырыня – 1,5 см, вышыня 0,9 см, вага 3,41 г.

*Пахаванне № 72* прадстаўлена згрушчваннем (КП 45416/27) (рыс. 1, *2–7*) аплаўленых пацерак сіне-жоўтага колеру з наступнымі памерамі: даўжыня – 1,4 см, шырыня – 1 см, вышыня – 0,65 см, вага – 0,65 г; згрушчваннем (КП 45416/28) сіне-бірузовага колеру з памерамі: даўжыня – 1,6 см, шырыня – 0,9 см, вышыня – 0,8 см, вага – 0,89 г; і чатырма згрушчваннямі (КП 45416/29) сіняга, жоўтага і бірузовага колераў. Першае згрушчванне прадстаўлена пацеркай з уплаўленым бронзавым трохабаротным колцам з круглага дроту, на паверхні шкла бачны сляды тканіны. Памеры наступныя: даўжыня – 3,8 см, шырыня – 2,3 см, вышыня – 1,5 см, вага – 7,19 г. Другое згрушчванне – сплаўленыя сіне-зялёныя пацеркі з украпленнямі жоўтага шкла з памерамі: даўжыня – 2,7 см, шырыня – 0,6–1,6 см, вышыня 0,5–0,7 см, вага – 1,82 г. Трэцяе згрушчванне – аплаўленыя сіне-бірузовыя пацеркі з памерамі: даўжыня – 1,95 см, шырыня – 0,75–0,95 см, вышыня – 0,6 см, вага – 0,99 г. Чацвёртае згрушчванне – трохкутнік з цёмна-сіняга шкла з памерамі 1,1 см на 1,1 см на 1,1 см і вагай 0,52 г.




*Рыс. 1.* Пацеркі з пахаванняў могільніка Чаплін:

*1* – № 63; *2–7* – № 72; *8* – № 99; *9–16* – № 111; *17–39* – № 116

*Пахаванне № 99* прадстаўлена шкляной пацеркай (КП 45417/7) (рыс. 1, *8*) цёмна-сіняга колеру тыпу сечаны бісер памерамі: дыяметр – 0,3 см, вышыня – 0,2 см, вага – 0,07 г. Па класіфікацыі К. М. Аляксеевай гэта тып 15 аднакаляровых пацерак [4, с. 64–65].

*Пахаванне № 111* (рыс. 1, *9–16*) прадстаўлена шкляной пацеркай (КП 45417/28) цёмна-сіняга колеру тыпу сечаны бісер (тып 15 аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай) з памерамі: дыяметр – 0,39 см, вышыня – 0,3 см, вага – 0,06 г [4, с. 64–65]. Да яго ж адносяцца рэшткі караляў з пацерак (КП 45417/29), якія складаюцца са згрушчвання бірузовага колеру з даўжынёй 1,6 см, шырынёй 0,5–0,6 см, вагай – 0,49 г, згрушчвання сіне-жоўтага колеру з даўжынёй 1,1 см, шырынёй 0,5–0,7 см, вагай 0,33 г, згрушчвання бірузовага, жоўтага і сіняга колераў з даўжынёй 1,3 см, шырынёй 0,35–0,5 см, вагай 0,32 г, згрушчвання нявызначанага колеру з даўжынёй

0,8 см, шырынёй 0,6 см, вышынёй 0,3 см, вагай 0,11 г і з трох згрушчванняў сіняга колеру (адно згрушчванне сплаўлена з сечанага бісеру) з даўжынёй 2,3 см, 0,9 см, 0,7 см, шырынёй 0,4–0,9 см, 0,3–0,7 см, 0,3–0,4 см і вагай 0,87 г, 0,16 г, 0,13 г адпаведна.

*Пахаванне № 116* прадстаўлена каралямі (КП 45417/37) (рыс. 1, *17–39*) са шкляных аплаўленых пацерак, на некаторых з якіх бачны рэшткі костак. Яны складаюцца са згрушчвання сіне-белых і шэрых пацерак з хвалепадобным арнаментам на сіняй частцы з памерамі: даўжыня – 1,8 см, шырыня – 1,8 см, вышыня – 1,0–1,6 см, вага – 3,32 г. Яшчэ адно згрушчванне сініх, жоўтых з залачэннем і зялёных пацерак з памерамі: даўжыня – 2,6 см, вышыня – 1,0 см, вага – 3,84 г. Тры згрушчванні сініх і зялёных пацерак маюць наступныя памеры: даўжыня – 2,4 см, 1,1 см, 0,6 см; шырыня – 0,6–1,0 см, 1,0 см, 0,5 см; вышыня – 0,45–0,6 см, 0,5 см, 0,4 см; вага 1,49 г, 0,55 г, 0,13 г адпаведна. Таксама тут было выяўлена дванаццаць згрушчванняў сініх пацерак розных памераў: ад 0,4 да 1,4 см у даўжыню і вагай усіх згрушчванняў 1,4 г. Згрушчванне шэрых, сініх і жоўтых пацерак мае памеры: даўжыня – 2,2 см, шырыня – 0,6–0,8 см, вышыня – 0,4 см, вага – 0,78 г. Згрушчванне шэрых і жоўтых пацерак мае памеры: даўжыня – 0,8 см, шырыня – 0,7 см, вышыня – 0,5 см, вага – 0,29 г. Яшчэ чатыры згрушчванні сініх і шэрых пацерак маюць памеры: даўжыня – 1,7 см, 1,4 см, 1,9 см, 0,8 см; шырыня – 0,9 см, 0,6–1,1 см, 0,6 см, 0,65 см; вышыня – 0,7 см, 0,6 см, 0,5 см, 0,55 см; вагай 0,61 г, 0,77 г, 0,23 г, 0,29 г адпаведна.

*Пахаванне № 117* прадстаўлена каралямі (КП 45417/38) (рыс. 2, *1–24*) са шкляных пацерак тыпу сечаны бісер. Першыя два згрушчванні, з якіх складаюцца дадзеныя каралі, маюць нявызначаны колер і наступныя памеры: даўжыня – 0,6 см, 0,7 см, шырыня – 0,4 см, 0,5 см, вышыня – 0,4 см. І адно, і другое згрушчванне мае вагу – 0,24 г. Трэцяе згрушчванне складаецца з адзінаццаці сплаўленых сініх шкляных пацерак з памерамі: даўжыня – 2,0 см, дыяметр – 0,3–0,5 см, вага – 0,48 г. Згрушчванне з чатырох сплаўленых сініх шкляных пацерак мае наступныя памеры: даўжыня – 0,7 см, шырыня – 0,4–0,5 см, вышыня – 0,2–0,4 см, вага – 0,15 г. Наступнае згрушчванне з пяці сплаўленых сініх пацерак мае памеры: даўжыня – 1,1 см, шырыня – 0,35–0,5 см, вышыня – 0,4 см, вага – 0,21 г. Яшчэ адно згрушчванне з пяці сплаўленых сініх пацерак мае памеры: даўжыня – 1,2 см, шырыня – 0,4–0,7 см, вышыня – 0,3 см, вага – 0,25 г. Найбольшую колькасць (чатырнаццаць) згрушчванняў у пахаванні склалі моцнааплаўленыя сінія пацеркі, два з якіх маюць сляды кальцынаванай косткі. Памеры дадзеных згрушчванняў: даўжыня – ад 0,25 да 1,0 см, шырыня – ад 0,2 да 0,6 см, вышыня – ад 0,2 да 0,4 см, вага – 1,19 г. Апошнія згрушчванні з чатырох жоўтых шкляных пацерак маюць памеры: даўжыня 0,4 см, шырыня – 0,4 см, вышыня – ад 0,2 да 0,3 см, вага – 0,16 г.




*Рыс. 2.* Пацеркі з пахаванняў могільніка Чаплін:

*1–24* – № 117; *25* – № 120; *26* – № 127; *27–28* – № 132; *29* – № 133; *30* – № 188




*Рыс. 3.* Пацеркі з пахаванняў могільніка Чаплін:

*1–7* – № 218; *8* – № 219; *9–15* – № 263; *16* – № 268; *17* – № 270

*Пахаванне № 120* прадстаўлена шкляной празрыстай пацеркай (КП 45417/47) (рыс. 2, *25*) светла-жоўтага колеру. Пацерка крыху аплаўлена, таму, верагодна, адтуліна ў яе адсутнічае. Памеры: даўжыня – 1,0 см, шырыня – 0,9 см, вышыня – 0,5 см, вага – 0,59 г. Хутчэй за ўсё, гэта тып 6 аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай [4, с. 63–64].

*Пахаванне № 127* прадстаўлена расплаўленай пацеркай (КП 45417/57) (рыс. 2, *26*) з сіняга шкла з жоўтымі ўстаўкамі з памерамі: даўжыня – 1,55 см, шырыня – 1,1 см, вышыня – 0,8 см, вага – 0,63 г. Пацерка моцна расплаўлена, таму яе класіфікаваць не магчыма.

*Пахаванне № 132* прадстаўлена шкляной аплаўленай пацеркай (КП 45417/66) (рыс. 2, *27*) бірузовага колеру з памерамі: даўжыня – 0,7 см, шырыня – 0,6 см, вышыня – 0,5 см, вага – 0,48 г. Гэта тып А – 4. Ж – 04 па К. М. Аляксеевай. Таксама ў склад пахавальнага інвентару ўвайшла нізка з пяці шкляных перламутравых крыху пацінізаваных пацерак (КП 45417/67) (рыс. 2, *28*) з памерамі: 0,46 см на 0,37 см, 0,48 см на 0,31 см, 0,42 см на 0,30 см, 0,56 см на 0,45 см, 0,45 см на 0,31 см; і вагай усіх пяці пацерак 0,52 г. Такія акруглыя і бочкападобныя пацеркі – гэта тып 1–2 шкла з металічнай пракладкай (А – 6) па К. М. Аляксеевай [4, с. 29, 64].

*Пахаванне № 133* прадстаўлена шкляной аплаўленай пацеркай (КП 45417/70) (рыс. 2, *29*) нявызначанага колеру выцягнутай цыліндрычнай формы з памерамі: дыяметр – 0,9 см, даўжыня – 1,2 см, вага – 0,94 см. Гэта, верагодна, тып 25 аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай [4, с. 65].

*Пахаванне № 188* прадстаўлена шкляной пацеркай (КП 45417/124) (рыс. 2, *30*) сіняга колеру тыпу сечаны бісер з памерамі: дыяметр – 0,3 см, вышыня – 0,2 см, вага – <0,01 г. Гэта тып 15 аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай [4, с. 64–65].

*Пахаванне № 218* прадстаўлена адразу вялікай колькасцю пацерак (рыс. 3, *1–7*). Тут былі выяўлены два скапленні сплаўленых пацерак (КП 45417/155) (рыс. 3, *6–7*), якія раней былі адным згрушчваннем. Першае скапленне складаецца з сіняй малай, сіняй вялікай, сіняй сярэдняй і блакітнай вялікай пацерак з памерамі: даўжыня – 1,4 см, шырыня – 0,7 см, вышыня – 0,55 см, вага – 0,57 г. Другое згрушчванне складаецца з зялёнай вялікай, празрыста-белай сярэдняй і светла-карычневай дробнай пацерак з памерамі: даўжыня – 1,0 см, шырыня – 0,3–0,7 см, вышыня – 0,45 см, вага – 0,33 г.

Таксама да разглядаемага пахавання аднесены два згрушчванні сплаўленых пацерак (КП 45417/156) (рыс. 3, *4–5*), якія раней былі аднім згрушчваннем. Першае складаецца з белай «глухой» дробнай, сіняй сярэдняй і зялёнай вялікай пацерак з памерамі: даўжыня – 1,6 см, шырыня – 0,6 см, вышыня – 0,5 см, вага – 0,43 г. Другое згрушчванне складаецца з часткі зялёнай вялікай і дзвюх сініх дробных пацерак з памерамі: дыяметр – 0,4 см, даўжыня – 0,85 см, вага – 0,15 г.

Асобныя пацеркі з пахавання прадстаўлены трыма асобнікамі. Вялікая круглая шкляная пацерка (КП 45417/157) (рыс. 3, *3*) сіняга колеру з памерамі: дыяметр – 0,9 см, вышыня – 0,6 см, вага – 0,48 г. Вялікая шкляная пацерка са слядамі тканіны (КП 45417/158) (рыс. 3, *2*) сіняга колеру з памерамі 0,8 см на 0,6 см і вагай 0,27 г. Дробная шкляная пацерка (КП 45417/159) (рыс. 3, *1*) сіняга колеру з памерамі: 0,4 см на 0,25 см і вагай 0,06 г. Гэта тып 15 аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай [4, с. 64–65].

*Пахаванне № 219* прадстаўлена апаленай шкляной круглай пацеркай (КП 45417/163) (рыс. 3, *8*) чорнага колеру з памерамі: дыяметр – 0,8 см, вышыня – 0,6 см, вага – 0,57 г. Гэта тып 1 (А – 2+4) аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай [4, с. 62–63].

*Пахаванне № 263* прадстаўлена нізкай з сямі крыху пацінізаваных пацерак (КП 45417/220) (рыс. 3, *9–15*). Адна пацерка цёмна-жоўтага колеру з памерамі 0,45 см на 0,35 см. Гэта пацерка тып 5 (А – 1. Ж – 01) аднакаляровых пацерак па К. М. Аляксеевай. Шэсць пацерак шэра-перламутравага колеру з памерамі: 0,5 см на 0,4 см; 0,4 см на 0,45 см; 0,5 см на 0,4 см; 0,4 см на 0,3 см; 0,5 см на 0,45 см; 0,4 см на 0,4 см. Вага ўсіх пацерак 0,76 г. Такія акруглыя і бачонкападобныя пацеркі – гэта тып 1–2 шкла з металічнай пракладкай (А – 6) па К. М. Аляксеевай [4, с. 29, 63].

*Пахаванне № 268* прадстаўлена нізкай з шасці крыху пацінізаваных пацерак (КП 45417/229) (рыс. 3, *16*) перламутрава-шэрага колеру з памерамі: 0,5 см на 0,4 см; 0,7 см на 0,5 см; 0,6 см на 0,4 см; 0,4 см на 0,3 см; 0,5 см на 0,3 см; 0,5 см на 0,4 см. Агульная вага ўсіх пацерак 0,95 г. Яны адносяцца да тыпу 1–2 шкла з металічнай пракладкай (А – 6) па К. М. Аляксеевай [4, с. 29].

*Пахаванне № 270* прадстаўлена згрушчваннем (КП 45417/233) (рыс. 3, *17*) сплаўленых пацерак сіняга, жоўтага і белага колеру. На адной са сплаўленых пацерак сіняга колеру бачны белы зігзагападобны арнамент, прыкладна пасярэдзіне згрушчвання праходзіць чырвоная паласа. Памеры згрушчвання: даўжыня – 2,2 см, шырыня – 1,8 см, вышыня – 0,75 см, вага – 2,46 г.

Па меркаванню Л. Д. Побаля і А. М. Абломскага, могільнік каля в. Чаплін разрастаўся з цэнтра і да краёў. Храналогія могільніка, зробленая У. Я. Яроменка, часткова пацвярджае гэта, аднак, згодна з планіграфіяй бачна, што пахаванні ранняга перыяду былі распаўсюджаны амаль па ўсёй тэрыторыі могільніка, як і комплексы пазнейшых перыядаў. Сапраўдным «краем» могільніка можна лічыць толькі яго паўднёва-заходнюю частку (раскоп И), дзе ў асноўным знаходзяцца пахаванні 3 і 4 фаз [5]. Што тычыцца пахаванняў з пацеркамі, то яны размешчаны ў цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частках могільніка. Пацеркі амаль не сустракаюцца ў пахаваннях з познелатэнскімі

фібуламі і каля сярэдзіны I ст. да н. э. перастаюць паступаць мясцоваму насельніцтву. Гэта можа быць звязана з разбурэннем гетамі ў 55 г. да н. э. Ольвіі [3, с. 135–139].

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Алексеева Е. М.* Стеклоделие в Горгиппии в начале III века н. э. и импорт в город художественного стекла // Стекло Восточной Европы с древности до начала XX века. Санкт-Петербург: Нестор-История, 2015. 400 с.

2. *Дробушевский А. И.* Зарубинецкая культура Белорусского Поднепровья // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: в 2-х кн. Кн. 1. Минск, 2016. С. 38–136.

3. *Поболь Л. Д.* Славянские древности Белоруссии (ранний этап зарубинецкой культуры). Минск: Наука и техника, 1971. 232 с.

4. *Алексеева Е. М.* Античные бусы Северного Причерноморья. Москва: Наука. 1978. 104 с.

5. *Еременко В. Е., Журавлев В. Г.* Хронология могильника Чаплин верхнеднепровского варианта зарубинецкой культуры // Проблемы хронологии эпохи латена и римского времени. Санкт-Петербург, 1992. С. 55–79.

# ЗМЕСТ


Спіс скарачэнняў 3

Прадмова 4

*Атрохаў Дз. А.* Ранні жалезны век Беларусі ў працах А. А. Егарэйчанкі 6

*Бегунова В. В.* Вклад В. Р. Тарасенко в археологическое изучение Смоленщины 1920-х гг. 27

*Бубенько Т. С.* Поселения раннего железного века в Витебском Подвинье в свете новых археологических данных 35

*Воронцов А. М., Воронцов М. А., Столяров Е. В.* Исследования памятников раннего железного века и эпохи Великого переселения народов на территории Окско-Донского водораздела в 2019–2023 гг. 53

*В. С. Вяргей, Г. М. Бяліцкая* Вытворчы ўчастак на паселішчы пражскай культуры Снядзін-2 72

*Гурьянов В. Н., Чубур А. А., Сударев Н. И.* Постройка с поселения Огородня в контексте домостроительства горизонта Почеп (по материалам Деснинской экспедиции) 92

*Дубицкая Н. Н.* Изделия из глины на памятниках культуры Абидни в Белорусском Поднепровье 107

*Зиньковская И. В.* Поселение и могильник гуннского времени на Животинном городище 119

*Зыль А. В.* Археазаалагічныя даследаванні матэрыялаў з гарадзішча Цясты Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці 132

*Касюк А. Ф., Ермаліцкая К. Ф.* «Скарб ювеліра» V–VII стст. з вярхоўяў р. Арэса (Прыпяцкае левабярэжжа) 143

*Колоколов А. М.* Этнокультурная ситуация на территории Окско-Донского водораздела в VIII–X вв.: современное состояние проблемы 155

*Крывальцэвіч М. М.* Загорыны-1 (Мазырскае Палессе) – ад неаліту да эпохі жалеза (падсумаванне вынікаў археалагічнага даследавання) 173

*Крывальцэвіч М. М.* Бронзавая сякера нартыкенскага тыпу ў нізоўях Гарыні 195

*Крывальцэвіч М. М., Ткачоў А. Ю., Чарняўскі М. М.* Некаторыя новыя знаходкі металічных вырабаў бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі 207

*Курловіч П. С.* Матэрыялы другой паловы I тыс. н. э. з тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі ў навуковых публікацыях А. А. Егарэйчанкі ... 227

*Курловіч П. С., Сазонаў А. А., Кухлеўскі Я. А.* Гарадзішчы Браслаўскага раёна па даных паветранага лазернага сканавання ... 236

*Линевич С. Б.* Каменные сверленые изделия, найденные на территории Беларуси. Терминологический аппарат ... 251

*Лошенков М. И.* О горизонте культуры штрихованной керамики на Банцеровском городище ... 269

*Медведев А. М.* К вопросу о типологии подковообразных фибул зарубинецкой культуры ... 290

*Медведева М. В., Соболев В. Ю.* Археологическая школа А. А. Спицына: С. А. Дубинский и его первые полевые исследования ... 299

*Михайлова Е. Р.* Культура псковских длинных курганов и система путей через лесную зону Восточной Европы ... 320

*Никитко А. А.* Браслет с утолщенными концами, выявленный на селище Речки-2 Вилейского района Минской области в 2020 году ... 334

*Образцов И. Ф., Биркина Н. А.* Материалы железного века и эпохи Великого переселения народов из раскопок Ф. В. Покровского в фондах Государственного исторического музея ... 340

*Пазднякоў В. С.* Клецк – паселішча культуры штрыхаванай керамікі ... 353

*Разуваев Ю. Д., Меркулов А. Н.* Микроморфологический анализ поселенческой керамики в изучении этнокультурных процессов скифо-сарматской эпохи в Донской лесостепи ... 362

*Сахончык А. Д.* Курганны могільнік каля в. Дубай у кантэксце пахавальных помнікаў мілаградскай культуры ... 372

*Ушко А. М.* Імпартаваныя шкляныя пацеркі з могільніка каля в. Чаплін у калекцыі «Археалогія першабытнасці» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь ... 389

Навуковае выданне

# УСХОДНЯЯ ЕЎРОПА Ў ЖАЛЕЗНЫМ ВЕКУ – ЭПОХУ ВЯЛІКАГА ПЕРАСЯЛЕННЯ НАРОДАЎ

**Матэрыялы**
**міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі,**
**прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння**
**А. А. Егарэйчанкі**

**Мінск, 24–25 красавіка 2025 г.**

У аўтарскай рэдакцыі

Адказны за выпуск *В. В. Рэпін*
Камп'ютарная вёрстка *П. С. Курловіч*
Дызайн вокладкі *Д. М. Бузун*

Падпісана да друку 29.10.2025. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 23,25. Ул.-выд. арк. 31,42.
Тыраж 40 экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў №1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка.